М. А. Лазарук, В. І. Русілка, І. М. Слесарава

БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА

Вучэбны дапаможнік для 8 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання

Дапушчана
Міністэрствам адукацыі
Рэспублікі Беларусь

МІНСК
НАЦЫЯНАЛЬНЫ ІНСТЫТУТ АДУКАЦЫІ
2011

УДК 821.161.3.09(075.3=161.3=161.1)
ББК 83.3(4Беи)я721
Л17

Р э ц э н з е н т ы:

кафедра беларускай літаратуры і культуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (канд. філал. навук дац. *У. В. Рагойша*);

нам. дырэктара па вучэбнай рабоце, настаўнік беларускай мовы і літаратуры выш. катэгорыі ДУА «Гімназія № 1 імя Ф. Скарыны г. Мінска» *Н. У. Целяпун*;

канд. філал. навук дац. *М. Ф. Шаўлоўская*;

галоўны навуковы супрацоўнік аддзела выданняў і тэксталогіі Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, д-р філал. навук, праф. *М. І. Мушынскі*

На вокладцы рэпрадукцыя карціны У. Хадаровіча «Бацькоўская скрыпка».

Лазарук, М. А.

Л17 Беларуская літаратура : вучэб. дапам. для 8-га кл. установ агульн. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / М. А. Лазарук, В. І. Русілка, І. М. Слесарава. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2011. — 360 с.

ISBN 978-985-465-859-9.

УДК 821.161.3.09(075.3=161.3=161.1)
ББК 83.3(4Беи)я721

ISBN 978-985-465-859-9

Дарагія васьмікласнікі!

Наша пазнанне літаратуры працягваецца. Аднак перш чым пачаць знаёмства з новым матэрыялам, давайце ўспомнім тое, што вывучалі ў сёмым класе. Вы даведаліся пра асаблівасці літаратуры як мастацтва, пра яе месца сярод іншых відаў мастацкай творчасці, такіх, напрыклад, як музыка, жывапіс, тэатр. Вы мелі таксама магчымасць параўнаць творы мастацкай літаратуры і публіцыстыкі, мастацкай літаратуры і навукі (гісторыі) і зразумець, што іх аўтары карыстаюцца словам, сродкамі мовы, але робяць гэта па-свойму, так, як дыктуюць законы таго ці іншага віду мастацтва ці пэўнай галіны навукі.

Галоўнае ж, на чым была сканцэнтравана ваша ўвага ў сёмым класе, гэта два асноўныя тыпы слоўнага мастацтва — паэзія і проза. Вы прачыталі шмат вершаваных і празаічных твораў і пераканаліся: яны значна адрозніваюцца не толькі тым, што адны напісаны рыфмаванай, рытмічнай мовай, а другія — «звычайнай». Паэзія, з яе настраёвасцю, эмацыянальнасцю, схільная да апісання перажыванняў, момантаў хвалююча яркіх, карыстаецца словам узнёслым, мовай метафарычнай. Для празаічных жа твораў найчасцей характэрны паказ з'яў і чалавечых адносін спакойна-апісальны, удумліва-разважлівы.

Вы зразумелі таксама, што паэтычныя і празаічныя творы розныя не толькі па форме, але і

па сродках і прыёмах паказу жыцця. Сапраўдная паэзія і выдатная проза адпавядаюць пэўным якасцям, творы такога кшталту з'яўляюцца высокамастацкімі, дасканалымі.

На працягу многіх стагоддзяў развіцця літаратуры выпрацавана шмат спосабаў мастацкага адлюстравання жыцця, а ў залежнасці ад іх з'явіліся разнастайныя тыпы мастацкіх твораў. Разглядаючы іх, працягнем знаёмства з асаблівасцямі мастацкай літаратуры, даведаемся аб яе родах і жанрах.

У ТРОХ АБЛІЧЧАХ

РОДЫ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Мастацкую літаратуру называюць чалавеказнаўствам. Гэта таму, што галоўным аб'ектам яе цікавасці з'яўляецца чалавек. А спазнаць чалавека, яго адносіны да жыцця, характар, духоўны свет можна, разглядаючы ўмовы, у якіх ён жыве, яго ўзаемаадносіны з іншымі людзьмі, передаючы яго думкі, перажыванні, пачуцці, паказваючы яго ўчынкі і паводзіны.

Мастацкая літаратура, адлюстроўваючы жыццё чалавека, ідзе трыма шляхамі. Першы з іх — эпічны (апавядальны), другі — лірычны, трэці — драматычны. І па спосабе паказу чалавека мастацкія літаратурныя творы падзяляюцца на тры асноўныя разнавіднасці, або, як іх прынята называць, роды: ***эпас, лірыку і драму***.

Натуральна, што ў творах эпічнага роду выкарыстоўваецца галоўным чынам эпічны, або апавядальны, спосаб паказу жыцця, у лірычных — лірычны і г. д. Аднак у мастацкай літаратуры не заўсёды бывае так, што гэтыя суадносіны вытрымліваюцца строга, і, скажам, у эпічных творах не бывае выяўлення перажыванняў, пачуццяў чалавека ці, наадварот, у лірычных — не расказваецца пра розныя падзеі, учынкі герояў. Нярэдка асноўны спосаб паказу жыцця спалучаецца з іншымі, бо і ў самім жыцці не бывае так, каб чалавек пазнаваўся толькі праз яго выказванні або толькі праз паводзіны.

Тры літаратурныя роды, або галоўныя спосабы паказу чалавека і жыцця, у мастацкіх творах узаемадзейнічаюць.

і часам настолькі моцна, што ўзнікаюць ліра-эпічныя творы (напрыклад, паэмы, балады і інш.), у якіх спалучаюцца адзнакі розных родаў.

Атрымліваецца гэтак жа, як у суадносінах паэзіі з прозай, якія, з'яўляючыся рознымі формамі ці відамі літаратурнай творчасці, утвараюць асаблівыя разнавіднасці мастацкіх твораў, напрыклад, «вершы ў прозе», або «свабодныя вершы».

Прыступаючы да разгляду літаратуры ў яе трох родавых абліччах (а разам з імі і жанравых асаблівасцях, бо кожны род, як убачым далей у вучэбным дапаможніку, мае свае жанры, або віды ці тыпы твораў), мы працягваем і пашыраем знаёмства з літаратурай, паглыбляем свае чытацкія веды і ўяўленні, сваё разуменне асаблівасцей літаратуры.

У папярэднім класе мы вывучалі такія разнавіднасці мастацкай слоўнай творчасці, як паэзія і проза. Цяпер робім новы крок наперад, па сутнасці, у тым жа або блізкім да таго кірунку. І, калі гаварыць дакладна, не пачынаем, а працягваем такую работу, бо з паняццямі роду і жанру літаратурных твораў вы ўжо сустракаліся, вывучаючы і беларускую, і рускую літаратуру. Таму, адказваючы на пытанне, якія творы эпічныя (гэта значыць творы апавядальнага характару) ці лірычныя, вы, напэўна, назвалі б у першым выпадку апавяданні, а ў другім — невялікія паэтычныя творы. Менш было сустрэч з творамі драматычнымі.

Можа падацца, што ўсё вельмі проста: лірыка — гэта тая ж паэзія, а эпас — тая ж проза. Ва ўспрыманні маладасведчаных чытачоў гэтыя віды твораў звычайна і атаясамліваюцца. У сапраўднасці ж усё больш складана. Паэзія і лірыка — паняцці сапраўды блізкія, гэтак жа, як і проза з эпасам. Але яны ў той жа час і розныя. Напісаны ў вершаванай форме твор зусім не абавязкова бывае лірычным, і не кожны празаічны твор адносіцца да эпасу. Таму мы і звяртаемся спецыяльна да вывучэння родаў літаратуры, каб глыбей зразумець своеасаблівасць спосабаў і форм адлюстравання жыцця ў мастацкай літаратуры.

Разгляд літаратурных родаў — лірыкі, эпасу і драмы — пачнём шляхам параўнальнага аналізу твораў, блізкіх па тэме, але розных па мастацкім характары.

Напачатку выберам тэму, важную, жыццёва актуальную, да якой асабліва часта звяртаюцца нашы паэты, празаікі, драматургі, нават публіцысты. Гэта тэма любові да Айчыны, спадчыны нашых продкаў. Перададзім яе змест так, як ён раскрываецца ў артыкуле драматурга Алеся Махнача:

«Нядаўна на адной з вуліц нашага стольнага горада сустрэў земляка. Ён калісьці прадаў хату бацькоў і ўжо каторы год жыве ў Мінску.

Цікаўлюся:

— Даўно быў у роднай вёсцы?

— Чаго туды ехаць? Там ужо нікога з маіх родных…

Балюча чуць такое ад чалавека, які забыў сваю малую радзіму, адцураўся зямлі, у якой вечным сном спачылі ягоныя продкі.

Для чалавека зямля, дзе яго карані, ніколі не бывае чужою. Продкі пакінулі нам у спадчыну свае шматвекавыя здабыткі, мудрасць жыцця, каб мы ўсё лепшае з гэтага шанавалі, памнажалі і перадалі як эстафету сваім дзецям, унукам, праўнукам.

Многія народы свету ведаюць свой радавод да 10—15-га пакалення. А што мы ведаем пра сваіх продкаў, пра гісторыю родных мясцін? Амаль нічога. Некаторыя з нас не ведаюць нават імя бацькі сваёй бабулі альбо дзядулі, дату іх нараджэння, наўрад ці могуць што сказаць і пра родныя навакольныя ўрочышчы, пра вуліцу, на якой жывуць, адкуль у яе тая ці іншая назва.

А між тым у кожнай вёскі, пасёлка, горада, як і ў чалавека, ёсць біяграфія — сваё нараджэнне, свае боль, смутак, гора, радасць, шчаслівыя ўзлёты…

Неаспрэчная выснова: наша пашана да Айчыны пачынаецца ад бацькоўскага парога, ад той песні, якую над калыскай нам спявала родная маці.

Трэба абуджацца ад бяспамяцтва, будзіць памяць роднай зямлі».

Калі сфармуляваць коратка галоўную думку артыкула — размова ідзе пра нашы вытокі, нашы карані, пра тое, як мы захоўваем памяць роднай зямлі, шануем нашых продкаў. Дзеля чаго гэта памяць патрэбна?

Бадай, няма ніводнага з сучасных беларускіх пісьменнікаў, які б не звярнуўся да гэтай тэмы. Амаль у кожнага мы знойдзем водгук на яе, творы са згадкамі аб малой радзіме, з уражаннямі, перажываннямі.

Але ў дадзеным выпадку нас будзе цікавіць галоўнае — як гэтая тэма можа раскрывацца ў творах розных літаратурных родаў: у лірыцы, эпасе, драме.

А запевам да гэтай тэмы возьмем шырокавядомыя радкі знакамітай беларускай паэмы «Новая зямля»:

Мой родны кут, як ты мне мілы!..
Забыць цябе не маю сілы!
Не раз, утомлены дарогай,
Жыццём вясны мае убогай,
К табе я ў думках залятаю
І там душою спачываю.

Якуб Колас

Рыгор Барадулін

ТРЭБА ДОМА БЫВАЦЬ ЧАСЦЕЙ

Трэба дома бываць часцей,
Трэба дома бываць не госцем,
Каб душою не ачарсцвець,
Каб не страціць святое штосьці.

Не забыць, як падвялы аер
На памытай падлозе пахне,
Як у студню цыбаты асвер[1]
Запускае руку да пахі.

Не забыць сцежкі той, што цябе
На дарогу выводзіла з дому,
Што у хаце там быў рубель
У цане і па курсу старому.

[1] *Асве́р* — журавель калодзежа.

Не забыць, як марозам злым
Клямка пальцы пячэ балюча
І адкуль на стале тваім
Бохан свежага хлеба пахучы.

Помніць свой на іржышчы цень,
Не забыць, як завуць суседа,
Не забыць, як пяе пад дзень
За вясёлым сталом бяседа.

Трэба дома бываць часцей,
Трэба дома бываць не госцем,
Каб душою ты стаў чысцей
І не страціў святое штосьці.

1. Пра гэты верш Янка Брыль сказаў наступнае: «Трэба заўсёды быць дома, адчуваць сябе сваім у сваіх, не столькі частым, няхай сабе і шчыра радасным госцем, заклапочаным назіральнікам, якому трэба час ад часу асвяжыцца здароўем роднай вёскі, але ж — у першую чаргу — і гаспадаром, саўдзельнікам, адказным за ўсё, на поўную меру душэўнай неадрыўнасці ад маці-зямлі, ад бацькі-народа — дзе б ты ні жыў, як бы далёка ад дому ні ехаў». Здавалася б, думкі тыя самыя, што і ў творы паэта. Чаму, на ваш погляд, Рыгор Барадулін абраў менавіта форму лірычнага верша для свайго выказвання? Што яго хвалюе, трывожыць?
2. Якія мастацкія дэталі знаходзіць Рыгор Барадулін, каб стварыць вобраз роднага дома? Чаму для яго так важна «не забыць, як завуць суседа»?
3. Якую ролю ў творы маюць шматлікія паўторы слоў і сказаў?
4. Параўнайце першую і апошнюю страфу верша, звярніце ўвагу на змены, якія ўнёс паэт у апошнюю страфу. Для чаго гэта зроблена?
5. Якія лірычныя вершы іншых паэтаў на гэтую або блізкую да яе тэму вы ведаеце?
6. Успомніце, якія творы Рыгора Барадуліна вы вывучалі ў папярэдніх класах, якія чыталі самастойна.
7. Маючы на ўвазе вядомыя вам творы паэта і верш «Трэба дома бываць часцей», падумайце, да якога літаратурнага роду яны належаць.
8. Падрыхтуйцеся да выразнага чытання верша.

Віктар Карамазаў

ДЗЯЛЬБА КАБАНЧЫКА

Ад аўтобуснага прыпынку Сцяпан не пайшоў на прасёлак, які кругам, паўз магільнік, вёў у вёску, а падаўся выганам, як бліжэй.

Таго выгану трыста крокаў, за ім — і матчын плот.

Нагою адкінуўшы ў плоце штыкеціну, якая вісела на адным цвіку, Сцяпан прасунуў у дзірку сумку, паставіў за плотам, за ёю бокам пралез сам. Штыкеціну прыладзіў на ранейшае месца, быццам веснікі зачыніў.

Снегу і тут, у вёсцы, ані парушынкі, як усю дарогу ад Мінска, ні на выгане, ні ў садзе, хоць пара б ужо легчы. Падумаўшы гэтак, Сцяпан пастаяў пад яблынькаю, агледзеў, галаву задраўшы, чорнае голле, сумнае без лісця і яблык, абвёў вачыма чорную, падшэрхлую, не сагрэтую снегам зямлю, па якой вецер расцягаў бурае пакурчанае лісце, раскатаў дробныя гнілякі-яблыкі. Падышоў да старой грушы-вінёўкі. Яшчэ грушы віселі, вышэй — гусцей, ды буйныя, жаўтлявазялёныя, нават лісце трымалася, пажоўклае. Паставіўшы сумку на зямлю, Сцяпан падскочыў, груш не дастаў, але галіну зачапіў — дажджом сыпанулі.

Падабраўшы з зямлі ладную, у руцэ ледзь месцілася, самую жоўтую грушу, кусануў, але ні грама не адкусіў — камень каменем. Сок, праўда, лінуў, салодкі. Паглядзеў на яе, падзівіўся, падкінуў у руцэ і схаваў, пашкадаваўшы выкідаць, у кішэню.

Каля хлява, як заўсёды, прывітаў Арсік: выскачыў з будкі, звякаючы ланцугом, стаў на заднія лапы, пярэднімі гроб у паветры, нібы плывец у вадзе, цягнуўся мордаю да Сцяпана, вёрткім пушыстым хвастом, чорным, як увесь сам, мёў зямлю. Сцяпан прысеў ля сабакі, малога, хоць ужо старога — парода такая, — аберуч узяў галаву, лагодна, нібы вінаваты, глядзеў у адданыя сабачыя вочы.

— Ну што? Без мяне тут сумуеш? — Сабака аж калаціўся ад радасці, цёплым языком лізаў рукі, а Сцяпан яго адпіхваў. — Ды пачакай! Вось… прывёз і табе.

З кішэні балонневай курткі выцягнуў кулёк, разгарнуў на калене газетную паперу — падняў над сабакам вараную, са сваёй рабочай сталоўкі, рыбіну.

Сабака падскочыў, схапіў гасцінец і павалок у будку.

Маці выйшла з хаты. Два пустыя вядры ў руцэ — ішла па ваду. Сына заўважыла — спынілася пад акном. У рыжым, старым, кругом палатаным кажусе, у шарсцяной хустцы, якую Сцяпан купляў у Мінску яшчэ да арміі.

— Ну што ты стаіш? — спытала зводдаль і замоўкла, адно вачыма лагодна ўсміхнулася, нібы казала-клікала: ну падыдзі да мяне, сынок...

Вёдры на зямлю паставіла, сама падышла.

Упартая стрыманасць у Сцяпанавай натуры змалку: руку падаў і больш — ані знаку, што рады сустрэчы з домам, з маці. Але гэта — адно першая хвіліна. Потым як глянуў маці ў вочы, малыя, нявінныя, нейкія галубіныя, з самотнай пякучай чырванню, у гусцейшых, як апошні раз, калі бачыліся, маршчынах, сэрца скранулася: сунуўся халодным носам у матчын твар, пацалаваў у шчаку. Ад непрывычкі засаромеўся сваіх раптоўных пачуццяў — адхінуўся, апусціў вочы, быццам не ведаў, як апраўдацца.

Маці сама знайшла словы, ціхія і простыя, нібы не заўважыла сынавай разгубленасці:

— Вось ты, Сцёпа, узяў мяне за руку, і яна ўжо заныла. — Левай памацала правую, пад локцем. — Сёння ноччу была аднялася. Я і ў хустку ўкручвала, і шкіпінарам націрала.

— Да доктара ці хадзіла?

— А што доктар? Кажа, гэта ад нерваў. Ад сэрца. А калі так, то якое лячэнне?

— Як жа ты робіш? — паспачуваў Сцяпан.

— А так і раблю. Пасяджу, пастагну, крыху адпусціць. А пасля зноў. Добра, што прыехаў. А то б і не ведала, як з кабаном управіцца.

— Гэта мне Волька сказала, каб ехаў, што ты кабанчыка біць надумала. Учора б выехаў, ды рабіў позна, у другую змену. А сёння ў мяне выхадны. І заўтра.

— Волька ж прыедзе?

— Абяцала.

— А Вера? Яна ці ведае?

— Волька звaніла.

— Каб хоць раз усе сабраліся. А то на Каляды вас не дачакаешся. Веру ад самай вясны не бачыла. Гразілася, што

сенавацъ прыедзе, і не прыехала. Забываеце на вёску, на матку.

Яна залыпала вачыма, і Сцяпан, ведаючы, якія лёгкія ў яе вочы на слёзы, паспяшаўся загаварыць пра іншае:

— Ідзём, кабана пакажаш.

Яна адчыніла хлеў, і цёплы, густы дух гною чухнуў у твар, выкаціўся на двор, а з двара святло ўкацілася ў хлеў, высвеціла высокі груд саломы ад сцяны, пад страхою, сячкарню, нацярушаную пад ёю сечку, з другога боку — загарадзь, слупы і жэрдкі, паабгрызеныя кабанамі, закарэлыя. Кабаны совалі паміж жэрдак лычы, доўгія і шэрыя, нібы ў дзікоў, рохкалі, грызлі жэрдкі, варушачы ружовымі пятакамі, — прасілі есці...

— Ну... пайду па Лёніка.

Сцяпан выйшаў на вуліцу. За веснікамі пастаяў, агледзеўся. Вуліца была пустая: ні людзей, ні сабак, ніводнай жывой душы. Падумаў, што ўжо даўно не раніца, трэба спяшацца, але пачуў, як за спіною звякнулі матчыны вёдры, — схамянуўся: трэба ж вады прынесці, каб маці хоць сёння не рвала хворыя рукі. Але яна ўжо заварочвала за хлеў, дзе калодзеж.

Вокны Лёнікавы на тым самым баку вуліцы, што і матчыны, праз тры двары. Сцяпан прасунуў руку між штыкецін, адкінуў зашчапку, прычыніў за сабою веснікі, па раўнюткім, з дошак, тратуарчыку прайшоў да новага ганка. Не спяшаючыся ў хату, агледзеўся, падзівіўся, як Лёнік, малады гаспадар, на якія тры гады старэйшы за Сцяпана, усё ля хаты давёў, панабудаваў хлевушкоў, нават лазенку. Без памочнікаў, сам. І цесля і сталяр.

Ён і цяпер рабіў: стаяў пасярод сянец ля стала, на якім ляжала шкло, прымерваўся доўгай лінейкаю, трымаючы паміж пальцаў алмаз.

— Здароў, вечны труженік! — прывеціў Сцяпан.

Той спадылба, праз бялявыя валасы, звешаныя на вочы, паглядзеў на госця, не адрываючы рук ад шкла і лінейкі, бадзёра, Сцяпану ў лад, адказаў:

— Прывет рабочаму класу!

Шаркнуў алмазам уздоўж лінейкі, пасунуў шкло на край стала, лёгенька разламаў напалам. Павярнуў другім бокам,

зноў прыклаў лінейку, зноў шаркнуў — шкло хруснула, дзынкнула, вузкі пасак раўнютка адскочыў. І толькі цяпер Лёнік паклаў алмаз, падаў госцю руку.

— Пойдзем да мяне.

— А што ў цябе? Чарка? Скварка?

— Трэба кабана закалоць. Швайка ёсць?

Сусед змоўчаў, але па тым, як паглядзеў на свае брудныя штаны, на далоні, як зняў са сцяны старую фуфайку, ускінуў на плечы, як узяў з падаконніка кепку, хвастануў ёю па калене, выбіў пыл з пілавіннем, ускінуў на галаву, Сцяпан зразумеў, што Лёнік ужо збіраецца, без лішніх слоў. Тут жа, у сенцах, адчыніў дзверы ў клець, зайшоў туды, у цямноту, заляскатаў жалеззем, нештачка шукаў.

...Прынёс шыла не шыла, штых не штых, тую самую швайку, да белага бляску надраеную жывым свіным салам.

— Ох і даўно яна табе служыць!

— Каб жа мне аднаму. Усёй вёсцы. Хто кабана ні б’е, усе да мяне: дай, Лёнік, швайку. Вяртаюць — і свежы кавалак у прыдачу. Можна кабаноў не трымаць, швайка пракорміць.

Ён ужо выйшаў на двор, а Сцяпан не паспеў, затрымаўся ў сенцах, калі хатнія дзверы адчыніліся і на дзвярной ручцы, ухапіўшыся за яе абедзвюма рукамі, павіс Віця, шасцігадовы Лёнікаў атожылак, мурласценькі, як бацька, з абвіслымі ніжэй пупка штанамі — абармот абармотам.

— Здароў, дзядзька Сцяпан!

Дзе ж таму дзядзьку не запыніцца з пляменнікам? Запыніўся, а малы, доўга не думаючы, схапіў за руку, пацягнуў у хату, прыгаворваючы:

— Ідзі-ідзі, не ўпірайся.

Сцяпан малых любіў, з імі часам знаходзіў большае паразуменне, як з дарослымі, з імі ўдавалася па-людску пагаварыць, без хітрыкаў, хованак, і таму, можа, малыя да яго ліплі таксама. А з Віцем дружба асаблівая: нейкі ён не такі, як усе малыя. І сур’ёзны, часам, здаецца, мудры, нібы дзед, і смешны — душою з ім адпачнеш...

...Кабана вынеслі за хлеў, паклалі на чыстую саломку, у пашчу ўсунулі камень, як рабілі заўсёды перад смаленнем. Лёнік распаліў паяльную лямпу. Прынёс сваю і Сцяпан.

Маці прытарабаніла вялізны чыгун з цёплай вадою, вядро халоднай — абліць гарачыя кішкі, — чыстыя анучы, нажы.

Лёнік трымаў у кожнай руцэ па лямпе, двума слупамі агню зганяў поўсць, распаленую да чырвані, да залацізны, якая тут жа і гасла, асыпалася шэрым прысакам. Сцяпан трымаў кабана за ногі, падварушваў, каб Лёніку лаўчэй было смаліць, следам за лямпаю абшкрабаў гар і так захапіўся, што не бачыў нічога, акрамя кабана, суседавых рук з лямпамі ды нажа ў сваёй руцэ. Абодва стараліся, як сабе. Абсмалілі і абшкрэблі з аднаго боку, пасля, перавярнуўшы кабана, з другога, паклалі на спіну і абсмалілі жывот, ногі, пахвінне.

Нарэшце Лёнік адставіў лямпы, абшкроб і абмыў вушы, лыч, хвост, капыты. Кабанчык быў гатовы. Ён ляжаў чысты, румяны, быццам пірог, які толькі што дасталі з печы. Сусед млосна разагнуў спіну, у добрым настроі ўсміхнуўся цётцы, рады і сваёй удалай рабоце, і ўдаламу кабану, і памочнікам.

Шырокі стары ўслон, які Сцяпан спусціў з гарышча, аблілі вадою, абцерлі, паклалі на яго кабана, пад бакі, каб не скаціўся, падсунулі паленне. Сцяпан ухапіўся за пярэднія ногі, стаўшы ля галавы, а Лёнік, трымаючы заднюю левую, прыклаў нож да грудзіны...

Калі кабана разабралі, расклалі ў тазы, у ночвы, тады прыехала Ніна, малодшая Сцяпанава сястра. Жыла яна блізка, у суседнім раёне, у вялікім рабочым пасёлку, там была замужам, рабіла фельчарыцаю, але ў вёску, хоць і блізка, наведвалася радзей, як старэйшыя сёстры з Мінска. Яе прыезду маці не чакала і таму, відаць, абрадавалася болей, як сыну: кінула і кабана і катоў — бегма насустрач.

Сцяпан у гэты час паліў салому, на якой смалілі. Падкінуўшы мокрую ў агонь, паглядзеў на сястрыцу ў белым плашчыку, чырвоным берэціку, лакавых чаравічках, таксама падышоў:

— Во... хоць кабанчык прывёў да маці.

Хацеў сказаць жартам, ды атрымалася злосна. Думаў, што і сястра жартам адкажа, а яна ўскіпела:

— Можа, ты яго гадаваў?

Схапіліся, як чужыя, не паспеўшы павітацца. Але маці не дала волі іхняй спрэчцы:

— Збегай, сынок, у магазін. Бутэльку я вам з Лёнікам прыпасла, ды як на ўсіх — мала будзе.

— Не трэба, — запыніла, супакойваючыся, Ніна. — Я таксама прывезла...

У матчынай хаце, як у кожнай вёсцы, гэтак адвеку вадзілася: дзень, калі білі кабана, быў святам, за стол збіралі гасцей. Праўда, цяпер госці не тыя, што некалі, пры бацьку, тады іх прыходзіла болей. І пілі болей, і елі болей. Цяпер каго маці пакліча? Жанчыны па хатах не хадзілі, а мужчын не было каму клікаць. Хіба Сцяпану? Але яго сябры разбрыліся па гарадах, як ён сам, нікога такога, яму роўнага, акрамя Лёніка, не засталося. І ўсё ж — як раней, у сенцах і хаце моцна пахла смажанай свежыною, гарачай бульбаю, на стале свежына стаяла і ў чыгунку, залітая гарачым тлушчам, і на скаварадзе — еш, хоць распераджыся.

Ледзь селі за стол — вароты рыпнулі.

Маці першая пачула, усхапілася да акна, фіранку адкінула:

— Нашы прыехалі! Коля... А з ім гэта хто? Волька, мабыць? Можа, і Андрэйка?.. — Выбегла за парог, а следам і Ніна.

Лёнік з-за стала нават не ўстаў, а Сцяпан да акна падышоў — паглядзець на гасцей.

Бялюткі «жыгуль» стаяў пасярэдзіне двара. Правыя дзверцы адчыніліся, і з машыны вылезла Вера, сярэдняя Сцяпанава сястра. Маці і Ніна падбеглі, расцалаваліся і ўжо ўтраіх стаялі, гаманілі, паглядаючы на машыну, чакалі, калі з яе пакажацца Коля, матчын старэйшы зяцёк. Той марудзіў, але нарэшце асмеліўся вытыркнуць прыгнутую лысую галаву — зяць ледзь пралазіў у малыя дзверцы, бо і таўсты, і высокі, не сказаць, каб здаровы, проста таўсты і высокі, тварам ружовы, нібы той кабанчык, якога пашкрэблі, памылі цёплай вадою. У шэрым світары, на які маці некалі прала ніткі, на шыі — доўгі, хамутом, шалік, у джынсах, вышараваных да белага бляску на каленях. Вылез і стаіць, галавы не падымаючы. Насупраць маці, Вера, Ніна, а ён уставіўся на кола, быццам акрамя кола нічога і нікога іншага не існуе. Хай ужо Ніна, якую таксама, дарэчы, даўно не бачыў, дык жа маці... Не, падняў галаву, заўважыў:

— Здрасце!

Падышоў, руку падаў, чубам — трыма валасінамі — матлянуў ветліва, вочы адвёў на хату, на акно.

Сцяпан адышоў ад акна, сеў за стол.

— Налівай. Ну іх... Скваркі астынуць.

— Пачакаем. Няёмка.

Сцяпан чакаць ды цярпець не жадаў:

— Будзе ёмка, як вып'ем.

Сам наліў, але падняць чаркі не паспелі — адчыніліся дзверы, парог пераступіў Коля, за ім Вера, а следам Ніна і маці.

— Як кажуць, з карабля на бал? — паспрабаваў жартаваць Коля, плюючы на далонь і далонню прылізваючы на галаве апошнія тры валасіны.

Падаў Сцяпану і Лёніку пухлую, нібы свежая аладка, руку, усміхнуўся абодвум, але Сцяпан не адказаў на ўсмешку.

— Што Андрэйку не ўзяў з сабою? — спытаў.

— У школе, хай вучыцца. А Волька прыхварэла, бок ломіць. Прастыла, відаць. Мы з Вераю ўдваіх. Думалі, што і ты, Сцяпан, з намі паедзеш...

Сцяпан не любіў ездзіць у швагравай машыне. У аўтобусе едзеш — ніхто цябе не ведае, нікому ты не патрэбны, хочаш — глядзі ў акно, хочаш — спі, хочаш — думай сваё, ніхто нічым не папракне. І людзей наслухаешся, дазнаешся, хто чым жыве. А ў швагравай машыне і размовы даўно знаёмыя, адно таўкуць ды таўкуць штодня, і ўсё ім, яму і сёстрам, Сцяпан не такі, за іх дурнейшы, усе яго, малодшага, вучаць, як сказаць, як сесці, куды запалку ці недакурак кінуць, крый божа — пад ногі: з'ядуць. А калі і маўчаць, дык не лягчэй таксама, нудна.

Селі за стол.

— Ну?.. — маці паглядзела на сына, вачыма падказваючы, што рабіць, але першым яе зразумеў зяць.

— Замочым кабанчыка? — падхапіў.

— За ваша здароўечка, — маці ўзяла чарку. — Гэта ж я цябе, Коля, з лета не бачыла. А Веру ад Вялікадня.

Лёнік паклаў на хлеб кавалак грудзінкі, крактануў, хітра ўсміхнуўся — да гаспадыні:

— Каб у вашым хляве, цётка Ганна, кабанчыкі не пераводзіліся. Як яны там будуць чухацца, дык будуць і госцейкі

ў хаце. Паверце мне. Я па людзях валачуся са швайкаю, ведаю.

Яго ўсе зразумелі, маці і дзеці, але ўсе змоўчалі, ніхто не знайшоў што адказаць.

— Ну, а кабанчык хоць ладнаваты? — пацікавіўся Коля, выпіўшы і набіўшы поўны рот.

— А хто яго?.. — няпэўна адказала маці. — Па кармёжцы і сала. Летам што я ім даю? Па траве ходзяць. Абы раслі здаровыя. З халадамі пачала парыць бульбу, буракі, жменю мукі сыпнеш, падмяшаеш. Дай больш хлеба, дык сала возьмеш. Казала, прывязіце, дзеткі, мех якой мукі, будзе вам сала. Дык жа ніхто не чуе. Але і так дзякуй Богу. Пакуль хопіць, а пасля другога апрыходуем. Ужо яго я вам пастараюся адкарміць.

Яны ўсе такія, маці: што б ні казалі, на языку, як і ў галаве, вечна дзеткі. Часам смешна з іх клопатаў. А часам горка. Вось Лёнік і ўчапіўся, нават скварку адклаў:

— Навошта вам, цётка, столькі ўсяго? Два кабаны, авечкі, карова, качкі, куры.

— І цялушку гадую, — пахвалілася тая. — Карова, Лёнік, старая, хачу маладую выгадаваць.

— Вам адной вядро малака трэба?

— Ну што ты кажаш? Я ўсё жыццё кароўку мела, а цяпер звесціся? Ты што?.. Летам, можа, дзеці прыедуць, унучак. Сваё малачко — не куплёнае. Ды і смятанка, тваражок.

— Гэта ясна, не куплёнае. Але сена?

— З сенам… бяда, — цяжка ўздыхнула.

— І авечкі навошта вам? — не сунімаўся сусед. — Цяпер авечак няма каму пасвіць, няма дзе пасвіць. У людзей сем’і, а і то пазводзіліся.

Суседчына жыццё Лёнік ведаў, казаў — як у сук ляпіў, і яна апраўдвалася, адкрываючы ўсе свае козыры:

— Бачыш?.. Будуць аўчыны. Цяпер жа мода на кажухі. Веры хацела справіць дублёначку. І Коля просіць.

Ад яе шчырасці зяць папярхнуўся, закашляўся, павільгатнелыя вочы заблішчалі, замітусіліся, стралялі то на Сцяпана, то на дзяўчат, то на Лёніка: што яны цяпер думаюць, калі дазналіся, дзеля чаго матка трымае авечак? Дзяўчаты ціха жавалі, нібы тыя авечкі, нічога, здаецца, не думалі,

уедлівы сусед таксама быццам не пачуў, закусваў моўчкі, а Сцёпка адразу кінуў жаваць, губу ніжнюю падабраў, як малы, наліўшыся крыўдаю, калюча зіркаў спадылба то на маці, то на дзевак, то на яго, швагра.

І Коля не сцерпеў:

— А не трэба мне ніякія кажухі. Не хачу. Рэжце ўсіх сваіх авечак. Па мне, дык рэжце.

— Адну зарэжу, — разважала маці, — а дзве пакіну. Будуць ягняткі. Лета пагадую, да той зімы, вось і яшчэ аўчынкі, нідзе не валяюцца.

Яна рашучая, але і Сцяпан гэтакі, у маці:

— Трэба ўсіх рэзаць.

— Не, сынок.

— Сам парэжу. І карову старую завяду на ферму...

Вось гэтак, бывала, і пры бацьку ішла за сталом размова, звычайная для вёскі: пра карову, кабаноў, сена, авечак. І тады не аднолькава ў хаце думалі. Бацька, бывала, у адно, што бык, увапрэцца, не саступіць, а маці ў другое. І паспрачаюцца. Але ніколі, здаецца, ад тых спрэчак не нарастала на душы ў Сцяпана столькі гаркаты, прыкрасці. Лёнік — чалавек чужы, сусед, а і яму відаць: навошта старой гэтак упрагацца, знясільвацца, калі ўжо сіл няма, сям'я па гарадах рассеялася, не сабраць? Бяда ацірацца ў жыцці гультаём, сабе і людзям бяда, але і гэтак надрывацца, жывучы адной, — нічога разумнага. Ды і сёстры злавалі Сцяпана. Швагер злаваў. Усе пілі, елі, а маці што параілі? Збываць скаціну ці трымаць? Нічога не сказалі. І не скажуць. Сказаць, каб трымала, языкі не павернуцца, бо не сляпыя, бачаць, які гэта цяжар, асабліва старой хворай жанчыне: што тады пра яе іх сусед падумае, вёска? І сказаць, каб не трымала, не хочуць: чым кепска ўзяць з вёскі дармавы кавалак?

Маці, можа, больш, як Сцяпану, прыкра ад усёй гэтай размовы. Таму і павярнула ў іншы бок:

— Што вы ўсё пра мяне ды пра мяне? Пра кабаноў, авечак. А пра сябе? Жыву і не ведаю, што там з дзецьмі. Ты, сынок, дзе хоць робіш?

Сцяпан і рады пахваліцца:

— Метро будую. Пад зямлю дарогу людзям пракладаю.

Лёнік і Коля ў адзін момант, не згаворваючыся, пырснулі ад рогату.

— Самі… туды людзі дарогу самі знойдуць. Маці іх рогат не спадабаўся, адвярнулася ад іх і сур'ёзна глядзела сыну ў твар…

Матчыны рукі ляжалі на краі стала, трымалі відэлец з кавалкам пячонкі, і Сцяпан, прыгледзеўшыся, раптам жахнуўся: якія ж яны старыя! Здрабнелі, счарнелі, абсыпаліся шэрым прысакам, быццам толькі што вымяталі з печы вугалле і попел, а запясці танклявыя, усохлыя. Такімі, здаецца, не былі раней. Не, ніколі. Ажно вачам зрабілася горача. Адвёў убок, каб матчыных рук не бачыць, і толькі цяпер заўважыў, што за акном сцямнела, змрок загусцеў у хаце.

Падхапіўся, уключыў святло. Гэтым святлом і Лёніка ўсё роўна як падштурхнуў — і той усхапіўся:

— Ну… дзякуй, цётка Ганна. За вячэру, за бяседу.

Сцяпан выйшаў з хаты разам з Лёнікам. На дварэ імжыла, церусіў нейкі вільготны пылок. Пастаялі, пакурылі, пагаманілі на развітанне, а за веснікі Сцяпан не пайшоў — аблёгся на плот і глядзеў на вуліцу, услед суседу. Яго танклявая ў касцюмчыку постаць знікла ў цемені, а свежына ў руцэ, загорнутая ў белую паперу, была відаць, пакуль сусед не схаваўся за веснікамі.

Сцяпану не хацелася ісці ў хату, класціся спаць. Пастаяўшы, падаўся ў сад.

За садам, за выганам па гравійцы зрэдку прабягалі машыны — каторыя з Мінска, каторыя ў Мінск. Ціха беглі, нячутна: адлегласць і волкая цемень паглыналі гукі. Было відаць святло фар, цьмянае.

Сцяпану падалося, што з глухмені-цемені, ад гравійкі, на яго глядзяць сумныя матчыны вочы.

А ноччу бачыў бацьку. Сон — не сон: па праўдзе, як было тры гады назад. Раённая бальніца, ён на ложку. «Заўтра, кажа, у маці дзень нараджэння. Не забудзь, купі што, ад мяне і ад сябе. Радая будзе». Усё — як было. Сцяпан купіў цёплую хустку — і цяпер носіць. Яшчэ бацька тады спытаў: «Інстытут кінуў, а далей? Што будзеш рабіць?» Ён якраз забраў дакументы з першага курса політэхнічнага. Адказаў, што знойдзе работу па душы — на зямлі, у вёсцы. Армію

адслужыць — вернецца. Бацька не ўшчуваў, яму быццам і спадабалася, што сын думае вярнуцца дамоў. Калі б жыў, дык, можа, гэтак і было б. Але не дачакаўся канца сынавай службы. Будаваў калгасны свінарнік — з вільчыка з сякераю скінуўся, нагу моцна выцяў. Спачатку пухліна-пухліна, пройдзе, а пасля і нагу аднялі, ды ўсё роўна не памагло — позна. Сцяпан і захрас у Мінску, пагоны не зняўшы, да вёскі не даехаўшы. На дзень усяго спыніўся ў сястры, у Волькі, — Коля і падбіў, завёў на завод. Што, кажа, рабіць у вёсцы?

Доўга ляжаў, глядзеў у столь, думаў: вось ужо два гады па начах бачыць бацьку, намагаецца сказаць яму штосьці вельмі патрэбнае, душу адкрыць, і не паспявае — кожны раз прачынаецца. Сёння тое самае. А што хацеў сказаць? Не ведаў.

А можа, душа хоча апраўдацца перад бацькам?..

Недзе — пачуў — гаманілі. За сцяною. Апрануўся, выйшаў на кухню. Стаяў і слухаў:

— Табе, табе, табе... Мне...

Маці казала і замоўкла. І зноў:

— Табе, табе...

Сцяпан выйшаў з кухні ў пярэдні пакой. Дзверы ў залу былі прачыненыя — праз іх убачыў маці. Яна сядзела наўколенцах перад цыратаю, перад усім сваім мясным багаццем, накінуўшы на галаву шарсцяную, тую самую, Сцяпанаву, хустку, раскладала кавалкі па кучках і казала:

— Табе, табе, табе... А гэта Сцяпану.

Над адной кучкаю збоку ад маці, на краёчку канапы, сядзела Ніна, з другога, на крэсле, Вера, а насупраць стаяў, спіною прываліўшыся да сцяны, Коля, і перад кожным ляжала куча сала і мяса. Толькі над адной не было пільнага вока — над Сцяпанавай.

Смешна было глядзець, як маці бярэ з агульнай кучы кавалак, варочае яго з боку на бок, перакладае з рукі ў руку, гадаючы, каму пакласці, а сёстры і Коля ўважліва сочаць за матчынымі рукамі, маўчаць, ані слова — не да размоў. Вось яна ўзяла ў дзве рукі любовы кавалак, доўгі і вузкі, паляндвіцу, патрымала, паклала ля каленяў, шырокім кухонным нажом пачала дзяліць на часткі. Пазначыла рыскамі, потым змясціла рыскі ўправа, потым — улева, парэзала нарэшце, але ўсё роўна не так, як хацела. Сядзела і гадала, што рабіць.

— Большы хай будзе табе, Коля, у цябе сям'я большая. А гэты, меншы, Веры. Ты, Вера, адна. А гэты Ніне. Два раты, трэцяга яшчэ няма, як у Колі.

Самае каштоўнае, што ёсць у кабана, але і самае цяжкое для дзяльбы — гэта кумпякі. Два кумпякі, а кучак — чатыры. Пасячэш — папсуеш. Маці ўзяла ў рукі адзін, паважыла і, не ўтрымаўшы, апусціла сабе на калені.

— Во... падняць не магу. — А думала, вядома, не пра рукі, не пра сябе, думала: што рабіць з кумпяком, каму аддаць? — Бяры яго ты, Коля. Ну, бяры, а то я не падыму.

Зяць зрабіў крок да маці, узяў у яе з каленяў кумпяк і сам, здаравіла, закрактаў, прыкідваючыся:

— Ого, цяжар!

— А другі табе, Ніна. І ў цябе... якая ні сям'я, а сям'я. Веры і Сцяпану лапаткі дам. І грудзінку...

Цяпер ужо Сцяпану было балюча глядзець, як маці раскідвае свайго кабана. Гадавала-гадавала, а што з'есць? Тут яшчэ заўважыў белы, заматаны ў анучку палец, падобны на белую кацінаю лапку. Парэзала, ці што? Учора не было гэтай анучкі. Сёння паспела? І плямка чырвоная — кроў. Відаць, моцна парэзала. Запякло на душы, як убачыў кроў на белай анучцы. Вось тут і ўзарваўся:

— Што гэта ў нас робіцца? Усё расклала, усё па кучках, а сабе?.. Што сабе пакідаеш? Капыты? Хвост? Ці табе не трэба? Ужо, можа, есці не будзеш?..

Такога маці не чакала ад Сцяпана — на момант збянтэжылася, моўчкі глядзела яму ў вочы. Але знайшла што адказаць:

— Па суседзях не пабягу. Другі ў хляве.

— Цяпер гэтак кажаш, — не суніімаўся Сцяпан, — а пасля і таго раскідаеш.

Коля захадзіў па хаце, захваляваўся.

Адно дзяўчаты сядзелі ціхія, ані слоўца, ні за маці, ні за брата, быццам спрэчка іх не датычыла.

А маці ўсхапілася на ногі, балюча, ледзь не плачучы, залыпала вачыма, замахала перад сынам рукамі, той белай, з чырвонай плямкай, анучкаю на пальцы:

— Што ты, Сцёпа, бунтуеш? З бацькам заўсёды быў ціхі, слухмяны, а як са мною... Што з табой робіцца?

Яе крыку Сцяпан не вытрымаў, выбег з хаты.

Куды ішоў — не думаў. Куды ногі неслі. А яны ў маладога хуткія, вынеслі аж на выган, ды і там не спыніліся — дарогу далей знайшлі. З аднаго боку не скончыўся пабурэлы, пасохлы выган, з другога пайшло ржышча, яшчэ мацней пабурэлае, па ім высыпаў, як ад страху перад блізкай зімою, халодны восеньскі пот, курэла нізкая смуга. Учора дзень быў ясны, сухі, а сёння ўжо засмужаны, волкі. Неба шэрае, цяжка абвісла.

На ўзгорку Сцяпан спыніўся. Збоч дарогі шумелі старыя бярозы, бязлітасна, як чужыя, сцябалі адна адну на ветры танклявым і доўгім веццем. Узгорак пад імі ўсыпаўся крыжамі, драўлянымі ды жалезнымі, курганкамі ў драўляных і жалезных агародках, а больш — без агародак, зялёнымі і сівымі замшэлымі камянямі, помнічкамі з надпісамі, дзе падноўленымі, дзе сцёртымі ветрам, змытымі дажджамі. Усё змывалася, асыпалася. Камяні ўрасталі ў зямлю, курганкі асядалі, губляліся. Буялі хмызнякі, быльнёг, шыпшына — не прабіцца. Сцяпан скалоў рукі, разграбаючы зарасці, пакуль выйшаў да бацькавай магілы. Ні крыжа, ні помнічка, ні агародкі, ніякага каменя. Паспрабуй дазнайся, хто ляжыць. Але не зблытаў ні з чыім іншым курганком, бо неаднойчы бываў тут з маці — і як бульбу ў полі, за магільнікам, капалі, і як сенаваць ездзілі міма, і як дровы вазіў з-за рэчкі. Вось сёстры ці знойдуць гэтую наспачку без маці? Ад таго дня, як хавалі, ці былі тут хоць раз?

Над галавою шумелі бярозы, а насупраць ляжала бясконцае, пад самае неба, поле, прыбранае і ўзаранае, па-восеньску пустое, маўклівае, знясіленае за вясну, лета і восень, халодна-санлівае перад надыходам зімы, сумнае, як гэты магільнік. Сцяпан быў не чужы свайму полю, ведаў, колькі жыцця і светлых надзей давала яно селяніну. На ім заўсёды буяла жыта. Бацька араў яго ўсё жыццё і вечна хваліў. Але цяпер поле пустое, сумнае — пуста і сумна было на душы.

Дзень такі: зямля халодная, неба шэрае, нізкае, а яшчэ — вецер, гоніць і гоніць шэрыя хмары.

Калі Сцяпан вярнуўся, дома, на двары, Коля корпаўся пад капотам, зачышчаў наждачкай свечы, а жанчыны пакавалі машыну: бегалі то ў хату, то з хаты, насілі і ставілі ў багажнік сумкі, каструлі, вёдры.

— Дзе гэта ты ходзіш? — спытала пакрыўджана маці.

— Табе пасобіць?

— Ужо няма чаго пасабляць.

— А грушу? — знайшла работу Ніна. — Грушу хто будзе абіраць? Я ж на яе не ўзлезу! І маці не ўзлезе.

А маці і радая, што дачка ўспомніла:

— Праўда, сынок. Абярыце вы з Колем грушу. Можа, маразы ўдараць, снегу накідае. А я сама не абяру.

— Абяром, — буркнуў Сцяпан і сеў пад плотам на бервяно.

Вера прабягала міма са слоікамі — чаплянула:

— Што, братуха? Стаміўся?

Ён моўчкі глядзеў, як жанчыны таўклі ў багажнік вядро з мочанымі яблыкамі, а яно не ставілася, месца не хапала, нават слоікі не было як утачыць, а яшчэ на зямлі стаяла вядзёрная каструля з капустаю, ручнікам абвязаная. Павымалі сумкі, пачалі ставіць нанава. Куткі нарэшце ўсяму пазнаходзілі, а зачыніць багажнік не маглі. Падышоў Коля — паглядзеў, накінуўся на жанчын:

— Што вы топчаце? Думаеце, калі машына жалезная, дык і тапчы колькі сілы?

А тут яшчэ маці прывалакла з хаты мяшэчак:

— Семачкі, гарбузікі. Андрэйка дужа любіць, лузгаць будзе. Куды паставіць, Коля?

— У салон укіньце, на сядзенне.

— Ну а грушы? Пайшлі, хоць вядро абяром.

— Куды ўжо? — узмаліўся зяць.

Але яму, пэўна, вельмі хацелася прывезці ў Мінск груш, вялізных жоўтых вінёвак, і ён пайшоў следам за маці, якая падхапіла кош, пашыбавала ў сад. Вось толькі як іх дастаць? Падскочыў, за галіну схапіўся, трасянуў.

— Паб’юць грушы, — шкадуючы, уздыхнула Вера. І зноў на брата накінулася: — Ідзі пасоб, не сядзі. Драбіну пастаў.

Сцяпан пайшоў, але не ў сад — у хлеў, успомніўшы ўчорашнюю размову пра карову, цялушку, авечак.

З хлява бачыў, як Коля і маці панеслі да машыны паўнюткі кошык біцікаў. Яшчэ раз пагладзіўшы Пярэстую, зачыніў вароты.

Грушы высыпалі проста ў багажнік, заканапаціўшы ўсе дзіркі і шчыліны паміж сумкамі, вёдрамі. Багажнік не зачынілі — не змаглі, — і, каб не ляскатаў дарогаю, Коля звязаў яго дротам.

Ад'язджалі ўсе разам. Ужо сядзелі ў машыне, як раптам маці штосьці ўспомніла, пабегла ў хату. Вярнулася з гарбузом — здаровым, жоўтым, ледзь несла, аберуч прыціснуўшы да жывата. Сцяпан адчыніў дзверцы, узяў, пабурчаўшы, а куды дзяваць? Паклаў сабе на калені: паганяй, швагер!..

Ехалі па вёсцы — Сцяпан усё азіраўся назад: маці доўга стаяла каля адчыненых варот, сашчапіўшы на прыполе рукі, глядзела ўслед машыне. Ці таму, што вуліца выдалася пустая і маці на ёй стаяла адна, ці што вароты былі адчыненыя і, як адчыненыя, нікому зараз не патрэбныя, ці што дзень выдаўся шэры, пахмурны, постаць матчына здавалася сумная, як позняя-позняя восень.

А тут яшчэ — гарбуз. Ён ляжаў на каленях цяжкі, нібыта матчын папрок, яе сумная радасць, схаваная ад дзяцей бяда.

Машына паўзла на ўзгорак, за шыбаю замільгацелі белыя бярозавыя ствалы.

— Можа, спынімся? Да бацькі зойдзем? — спытаў Сцяпан.

Коля змоўчаў, а Вера, якая сядзела з ім побач, цяжка ўздыхнула, як згадаўшы бацьку, лагодна адказала Сцяпану:

— Іншым разам, Сцёпа. Трэба даехаць засветла.

Сцяпан зноў азірнуўся, але ўжо не на вёску — на магільнік. Зноў, ужо нейкай балючай памяццю вачэй, убачыў маці, яе самотную маўклівую постаць, рукі на прыполе, белы, абматаны анучкаю палец, і... вось калі: да горла падкацілася хваля, тая самая, што душыла ўчора за сталом, калі глядзеў на шэрыя матчыны рукі, пасля ўранні, калі бачыў маці наўколенцах перад цыратаю з кучкамі мяса і сала, на дзяльбе кабанчыка, пасля, апошні раз, на магільніку. Заплюшчыў вочы — маці ўсё стаяла пасярод вёскі, сіратліва глядзела на дарогу...

— Стой!..

Машына спынілася.

— Ну што?.. Што ты, Сцяпан, хочаш? — закрычала Вера.

Ён адчыніў дзверцы. Не было куды дзець гарбуз — вылез з ім разам.

І Коля вылез з машыны, падышоў да Сцяпана:

— Ну?..

— Едзьце, — сказаў Сцяпан. — Мне трэба ў вёску.

— Ты што?.. Што ты там забыў?..

Звесіўшы галаў, Сцяпан глядзеў на гарбуз, які трымаў у руках, і не ведаў, што з ім рабіць, але здагадаўся — сунуў яго Колю ў рукі, сам павярнуўся і пайшоў назад, у вёску. Чуў, як з машыны выскачыла Вера, крычала наўздагон:

— Сцяпан, куды ты? — Прасіла-маліла: — Дамоў паехалі, Сцёпа! Ці чуеш, Сцёпка?!

Вароты былі ўсё яшчэ адчыненыя. Ён зайшоў праз іх на двор. Усюды ціха, нідзе ніякага жыцця.

«Дзе ж ты, мама?» — падумаў.

Яна, відаць, была ў хаце, але ён у хату не пайшоў. Пастаяў пасярод двара, агледзеўся, як даўно тут не быў, і падаўся да хлява.

З будкі выскачыў Арсік. З той самай радасцю, з якою сустракаў учора, ад аўтобуса.

Сцяпан адчыніў хлеў.

Сечкі пад сячкарняю не было ані каліва, маці ўсё падгрэбла, што ён учора нарэзаў. Сцяпан наклаў саломы на латачыну, пад нож — пусціў кола. Яно закруцілася лёгка, быццам не жалезнае, не чыгуннае.

Спыніўся, каб скінуць куртку. Павесіў яе на цвік у сцяне — і зноў сечка сыпанула пад ногі.

— Сцяпан?.. — Вось яно, матчына здзіўленне. Выпусціў кола, разагнуў спіну — яна стаяла, разгублена глядзела яму ў твар вузенькімі галубінымі вочкамі.

Хай едуць, — адказаў ён. — Я дарогу знайду.

Але маці ў яго ні пра што не пыталася, і гэта да яго дайшло. Яму вечна здавалася, што маці яго не разумее, а яна разумела, як сябе, бо ён быў яе часцінкаю — целам і душою. Таму, напэўна, загаварыла, нібы спавядаючыся:

— Каму ж я, сынок, раблю? Вам і раблю. Мне той кавалак не палезе ў горла, калі вам не аддам.

Яму захацелася суцешыць маці, сказаць тое самае, чаго не паспеў сказаць бацьку, чаго бацька ўжо ніколі не пачуе ад яго, але дыханне перахапіла:

— Мам-м...

Адвярнуўся, аберуч схапіўся за кола сячкарні і з усёй сілы, прагна, злосна пачаў круціць, не думаючы, ці ёсць у латачыне салома. Кола бегла лёгка, але раптам пайшло цяжэй, сечка пасыпалася гусцей, і праз мроюу, цёплую і плыткую, нібы летняя рачная вада, Сцяпан убачыў спачатку штосьці белае, жывое і белае, нібы каціная лапка, а пасля, у той самай мроі, разгледзеў матчыны рукі. За колам, у латачыне, яны трымалі салому, совалі пад нож.

Бегла вакол свае восі кола, чахкаў нож, сечка сыпалася пад ногі, а Сцяпан круціў і круціў, не адводзячы вачэй ад белай анучкі на матчыным пальцы.

1. Чым кранула, зацікавіла вас апавяданне «Дзяльба кабанчыка»?
2. Які эпізод апавядання найбольш уразіў вас? Чым?
3. Якія важныя жыццёвыя, маральныя праблемы ставіць гэты твор?
4. Хто з герояў апавядання вам спадабаўся і хто не? Чаму?
5. Адшукайце ў тэксце твора характарыстыкі герояў апавядання і перадайце іх сваімі словамі.
6. Каму з герояў спачувае аўтар і, наадварот, да каго ставіцца асуджальна?
7. Знайдзіце ў творы дэталі (асобныя заўвагі, штрыхі), якія сведчаць пра тое, што маці вельмі цяжка, што работа ў гаспадарцы ёй ужо не пад сілу. Якімі мастацкімі дэталямі ствараецца вобраз маці?
8. Чаму, едучы з вёскі дадому, сёстры не пажадалі спыніцца каля могілак? І чаму Сцяпан не захацеў ехаць разам з імі і выйшаў з машыны?
9. Чаму Сцяпан вярнуўся і ўзяўся за работу? Як такі ўчынак дамалёўвае яго вобраз?
10. Чаму апавяданне заканчваецца сцэнай зладжанай працы маці і сына? Якая аўтарская думка ўкладваецца ў гэту сцэну?
11. Падрыхтуйце вуснае паведамленне на адну з прапанаваных тэм: «Мама, родная мама, як цябе я люблю!», «Да наступнай дзяльбы кабанчыка», «Бацькі і дзеці», «Сэрца маці» або загаловак верша Рыгора Барадуліна «Трэба дома бываць часцей». Абгрунтуйце свой выбар.

Тэма, ідэя і праблема мастацкага твора

Вы ўжо ведаеце значэнне такіх паняццяў, як тэма і ідэя твора. Нагадаем: ***тэма*** — гэта тое, пра што ідзе размова ў творы, што ў ім паказваецца, — нейкі эпізод з жыцця героя ці герояў, выпадак, падзея, жыццёвая з'ява, якая зацікавіла пісьменніка і стала асновай зместу твора. ***Ідэя*** — гэта асноўная думка, што вынікае з усяго паказанага, вывад, выснова, якую робіць чытач, пазнаёміўшыся з творам.

Але пры характарыстыцы зместу мастацкага твора, асабліва эпічнага, нярэдка ўзнікае патрэба звярнуцца і да такога паняцця, як праблема. ***Праблема*** — гэта тое асноўнае жыццёвае пытанне, якое пісьменнік ставіць у творы, на якое звяртае ўвагу чытача.

Гэтыя тры паняцці, у іх узаемасувязі, асабліва выразна вылучаюцца ў апавяданні «Дзяльба кабанчыка». Тэма апавядання — прыезд у госці да маці, якая адзінока жыве ў вёсцы, яе дзяцей з нагоды свежавання кабанчыка. Але ж, калі мы ўважліва прачытаем твор, становіцца ясна, што аўтар звярнуўся да гэтага выпадку не проста дзеля таго, каб апісаць жыццёвы эпізод. Са зместу апавядання выразна бачыцца, што пісьменніка хвалюе пытанне пра тое, як складваюцца адносіны паміж дзецьмі і бацькамі ў сучасным жыцці. Гэта і ёсць уласна праблема твора. Распрацоўваючы праблему твора, аўтар сутыкае пункты гледжання на жыццё розных людзей.

З асэнсавання ўсяго, паказанага ў творы (паводзін і выказванняў маці, дачок, Сцяпана, апісання хаты, двара, эпізода з дзяльбой кабанчыка, карціны ад'езду гасцей і г. д.), і вынікае асноўная ідэя твора: адбываецца адчужэнне дзяцей ад бацькоўскага дому, ад родных каранёў, страчваецца адказнасць за жыццё бацькоў, пакінутых дзецьмі адзінока, самотна дажываць свой век у цяжкай працы.

Праблема ўзаемаадносін бацькоў і дзяцей, дарэчы, хвалюе не толькі празаікаў, але і паэтаў. Нагадаем зноў верш Рыгора Барадуліна:

Трэба дома бываць часцей,
Трэба дома бываць не госцем,
Каб душою ты стаў чысцей
І не страціў святое штосьці.

Два творы двух аўтараў. Адзін твор апавядальны, празаічны, другі — вершаваны, лірычны. Але абодва па-свойму ставяць адно пытанне, адну праблему, даюць, па сутнасці, аднолькавы адказ на пытанне, выказваюць адну ідэю.

Аляксей Дудараў

ВЕЧАР

(Скарочана)

Дзейныя асобы

М у л ь ц і к, 80 гадоў.
Г а н н а, 76 гадоў.
Г а с т р ы т, 78 гадоў.
Нашы дні, Усходняя Беларусь.

Д З Е Я П Е Р Ш А Я

Вуліца сучаснай неперспектыўнай вёскі. Хата, яе фасад. Пад вокнамі лавачка. Злева, каля плота, стары рыпучы журавель. На адным яго канцы ледзь пагойдваецца абшарпанае драўлянае вядро, на другім — груз. Чаго тут толькі не панавешана! І шчарбатая шасцяронка ад камбайна, і доўгая мядзяная гільза ад снарада, і кавалак гусеніцы ад трактара, і нават іржавая прабітая каска. Калі набіраюць ваду, праз тужлівы рып жураўля чуваць перазвон гэтых жалязяк.

У гэту хату сонца свеціць ва ўсе вокны. Калі ўзыходзіць— сыпле промні праз лістоўе старога саду, высока падымецца — свеціць у тыя вокны, што заўсёды задуменна глядзяць на вуліцу, а скончыцца доўгі летні дзень, яно зробіць апошні позірк у акно, што выходзіць на захад, і ўжо пасля гэтага схаваецца ў драўлянае вядро калодзежа. І вясёлы акрайчык месяца павісне над комінам.

Толькі-толькі пачынаецца дзень. Шэрая раніца. Сонца яшчэ спіць. Недзе далёка самотная зязюля лічыць некаму гады. Нястройны і яшчэ нясмелы птушыны хор і смелы ўрачысты покліч «ку-ка-рэ-ку-у-у-у» абвяшчаюць усёй вёсцы, што надышоў новы дзень. Павольна-павольна з-за вугла сваёй хаты выходзіць М у л ь ц і к з вядром. Высокі, худы, нетаропкі ні ў рухах, ні ў словах, ні ў думках. Павесіў на калок вядро, пачаў адчыняць варотцы з вуліцы на двор сваёй хаты.

М у л ь ц і к *(пазіраючы за сад)*. Уставай, уставай ужо... І сёння трэба жыць. З табой, з зямлёю і з людзьмі... Людзі добрыя ўсе, мо толькі забыліся пра гэта... Бягуць, едуць, ля-

цяць… Ці то ўцякаем ад некага, ці то даганяем — ліха нас ведае, якая нам галавешка ў штаны трапіла… *(Падыходзіць да калодзежа, пачынае даставаць ваду.)* Як у чыгунку жывём! Як быццам нас на агонь паставілі… Аж бурбалкі, аж пара прэ… Немаведама хто толькі гэту поліўку сёрбаць будзе, калі яна ўрэшце зварыцца… *(Дастаў вядро, пераліў у сваё, аднёс у бок ад калодзежа, выліў на зямлю.)* Гэта на тваю хату, Сёмка… *(Вяртаецца, зноў пачынае даставаць ваду.)* Як паспакайнець? Няма спакою, і дабрыні не знойдзеш… Дабрыня ціхая… *(Дастаў вядро, пераліў, аднёс, выліў.)* А гэта на тваю хату, Іван… *(Вяртаецца, зноў дастае ваду.)* Думаеш, глупствам займаюся? Няма каму ваду з калодзежа браць. Раз’ехаліся ўсе… А калодзеж жывы павінен быць… З яго чэрпаць трэба, каб вада ў зямлю не пайшла, каб не застаялася, каб свежай была… Во я і выбіраю яе штодня… За былых сваіх суседзяў, за дзяцей іх і за свайго сына… *(Аднёс вядро, выліў.)* На тваю хату, Пятрок… Ах, дзеткі, дзеткі… Такія вы ў нас грамацеі выраслі! Яны табе і пра космас адбарабаняць, і Бога на лапаткі пакладуць, і, калі захочуць, дакажуць, што Іуда некалі добрую справу зрабіў… Усё могуць. Толькі сваіх дзяцей не хочуць на свет пускаць… Ці то баяцца, ці то хочуць, каб ніхто жыць не замінаў… Дык ты сам жывеш, дык і другому дай… Ненароджаныя дзеткі — гэта ж усё адно як памерлыя… Слухаеш? Ну, слухай, слухай… холадна, мабыць, там і цёмна… Дзе там? У космасе, канечна… Дзе ж яшчэ? Я во падумаю-падумаю, а што, калі б мае бацька-маці ўзялі дый не нарадзілі мяне?! Га? Ды я б ім гэтага ніколі не дараваў! Салодкага, праўда, мала з’еў: тры вайны адпляскаў, на фінскай нозе адмарозіў, у партызанах немцы расстрэльвалі, потым ваяваў — два разы паранілі, тры разы кантузілі. І гэта яшчэ не ўсё! Двух дзетак за вайну пахаваў, і нішчымніца пасляваенная была, і хату пярун паліў, і карова здыхала, і жонка памерла, і сын апошні гадоў пяць пісем не піша… Толькі паўспамінаць, дык язык забаліць, расказваючы… Слухаеш? Слухай, слухай… І прачынайся… Пеўні ўжо ахрыплі, цябе гукаючы…

Разам з Сонцам прачнулася і радыё. Са старэнькага дынаміка, што стаіць на падаконніку, паліліся пазыўныя, а затым бадзёра-радасны голас дыктара.

Г о л а с д ы к т а р а. Добрай раніцы, таварышы!

М у л ь ц і к. Здароў...

Г о л а с д ы к т а р а. Сёння аўторак, трыццаць першага ліпеня!

М у л ь ц і к. Што ты кажаш! А я думаў — трыццаць другога...

Да калодзежа падыходзіць Г а н н а. Такая ж, як і Мульцік, старэнькая, белая. І яна нікуды не спяшаецца. Спынілася, паслухала.

Г а н н а. Чаго й та ты, Васіль?

М у л ь ц і к. Што?

Г а н н а. Бубніш нешта сам сабе... Маліўся, ці што?

М у л ь ц і к. Размаўляў... з Сонцам размаўляў...

Г а н н а. Ашалеў пад старасць... З Богам, з Богам трэба размаўляць, а ты немаведама з кім...

М у л ь ц і к. Немаведама... Вунь свеціць... І грэе ўсіх... Усё на зямлі ад цяпла і святла... Калі душа ў чалавека цёплая і светлая, значыць, кавалак сонца па зямлі ходзіць... Ёсць такія людзі, ёсць...

Г а н н а. Грэх...

М у л ь ц і к. З кім хачу, з тым і размаўляю... У нас свабода совесці... Радыё правялі — я з ім размаўляў, тэлевізар паставілі — з ім гаманіў... надакучыла. Я ім адно — яны другое... Цяпер з Сонцам раюся... Маўчыць яно. Свеціць і маўчыць. Слухае...

Г а н н а. Доўга ты яшчэ пражывеш, Васіль...

М у л ь ц і к. Кінь ты! Дваццаты год на пенсіі...

Г а н н а. Прыкмета такая... Гаварыць табе яшчэ хочацца з кім-небудзь... А перад смерцю чалавек заціхае і маўчыць, як тваё Сонца... Колькі гэта табе?

М у л ь ц і к. Восемдзесят, а мо і болей... Лічыць надакучыла...

Г а н н а. Дык гэта ты старэйшы за мяне?

М у л ь ц і к. А ты думала?..

Г а н н а. Ну-у, тады і мне яшчэ трохі пасмылець трэба... Хаця б да тваіх гадоў...

М у л ь ц і к. Смылей на здароўе...

Г а н н а. Вады з твайго калодзежа вазьму...

М у л ь ц і к. Бяры... *(Уважліва глядзіць некуды ўдалячынь, падымаецца, выходзіць уперад.)*

Г а н н а. Што там?

М у л ь ц і к. Ідзе нехта...

Ганна падыходзіць. Глядзяць удваіх.

Павярнуў... У Займішча, мабыць...

Ганна падыходзіць да калодзежа, марудна апускае драўлянае вядро. Тужліва рыпіць журавель, звіняць жалезкі.

Г а н н а. Грышка твой усё не піша?

М у л ь ц і к. З'ехаў пасля арміі і як у балота праваліў-ся... Саўсім забыўся, што ў яго бацька ёсць.

Г а н н а. Была б Наста жывая, дык пісаў бы і прыязджаў.

М у л ь ц і к. Бацьку дзеці лягчэй забываюць... Твая праўда...

Г а н н а. Сон я сёння бачыла... Мажа, разгадаеш?

М у л ь ц і к. Знайшла цыганку...

Г а н н а. Дык ты ж Сонцу молішся!

М у л ь ц і к. Расказвай, разгадаю...

Г а н н а. Іваньку бачыла... Старэйшага свайго... Здаецца, роўненькае поле жытнёвае, неба над ім чыстае-чыстае! І жаўрукі ў ім вісяць. І як быццам Іванька мой ідзе гэтым полем, раз-пораз жменю зерня дастае з кішэні і сыпле сабе пад ногі. Я стаю на ўзмежку дый думаю: «Навошта ён зерне кідае ў зямлю? Жыта ж ужо вырасла, у каласы пайшло, а ён нанава сеяць надумаўся...» Спытаць хацела, а голасу няма. Ён і прайшоў. Я і не спытала...

М у л ь ц і к *(не адразу)*. Добры сон...

Г а н н а. А чым?

М у л ь ц і к. Неба было чыстае?

Г а н н а. Ну.

М у л ь ц і к. Чыстае неба заўсёды на дабро. Жыта было?

Г а н н а. Было...

М у л ь ц і к. Хлеб на дабро. Жаўрукі з песняй таксама на радасць...

Г а н н а. А Іванька? Нябожчыка ж сніць — гэта ж, кажуць...

М у л ь ц і к. Ён жа «без весці»! Які ж нябожчык, старая?!

Г а н н а. Яно-та так...

М у л ь ц і к. Я табе кажу — добры сон... Чакай.

Г а н н а. Што чакаць?

М у л ь ц і к. Радасці, дзіва нейкага…

Г а н н а. Ну, дзякуй табе… Маліся далей, пайду казу пасвіць… У Займішча буду заходзіць, мо ўзяць што?

М у л ь ц і к. Хлеба куш… І пенсію сёння павінны даць…

Г а н н а. Ага…

Разышліся. Мульцік панёс вядро з вадой дахаты. З другога боку вуліцы выходзіць Г а с т р ы т. Маленькі, жвавы, нейкі калючы дзядок. Усё ў яго вострае: і барада, і плечы, і локці, і калені, і нос. Прыйшоў па ваду з чайнікам. Дастаў, наліў у чайнік, выпіў з носіка. Пастаяў, уздыхнуў, прысеў на лавачку.

Г а с т р ы т *(кліча)*. Васіль!

За плотам з'явіўся Мульцік.

М у л ь ц і к. Га?

Г а с т р ы т. Калі паміраць думаеш?

М у л ь ц і к *(без паўзы)*. У сераду…

Г а с т р ы т *(збянтэжыўся)*. У гэту, ці што?

М у л ь ц і к. У якую, ліха яе ведае, а што ў сераду — гэта як піць даць. Самы зручны дзень. Памру, значыць, зранку… Не, не! Пасля абеду. Памыюць вадой вось з гэтага калодзежа…

Г а с т р ы т. Халодная ж…

М у л ь ц і к. Табе халодная, а мне ў акурат… Ну, увесь чацвер паляжу ў хаце… У пятніцу, значыць, на кладзішча, а потым ужо ўсе выхадныя памінайце… Піце, гуляйце аж да панядзелка… На гэта сотню-другую пакіну…

Г а с т р ы т *(падумаўшы, злосна)*. Брэшаш! Не веру. І ты баішся. Павінен баяцца, а не… Ну што ты ў жыцці бачыў, каб з лёгкай душой смерць прымаць?

М у л ь ц і к. Усё трэба рабіць з лёгкай душой…

Г а с т р ы т. Брэшаш!

М у л ь ц і к. А ты не гаўкай тады! Прыпёрся, ёлкі-маталкі, да старога чалавека і пра смерць бае. Знайшоў пра што… А я, можа, на ўсю сотню замахнуўся, як даўгажыцель гор…

Г а с т р ы т. Нашто табе столькі свет капціць?

М у л ь ц і к. Унукаў дачакацца трэба… Каб ведаць, што маё насенне корані пусціла ў гэтым свеце.

Г а с т р ы т *(усміхнуўся)*. Дык а яны, можа, ужо ёсць, а ты і не ведаеш. Унукі… Корані… Піша каму-небудзь твой Грышка?

М у л ь ц і к *(ніякавата)*. Піша… Мне піша… Во нядаўна…

Г а с т р ы т. Брэшаш… Мае не пішуць, і твой павінен не пісаць…

М у л ь ц і к. Піша!

Г а с т р ы т *(спакойна)*. Брэшаш…

М у л ь ц і к *(нечакана)*. Калі ты нарадзіўся, Мікіта?

Г а с т р ы т. Ну, восенню…

М у л ь ц і к *(падумаў, нібы падлічваючы)*. Правільна…

Г а с т р ы т. Што правільна?

М у л ь ц і к. Душа ў цябе атрымалася халодная… як жаба… Ідзі дадому, Мікіта… З табой пагаворыш — потым цэлую ноч поскудзь усялякая сніцца…

Г а с т р ы т *(зацята)*. Ладна! Пагляджу я, ці такі ты будзеш вясёлы, калі гэта касая ўсур'ёз за цябе возьмецца. Пагляджу!

М у л ь ц і к. А мо мне давядзецца паглядзець? Га? Ты ж ад сваёй злосці капыты адкінеш… Твар вунь, як жоўты кукіш…

Г а с т р ы т. На гэта не надзейся!

М у л ь ц і к. Здурнеў я, ці што, на чужую смерць спадзявацца. Век не спадзяваўся.

Г а с т р ы т. Здохну, а цябе перажыву!

М у л ь ц і к. Пакарала цябе, Мікіта, Сонца за нешта. Усе людзі, увесь свет, сам сабе ты не любы… Ляжыць у цябе нешта на душы…

Г а с т р ы т. На зберкніжцы ў мяне ляжыць, а не на душы!

М у л ь ц і к *(зірнуў на дарогу)*. Пачакай, пачакай… Едзе нехта! У вёску едзе!

Выбеглі ўперад, глядзяць. Чакаюць. Уздыхнулі.

Г а с т р ы т. Павярнулі… Па грыбы прыкацілі… А ты ўжо ўзрадаваўся! Не прыедуць… *(Засмяяўся.)* Дальбог, мы з табой, як крумкачы ці чарапахі, гадоў сто трыццаць пражывём! Яны ж і на хаўтуры не прыедуць! Сорамна будзе ў труне ляжаць…

М у л ь ц і к. І чаму ты так пра смерць любіш пагаварыць, не раўнуючы, як я пра свой раўмацізм?.. Дык у мяне хвароба, яна, праклятая, косці ломіць, хочаш не хочаш, а будзеш і памятаць, і гаварыць... А пра смерць...

Г а с т р ы т. Дай сказаць!

М у л ь ц і к. На які д'ябал языком мянціць, праклінаць, прымервацца да яе? Не спужаеш і не ўцячэш!

Г а с т р ы т. Дай сказаць, я табе кажу!

М у л ь ц і к. Ды і добрую яна справу робіць, што ні кажы... Калі раней часу не з'яўляецца і без страшных хвароб зводзіць чалавека на Сонца... Маладзенькім, здаровым месца расчышчае для новага пасеву, новага жыцця...

Г а с т р ы т. Спынішся ты, поп пракляты, ці не?!

М у л ь ц і к. Гавары...

Г а с т р ы т *(трохі супакоіўшыся)*. Не разумею. Як так можна? Усё яму добра, усё хараша! Што за народ?! Б'юць іх — добра, апошняе адбіраюць — хай, дзеці забыліся — так трэба, смерць у вочы глядзіць — заходзь, любая, чарку дам! Лапухі! Увесь век перад усім і ўсімі гнуцца, скараюцца!

М у л ь ц і к. Перад жыццём скараемся, дурань зацяты... Перад жыццём! Яно і маці наша, і бацька, цар і Бог справядлівы...

Г а с т р ы т. Пагляджу я...

М у л ь ц і к. Не хадзіў бы ты да майго калодзежа... Га, Мікіта?..

Г а с т р ы т. Хадзіў і буду. Не забароніш.

М у л ь ц і к. Забараніць не магу... Гэта калодзеж... Уся вёска некалі з яго ваду піла... Самая смачная, самая чыстая ва ўсім раёне...

Г а с т р ы т. У цябе? Самая смачная? Цьфу!

М у л ь ц і к. Што ты робіш?! На святы калодзеж пляваць! Гэта вада душу мягчэйшай робіць і галаву яснай... Я мо такі доўгі век і жыву, што з маленства яе п'ю, а ты...

Г а с т р ы т *(папрасіў)*. Васіль, растлумач ты мне... Хоць забі — не разумею...

М у л ь ц і к. Што растлумачыць?

Г а с т р ы т. Ты проста прыдурак ці толькі прыкідваешся? Сонцу, як людаед, моліцца, вада ў яго ну не проста вада, а жывая... Нябожчыку на пятку капні — у скокі пойдзе...

Здзяцінеўся пад старасць! Нездарма цябе Мульцікам клічуць.

М у л ь ц і к. Ідзі ты, Мікіта, адсюль...

Г а с т р ы т. Не пайду.

М у л ь ц і к. Не трывож майго сэрца!

Г а с т р ы т. Не пайду! Вуліца не твая.

М у л ь ц і к. Тады злазь з лаўкі! Лаўка мая, сам рабіў...

Гастрыт устаў з лаўкі, сеў побач на траву.

Г а с т р ы т. Падавіся сваёй лаўкай. Куркуль!

Мульцік маўчыць.

Міраед!

Мульцік, маўчыць.

Перажытак кулацкі!

М у л ь ц і к. Сталоўка ўжо адчынілася, Мікіта... Ідзі гуляш калгасны ў Займішча есці... Вадзіцы з майго калодзежа напіся і ідзі.

Г а с т р ы т. І пайду. А ты бульбай нішчымнай давіся!

М у л ь ц і к. Яешню з салам сёння буду есці... Яйкі свае, і сала сваё... Сам сябе ўсё жыццё карміў, кармлю і да смерці карміць буду...

Г а с т р ы т. Брэшаш! Грошай шкада, во і цягнеш з сябе жылы... А нашто яны табе? Богу ўзятку даваць уздумаў?

М у л ь ц і к. Грошай не шкада. Не хачу нават пад старасць як той клоп жыць... Хадзіць па зямлі і ў сталоўцы абедаць... Гэта ж сорам!

Г а с т р ы т. Гэта не сорам! Гэта абшчэственная пітанія! І потым я заслужыў... У мяне пенсія!

М у л ь ц і к. Пенсія хутка ва ўсіх будзе... Хто толькі нас гуляшамі карміць будзе?..

Г а с т р ы т. Ведаеш, хто ты?

М у л ь ц і к *(махнуў рукой)*. Ведаю, ведаю... Элемент.

Г а с т р ы т. І не наш!

М у л ь ц і к. Шкада, што ты наш... Бяда народная...

Г а с т р ы т. Я калі-небудзь на цябе ананімку напішу. Пабачыш.

Злосны, пайшоў. Чайнік з калодзежнай вадой застаўся каля лаўкі.

М у л ь ц і к *(адзін)*. Ты не крыўдуй на яго… Душа ў чалавека баліць. На зямлі нарадзіўся, вырас, а рук да гэтай зямліцы ніводнага разу не прыклаў… А зямлі ласку, любоў сваю аддаць трэба… Тады яна і накорміць, і сагрэе, і суцешыць, і сілы дасць пад старасць… Яна жывая… Дачка твая, наша маці… Слухаеш? Пайду свіннату сваю карміць… Чуеш, вішчаць? Эх, ручухны мае, ручухны!.. Што ж гэта вы так расхадзіліся? Ці не дождж збіраецца?.. Не падобна як быццам…

З'яўляецца Г а н н а. З сумкай хлеба, стомленая і вясёлая.

Г а н н а. Канчай маліцца — будзем весяліцца…

М у л ь ц і к. Хлеба купіла?

Г а н н а. Ага…

М у л ь ц і к. А пенсію прынесла?

Г а н н а. Пенсію не далі… Ты, кажуць, з завітушкамі распісваешся, а я без завітушак… Сам сходзіш… *(Прысела на лаўку, зняла хустку.)* Ну, давай, Васіль!

М у л ь ц і к *(глядзіць здзіўлена)*. Што табе даць?

Г а н н а. Страсяні касцямі — пакажы самадзейнасць!

М у л ь ц і к. Ды ты, мабыць, піва ў сталоўцы выпіла?

Г а н н а. Пісьмо табе прынесла…

М у л ь ц і к *(захваляваўся, але наўмысна спакойна)*. Ад каго?

Г а н н а. Ну, ад каго ты думаеш?

М у л ь ц і к *(рашуча)*. Давай!

Г а н н а. Не-не-не! Табе радасць, дык ты ўжо і мяне парадуй… Згоцай «Лявоніху» з прыпеўкамі… Як да вайны на маёўцы.

М у л ь ц і к. Не дуры галавы! Адкуль пісьмо?

Г а н н а. Ой, язык зламаць можна! Нешта такое джык-гам-гаў…

М у л ь ц і к. Джэзказган!

Г а н н а. Во-во!

М у л ь ц і к. Ад Грышкі…

Г а н н а. «Лявоніху», Васіль, «Лявоніху»…

М у л ь ц і к. Ну, што ты як маленькая, чэснае слова…

Г а н н а. А так — забі, не аддам!

М у л ь ц і к. А, ёлкі-маталкі! *(Падышоў, схапіў сумку, пашукаў і не знайшоў.)* Аддай, табе кажуць!

Г а н н а. «Лявоніху», Васіль, а то зараз пайду!

М у л ь ц і к. Дык я ж растрасуся...

Г а н н а *(паднялася)*. Пайду! І аддам толькі пад вечар...

М у л ь ц і к. Каб ты згарэла! *(Разы са два тупнуў.)*

Г а н н а. Не, не... Пад музыку. *(Заспявала.)*

Ой, Лявоніха, ня жонка была,
Нямытую рубашонку дала,
Нямытую-некачаную,
У суседа...

Ну, чаго ты колам стаў?! Танцуй! *(Спявае.)*

Нямытую-некачаную,
У суседа пазычаную...
Весялей, весялей...
Туры-туры-турытушачкі,
Туры-туры-турытушачку!

Мульцік скача.

А цяпер упрысядкі! І-і-і-эх!

Мульцік сагнуўся, каб пусціцца ўпрысядкі, і знерухомеў.

М у л ь ц і к *(схапіўся за спіну)*. Ой!

Г а н н а. Чаго й та ты?

М у л ь ц і к *(стаіць, сагнуўшыся, як пытальнік)*. Порхаўка старая! Прысядкі ёй трэба! З маім здароўем — «Лявоніху»! Хадзі во, разгінай мяне, каб табе не ведаю што... У мяне ж сярэдзіна!

Г а н н а. А Госпадзі! *(Падбегла.)* Што ж рабіць?

М у л ь ц і к. Увапрыся далоняй у сярэдзіну... Ды не кулаком, а далоняй! Так... так... Не, вышэй трохі... Во чокнутая. Ці ж можна так з чалавека здзекавацца?

Г а н н а. Ну ладна табе...

М у л ь ц і к. Дай толькі разагнуцца — ты ў мяне балетам заскачаш! Во так трымай. Цяпер бяры за галаву... Так... *(Камандуе.)* Разгінай!

Ганна спрабуе «разгінаць». Мульцік стогне.

Нічога не выйдзе... Цягні на лаўку, пакладзі як-небудзь... Сам буду разгінацца.

Г а н н а *(вядзе старога да лаўкі)*. Аёечкі, каб жа я ведала…

М у л ь ц і к *(сярдзіта)*. Галавой думаць трэба… Самадзейнасці ёй захацелася…

Ганна падвяла Мульціка да лаўкі, асцярожна-асцярожна паклала яго на яе. Мульцік паволі выпрамляецца.

Давай пісьмо!

Г а н н а *(дастае з-пад кофты)*. На, на…

Мульцік, лежачы, разрывае канверт, нецярпліва выцягвае белы лісток.

М у л ь ц і к. У цябе акуляры з сабой?

Г а н н а. Зараз, зараз… *(Дастае з сумкі.)* На…

Мульцік надзявае акуляры. Ганна ўздыхнула, адышла да плота, глядзіць. Мульцік жмурыцца, здымае акуляры.

М у л ь ц і к. Ты ў іх бачыш што-небудзь?

Г а н н а. Усё чыста.

М у л ь ц і к. Туман нейкі, і ўсё… *(Перавярнуў акуляры дужкамі ўперад.)* Во! Другое дзела… Ты ж іх не тым бокам носіш! *(Прачытаў некалькі радкоў, спахмурнеў, адразу, забыўшыся пра сярэдзіну, падняўся, сеў, паклаў на калені пісьмо, акуляры. Сумна глядзіць перад сабой.)*

Г а н н а *(устрывожана)*. Ну?! Што там у яго?

М у л ь ц і к. Маё гэта пісьмо, Ганна, маё… Пасылаў з месяц таму… Вярнулася… Зноў Грышка выбыў некуды… Во табе і «Лявоніха ня жонка была…»

Паўза. Старая павольна падыходзіць да лаўкі, сядае побач.

Г а н н а. Не сярдуй, Васіль…

М у л ь ц і к. Кінь ты…

Г а н н а. Табе хоць ёсць ад каго чакаць…

М у л ь ц і к. Дачакаешся…

Г а н н а. А я б, здаецца, з раніцы да ночы скакала, каб толькі ведаць, што мой Віцёк няўдачны калі-небудзь успомніць пра мяне… Хай ужо і пісьма не напішыць… Абы толькі ўспомніў… Не сярдуй… *(Дастае з сумкі хлеб.)* Булкі табе хопіць?

М у л ь ц і к. Хопіць…

Г а н н а. А то дзве магу пакінуць…

М у л ь ц і к. Хопіць адной…

Г а н н а. Ну, пайду…

Пайшла. Стары зноў разгарнуў пісьмо. Пакруціў у руках, паглядзеў і горка-горка засмяяўся. Падыходзіць Г а с т р ы т.

Г а с т р ы т *(весела)*. Жывеш?

М у л ь ц і к. Жыву…

Г а с т р ы т. А чаго гэта ты рагочаш?

М у л ь ц і к. Хачу і рагачу…

Г а с т р ы т. Атрымаў, я бачу?

М у л ь ц і к. Ну, атрымаў, а табе што?

Г а с т р ы т. Давай пачытаю…

М у л ь ц і к. Ідзі, Мікіта, не чапляйся…

Г а с т р ы т. Грошай, канечне, просіць. Прапіўся да ніткі, во і бацьку ўспомніў.

М у л ь ц і к *(стомлена і не злосна)*. Ну, што ты за чалавек? Гастрыт, адно слова — Гастрыт… Чаго ты на ўвесь свет злуеш? Дзяцей разагнаў, яны да цябе ні нагой, вось і злуеш…

Г а с т р ы т. Я — дрэнны. Я разагнаў. А ты добры. І да цябе не едуць…

М у л ь ц і к. Гваздану я цябе калі-небудзь…

Г а с т р ы т. У суд падам. Пасадзяць…

М у л ь ц і к. Прэмію дадуць! Ад цябе ж ва ўсім свеце холадна… Ідзі, ідзі, я табе сказаў…

Г а с т р ы т. Я па свой чайнік прыйшоў… Забыўся тут… Дзе падзеў?

М у л ь ц і к. Вунь стаіць!

Гастрыт падышоў, узяў чайнік, выліў з яго ваду.

Г а с т р ы т. Вады свежай можна ўзяць?

М у л ь ц і к. Бяры…

Гастрыт пачынае даставаць ваду.

Г а с т р ы т. Што гэта ў свеце робіцца, Васіль?

М у л ь ц і к. Лета канчаецца…

Г а с т р ы т. Куды ідзём?

М у л ь ц і к. Не ведаю…

Г а с т р ы т. Чым далей — тым людзі паганей робяцца… Сёння каля сталоўкі бугая гэтага, Мішку Сіляўца, сустрэў…

Вісіць на плоце, носам сваім чырвоным шмыгае… Алкаш няшчасны! І чаго яны такія? Толькі пра тое і думаюць, каб кожны дзень гарэлкі нажэрціся да ікаўкі!

М у л ь ц і к. А што ім яшчэ рабіць? Ні рукі, ні душы не занятыя… Гадзіны свае адпрацуе, у сталоўцы пад'есць, прыйдзе ў сваю цагляную хату, у блакітны яшчык паглядзіць… А далей што? Дзень доўгі… А каля дому ні гарода, ні хлява, ні курыцы… Пуста… Што яму рабіць? Чым заняцца?

Г а с т р ы т. Хай над сабой працуе! Павышаіць уравень!

М у л ь ц і к. Во ён траячку ў кішэню, «чарніла» ў магазіне возьме і павышае…

Г а с т р ы т. Мы ім шчасце паўвека заваёўвалі… Заваявалі… Сытыя ўсе, абутыя-адзетыя… І недавольныя! Якой ім яшчэ трасцы трэба?

М у л ь ц і к. Шчасце з чужых рук заўсёды кіслае… Шчасце самому сабе рабіць трэба… Абутыя-адзетыя… І ўпрогаладзь жывучы, радасныя песні спяваць можна… Галодных у нас даўно няма… Не ў сытасці шчасце…

Г а с т р ы т. А ў чым жа яно? Растлумач мне, цёмнаму, святы чалавек.

М у л ь ц і к. У працы… У радаснай працы… А вы адбілі ахвоту ў людзей радасна працаваць на зямлі…

Г а с т р ы т. Хто гэта мы?

М у л ь ц і к. Ты і такія ж асталопы, як ты…

Г а с т р ы т. Што? Што ты мелеш? Ды я з самага пачатку… з маладосці ўсё сваё здароўе, увесь… усё сваё жыццё для ўласці, для камунізму…

М у л ь ц і к. Камунізм спачатку трэба пабудаваць у сваёй душы… Самому. А потым ужо нешта рабіць… Для ўласці… Якая табе ўласць загадвала даводзіць вясковых людзей да таго, што яны пачалі сароміцца, што жывуць і працуюць на зямлі… Самага святога саромеліся…

Г а с т р ы т. Што ты мне вешаеш? Што вешаеш? Як гэта я даводзіў?

М у л ь ц і к. Ты ж некалі ўсіх добрых гаспадароў з вёскі павыгнаў… Тых, хто любіў зямлю… Любіў і слухаў…

Г а с т р ы т. Я супраць кулакоў…

М у л ь ц і к. Колькі іх было на ўсю нашу вёску? Два.

Г а с т р ы т. Брэшаш, болей…

М у л ь ц і к. Два. Зяпа і Мішук Цяркоўскі... Ад іх усе Вежкі плакалі... А каго Васіль Барабулінак эксплуаціраваў? У яго ж парабкаў не было, ён са свайго мазаля жыў...

Г а с т р ы т. Ён народную зямлю эксплуаціраваў...

М у л ь ц і к. Зямля з радасцю аддае ўсё таму, хто да яе рукі прыкладае... Ты проста не хацеў працаваць, як усе, а хацеў наглядчыкам над людзьмі быць... Лёгка, няпыльна і ў пачоце! Вось і муціў ваду, пускаў усім пыл у вочы... Сазнацельным прыкідваўся!

Г а с т р ы т. Я лінію праводзіў...

М у л ь ц і к. Толькі крывую і сваю. У Вежках ты моладзь ад зямлі адбіў? Ты... Колькі гадоў сачыў за тым, каб, значыць, ніхто лішнюю бульбіну ці мех зерня ад зямлі не ўзяў... А чаму ж не браць, калі яна дае? Бегаў па гародах, каб хто лішнюю баразну не прагнаў. Хай пустуе, бур'янам зарастае... Не магі!!! З усіх сіл адбіваў ахвоту ў людзей працаваць. Крычаў да хрыпаты, што пазорна мець скаціну ў хляве, хлеба, бульбы шмат збіраць з агарода... Вось калі гол як сакол — значыць, сазнацельны! Калі ў хляве пуста — маладзец! А калі ў цябе каля хаты заместа крапівы жыта калосіцца — буржуй! міраед! кулак! Пуста ў хляве — пуста і ў душы будзе. І хто ты такі быў? Ні начальнік, ні падначальнік, а так... Прышчык «сазнацельны»... Мы б з голаду ўсёй краінай здохлі, каб, не дай бог, сталі ўсе такія «сазнацельныя», як ты... І тое, што мой Грышка, Ганнін Віцёк і твае дзеці па свеце бадзяюцца, шукаюць немаведама чаго — ты вінаваты! Яны ж на зямлі выраслі, яна ж іх маці, яны ж павінны былі заместа нас на яе прыйсці, каб хлебам людзей карміць... Не пайшлі... Таму што ведалі: такія гастрыты, як ты, не дадуць ім ні спакою, ні волі...

Г а с т р ы т *(злосна)*. Такім, як ты, дай волю — даўно б савецкай уладзе жылы перагрызлі...

М у л ь ц і к. А хто яе карміў, гэту ўладу, як не мы? Можа, ты, прышчык? Хто ў калгасе за голы трудадзень працаваў, налогі з кожнага дрэўца, з кожнай курыцы плаціў, калі ўсім цяжка было?!

Г а с т р ы т. Баяліся, таму і кармілі...

М у л ь ц і к. Асталоп! А калі немцы каля Масквы стаялі, хто партызанам апошняе аддаваў? Дзеткі з голаду пухлі,

карнікі вёскі palілі, а гэтыя твае падкулачнікі хлеб, бульбу, сала ў лес вазілі... Святым хлебам святую зямлю сваю баранілі ад чужынцаў...

Г а с т р ы т. Васіль! Я цябе па-суседску папярэджваю: кінь гэту філасофію, не смушчай людзей. Ты ведаеш, супраць чаго выступаеш?

М у л ь ц і к. Супраць дурноты!

Г а с т р ы т. Васіль, я чэсны! Я магу ананімку напісаць...

М у л ь ц і к. Пішы...

Г а с т р ы т. Выклічуць... куды трэба за такія закідоны.

М у л ь ц і к. Не пужай. Скончыўся твой час. Гэта цябе самога трэба было выклікаць з самага пачатку. Каб не такія гастрыты, як ты, мы даўным-даўно камунізм пабудавалі б...

Г а с т р ы т. Ты яшчэ пра камунізм, часнік няшчасны?!

М у л ь ц і к. Я не часнік, я ўчаснік...

Г а с т р ы т. Рукамі і зубамі за кавалак зямлі трымаецца і пра камунізм яшчэ...

М у л ь ц і к. Я і пры камунізме за яго трымацца буду... І пры камунізме ў сталоўку не пайду... Я хлебароб вечны... Хлеб раблю... А калі робіш хлеб — трэба сябе карміць...

Г а с т р ы т. Чэснае слова, напішу...

М у л ь ц і к. Пішы... *(Падняўся з лавачкі, пайшоў да веснічак.)*

Прыбягае Г а н н а. Без хусткі, расхрыстаная, заплаканыя вочы гараць.

Г а н н а *(крычыць)*. Людцы-ы!! Людцы!

М у л ь ц і к. Чаго ты?

Г а н н а *(задышліва)*. Радзіва! Радзіва... Хутчэй уключыце! Слухайце!

Мульцік подбегам кідаецца да акна, адчыняе яго, круціць дынамік. Урываецца голас дыктара.

Г о л а с д ы к т а р а. ...яе мацярынскую любоў і пяшчоту. Я памятаю яе ласкавыя рукі, што пяклі самы смачны хлеб і маглі трымаць зброю. У грозныя дні вайны, у партызанскім атрадзе, яна абараняла Радзіму ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў...

М у л ь ц і к. Фу-у-у, я ўжо думаў, што ізноў вайна...

Г а с т р ы т *(да Ганны)*. Ты што, з глузду з’ехала?

Г а н н а. Сціхніце!

Г о л а с д ы к т а р а. ...Цяпер я далёка. Але вельмі часта мне сняцца начамі нашы Вежкі...

Г а н н а *(усхліпнула)*. Сыночак!

Г о л а с д ы к т а р а. ...хата канцавая, тры бярозкі пад акном і мама...

І на гэтых словах Ганна, ужо не стрымліваючыся, загаласіла на ўвесь голас, пайшла да акна, схапіла з падаконніка старэнькі дынамік, прыціснула яго да грудзей.

М у л ь ц і к *(спалохана)*. Ганна, Ганна... Ты гэта... Сядзь... Супакойся. Не трэба так... Зараз вады дам... Чаго ты? *(Да Гастрыта.)* Чаго аслупянеў? Дай свой чайнік!

Гастрыт падае чайнік. Ганна п’е.

Г а с т р ы т. Дайце-ка даслухаць... *(Бярэ з рук Ганны дынамік.)*

Г о л а с д ы к т а р а. Паважаная Ганна Восіпаўна! Ад усяго сэрца мы жадаем вам моцнага здароўя і доўгіх год жыцця і па просьбе вашага сына Віктара перадаём для вас вашу любімую песню «Ой, ляцелі гусі з броду».

Г а н н а *(выціраючы вочы)*. Дачакалася, дзякуй Богу... Успомніў... Спакойна памру...

І гучыць песня па радыё:

Ой, ляцелі гусі з броду,
Замуцілі ў рэчцы воду.
Ой, ляцелі гусі з броду,
Замуцілі ў рэчцы воду.
Пакуль вада чыста стала,
Я з Раманам прастаяла.
Пакуль вада чыста стала,
Я з Раманам прастаяла.
Роман, Роман, Романеньку,
Пусці мяне дадоменьку,
Роман, Роман, Романеньку,
Пусці мяне дадоменьку.
У мяне не родна маці,
Будзе біці і ругаці.
У мяне не родна маці,
Будзе біці і ругаці.

Во яно і дзіва... Ваську ў сне бачыла, а Віцёк аб’явіўся... Помніць... Любіць...

М у л ь ц і к *(бубніць паблажліва).* А толькі ныла ўсё: няўдачліва я яго радзіла, няўдачны ён атрымаўся… А ён цябе на ўсю краіну… Увесь народ цяпер ведае, што на зямлі жыве… Ганна з Вежак… І што сын у яе ёсць… Хоць і далёка, але ж ёсць…

Г а с т р ы т. Оё-ё-ёй! Зірніце вы на іх! Загарэліся! Засвяціліся! Аж блішчаць!

М у л ь ц і к. Мікіта, ты… ідзі адсюль… Я цябе прашу.

Г а с т р ы т. Не пайду! Нечага тут… *(Да Ганны.)* Ганна, я цябе паважаю, але я чэсны… я справядлівы… Не крыўдуй… Не пра цябе гэта ўсё. Не ён гэта.

Г а н н а. А хто ж?

М у л ь ц і к. Табе вушы пазакладвала, ці што?! Пра нашы ж Вежкі гаварылі!

Г а с т р ы т. Другія Вежкі, другая Ганна і другі Віцёк! Ён такое не мог напісаць! Не мог!

М у л ь ц і к. Дык што ж, яна сама пра сябе напісала?!

Г а с т р ы т. Не ведаю. Дзе ён у яе? Дзе?

Г а н н а. Вы ж ведаеце… Сядзіць.

Г а с т р ы т. І каторы раз? Толькі, Ганна, прашу… не крыўдуй… Я чэсны. Я справядлівы. У мяне ў самога дзеці няўдачныя… Расціў-карміў іх, дык быў харошы, а выраслі — дрэнным стаў! Грошы толькі пасылаюць, рублямі ад мяне адкупліваюцца, а каб што-небудзь такое… і не падумаюць і не ўспомняць… Няўдачныя!

М у л ь ц і к. А вось Віцёк пра яе ўспомніў… Узяў і напісаў…

Г а с т р ы т. Ага! Сяджу на нарах, як кароль на імянінах, — перадайце для маёй маці «Ой, ляцелі гусі»!

М у л ь ц і к. Ідзі адсюль!

Г а с т р ы т. Не пайду!

М у л ь ц і к. Ганна, не слухай… *(Да Ганны.)* Прозвішча тваё перадавалі ці не?

Г а н н а. Не пачула я… Пра Вежкі толькі… Што добра чалавеку, калі ў яго куточак родны на зямлі ёсць, дзе некалі босым па расе бегаў… Добра, значыць, што цябе чакаюць і помняць заўжды… Яшчэ нешта… А прозвішча не пачула… Я не з самага пачатку слухаць стала…

М у л ь ц і к. Перадавалі, канечне… І тры бярозкі пад акном у цябе растуць…

Г а с т р ы т. Стоп! Калі ён з'ехаў, бярозка адна была... А гэтыя дзве без яго выраслі... Я памятаю... Скажыце, адкуль ён пра гэтыя бярозкі ведае? Ніводнага разу не прыязджаў, пісем не пісаў... Адкуль ён ведае?!

М у л ь ц і к. Прашу цябе, Мікіта, сыдзі з воч! Не дай і мне пад старасць у турму сесці... *(Да Ганны.)* Я ведаю, што пра цябе перадавалі... Пра цябе. І Віцьком яго завуць, і ў партызанах жа ты была, і Вежкі, і па бацьку ж цябе Восіпаўна...

Г а с т р ы т. А вось і не! Па бацьку яе Васільеўна...

М у л ь ц і к *(уражана)*. Як?!

Г а н н а. Гэта Піліпа майго Восіпавічам звалі...

М у л ь ц і к. Дык як жа гэта я?.. Забыўся...

Г а с т р ы т. Усё ясна! Так я і думаў... *(Тыцнуў пальцам у Мульціка.)* Ён напісаў! Заяўку зрабіў замест твайго Віцька...

М у л ь ц і к. Ды не, Ганна, што ты?! Не! Што ты выдумаў, дурань?!

Г а с т р ы т. Ну, арты-ы-ыст! Ну, Мульцік! За такія штучкі ведаеш, што бывае...

М у л ь ц і к. Ды пры чым тут я?! Ён, мабыць, напісаў і пра Піліпа, а там пераблыталі...

Г а с т р ы т. Хопіць лухту несці! Там не блытаюць...

Г а н н а *(устала з лаўкі)*. Нашто ты гэта, Васіль... Не варта было... *(Цяжка пайшла прэч.)*

М у л ь ц і к *(крычыць услед)*. Ды няхай мне рукі адваляцца, калі гэта я пісаў! Ды я і пісаць разумна не ўмею! Ды і не ведаю нават куды! Ганна!

Г а н н а не азірнулася. Пайшла. Гастрыт сумна глядзіць ёй услед. Мульцік — на Гастрыта.

Г а с т р ы т. Расстроіў толькі бабу з-за глупства...

М у л ь ц і к *(выцягвае са штаноў дзягу)*. Здымай штаны!

Г а с т р ы т. Што-о-о-о?!

М у л ь ц і к. Здымай штаны, я цябе вучыць буду!

Г а с т р ы т. Ну-ну-ну!

М у л ь ц і к *(наступае на яго)*. Асталоп! Пень! Гастрыт! Бульдозер пракляты! Што ў цябе пад сарочкай?!

Г а с т р ы т *(таксама завёўся)*. Рэбры ў мяне пад сарочкай! І пуп!

М у л ь ц і к. А сэрца?! Дзе тваё сэрца?! Радасць у чалавека была!!! Яна ж без яе ўсё жыццё сваё!!! Трое дзетак у партызанах з голаду памерлі, старэйшы сын «без весці», Піліп вярнуўся кулямі ды асколкамі начынены, два месяцы пажыў... Віцька адзін застаўся, дык і ў яго жыццё наперакасяк пайшло... Адна ўсё жыццё... Гаротніца... Хоць ты яе ў царкве вешай як пакутніцу святую, а ты...

Г а с т р ы т. А я не дазволю! Не дазволю ўсяму народу, усяму гасударству галаву дурыць! Мільёны людзей падманваць! У мяне таксама дзеці! Але ж я не хачу, каб мне па радыё пра гусей спявалі! Па нашаму радыё толькі праўду перадаюць! І нечага...

М у л ь ц і к *(махнуў рукой)*. Што з табой гаварыць! Цяпла ў цябе, чалавеча, няма... Хоць сто гадоў яшчэ пражывi — не даведаешся пра самае галоўнае...

Г а с т р ы т. Пра што гэта?

М у л ь ц і к. Навошта мы, людзі, з таго свету на гэту зямлю прыходзім?.. Навошта жывём...

Г а с т р ы т. Няўжо ведаеш?

М у л ь ц і к. Ведаю... Зямля халодная, і неба халоднае, космас яшчэ халаднейшы... Даў нам Бог жыццё, каб мы ўсё гэта сагрэлі... Душамі сваімі сагрэлі! І зямлю, і неба, і адзін аднаго... Дык грэй жа, грэй! Хаця чым табе грэць? Халодны ты...

Г а с т р ы т. У мяне трыццаць шэсць і шэсць... Як ва ўсіх...

М у л ь ц і к. Не свеціць на цябе Сонца... *(Пайшоў.)*

Г а с т р ы т *(услед)*. Сам ты!.. *(Не прыдумаў, што сказаць, і змоўк.)*

З а ц я м н е н н е

Дрэмле стары журавель. Ціхая зорная ноч вісіць над неперспектыўнай вёскай. І ці то ўяўляецца, ці то сніцца старым жыхарам яе наступнае: павольна і ўрачыста падыходзяць да калодзежа іх дзеці. С т а р э й ш а я д а ч к а Г а с т р ы т а набірае ваду, Мульцікаў Г р ы ш к а ў джынсах і ў вышыванай кашулі, Ганнін І в а н ь к а ў вайсковым дапамагаюць ёй. Смяюцца бязгучна, жартуюць. Потым схіляюцца да вядра, прагна п'юць самую смачную ваду свайго дзяцінства. Прыгожыя, святочныя нейкія. М у л ь ц і к, Г а н н а і Г а с т р ы т сядзяць на лавачцы і з цёплымі ўсмешкамі глядзяць на дзяцей. Цямнее. Раствараюцца ў цемені д з е ц і, знікаюць с т а р ы я. Пачынае святлець. Вечар. З'яўляецца Мульцік. Доўга-доўга глядзіць на дарогу. Уздыхнуў, падышоў да калодзежа, пачынае даставаць ваду. Прыходзіць Гастрыт. У свежай кашулі, пры гальштуку нават. Сумны.

Г а с т р ы т. Здароў…

М у л ь ц і к. Зноў прывалокся? Мікіта, я сварыцца больш не буду! У мяне на цябе нерваў не хапае… Сядзі і маўчы.

Г а с т р ы т. Маўчу! А ты раскажы…

М у л ь ц і к. Што?

Г а с т р ы т *(смяецца)*. Як учора каня прасіў у старшыні… Іш ты, кавалерыст! Барон цыганскі! Каня яму трэба! Узятку нават даваў!

М у л ь ц і к. Я купіць хацеў!

Г а с т р ы т. Навошта ён табе?

М у л ь ц і к. Адчапіся!

Г а с т р ы т. Скажы нашто — адчаплюся!

М у л ь ц і к. Малако людзям трэба?

Г а с т р ы т. А ці ты яго даіць збіраўся?

М у л ь ц і к. Змагу я трымаць карову адзін? Назапасіць на зіму сена? Сілы нямашака. Ды і касіць няма дзе. А будзе ў мяне конь, ды я на ім паўсвету за лета аб'ездзіў бы… Там касануў, там… Па ахапцы сена назапасіў бы… І карове і яму. І соткі свае лягчэй зрабіць будзе. І дроў прывезці. Жыць мне з ім лягчэй будзе. Сябе карміць буду, і застанецца яшчэ. А так, год-два, я ж дзяржаве на шыю сяду, як і ты!

Г а с т р ы т. Я не на шыі! Я на пенсіі!!!

М у л ь ц і к. А з канём я сам пракармлюся…

Г а с т р ы т. Ты гэтыя свае кулацкія замашкі кінь!

М у л ь ц і к. Атамны век канчаецца, яны ўсё кулакоў баяцца!

Г а с т р ы т. Конь — гэта срэдства праізводства!

М у л ь ц і к. Дык што?

Г а с т р ы т. А калі табе даць срэдства ў рукі — ого-го! Ты такую багатую гаспадарку на сваіх сотках закруціш — чарцям моташна стане!

М у л ь ц і к. І добра!

Г а с т р ы т. І скоцішся!

М у л ь ц і к. Куды?

Г а с т р ы т. Да мелкабуржуазнай ідэалогіі…

М у л ь ц і к. Якая ідэалогія?! Мне восемдзесят гадоў! Лягчэй мне будзе з канём. Больш бульбы вырашчу, малако будзе, заместа аднаго парсючка — трох трымаць буду. Дык я ж сам не з'ем — я вунь адной бульбінай і шкваркай цэлы дзень жыву — прадам калгасу…

Г а с т р ы т. Ага! І грошы, канечне, у кішэнь?! Багацець пачнеш...

М у л ь ц і к. Куды ж я падзенуся з гэтымі грашыма? Яны ж на кніжцы ляжаць будуць: надзёжна, выгадна, удобна! Я ж на гэтыя грошы гвардзію ўзбройваць не буду, каб супраць улады ісці. Я ж не Дзянікін. Я — Мульцік.

Г а с т р ы т. Дай табе каня — Дзянікіным станеш!

М у л ь ц і к. Цьфу! Гэта ж трэба такім ідэйным прыдуркам урадзіцца!

Г а с т р ы т. І што чалавеку яшчэ трэба? Усё ёсць, гасударства пра яго клапоціцца, пенсію плоціць, а ён...

М у л ь ц і к. Гэтымі грашыма сына ад мяне адбілі... Пяты год немаведама дзе бадзяецца, бацьку роднага забыў...

Г а с т р ы т. Ты што?! Што ты вярзеш? Пры чым тут пенсія?

М у л ь ц і к. А пры тым: ведае ён, што мне яе даюць... А раз даюць, значыць, з голаду не здохну! А не здохну з голаду — навошта ж пра мяне клапаціцца, пісьмы пісаць: як ты там, бацька, жывеш-маешся ў нашых неперспектыўных Вежках? Ведае: рубель ёсць, сталоўка ёсць — накормяць якім-небудзь гуляшом! А я б, здаецца, крапіву з лебядой еў, каб толькі ўнука ці ўнучку за руку павадзіць...

Г а с т р ы т. Распусціўся ты, Васіль, ой распусціўся! Нічога не баішся! Дэмагогіяй займаешся, усім незадаволены... І гэта табе не тое, і тое не гэта... Ой, няма на вас пастуха!

М у л ь ц і к. А на цябе?

Г а с т р ы т. А я сазнацельны.

М у л ь ц і к. Ну, канечне... Ідзі гуляш у сталоўку есці...

Г а с т р ы т. Што ты да гэтага гуляша прычапіўся? Сёння шніцаль давалі!

М у л ь ц і к. Ну, шніцаль...

Г а с т р ы т *(уздыхнуў)*. Ой, няма... *(Пайшоў.)*

М у л ь ц і к *(адзін, глядзіць на дарогу)*. Стамілася, бедалага?.. Я думаю: цалюткі дзень на небе... І добрых людзей грэеш, і дрэнных, і ніякіх... Дзякуй табе... Адпачывай ужо... Хаця дзе там? Зямля, кажуць, круглая... Амерыканцаў, значыцца, грэць пойдзеш? Давай, давай... І ім трэба... І там, мусіць, ёсць людзі, што чакаюць цябе і любяць... І такія во неперспектыўныя шкілеты, як я, і дзеткі маленькія, дай ты

ім здароўя, радасці, спалі ўсё благое сваім цяплом... *(Дастае вядро вады, адносіць яго ад калодзежа, вылівае на траву, пачынае набіраць новае.)* Толькі там не затрымлівайся ўжо... Як мне здаецца, дык ты ўсё-ткі нашага роду-племені... Мабыць, на нашу зямлю трохі раней зірнула... І блін наш на цябе падобны, і бохан хлеба... Ты — наша... Але і астатнія твае дзеці... І іх любіць трэба... Любі, не стамляйся... І нас, і іх... Ну, шчаслівай табе дарогі... *(Набраў вады, пайшоў у свой двор.)*

Са свайго двара прыходзіць Г а н н а. Марудна-марудна апускае ў калодзеж вядро. Звіняць жалезкі. Падымае, пералівае ваду ў сваё вядро. Узняла, панесла, паставіла вядро на зямлю, памахала рукой. Узяла, зноў трошкі пранесла... Зноў паставіла. Падышла да лавачкі, села, заплакала. Ціха, аднымі вачыма. Прыходзіць Г а с т р ы т.

Г а с т р ы т. Чаго макрэчу развяла?

Г а н н а. Сілоў нямашака, Мікіта... Поўнае вядро ўжо занесці не магу...

Г а с т р ы т. А нашто табе поўнае?

Г а н н а. Прывыкла...

Г а с т р ы т. Адвыкай...

Г а н н а. Казу ж напаіць трэба... Сабе бульбіну якую зварыць і каб каля парога поўнае вядро стаяла...

Г а с т р ы т. Пагаварыць трэба... *(Азірнуўся.)*

Г а н н а. Гавары...

Г а с т р ы т. Пінача́эта не бачыла?

Г а н н а. Каго-о?

Г а с т р ы т. Ката майго... Рыжага...

Г а н н а. Не...

Г а с т р ы т. Збег некуды, воўчае мяса... А я праз яго цэлую ноч не спаў...

Г а н н а. Праз ката?

Г а с т р ы т. Праз яго, старую падлу! Можа, паміраць куды пабег... Каты ж, кажуць, на вачах баяцца паміраць...

Г а н н а. Не бачыла я твайго Пінача́эта...

Г а с т р ы т. Лёг учора звечара, толькі вочы закрыў, толькі драмаць пачаў — чую, нехта глядзіць на мяне... Во так блізка-блізка нахіліўся і глядзіць... Аж страх за сэрца ўзяў! Вочы расплюшчыў — нікога! Толькі зноў драмаць — глядзіць, падлюга!

Г а н н а. Дык хто ж гэта?

Г а с т р ы т. А каб я ведаў! Насланнё нейкае. Позірк дурны… Здаецца, пранізвае ўсю галаву наскрозь і пад падушку зазірае…

Г а н н а. Адзінота гэта, Мікіта… Мне, калі Піліп памёр, гэткае ж мроілася…

Г а с т р ы т. А мо смерць ужо прыглядаецца, з якога боку за мяне ўчапіцца?

Г а н н а. Мо і яна, касая…

Г а с т р ы т. Ды не, ранавата яшчэ…

Г а н н а. Яно заўсёды ранавата…

Г а с т р ы т. Праз ката гэта ўсё! Збрадлівы, зараза, быў, ганяў я яго, біў, а ён, аказваецца, спакой мой сцярог па начах.

Г а н н а. Чым жа гэта?

Г а с т р ы т. Дыхаў… Падпнецца мне пад бок, клубочкам скруціцца, вурчыць… і дыхае… Куды збег?

Г а н н а. Можа, прыйдзе яшчэ… *(Устала.)* Ну, пайду…

Г а с т р ы т *(рэзка)*. Сядзь!

Г а н н а. У мяне ж каза там…

Г а с т р ы т. Не здохне твая каза… Сядзь! Гаварыць буду…

Ганна села. Чакае. Гастрыт хвалюецца, папраўляе гальштук.

Г а н н а. Ну, чаго ты мылішся, як дзеўка перад сватамі?

Г а с т р ы т *(не адразу)*. Ганна… давай я на табе як-небудзь паджанюся… Га?

Г а н н а. Што-што-што?!

Г а с т р ы т. Ну чаго ты штокаеш? Ты адна, і я адзін… Разам як-небудзь ужо… на гэтым свеце…

Г а н н а. Во спасібачкі! Во ўважыў! Гэта ты мяне заместа ката свайго рыжага да сябе завеш… Каб дыхала…

Г а с т р ы т. Дык і я ж табе дыхаць буду!

Г а н н а. А мышэй мне лавіць у тваёй хаце не трэба будзе?

Г а с т р ы т. Ай, ладна табе! Не хочаш да мяне, я да цябе перайсці магу… Шкода глядзець на цябе… Ледзь ногі валочыш, а ўсё: каза, агарод, соткі…

Непрыкметна выйшаў са свайго двара М у л ь ц і к. Стаў, слухае.

Няўжо ты за сваё жыццё не нарабілася? Адпачні... У мяне грошы на кніжцы ёсць, хату прададзім... Хоць пад старасць пажыві па-людску...

Г а н н а. Смяяцца ж будуць, Мікіта...

Г а с т р ы т. Каму смяяцца? Вёска пустая саўсім... Неперспектыўная. Ні смяяцца, ні плакаць няма каму... Давай перабярэмся ў Займішча? Там асфальт, магазін, сталоўка, людзі... Ты хоць свет убачыш... Пуцёўку мо якую возьмем на курорт... А што? Мы ж з табой за свой век напрацаваліся... Хопіць ужо! Дай супакой рукам сваім... Нашто табе каза, агарод?.. Вядра ды падняць не пад сілу... Гэта вунь Мульцік, дык той і з труны ўстане, каб бульбу выкапаць... Таму што сквапны... Усё б, здаецца, загроб пад сябе... Жылка кулацкая ў чалавеку сядзіць! А мне... Мне нічога не трэба... Ды і табе... Адпачні ты... Га, Ганна? Хоць цяпер парадуйся жыццю, уздыхні на поўныя грудзі... Ты ж зарабіла сабе гэта... Ці праўда?

Г а н н а *(уздыхнула)*. Яно-то так, што казаць... Праўда.

Г а с т р ы т. А грошай нам з табой хопіць, за гэта не бойся... Пражывём...

Г а н н а. Ды нам шмат і не трэба...

Г а с т р ы т. Канечна...

М у л ь ц і к *(злосна)*. Ашалела, баба?!

Г а с т р ы т *(азірнуўся, спалохана)*. Не лезь! Я сватаюся.

М у л ь ц і к *(да Ганны)*. Каго ты слухаеш, бахіла старая?! Курортніца! Адпачываць захацела... Вунь наш курорт, за вёскай, пад бярозкамі... Прыйдзе час — адпачнём! Наляжымся, наспімся, наадпачываемся... А пакуль сілы ёсць хоць каліўца — рабіць трэба, рабіць, рабіць...

Г а с т р ы т. Для каго ёй рабіць?! Яна ж усё жыццё як праклятая, як катаржная...

М у л ь ц і к *(ужо спакойна)*. Ты не зразумееш... *(Да Ганны.)* Варта нам толькі махнуць рукой на ўсё, пачаць пра курорты думаць — смерць усімі кіпцюрамі ўчэпіцца... Ганна, адумайся! Жыць надакучыла?

Г а н н а. Не надакучыла... Стамілася толькі я...

М у л ь ц і к. І я стаміўся... Але мы з табой яшчэ толькі таму і жывём, што кожную раніцу па ваду ў гэты калодзеж ходзім, на сотках сваіх калупаемся... З зямлёй за доўгі век зрасліся, душой-сэрцам увайшлі ў яе, а цяпер па курортах?

Паспрабуй толькі! Хоць адзін дзень паспрабуй паляжаць паленам — усе хваробы як саранча наляцяць…

Г а н н а. Дык во ж на Мікіту нічога не налятае…

М у л ь ц і к. А ён іначай і не жыў… Усё жыццё з чайнікам па ваду хадзіў…

Г а с т р ы т. Я адказным і сазнацельным быў!!!

М у л ь ц і к. У нас адзін адказ: перад зямелькай, на якой стаім… Перад ёй мы адказныя… Кінь, Ганна, я табе сказаў…

Г а н н а. Дык сілоў няма вядро вады падняць! Што ж рабіць?

М у л ь ц і к. Бяры сваю казу за рогі і перавядзі ў мой хлеў… Няма сілы — па палавінцы насіць будзем… Ты палавінку, і я палавінку… Разам…

Г а с т р ы т. Ну і гад ты, Васіль, ну і гад! Я сасватаў, а ён жэніцца! Чаго ж ты яе раней не прасіў?!

М у л ь ц і к. Саромеўся…

Г а с т р ы т. На восьмым дзясятку! *(Да Ганны.)* Пайшлі, не слухай яго. Самому не пад сілу варочаць, дык батрачку сабе захацеў узяць пад старасць. Ты са мной паняй пажывеш…

М у л ь ц і к. Ага, пажыве… толькі адзін тыдзень. А потым хаўтуры панскія будзем рабіць… Хадзі, баба, да мяне! Жыць будзем, як жылі… Памагаць адно аднаму… Адпачываць па святах… І рабіць на зямлі! Трэба так, Ганна, трэба…

Г а с т р ы т. Не слухай яго!

Г а н н а. Ціха, мужчыны… Не сварыцеся… А можа, мы пад адным дахам, у адной хаце ўсе разам сыдземся дый будзем жыць… Я вам бялізну буду мыць, а вы…

Г а с т р ы т. Цьфу! Я ёй руку і сэрца, а яна мне — абшчажыція! Дом прыстарэлых!

Г а н н а. Тады пайду ў свайго Піліпа спытаюся… Калі дазволіць — перайду…

Г а с т р ы т. Як у Піліпа? На кладзішча пойдзеш?

Г а н н а. Нашто? З партрэта спытаюся… Што скажа — тое і будзе.

М у л ь ц і к. Ідзі. Пытайся.

Г а н н а пайшла. Мульцік і Гастрыт касавурацца адзін на аднаго.

Г а с т р ы т. Ну за што? За што ты мяне, Васіль, так ненавідзіш?

М у л ь ц і к. Кінь, Мікіта… Не ўмею я ненавідзець… За восемдзесят гадоў так і не навучыўся…

Г а с т р ы т. Добранькі, значыцца… Хіба можна ў гэтым свеце без нянавісці пражыць?

М у л ь ц і к. Можна…

Г а с т р ы т. Ты ж тры вайны прайшоў!

М у л ь ц і к. Прайшоў… І немцаў біў у партызанах без нянавісці.

Г а с т р ы т. Біў і плакаў?..

М у л ь ц і к. Не, не плакаў… Звярамі людзі сталі, сабакамі шалёнымі… А сабак шалёных забіваць мусіш, каб людзей не пакусалі… Без жалю, але і без нянавісці…

Г а с т р ы т. Нянавісць і святая ёсць…

М у л ь ц і к. Святое ў жыцці толькі святло, цяпло, любоў і зямля…

Г а с т р ы т. Поп ты…

М у л ь ц і к. Мульцік я…

Вяртаецца Г а н н а. Старыя чакаюць адказу.

Г а н н а *(выцершы ражком хусткі вочы)*. Дазволіў… *(Пасля паўзы.)* З табой, Васіль, жыць буду…

Г а с т р ы т *(блазнавата і горка ўсміхаючыся, пляскае ў далоні)*. Гор-ка! Гор-ка! Гор-ка!

З а с л о н а

1. Перад вамі прайшлі карціны (сцэны) першай дзеі (часткі) драмы Аляксея Дударава «Вечар». Падумайце і адкажыце, пра што гэты твор. Як можна коратка, у некалькіх словах, вызначыць сэнс паказанага? Звяжыце змест п’есы з двума папярэднімі творамі, чым яны блізкія, падобныя.
2. Чым адрозніваецца гэты драматычны твор ад лірычнага — верша «Трэба дома бываць часцей» — і эпічнага — апавядання «Дзяльба кабанчыка» — па форме, спосабах паказу жыцця?
3. Ахарактарызуйце аднаго або некалькіх герояў п’есы. Звярніце ўвагу на канкрэтныя выказванні, заўвагі аўтара, іншыя дэталі, якіх у творы шмат. Пачніце з таго, якія імёны-мянушкі дае аўтар сваім героям: Мульцік і Гастрыт. Што азначаюць яны, якія асаблівасці характару гэтых людзей выяўляюць, як перадаюць адносіны да іх з боку аўтара? Якія ў сапраўднасці імёны герояў п’есы?

- Як Мульцік характарызуе Гастрыта, які «праводзіў лінію» ў часы калектывізацыі, пісаў даносы, ананімкі на сваіх аднавяскоўцаў? Чаму Мульцік называе Гастрыта «ідэйным прыдуркам»? Адшукайце ў творы гэтыя мясціны і пракаменціруйце іх.
- Як Мульцік характарызуе Ганну, яе жыццё, усё, што адбылося з яе мужам, дзецьмі, апошнім сынам?
- Навошта Мульцік робіць, здавалася б, зусім непатрэбную работу: выбірае з калодзежа ваду і тут жа вылівае яе?
- Як бы вы растлумачылі сцэну з заяўкай на выкананне па радыё песні для Ганны нібыта ад сына, што знаходзіцца невядома дзе? Хто ў сапраўднасці зрабіў гэту заяўку? Дзеля чаго? Абгрунтуйце сваё меркаванне.
- У другой дзеі п’есы расказваецца, як Мульцік і Ганна жывуць разам. А Гастрыт памірае, раскайваючыся перад тымі, каму прынёс нямала гора і пакут, просячы даравацъ яму ранейшыя паводзіны. Як бы вы пракаменціравалі гэтыя змены ў лёсе герояў? Ці не маюць яны сімвалічнага сэнсу? Чаму памірае (па волі аўтара) менавіта Гастрыт?
- Ці не такі ж сімвалічны сэнс маюць і іншыя моманты твора, пачынаючы з назвы п’есы — «Вечар»? Дзеянне п’есы адбываецца ў розны час сутак: і раніцай, і днём, і ўвечар. Чаму ж аўтар называе п’есу «Вечар»?
- Звярніце ўвагу на тое, як у пачатку п’есы апісваецца калодзежны журавель, што начапляна на яго. Падумайце, як гэтыя розныя прадметы характарызуюць ранейшае і сучаснае жыццё вёскі і герояў. Паразважайце на гэту тэму. Успомніце пра тое, што верш Рыгора Барадуліна таксама пачынаецца з вобраза калодзежнага жураўля, «цыбатага асвера». Ці выпадковыя гэтыя супадзенні ў творах на блізкую тэму?
- Чаму менавіта каля калодзежа адбываецца сцэнка-фантазія, калі героям п’есы мроіцца, як збіраюцца разам іх дзеці, радасныя, вясёлыя, «прагна п’юць самую смачную ваду свайго дзяцінства»? Які сэнс мае згаданая сцэна ў адносінах да галоўнай тэмы і ідэі твора?

4. Напішыце сачыненне, якое будзе складацца з «біяграфій» герояў твора або аднаго з іх.
5. Магчыма, вам давялося паглядзець п’есу ў тэатры або па тэлебачанні. Раскажыце, якое ўражанне выклікала сустрэча з героямі на сцэне ці на экране. Ці супадае гэтае ўражанне з тым, што ўзнікла ў вас пры чытанні твора?

Аляксей Дудараў

КІМ

П'еса для дзіцячага тэатра ў дзвюх дзеях

Дзейныя асобы

К і м
Ю л я
К а р а л ё ў
Л е н а
Х а д з е е ў

ДЗЕЯ ПЕРШАЯ

Столік дзяжурнай сястры ў клініцы. Гарыць лямпа. Позні вечар. К і м і Ю л я.

К і м. Гэты рэцэпт вынайшлі лекары фараонаў у Старажытным Егіпце. Бярэцца 273 чорныя разынкі.

Ю л я. Чаму менавіта 273?

К і м. Пра гэта трэба спытаць фараонаў. Не перапыняйце мяне, мэм... Кожная разынка разразаецца крыж накрыж на чатыры роўныя паловы ў першую гадзіну першай квадры месяца... Дадаецца сем лыжак веснавога, менавіта веснавога, мёду. Усё старанна перамешваецца.

Ю л я. А як перамешваць?

К і м. У сэнсе?

Ю л я. Па стрэлцы гадзінніка ці супраць?

К і м. Супраць. Не менш сямі разоў.

Ю л я. Белая магія.

К і м. Пасля гэтага прыгатаваная маса апраменьваецца на падаконніку месячным святлом.

Ю л я. Колькі?

К і м. Не менш гадзіны. Затым выціскаецца сок з трох лімонаў, зноў перамешваецца.

Ю л я. І зноў сем разоў? І супраць стрэлкі гадзінніка?

К і м. Дзевяць і па стрэлцы! Ужываць па маленькай лыжцы тры разы на дзень да, у час ці пасля яды. Кроў абнаўляецца на самую поўню пры ўмове, што ніводнага разу... ніводнага! Не будзе перапынку ў прыёме лекаў...

Ю л я. І ў час прыёму пацыент не будзе думаць пра белага мядзведзя.

К і м. Вы цынічны, мэм... Менавіта ён вашу кроў і псуе першы... Цыкл пачнем з заўтрашняга ранку.

Ю л я. Няўжо ты сядзеў ноччу і рэзаў на чатыры часткі разынкі... Пад месяцам.

К і м. Яшчэ чаго! Я стамляюся за дзень і мне трэба выспацца, каб усю гэтую araву зранку пабудзіць, памыць, прычасаць, прымусіць заслаць ложкі, накарміць і развесці каго куды... Разынкі крышыў ваш любімчык Піня.

Ю л я. Божа! Ты даў дзіцёнку нож у рукі.

К і м. Я не даваў дзіцёнку ў рукі нож! Ён рэзаў разынкі брытвай. Гэты дзіцёнак — дзіцёнак толькі тады, калі з ім сюскаюцца, як гэта робіце вы, мэм... А са мной, як шоўкавы... Усё робіць! І заўважце, мэм, усё есць... нават пярловую кашу. Варта толькі было вам апынуцца ў клініцы, у яго на наступны ж дзень з'явіўся апетыт і перастаў балець жывоцік... Як бачыце, іншым разам і хвароба на нешта вартая.

Ю л я. А што Баранеса?

К і м. У-у-у! Трагедыя... Учора вярнулася са школы, залітая слязьмі, як дажджом...

Ю л я. Што здарылася?

К і м. Тройка па літаратуры!

Ю л я. І што?

К і м *(дражніць)*. Мой тата — паэт, а ў мяне тройка па літаратуры!

Ю л я. Што ты ёй сказаў?

К і м. А я сказаў, што ў мяне тата — дэсантнік, парашутыст, а я з другога паверху вышыні баюся... Галава кружыцца...

Ю л я. І што?

К і м. Зарагатала. Усё, мэм! Позна, мне рана ўставаць... Заўтра зранку адну лыжачку...

Ю л я. За што ты купіў разынкі і мёд?

К і м. Эканомія...

Ю л я. Кім!

К і м. Што Кім? Што Кім? Мы зарабілі! Мы з Пінем працавалі...

Ю л я. Дзе?!

К і м. Упрыгожвалі парк...

Ю л я. Зноў?!

К і м. Мэм! Мы прыбіралі парк!

Ю л я. Зноў?

К і м. Мэм! У вас «предрассудки»... Дарэчы, «предрассудки» з двума «с».

Ю л я. Не!

К і м. Няўжо з адным?

Ю л я. Не! Забабоны пішуцца без «с»!

К і м. Не можа быць...

Ю л я. Я ж цябе прасіла...

К і м. Што я зрабіў дрэннага? З Пінем. Мы прыбіралі парк пасля свята, там было шмат бутэлек. Я хацеў іх выкідваць, але ваш Піня, мэм, хадзіў за мной як хвост і талдычыў: «Сто ты! Сто ты? Зацэм? Зацэм? Здадзім, здадзім!» Я б не дадумаўся! Ну такі расце прашчалыга, такі круцель... Уяўляеш, стаміліся, селі адпачываць, я адвярнуўся на хвілінку, прыходжу. Сядзіць на лавачцы, ну, такі няшчасны, такі бедны, такі галодны... Між іншым, ідучы ў парк, ён з'еў банку тушонкі і во такую талерку пярлоўкі, а тут... Зрабіў такі выгляд, быццам яго ад дня нараджэння ніхто ніколі нічым не карміў. І шапачка побач. І ў шапачку ўжо накідаць паспелі... Я яго ледзь не забіў! *(Дражніць.)* А сто я зрабіў? Сто я зрабіў? Я стаміўся! Я заснуў! Сапацка звалілася. А цаго яны туды гросы кідалі? Я не прасіў! І сапраўды ж не прасіў, паразіт!

Ю л я. Кі-ім...

К і м. Калі ў Баранесы бацька паэт, то ў гэтага... Я не ведаю... Банкір, мабыць.

Ю л я. І ты не выкінуў іх?

К і м. Каго?

Ю л я. Грошы...

К і м. Мэм, мне здаецца, што вы лечыцеся не ў той клініцы... Грошы выкідваў толькі герой Дастаеўскага... У якім гэта рамане?

Ю л я. «Ідыёт»...

К і м. Правільна, раман «Ідыёт»! Дарэчы, вы зноў дзяжурыце, а Джульета ў садзе на спатканні?!

Ю л я. Я ўсё адно не сплю... Якая розніца, дзе не спаць?

К і м. Я пайшоў. Баранеса без мяне не засынае.

Ю л я. А Піня?

К і м. Фу-у, гэты прачынаецца толькі затым, каб паесці, а есці толькі затым, каб адразу заснуць. Значыць, заўтра адну лыжачку ў час сняданку. Халадзільнік тут ёсць?

Ю л я. Ёсць.

К і м. Трымаць у халадзільніку.

Зумер сігналізацыі.

Ю л я. Пабудзь ля тэлефона. Пятая палата выклікае. Я хутка!

Выходзіць. З'яўляецца Л е н а.

Л е н а. Салют, Кім!

К і м. Сястра, вас у даўнія часы называлі сёстрамі міласэрнасці... А што робіце вы?

Л е н а. Што я раблю?

К і м. Нават дыктатарскія рэжымы забараняюць выкарыстоўваць працу непаўналетніх. А вы выкарыстоўваеце працу хворых.

Л е н а. Не дуры галавы!

К і м. І дзеля чаго?! Каб бегаць у парк і цалавацца пад плакатам «Осторожно — СПИД!»

Л е н а. Адкуль ты ведаеш?

К і м. Гэта ведаю не я. Гэта ведаюць усе, хто праходзіў па тратуары каля клінікі. А ці ведаеце вы, сястра, што па апошніх даследаваннях вучоных Занзібара пацалункі на рабочым месцы аказваюць неспрыяльны ўплыў на нервовую сістэму, а ў Амерыцы...

Л е н а. Ой, дэмагог!

К і м. А ў Амерыцы за пацалунак у офісе пагражае турэмнае зняволенне...

Л е н а. Пайшоў к чорту! Дзе Юля?

К і м. Мэм адпрацоўвае вашу разбэшчанасць. Мяняе заместа вас хвораму судна.

Л е н а. У якой палаце?

К і м. У пятай...

Л е н а. Будзь здароў, акселерацік!

К і м. Лена!

Л е н а. Што?

К і м. Як яна?

Л е н а. Складана, Кім, складана…

К і м. Аналізы не палепшыліся?

Л е н а. Горшымі сталі… Толькі ёй не кажы. Яна не ведае…

К і м. Яна адчувае…

Л е н а. Патрэбна аперацыя.

К і м. І колькі яна каштуе?..

Л е н а. Чорт яе ведае… Дарага, канечне…

К і м. Даведайся, калі ласка.

Л е н а. Добра. Пайду яе падмяню…

К і м. Скажы, што я пайшоў. І прасачы, каб яна заўтра абавязкова прыняла маю сумесь. Чао!

Л е н а. Будзь здароў.

Разыходзяцца. Праз нейкі момант з’яўляецца К а р а л ё ў, прыціскаючы адну руку да сэрца, а ў другой трымаючы пісталет. Левае крысо пінжака запэцкана крывёй. Уваходзіць Ю л я.

Ю л я. Божа!

К а р а л ё ў. Памажы мне…

Ю л я. Я паклічу доктара!

К а р а л ё ў. Назад! *(Наводзіць на Юлю пісталет.)* Нікога не клікаць! Ты зразумела?

Ю л я. Зразумела.

К а р а л ё ў. Крыві баішся?

Ю л я. Не.

К а р а л ё ў. Хадзі сюды! Вазьмі пінцэт… не той, большы! Там тырчыць куля…

Ю л я. Дзе?

К а р а л ё ў. У грудзях. Насупраць сэрца. Дастань яе.

Ю л я. А… бачу!

К а р а л ё ў. Зачапі пінцэтам і цягні!

Ю л я. Вам жа будзе балець!

К а р а л ё ў. Цягні, дура!

Юля *(спрабуе нешта зрабіць)*. Не атрымліваецца! Яна паміж рэбраў засела.

К а р а л ё ў. Цягні!

Ю л я. Пінцэт зламаўся!

К а р а л ё ў. Пашукай пласкагубцы…

Ю л я. Гэта клініка! Адкуль тут пласкагубцы? Я паспрабую зубамі…

К а р а л ё ў. Ты што?!

Ю л я. Рукі!

Каралёў адводзіць рукі, Юля схіляецца над ім і зубамі выцягвае з грудзей кулю. Каралёў стогне.

К а р а л ё ў. Дай сюды…

Ю л я. Я зараз кроў спыню…

К а р а л ё ў. Дай сюды кулю! Прапалашчы рот вадой. Яна атручаная… А кроў спыняць не трэба. Хай атруту вымывае… Прапалашчы рот вадой! Куля атручаная! Ты што не баішся?

Ю л я. Не.

К а р а л ё ў. Ну і чорт з табой! Каб не партманет у левай кішэні — каюк! Партманет уратаваў…

Ю л я *(дастае з пінжака маленькую кніжачку)*. Гэта не партманет…

К а р а л ё ў. А што?

Ю л я. Біблія…

К а р а л ё ў. Уроды…

Офіс Хадзеева. Уваходзіць К а р а л ё ў.

Х а д з е е ў. Ты?!

К а р а л ё ў. Я пригласил вас, господа, с тем, чтобы сообщить пренеприятное известие: Бог, оказывается, есть.

Х а д з е е ў *(пасля паўзы)*. Гэта… ты?

К а р а л ё ў. Я… Толькі давай так… галаварэза свайго не мачы… Ён зрабіў усё як мае быць. Маэстра! Два сантыметры ніжэй левага саска пацэліў. Зірні.

Х а д з е е ў. Адкуль ты?

К а р а л ё ў. Я спадзяюся, ты здагадаўся, што не з морга. Але і не з пракуратуры. Як у цябе справа з атэізмам? Мае светапогляды пахіснуліся… Паўгода таму, каб адчапіцца ад надакучлівых манашак, я купіў ім машыну цэглы, а яны мне падаравалі *(дастае з кішэні кніжачку, чытае)* «Новы запавет» Госпада нашага Ісуса Хрыста. Новы пераклад з грэчаскага арыгінала. Твой абармот яго прастрэліў… Наскрозь. Я панёс матэрыяльныя страты, Халдзей!

Х а д з е е ў. Я — Хадзееў…

К а р а л ё ў. Мне ўсё адно. Святыя сёстры падарылі мне кніжку, а я не магу яе пачытаць, бо ты мне яе сапсаваў. Яна прабіта атручанай куляй і залітая маёй крывёй… Я не магу

яе пачытаць!!! Дык вось, гэта… гэта мой тавар… вось гэтая кніжачка... Я яе мяняю на тое, што я табе вінен… Я так яе ацаніў! Яна столькі каштуе!

Х а д з е е ў. Не псіхуй!

К а р а л ё ў. Ты згодны на абмен?

Х а д з е е ў. Ты ж прыйшоў адзін…

К а р а л ё ў. Адзін! Ты згодны на такі абмен?

Х а д з е е ў. Згодны.

К а р а л ё ў. Слова!

Х а д з е е ў. Слова.

К а р а л ё ў *(аддае яму пісталет)*. На, я прыйшоў адзін, ён зараджаны. Ты можаш мяне застрэліць. Я асуджаны. Але перад смерцю прашу выканаць маё апошняе жаданне. Відак працуе?

Х а д з е е ў. Працуе…

К а р а л ё ў. Хачу мульцікі перад смерцю паглядзець…

Дастае з кішэні відэакасету, устаўляе ў відэамагнітафон.

Уключы… *(Хадзееў уключае.)* Дзень першы, пасля таго, як ты мяне хацеў замачыць… Ды там дата стаіць, ты бачыш… Та-а-к… Вось тваю Зайку выводзіць з дома ахоўнік… Ты здымаеш для яе катэдж у Баравусе… Азёрная, 4… Глядзі, глядзі… Вось ён адчыняе машыну. Зараз на яе шапачцы чырвоненькая кропачка з’явіцца… Ведаеш, што гэта? Лазарны прыцэл! Та-а-ак… Элітарны ліцэй… тысяча баксаў у месяц. Урок па прадмеце «Чалавек і свет»… Зараз наезд будзе… Воо-сь… Гэта праз акно здымалі… Вунь Зайка сядзіць на другой парце… Уй, які банцік! А на банціку бачыш чырвоненькую кропачку… О, о! Настаўніца занепакоілася… Заўважыла! Але падумала, што нехта з вучняў забаўляецца лазарным ліхтарыкам… І быў дзень, і быў вечар… Дзень другі… Глядзім…

Х а д з е е ў *(кідаецца да Каралёва)*. Ты… ты… скаціна… Калі з ёй што-небудзь… Калі хоць адна валасінка… Я… я цябе…

К а р а л ё ў. Што? Што ты мяне? Я ж табе пісталет аддаў! Ты думаеш, я гарбатага ляплю… Дай сюды! *(Забірае пісталет.)* Якая ў цябе тут самая каштоўная ваза… А, вунь! *(Прыцэльваецца, страляе. Ваза разлятаецца на кавалкі.)*

Бачыў? На! Там яшчэ шэсць патронаў засталося. Стаць да сценкі? Ці мо ў ванную пройдзем? Га? Ні храна ты са мной не зробіш і нічым не дастанеш… Я — адзін… У мяне нікога. Нікога. Зразумеў, Халдзей?

Х а д з е е ў. Я — Хадзееў…

К а р а л ё ў. Хадзееў! Ты мяне цяпер ахоўваць будзеш… Варта толькі мне знікнуць. Знікнуць на адзін дзень, і банцік тваёй Зайкі будзе сапсаваны… Той самай куляй, што прабіла гэту кніжачку! І нідзе ты яе не схаваеш! Яе дастануць, нават на Канарах! Ты б ужо спраўляў па ёй дзевяць дзён, каб не прыдуркаватая медзічка з клінікі, якая зубамі дастала кулю з маіх грудзей! Яна на каленях прасіла мяне не рабіць гэтага, бо мяне ўратаваў сам Бог, паклаўшы ў маю кішэню гэтую кніжачку! Так што давай грошы на свечку… Я не жартую… Грошы на тоўстую-тоўстую свечку!

Х а д з е е ў. Хопіць?

К а р а л ё ў. Хопіць. Хаця не! Я прыехаў сюды на таксі… Давай і за таксі. А сам чытай знявечанае пісанне і малі Бога, каб мне на галаву не звалілася цагліна, каб не збіла машына, каб не прыхапіў інфаркт, каб я не атруціўся ў рэстаране чым-небудзь… Таму што кветкі з маёй магілы можна будзе ўскласці на магілу тваёй Зайкі. Завянуць не паспеюць.

Бар. За столікам Ю л я. Перад ёй бакал. З'яўляецца К і м.

К і м. Тут холадна, мэм, я прынёс вам кофту.

Ю л я. Дзякую…

К і м. Вы сваёй сумнай постаццю нагадваеце нешта з імпрэсіяністаў. О! «Абсент» Ван Гога.

Ю л я. «Абсент» у Гагена. Двойка.

К і м. Дарэчы, што такое абсент?

Ю л я. Алкагольны напой на палыне. Яшчэ адна двойка.

К і м. Я непаўналетні і маю законнае права гэтага не ведаць.

Ю л я. Калі непаўналетні, няма чаго швэндацца вечарам па барах…

К і м. Я прынёс вам кофту, няўдзячная! І заадно паведаміць, што сям'я хвалюецца і хоча ведаць, ці хутка вы з'явіцеся дадому. Малым класціся спаць, ці вас яшчэ можна дачакацца?

Ю л я. Ідзі. Я хутка.

К і м. Праз паўгадзіны я вас чакаю каля пад'езда.

Ю л я. Добра.

К і м. Я пайшоў.

Выходзіць. З'яўляецца К а р а л ё ў.

К а р а л ё ў. Што адзначаеш, прыгожая?

Ю л я. Свята...

К а р а л ё ў. Чаму адна?

Ю л я. Так.

К а р а л ё ў. А якое ў цябе свята?

Ю л я. Не ў мяне асабіста, ва ўсіх. Няўжо не чулі? Сёння дзень закаханых...

К а р а л ё ў. А-а-а, нешта чуў... Людзі ўсё, чым толькі ні займаюцца на зямлі, якой бы брыдотай ні займаліся, усё хочуць звязаць, знітаваць з нябёсамі... Са святымі. Як яго?

Ю л я. Дзень святога Валянціна...

К а р а л ё ў. Гэта яшчэ нічога... А ты ведаеш, што ў ракетчыкаў... ну ў тых, што з ядзернымі боегалоўкамі... таксама ёсць свая святая. Чэснае слова! Святая Варвара... Варррварррa... Смешна?

Ю л я. Не.

К а р а л ё ў. І мне не смешна. А ты што, закаханая?

Ю л я. Так.

К а р а л ё ў. І хто ён?

Ю л я. Мужчына.

К а р а л ё ў. Ты вельмі прыгожая...

Ю л я. Дзякую.

К а р а л ё ў. Плюнь на свайго п'яніцу... і паехалі да мяне.

Ю л я. Не магу.

К а р а л ё ў. Ты мне падабаешся... Ты мне некага нагадваеш нават...

Ю л я. Ну маці, вядома, так звычайна гавораць.

К а р а л ё ў. Паслухай, у мяне ніколі не было ні маці, ні бацькі, і я прашу на гэтую тэму не жартаваць!

Ю л я. Скуль жа я ведала? Даруйце...

К а р а л ё ў. Ну во... ты зноў мне падабаешся. Паедзем да мяне... У маёй спальні шкляная столь... Уяўляеш? Ты спіш, а над табой свецяць зоркі... Я аднаго разу метэарыт

бачыў… Так жу-ух праляцеў справа налева… Ну што табе твой п’яніца? Га? І чаму вы, жанчыны, любіце толькі прыпыленых, няўдачнікаў і альфонсаў, якія корчаць з сябе «непонятых гениев»…

Ю л я. Гэта да яго не падыходзіць.

К а р а л ё ў. Дык хто ён?

Ю л я. Бандзюга дурны…

К а р а л ё ў. Калі бандзюга ды яшчэ дурны, ты хутка ўдавою будзеш… Такія доўга не жывуць.

Ю л я. Мабыць.

К а р а л ё ў. Мяркуючы па тым, як ты апранута, ён не надта і клапоціцца пра цябе…

Ю л я. Зусім не клапоціцца…

К а р а л ё ў. Ну дык…

Ю л я. Я яго кахаю…

К а р а л ё ў. Паехалі!

Ю л я. Не.

К а р а л ё ў *(дастае з партманета некалькі зялёных банкнотаў, кладзе іх на бакал)*. Ладна, давай так… Я пайду за шампанскім, а ты за гэты час пе-ра-ду-ма-еш… О’кэй…

Ю л я *(б’е Каралёва па шчацэ і выходзіць)*.

К а р а л ё ў *(ашалела)*. Яна ўдарыла мяне… Яна мяне ўдарыла… *(Машынальна бярэ бакал Юлі і выпівае.)* Якая гадасць!

Дом Каралёва. Раніца. Каралёў у вопратцы спіць на падлозе. Валяюцца бутэлькі, паміж імі сотавы тэлефон. Ён і звініць. Доўга звініць. Каралёў прачынаецца, бярэ тэлефон.

К а р а л ё ў. Слухаю… Які пацан? А колькі яму гадоў? Ну, прыкладна! Праверылі ўсё? Хай заходзіць…

Каралёў знаходзіць недапітую бутэльку, налівае ў бакал, п’е. Уваходзіць К і м, трымаючыся за нос.

К і м. Дзень добры…

К а р а л ё ў. Салют! Што скажаш?

К і м. У вас сурвэткі няма?

К а р а л ё ў *(дастае насоўку)*. На… І што з табой?

К і м. Капіляры знаходзяцца блізка каля сценкі носа… Пры нязначным узрастанні напружання лопаюцца… Гэта

ў мяне з дзяцінства… сястра кажа, што калі мне паказаць здалёк кукіш, у мяне з носу пальецца кроў.

К а р а л ё ў *(бярэ тэлефон, націскае кнопку)*. Навошта ты яго біў?

К і м. Ён мяне не біў!

К а р а л ё ў. Заткніся! *(У трубку.)* Я цябе пытаюся, урод, навошта ты яго біў? Ах, проста нос паміж пальцамі сціснуў… *(Да Кіма.)* Колькі табе гадоў?

К і м. Трынаццаць.

К а р а л ё ў *(у трубку)*. Выйдзеш за вароты і па перыметру абыдзеш дом… *(Да Кіма.)* Колькі табе гадоў, ты казаў?

К і м. Трынаццаць.

К а р а л ё ў *(у трубку)*. Абыдзеш дом трынаццаць разоў на кукішках! На кортачках, урод!

К і м. Прабачце, я пайду…

К а р а л ё ў. Табе шкада яго?

К і м. Шкада.

К а р а л ё ў *(у трубку)*. Адбой: ён табе амністыю абвясціў… Не я, а ён! *(Кідае тэлефон.)*

К а р а л ё ў *(налівае)*. З твайго дазволу… *(П'е.)* Цяпер кажы, хто ты…

К і м. Я ваш сын…

К а р а л ё ў. Яшчэ раз.

К і м. Я ваш сын…

К а р а л ё ў. Вельмі прыемна, сынуля…

К і м. Мне таксама.

К а р а л ё ў. За сустрэчу! *(П'е.)* Калі б ты ведаў, як я цябе доўга шукаў. Ты, канечне, сынок, бедны, няшчасны, адзінокі, табе няма чаго есці і табе трэба грошы… так?

К і м. Не зусім. Я не сірата, не бедны, не адзінокі, мне ёсць што есці і ёсць дзе жыць… А вось грошы мне патрэбны. Тут вы здагадаліся.

К а р а л ё ў. Колькі?

К і м. Пяцьдзясят тысяч.

К а р а л ё ў. Ну, мужык, ты сціплы…

К і м. Я пра долары…

К а р а л ё ў. Тады «ой»! Ты сапраўды мой сын. Па размаху. Цябе мамка паслала?

К і м. Мама памерла дзесяць гадоў таму.

К а р а л ё ў. А як яе звалі?

К і м. Эльвіра.

К а р а л ё ў. А дзе мы з ёй… сустракаліся?

К і м. На фестывалі моладзі і студэнтаў… Вы тады былі намеснікам старшыні Саюза моладзі.

К а р а л ё ў. Колькі табе гадоў?

К і м. Вы пыталіся ўжо два разы… Трынаццаць.

К а р а л ё ў. А-а-а… Так, так… І з кім ты жыў?

К і м. Жыў я ў дзетдоме, бо ў мамы таксама нікога з блізкіх не было… Дом знаходзіўся ў Расасенцы. Калі здарылася Зона, дзетдом рассялілі па ўсёй рэспубліцы… Я цяпер жыву тут, у сямейным дзіцячым доме.

К а р а л ё ў. І як ты пра мяне даведаўся?

К і м. Ваша інтэрв'ю было ў «Дзелавой газеце».

К а р а л ё ў. Ну ясна. А яна што расказвала табе пра мяне і ты ўсё запомніў… Калі яна памерла?

К і м. Я ж казаў… дзесяць гадоў таму.

К а р а л ё ў. І ты нешта запомніў з таго, што яна табе расказвала… пра мяне? У такім узросце?

К і м. Яна амаль нічога не расказвала… Толькі перад смерцю прашаптала: «Фестываль. Тваё імя — твой бацька…»

К а р а л ё ў. Чыё імя?

К і м. Маё.

К а р а л ё ў. А як цябе завуць?

К і м. Кім…

К а р а л ё ў. Пры чым тут я?

К і м. Вы знаёмы з абрэвіятурай? Назавіце сябе і зразумееце…

К а р а л ё ў. Называю: Каралёў… І што?

К і м. Поўнасцю…

К а р а л ё ў. Каралёў Ігар Міхайлавіч… І што? А-а-а… Крута… Кім атрымліваецца… Толькі няўвязачка з прозвішчам па бацьку. Справа ў тым, што мяне на вакзале некалі знайшоў сяржант міліцыі… Мая мамачка пакінула мяне на падаконніку… Прозвішча ў сяржанта было Міхайлаў… Так я стаў Міхайлавічам.

К і м. А чаму Каралёў?

К а р а л ё ў. Тады ўсе шызелі ад касманаўтыкі…. Акурат на тым тыдні памёр славуты генеральны канструктар…

К і м. А Ігар?

К а р а л ё ў. А вось гэтага не ведаю… Можа нянечка якая ахрысціла, а можа клапатлівая матуля запіску пакінула… Не ведаю.

К і м. Даруйце…

К а р а л ё ў. Усё пуцём, Кім! Дык ты кажаш мой сын? І прыйшоў па аліменты? Лады, Кім… Толькі давай так… Колькі ты заяўляў?

К і м. Пяцьдзясят тысяч.

К а р а л ё ў. Замётана. Тры нулі закрэсліваем і… Атрымай і распішыся!.. *(Падае купюру.)*

К і м. Мне столькі не трэба.

К а р а л ё ў. Маеш рацыю. За геніяльную прыдумку трэба дадаць яшчэ… *(Дастае яшчэ купюру.)*

К і м. Бывайце…

К а р а л ё ў. Чакай! Што ты сабе хочаш купіць? Велік? Камп'ютар?

К і м. Я нічога не хачу купіць. Мне патрэбна пяцьдзясят тысяч долараў.

К а р а л ё ў. На меншае ты не згодны?

К і м. Не.

К а р а л ё ў. Я балдзею ад цябе… Ну ты ж разумны, мужык… Табе не смешна? Я прачынаюся з пахмелу, заяўляешся ты і… здравствуйте, я ваша тётя! Не тётя, а сын! Сын! І за гэту хохму ты хочаш атрымаць пяцьдзясят тысяч баксаў… Навошта яны табе?

К і м. Асабіста мне непатрэбна ані цэнта. Такія грошы трэба маёй сястры… На лячэнне.

К а р а л ё ў. Гэта яна цябе паслала?

К і м. Не.

К а р а л ё ў. І колькі ёй?

К і м. Дваццаць два.

К а р а л ё ў. Клас! Значыць, у мяне і дачка зусім дарослая! Ну раз ты мой сын, а яна твая сястра... Колькі кажаш? Дваццаць два? А-а-а, помню, помню… Я тады ў пяты клас хадзіў, а яна нарадзілася перад самымі вясеннімі канікуламі… Мяне завуч з дырэктарам павіншавалі і адпусцілі з урокаў у раддом.

К і м. Бывайце.

К а р а л ё ў. Стаяць! Я цябе яшчэ не адпусціў. Кажы, хто і навошта цябе прыслаў да мяне?

К і м. Мяне ніхто не прысылаў… Мая сястра хворая. Мне патрэбны грошы, каб вылечыць яе...

К а р а л ё ў. Якая к чорту сястра, калі ты сцвярджаеш, што ты мой сын!

К і м. Канечне, яна не родная мне. Калі здарылася Зона і дзетдом рассялілі, яна ўзяла мяне, Піню і Баранесу на выхаванне… Мэрыя выдзеліла трохпакаёвую кватэру. Гэта называецца сямейны дзіцячы дом. Яна нас усынавіла і ўдачарыла…

К а р а л ё ў. А цяпер ты хочаш, каб я яе ўмацярыў, аж на пяцьдзясят тысяч баксаў?!

К і м. Яна захварэла! Гэта пасля Зоны!.. І калі не будзе грошай, яна памрэ! І нас расселяць па дзіцячых дамах! Я — нічога… Прывыкну… А вось Піня з Баранесай…

К а р а л ё ў. Хто такія Піня з Баранесай?

К і м. Дзеці. Хлопчыку пяць, дзяўчынцы тры…

К а р а л ё ў. Яны таксама ад мяне?

К і м. Пусціце!

К а р а л ё ў. Не, пачакай…

К і м. Я больш нічога не скажу!

К а р а л ё ў. Я скажу, сынуля… Мяне сентыментальнымі байкамі разжалабіць не атрымаецца… Па-першае, я сам хапануў за жыццё вось так і болей, але я ніколі не быў няшчасненькім. Ніколі! Галодным быў! Прыніжаным быў! Бітым быў! У адчаі да слёз гарачых быў! Але няшчасненькім ніколі! Ні-ко-лі!

К і м. Не ва ўсіх жа клыкі, як у ваўка.

К а р а л ё ў. Ты як з бацькам размаўляеш, гадзёныш!

К і м. Даруйце.

К а р а л ё ў. Гэта першае. А па-другое, сын мой, калі чалавек пакутуе, значыць, Госпадзь Бог яго за нешта пакараў! Ён адпрацоўвае свае грахі… І калі я буду аблягчаць яго долю, хоць самую горкую, значыць уступлю ў канфлікт з самім Богам! А з гэтым паханам лепш не спрачацца…

К і м. Вы падвялі пад сваё злое існаванне прымітыўную філасофскую базу і гэтым апраўдваеце свае абыякавыя адносіны да ўсяго і ўся… І ў першую чаргу да сябе самога…

К а р а л ё ў. Чаму ты раней да мяне не прыходзіў?!

К і м. Таму што маці, паміраючы, сказала: «Кім, дай мне слова, што звернешся да яго толькі тады, калі не будзе выйсця, калі будзе тупік. Я яго кахаю і не хачу, каб хоць нечым ён быў у жыцці засмучаны». У мяне цяпер тупік. Калі яна памрэ, я згублю сям'ю... І дзеці згубяць яе... А так я ніколі б да вас і не звярнуўся і не падышоў...

К а р а л ё ў. Чаму?

К і м. Ваўкоў баюся.

К а р а л ё ў. Ты зноў?!

К і м. Даруйце...

К а р а л ё ў. Ты разумееш, усё, што ты прыдумаў, абсалютна неверагодна...

К і м. Таму гэта і праўда! Хлусню вы па свайму вопыту павінны ведаць...

К а р а л ё ў. Зноў?!

К і м. Дык вось, хлусня неверагоднай не бывае! Яна заўсёды апранае былое адзенне праўды...

К а р а л ё ў. Слухай ты, Спіноза, я б цябе мог проста выгнаць...

К і м. Я б даўно сам пайшоў, вы ж не пускаеце мяне...

К а р а л ё ў. Мне раскалоць цябе — раз плюнуць...

К і м. Каліце...

К а р а л ё ў. У цябе фота маці ёсць?

К і м. Цяпер няма... Калі здарылася Зона і нас вывозілі, рэчы браць забаранілі...

К а р а л ё ў. Ну а ты памятаеш яе? Пазнаў бы на здымку?

К і м. Канечне.

К а р а л ё ў. Не пашчасціла табе, сынуля... Рэч у тым, што ў мяне захаваўся здымак усёй дэлегацыі, якая ездзіла на фестываль... Зараз... *(Дастае з шуфляды стала здымак у рамачцы.)* Вось, іншым разам зірну, каб збегаць на спатканне са сваім юнацтвам. На, зірні і ты... Падкрэсліваю, тут уся дэлегацыя. Уся! Гэта мы на Краснай плошчы пасля паходу ў Маўзалей. Мяне пазнаў... Вось я ў цэнтры абдымаю дзвюх прыгажунь... Якая з іх твая мама?

К і м. Ні тая, ні тая...

К а р а л ё ў. Правільна. Адна з іх цяпер жонка камандуючага пагранвойскамі, а гэта працуе дыктарам радыё... Жывыя, здаровыя... ну а дзе ж твая нябожчыца-маці?

К і м. Здымак вельмі дробны…

К а р а л ё ў. А я табе лупу дам. На! Шукай…

Кім *(паводзіць лупай па здымку)*. Вось яна…

К а р а л ё ў. Дзе?

К і м. Пятая злева ў другім радзе…

К а р а л ё ў. Пакажы, пакажы… *(Бярэ здымак, потым вырывае з рук у Кіма лупу, уважліва разглядае.)* Дык як ты кажаш яе звалі? Эма?

К і м. Эльвіра… дайце, калі ласка, вады…

К а р а л ё ў. Ты так расхваляваўся?

К і м. Мне лякарства трэба запіць…

К а р а л ё ў. Не толькі сястра, і ты хворы?..

К і м. Прафілактыка. Пасля Зоны…

К а р а л ё ў. Можа мінералкі?

К і м. Проста вады. З-пад крана.

К а р а л ё ў. Зараз…

К а р а л ё ў выходзіць імкліва. Выходзіць і К і м. Вяртаецца са шклянкай К а р а л ё ў.

А ў якой школе ты вучышся? Гэй! Ты дзе? Кім!

Бярэ тэлефон, набірае нумар.

Зараз будзе выходзіць пацан, не выпускай яго… Як выпусціў?! І машыну даў?! Ты… А калі б ён сказаў, каб ты мне галаву адрэзаў, ты б і гэта зрабіў, уррод! Пазвані ў машыну і скажы… Лёня без мабільніка?! Усё! Не пападайся мне сёння на вочы, прыдурак!!!

Ходзіць па пакоі, трымаючы перад сабой здымак. Задуменна спыняецца. Бярэ са стала насоўку, што пакінуў Кім.

Ды не… Лухта ўсё гэта! Лух-та!

Клініка. За столікам Ю л я і Л е н а. Вечар.

Л е н а. Ты зноў сабралася ў бар?

Ю л я. Так…

Л е н а. І што ты там робіш?

Ю л я. Гляджу на яго.

Л е н а. Дзіўлюся…

Ю л я. Я сама дзіўлюся… Мне даўным-даўно нехта салодкага кіпеню ў душу лінуў… Плыву… Прыходжу ў бар

і чакаю... Ён з'яўляецца і пачынае напівацца... Кожны дзень... Ты ўяўляеш? Кожны дзень!.. Потым сядзіць у кутку за столікам, смаліць. З выгляду круты-круты, а я бачу ў ім дзіцёнка, што выйшаў пагуляць на перон, а цягнік з бацькамі пайшоў... Ты разумееш, ён плача...

Л е н а. Не выдумляй. Такія не плачуць.

Ю л я. Плача! Ён плача нават тады, калі смяецца...

Л е н а. У цябе аналізы палепшыліся.

Ю л я. Яго ніхто ніколі не любіў...

Л е н а. Ты ведаеш, што нас, жанчын, у адносінах да мужыкоў падзяляюць на тры катэгорыі: сёстры, жонкі, маці...

Ю л я. Адкрыла Амерыку...

Л е н а. Ды не ў прамым сэнсе! Як характар, як від... Сёстры строгія, сухаватыя і прагматычныя. Не раўнуюць. Жонкі раўнівыя, больш чуллівыя, аднак таксама патрабавальныя і строгія... Ну і мамачкі... Чым болей сыночак гадасцей робіць, тым больш яго любяць. Чым больш падоністы, тым даражэйшы. Ты — тыповая мама...

Ю л я. А ты?

Л е н а. Я і па прафесіі і па натуры — сястра... Большага мужчыны не заслугоўваюць! Ты калі пазнаёмішся з ім...

Ю л я. Ужо пазнаёмілася...

Л е н а. І што?

Ю л я. Да сябе запрашаў. У яго спальня са шкляным дахам... Спіш, а на цябе зоркі свецяць...

Л е н а. Дык ты хадзіла?!

Ю л я. Ты з глузду з'ехала! Як гэта я пайду.

Л е н а. Ты ж казала, што кахаеш...

Ю л я. Кахаю.

Л е н а. Чаму ж не пайшла?

Ю л я. А ты б пайшла за трыста долараў?

Л е н а. Ён табе яшчэ і трыста долараў даваў?!

Ю л я. Прапаноўваў. Ну скажы, ты б пайшла?

Л е н а. Калі б кахала, якія пытанні!

Ю л я. Ой, не выпендрывайся ты... Як гэта называецца, ты ведаеш...

Л е н а. Ведаю! Але я як медык, мілая, яшчэ нешта ведаю... Быў у маёй практыцы выпадак, калі праблемы такія ж, як і ў цябе, у адной дзяўчынкі адышлі самі па сабе, без медыкаментаў.

Ю л я. І што з ёй здарылася?

Л е н а. Што з усімі намі рана ці позна здараецца. Зацяжарыла...

Ю л я. І што?

Л е н а. Арганізм складаны камп'ютар... Нешта ў ім шчоўкнула — праз тры месяцы з уліку знялі. А ўжо рукой на яе ўсе махнулі...

Ю л я. Значыць, яна кахала і ён кахаў...

Л е н а. У гэтыя дэталі я не ўнікала.

Ю л я. Іначай нічога б не адбылося...

Л е н а. Можа. Не затрымлівайся.

Ю л я. Добра... *(Выходзіць.)*

З'яўляецца К і м.

К і м. Яна зноў пайшла?

Л е н а. Вітацца трэба.

К і м. Хэлло!

Л е н а. Чао, бамбіна!

К і м. Па-французску трэба казаць «гутэн таг». Чаму ты яе зноў адпусціла швэндацца па начным горадзе?

Л е н а. А ты раўнуеш?

К і м. Яна мая сястра, і я за яе непакоюся. Рэўнасць жа, як вам, мабыць, вядома з сусветнай літаратуры, бывае толькі да маці... Вы Сафокла чыталі?

Л е н а. Слаўны з цябе мужчына атрымаецца, Кім...

К і м. Не падлізвайцеся...

Л е н а. Не, сур'ёзна. Быў бы ты гадоў на пятнаццаць старэйшы, я б выйшла за цябе замуж.

К і м. Быў бы я гадоў на пятнаццаць старэйшы, я б з'еў каля загсу свой пашпарт, а з табой не ажаніўся...

Л е н а. Паччаму?

К і м. Ты спазнялася калі-небудзь на цягнік?

Л е н а. На цягнік не... Затое я заўсёды спазняюся на спатканні.

К і м. Вы гэта робіце знарок, міс! І на спатканні вы не спазняецеся, я ведаю... Вы прыходзіце іншым разам раней за вашага амаранта і з-за вугла назіраеце, калі з'явіцца ён, а потым цярпліва вытрымліваеце пяць-сем хвілін і...

Л е н а. Нахабнік!

К і м. ...і з лёгкадумным выглядам заяўляецеся. Ах, я зноў спазнілася!

Л е н а. Усё, надакучыў!

К і м. Вы гублялі калі-небудзь грошы?

Л е н а. Усё!

К і м. Ці праспалі вы хоць раз на экзамен?

Л е н а. Усё я сказала!

К і м. Вы плакалі хоць раз без прычыны, а проста ад замілавання?

Л е н а. Ты мяне давядзеш!

К і м. Узяць з вамі шлюб — тое ж самае, што пасадзіць сябе на жорсткую дыету на ўсё жыццё... Я жартую. Куды яна пайшла?

Л е н а. Куды і заўсёды.

К і м. І зноў без кофты... Толькі прастуды мне яшчэ не хапала... Я пайшоў.

Л е н а. Ты, можа, прабачэння папросіш?

К і м. Міс, даруйце мне і ў маёй асобе ўсім мужчынам, што крыўдзілі вас, крыўдзяць цяпер і будуць крыўдзіць *(выходзіць)*.

Л е н а *(глядзіць на сябе ў люстэрка)*. Ну, нягоднік малы! Трэба ж наплесці такога...

З'яўляецца К а р а л ё ў.

К а р а л ё ў. Добры вечар...

Л е н а. Добры. Вы да каго?

К а р а л ё ў. Не ведаю. Мабыць, да цябе.

Л е н а. Тады чым магу?

К а р а л ё ў. Ты даўно тут працуеш? Нічога, што я на ты?

Л е н а. Карона не зваліцца. Даўно працую.

К а р а л ё ў. Ты не можаш мне сказаць, хто тут дзяжурыў дваццатага.

Л е н а. А вы хто?

К а р а л ё ў. Ты не бойся, усё нармальна...

Л е н а. А я і не баюся...

К а р а л ё ў. Разумееш, дваццатага са мной непрыемнасць адна здарылася. У нейкай бальніцы мне дапамаглі. Выскачыў, схапіў таксі і... нават дзякуй не сказаў.

Л е н а. Падумаеш! У нас такая прафесія: ні грошай, ні дзякуй.

К а р а л ё ў. Разумееш, мне здорава дапамаглі… Я ў гарачцы быў… не памятаю, як дадому дабраўся… І не памятаю, у якой бальніцы быў…

Л е н а. Крутая гарачка была.

К а р а л ё ў. Ты нават не ўяўляеш.

Л е н а. Якога вы казалі?

К а р а л ё ў. Дваццатага.

Л е н а. А ў які час?

К а р а л ё ў. Вечарам.

Л е н а. Да дзесяці? Пасля?

К а р а л ё ў. Пасля.

Л е н а *(глядзіць у графік)*. Я дзяжурыла 20-га. З 21-й да сямі раніцы.

К а р а л ё ў. Не-е, там медсястра прыгожай была…

Л е н а. Дзякую за камплімент.

К а р а л ё ў. Не-не-не! Я не тое хацеў сказаць! У сэнсе прыгожая, што падобная…

Л е н а. На каго? На Сафі Ларэн ці Пугачову?

К а р а л ё ў. На маці маю падобная! На маці! Ты таксама нішто сабе, але ты на яе не падобная…

Л е н а. Ты таксама да майго бацькі не дацягваеш…

К а р а л ё ў. Хіба я супраць?

Л е н а. Значыць, так… Дваццатага вечарам дзяжурыла я. Нічыіх гарачак тут не было. Усё?

К а р а л ё ў. Не ўсё. Па-першае, не крыўдуй. Калі я цябе пакрыўдзіў, прашу прабачэння.

Л е н а. За вас ужо папрасілі прабачэння.

К а р а л ё ў. Хто?

Л е н а. Тут адзін акселерат швэндаецца… Што па-другое ў вас?

К а р а л ё ў. А па-другое, хачу аказаць вашай клініцы дабрачынную дапамогу… *(кладзе на столік канверт)*.

Л е н а. А па-трэцяе, ніякіх медыкаментаў, ні за якія грошы я вам даставаць не буду… Так што забярыце свой дабрачынны канверт і каціцеся к чортавай матары…

К а р а л ё ў. Ды якія к чорту медыкаменты! Калі мне спатрэбяцца наркотыкі, я іх воз дастану… І цябе магу пачаставаць…

Л е н а. Значыць проста так ахвяруеце…

К а р а л ё ў. Не, не зусім.

Л е н а. Забярыце канверт.

К а р а л ё ў. Спакойна! Ты будзеш чыстая, як херувім. *(Дастае з кішэні насоўку.)* Вось бачыш насоўку… На ёй кроў. Не баішся крыві?

Л е н а. Я медсястра і не баюся нават голых мужчын…

К а р а л ё ў. Гэта калі яны хворыя… Цяпер вось гэтая бутэлечка… Тут таксама кроў. Мне трэба ведаць: ці ёсць паміж імі розніца.

Л е н а. І ўсё?

К а р а л ё ў. І ўсё. Гэта *(паказвае на канверт)* раздасі лабаранткам за паслугі. А хочаш, купі для іх новы мікраскоп.

Л е н а. Там хопіць на мікраскоп?

К а р а л ё ў. Хопіць. Ну? І ў чым тут крымінал? Запэўніваю, што ўласнікі гэтых крывей жывыя і здаровыя.

Л е н а. Навошта гэта вам?

К а р а л ё ў. Я пісьменнік. Пішу дэтэктывы. Распрацоўваю адзін сюжэт. Хачу, каб усё ў ім было праўдападобным.

Л е н а. Ну добра, зайдзіце дні праз тры, ці лепш пакіньце тэлефон, я вам пазваню…

Зумер.

Даруйце, мне ў палату трэба… *(Выходзіць.)*

К а р а л ё ў накіроўваецца да выхаду і сутыкаецца з Ю л я й.

Ю л я. На вуліцы надзвычай холадна…

К а р а л ё ў. Так…

Ю л я. Затое на небе зорак багата…

К а р а л ё ў. Так…

Ю л я. І ўсе буйныя-буйныя… І мігцяць.

К а р а л ё ў. Так…

Ю л я. І яшчэ. Адзін мой выпадковы знаёмы ў бары, калі я сказала яму, што кахаю цябе дванаццаць гадоў… Прасіў перадаць табе, што ты ўрод…

К а р а л ё ў. Я з ім згодны. *(Абдымае яе.)* Я сапраўды ўрод…

ДЗЕЯ ДРУГАЯ

Дом Каралёва. Ноч. Ціхая музыка. Ю л я і К а р а л ё ў у павольным танцы.

Ю л я. Дзякую табе…

К а р а л ё ў. За што?

Ю л я. За тое, што я кахаю цябе…

К а р а л ё ў. Даруй, я не ведаю, што ў такіх выпадках гаварыць трэба…

Ю л я. І не гавары нічога…

К а р а л ё ў. Хочаш шампанскага?

Ю л я. Баюся.

К а р а л ё ў. Чаго?

Ю л я. У мяне і так усё кружыцца. Я абамлею…

К а р а л ё ў. Ну і на здароўе… У мяне нашатырны спірт ёсць…

Ю л я. Давай.

К а р а л ё ў. Нашатырны спірт?

Ю л я. Шампанскае.

К а р а л ё ў. Зараз…

Ю л я. Можна я прылягу?

К а р а л ё ў. Канечне, канечне… Што ж ты слабенькая такая? Можа есці хочаш?

Ю л я. Не, дзякуй… *(Прылягла на край ложка.)* Ой, сапраўды зоркі! А адна рухаецца нават…

К а р а л ё ў. Гэта самалёт…

Ю л я. А чаму не чутно?

К а р а л ё ў. Высока…

Ю л я. А можа спадарожнік?

К а р а л ё ў. Можа… Лёд пакласці?

Ю л я. Як хочаш… Якая я шчаслівая… Палову свайго жыцця не жыла, а ляцела… Што б ні здарылася, што б ні накаціла… варта было толькі ўспомніць пра цябе — усё! Усе праблемы радасцю рабіліся… *(Смяецца.)* Калі ў час путчу цябе арыштавалі, я хацела на плошчы абліць сябе бензінам і падпаліць.

К а р а л ё ў. Прыпадачная!

Ю л я. Калі ты недзе заявіў, што не прызнаеш Бога, цэлы дзень стаяла ў царкве на каленях і маліла, каб Ён дараваў

табе… А калі цябе паклалі на аперацыю — ледзь з глузду не з'ехала…

К а р а л ё ў. Юля, мілая, у мяне ніколі нічога падобнага не было… Пашкадуй… Памаўчы... Мая псіхіка не вытрымлівае. Я заплакаць магу…

Ю л я. Такой бяды…

К а р а л ё ў. Колькі памятаю сябе — я быў адзін… У мяне адсутнічае, паталагічна адсутнічае пачуццё натоўпу… Мне ў ім млосна. Натоўп — гэта жывы і да нейкай ступені разумны арганізм… Ён адчувае гэта і ненавідзіць мяне. Я заўсёды хацеў любіць, а ад мяне шарахаліся, як ад заразнага… А калі спрабавалі любіць мяне, дык абавязкова за нешта. Тады я шарахаўся, бо адразу ж адчуваў гэта… Я праклінаў сябе за гэта, я люта зайздросціў тым, хто бачыць тое, што хоча бачыць, і не заўважае таго, чаго не трэба…

Ю л я. Мы шампанскае піць будзем?

К а р а л ё ў. А-а, даруй… Табе не цікава?

Ю л я. Я цябе кахаю, дурненькі…

К а р а л ё ў. За цябе…

Ю л я. А я за цябе…

К а р а л ё ў. У гэтым доме столькі перабывала людзей, а, здаецца, не было ніводнага чалавека і ніводнай жанчыны…

Ю л я. Ты проста з маленства заўсёды абараняўся. Гэта ўжо ўвайшло не толькі ў звычку, а і ў характар. На цябе ніхто і не думае нападаць, а ты ўсё адно абараняешся… Як ты яшчэ толькі трымаешся? Ты ўжо павінны быў усё сваё здароўе на гэта пакласці...

К а р а л ё ў. Нічога. Мяне не так проста скруціць.

Ю л я. Ну во! Зноў іголкі выпусціў… Ну, а цяпер на каго, вожык?

К а р а л ё ў. Даруй…

Ю л я. Запрасі мяне яшчэ танцаваць.

К а р а л ё ў. Ты так любіш танцаваць?

Ю л я. Абалдзенна!

К а р а л ё ў. А я ненавіджу…

Ю л я. Ну намагніся ўжо.

К а р а л ё ў *(уключае музыку, галантна падыходзіць)*. Мадам! Белы танец!

Ю л я. Па-першае, мадэмуазель, а па-другое — на белы танец жанчыны запрашаюць.

К а р а л ё ў. Ну ўсё адно, прашу вас...

Танцуюць. Б'е гадзіннік.

Ю л я. Колькі?

К а р а л ё ў. Тры гадзіны...

Ю л я. Позна. Час ехаць.

К а р а л ё ў. Можа застанешся? Заставайся...

Ю л я. Не, давай не сёння. Не сёння. Добра?

К а р а л ё ў. Як хочаш... *(Засмяяўся.)* Жах! Ціхі жах!

Ю л я. Што?

К а р а л ё ў. Нічога. Я адвязу цябе.

Ю л я. Не трэба і праводзіць! Не трэба. Добра?

К а р а л ё ў. Як скажаш... Жах!

Ю л я. Вызаві таксі...

К а р а л ё ў. Ды якое таксі?! *(Бярэ тэлефон, націскае кнопку.)* Серж? Ну што, пакрыўдзіўся? У нас проста няўдалы дзень з табой быў учора... Даруй. Значыць, сядзеш на «Аўдзі» і адвязеш маю госцю, куды скажа... Я сам сябе ахоўваць буду... Стоп, стоп! Будзеш везці яе, як мяне самога. Малайчына, здагадлівы... Яна ўжо спускаецца.

Ю л я. Бывай...

К а р а л ё ў. Я хоць да машыны праводжу!

Ю л я. Не трэба. Я знайду дарогу.

К а р а л ё ў. Тады спакойнай ночы...

Ю л я. Добрай раніцы! Пацалуй мяне.

Цалуюцца. Ю л я выходзіць.

К а р а л ё ў *(смяецца)*. Жах! Жах!

Тэлефон. Каралёў націскае кнопку.

Г о л а с. Камандзір, гэта боцман...

К а р а л ё ў. Ну?

Г о л а с. Калі разбудзіў — даруйце, але вы загадалі гэту інфармацыю дакладваць у любы час.

К а р а л ё ў. Слухаю.

Г о л а с. Халдзей вывез дачку за мяжу. Яна ў Кёльне. Мне вылятаць?

К а р а л ё ў. Не трэба, адбой. Праблема здымаецца.

Г о л а с. Зусім?

К а р а л ё ў. Зусім. Дзякую.

Г о л а с. Зразумела. Ну, а...

К а р а л ё ў. Усё, што атрымаў, — ваша... Усё, што ведаеш, — забудзьце.

Г о л а с. Ужо забыліся. Дзякую. Пазваніце — буду рады.

К а р а л ё ў. Будзь здароў!

Г о л а с. Бывайце...

Каралёў выключае тэлефон, ходзіць па пакоі, падыходзіць да акна.

К а р а л ё ў. А дзень павялічыўся. Ледзь прыкметна, але святлее... І спаць не хочацца.

Дом Юлі і Кіма. К і м сядзіць каля акна. З'яўляецца Ю л я.

К і м. Мэм, прыстойныя жанчыны заяўляюцца дадому да апоўначы.

Ю л я. А ты не спіш?

К і м. У мяне заўтра... якое заўтра? Сёння! Кантрольная. Мне трэба падрыхтавацца, а вы мала таго што подла адсутнічаеце дома і прымушаеце мяне хвалявацца, дык яшчэ прыязджаеце пад раніцу і на «мерседэсе».

Ю л я. Гэта не «мерседэс»! Гэта «аўдзі», а ты... ты бурчыш, як свёкар! Дзеці спяць?

К і м. А што могуць рабіць дзеці а чацвёртай гадзіне ночы? Ой-ё-ёй! Ой-ё-ёй! Мы сэканомім на энергаталонах... Вы, мэм, ззяеце, як ёлачная цацка...

Ю л я. Кі-ім!

К і м. Што пачварная?

Ю л я. Калі б ты ведаў... Калі б ты ведаў...

К і м. Я нічога не хачу ведаць, я хачу спаць. Лена тэлефанавала.

Ю л я. Якая Лена?

К і м. З клінікі.

Ю л я. Чаго?

К і м. Непакоілася за вас, мэм, і пыталася, куды вы падзеліся...

Ю л я. І што ты сказаў?

К і м. Я сказаў, што вы дома, стаміліся і спіце разам з дзецьмі. Бачыце, як вы нізка палі... Мала таго, што за-

гульваеце начамі, дык яшчэ вымушаеце непаўналетняга прыстойнага падлетка хлусіць дарослым.

Ю л я. Навошта ж ты хлусіў?

К і м. А што мне было рабіць? Сказаць, што і мне невядома, дзе вы падзеліся? Каб і яна хвалявалася ўсю ноч... А так я зло ў свеце паменшыў роўна ў два разы, і твая сяброўка спакойна спала на начным дзяжурстве. І я таксама іду спаць... чаго і вам жадаю.

Ю л я. Я толькі чаю пап'ю...

К і м. Вас там не напаілі нават чаем? Які жах! Я зараз прыгатую.

Ю л я. Я сама... Ідзі спі.

К і м. Калі вас яшчэ і голадам марылі — магу прапанаваць аўсяную кашу.

Ю л я. Разбяруся. Ідзі спаць...

К і м. Сонца ўзыходзіць. Дабранач, мэм!

Ю л я. Не здзекуйся. Ідзі.

К і м. Пайшоў. *(Пайшоў.)*

Ю л я. Кім!

К і м. Што?

Ю л я. Я цябе люблю...

К і м. Гэта ў вас ад бяссонніцы...

Ю л я. Ну хопіць ёрнічаць, я сур'ёзна!

К і м. У чатыры раніцы толькі пеўні сур'ёзна кукарэкаюць, сур'ёзныя ж размовы людзі вядуць пасля дзевяці... Гуд бай!

Ю л я. Чакай.

К і м. Ну што яшчэ?

Ю л я. Я хачу, каб ты ведаў, што б ні здарылася, што б ні адбылося, я заўсёды буду з табой, з Пінем і з Баранесай...

К і м. Не веру...

Ю л я. Чаму?

К і м. Вы парушылі іерархію, якую ж самі і ўстанавілі...

Ю л я. Ну добра! З Пінем, з Баранесай і з табой! Ты задаволены?

К і м. Я незадаволены, але скараюся жорсткаму лёсу.

Ю л я. Ты балаболка!

К і м *(пазяхаючы)*. Я таксама хачу зрабіць сур'ёзную заяву: калі вы будзеце замест лячэння прападаць у барах, ездзіць на «мерседэсах», то...

Ю л я. Клянуся, гэта ў першы і апошні раз! *(Абдымае яго.)*

К і м. Дадуць мне сёння паспаць ці не! Гэта абуральна! *(Выходзіць.)*

Юля *(глядзіць у акно)*. Сон… Раніца… Ранішні… Сон…

Офіс Хадзеева. З'яўляецца К а р а л ё ў.

Х а д з е е ў. Што табе трэба?

К а р а л ё ў. Прыстойныя людзі вітаюцца і прапаноўваюць сесці *(паўза)*. Можна мне сесці?

Х а д з е е ў. Сядай.

К а р а л ё ў. Я прыйшоў табе сказаць, што ты дарма адправіў сваю Зайку ў Кёльн.

Х а д з е е ў *(падхапіўся)*. Адкуль ты ведаеш?

К а р а л ё ў. Не кіпяціся! Гэта яшчэ не ўсё. Ёй ужо нічога не пагражае. Ні ў Кёльне, ні тут. Я прыйшоў разлічыцца з табой *(пачынае выкладаць з саквяжа пачкі грошай)*, папрасіць прабачэння і сказаць, што я быў свіннёй…

Х а д з е е ў. Чаму быў?

К а р а л ё ў *(горача)*. Таму што я ўжо даўно не свіння!

Х а д з е е ў. І як даўно?

К а р а л ё ў. Сем гадзін. З паловай.

Х а д з е е ў. Ну-у, так доўга не жывуць…

К а р а л ё ў. І тым не менш… Але і ты фрукт… З-за гэтай муры *(ківае на грошы)* сябру, хоць і былому, кулю пад сэрца… Ну менш іх, больш — якая розніца…

Х а д з е е ў. Дык а чаго ж ты тады...

К а р а л ё ў. Я ж сказаў табе, кім я быў! Свіннёй.

Х а д з е е ў. Вось я і хацеў замачыць цябе. На сала.

К а р а л ё ў. Бяры свае грошы, людаед… І яшчэ раз даруй… За дачку. Я разумею, што ты пераЖыў.

Хадзееў нервова набірае нумар.

Г о л а с. Слухаю.

Х а д з е е ў. Як вы?

Г о л а с. Усё ў парадку.

Х а д з е е ў. Дзе яна?

Г о л а с. На занятках.

Х а д з е е ў. А ты?

Г о л а с. Тут. Каля дзвярэй класа. Не хвалюйцеся, усё ў парадку.

К а р а л ё ў. Усё ў парадку. Не мучай дзіцёнка. Туды ніхто не паехаў ад мяне… А сёння ноччу я і тут усё зняў…

Х а д з е е ў. Што адбылося?

К а р а л ё ў. Пагібель адбылася… Катастрофа… Душэўны «Тытанік», Хадзееў…

Х а д з е е ў. Ты ж мяне заўсёды Халдзеем клікаў…

К а р а л ё ў. Табе і ў трэці раз сказаць, кім я быў?! Што ты прыніжаеш мяне!

Х а д з е е ў. Хто цябе прыніжае…

К а р а л ё ў. Я папрасіў у цябе прабачэння, з дачкой тваёй усё нармальна… Я вярнуў твае грошы…

Х а д з е е ў. А ты мне нічога не вінен…

К а р а л ё ў. Што значыць не вінен? Канчай залівань.

Х а д з е е ў. У мяне на залівоны няма часу. Ты мне нічога не вінен.

К а р а л ё ў. Ды ты што?! Я зранку вышкрабаў адусюль апошнія грошы, машыну загнаў за палову цаны, прадаў за бясцэнак два прадпрыемствы!

Х а д з е е ў. Я за чужую шызафрэнію не адказваю…

К а р а л ё ў. Паслухай, Хадзееў…

Х а д з е е ў. А вось цяпер я — Халдзей… А ты забірай свае бабкі і кацiся…

К а р а л ё ў. Я не жабрак! Мне твае падачкі не трэба!

Х а д з е е ў. Якія падачкі, Каралёў? Успомні, калі я каму падаваў хоць адзін рубель… Тыдзень таму ты мне прадаў вось гэта *(паказвае прастрэленую кніжачку)*, я купіў і ўсё. Мы квіты.

К а р а л ё ў. Я яе пакідаў у залог!

Х а д з е е ў. У мяне не ламбард! І я не ліхвяр! Будзь здароў…

К а р а л ё ў *(спрабуе вырваць з рук Хадзеева кніжачку)*. Дай сюды!

Х а д з е е ў. Я зараз паклічу ахову і цябе вышпурнуць адсюль к чортавай матары!

К а р а л ё ў. Дай сюды і забяры свае ванючыя грошы!

Х а д з е е ў. Гэта не мае грошы.

К а р а л ё ў. На ёй мая кроў!

Х а д з е е ў. Ты прадаў яе… Гэта мая ўласнасць.

К а р а л ё ў. Я не мог яе прадаць! Гэта падарунак. Дай сюды!

Х а д з е е ў. Ды пайшоў ты!!! *(Змагаюцца за кніжачку. Падаюць.)*

Дом Каралёва. Уваходзіць злы, ускудлачаны і памяты К а р а л ё ў. Яго, пэўна, сапраўды «вышпурнулі».

К а р а л ё ў *(выкідваючы з усіх кішэняў грошы)*. Урроды! Пазабіваў бы ўсіх…

З'яўляецца Л е н а.

Л е н а. Можна, Ігар Міхайлавіч?
К а р а л ё ў. Можна. А ты хто?
Л е н а. Лена з клінікі…
К а р а л ё ў. З якой клінікі? Якая Лена?
Л е н а. Вы прасілі мяне зрабіць аналізы…
К а р а л ё ў. А-а-а… Ну й што?
Л е н а. Вы, мабыць, памыліліся. Справа ў тым, што і ў бутэлечцы і на насоўцы адна і тая ж кроў...
К а р а л ё ў. Гэтага не можа быць!!! Вашы лабаранткі пераблыталі нешта!
Л е н а. Наша лабараторыя рабіла аналіз толькі з прабіркі. У нас такой апаратуры няма, каб здымаць з тканіны. А з насоўкі рабіў мой знаёмы… Ён судмедэкспертам працуе… У міліцыі…
К а р а л ё ў. І што?
Л е н а. Усё аднолькава… Надзвычай рэдкая група. Перадайце вашаму знаёмаму, каб ён здаў у сваёй паліклініцы кроў…
К а р а л ё ў. Каму?
Л е н а. Сабе самому. Не давядзі Бог што-небудзь здарыцца і спатрэбіцца пераліванне — будуць праблемы… Надзвычай рэдкае спалучэнне…
К а р а л ё ў. Ды на насоўцы зусім іншая кроў!!! Ты разумееш?
Л е н а. Вось вынікі аналізу з нашай лабараторыі, а гэта рабіў мой сябар… З насоўкі, якую вы прынеслі… Нават лейкацыты аднолькавыя…
К а р а л ё ў. Дурдом…
Л е н а. Сяброўкі з лабараторыі дзякуюць за мікраскоп…
К а р а л ё ў. А міліцыянер?

Л е н а. Міліцыянеру за мікраскоп падзякую я…

К а р а л ё ў. Выпіць хочаш?

Л е н а. Не-е, мне яшчэ сёння цалавацца.

К а р а л ё ў. Ну, ідзі…

Л е н а. Дзякуй вы ўжо сказалі?

К а р а л ё ў. У старажытнасці ганцоў за такія навіны не дзякавалі… Ім галовы адсякалі.

Л е н а. Ну падумаеш, рэдкая група… Было б ад чаго расстройвацца…

К а р а л ё ў. Усё. Дзякуй. Ідзі.

Л е н а. Бывайце… *(Выходзіць.)*

К а р а л ё ў *(сам сабе)*. Пашлякі маюць рацыю: сваякоў у нас намнога больш, чым мы думаем… «А поворотись-ка, сын! Экой ты смешной какой!» *(Націскае кнопку.)* Серж! Ты памятаеш, хлапчук да мяне прыходзіў? Ты яшчэ яму нос разбіў і на машыне ў горад адправіў.

Г о л а с. Памятаю…

К а р а л ё ў. Чаго ты хмыкаеш? Падымі на ногі ўсіх, каго можна, і знайдзі яго. Клічуць — Кім. Сірата. Жыве ў нейкім сямейным доме. Язык падвешаны добра… Гадоў дванаццацьтрынаццаць. Апрануты… Чаго ты рагочаш?

Г о л а с. Шэф, вы будзеце смяяцца, але ён сядзіць у мяне.

К а р а л ё ў. Затрымай яго!

Г о л а с. Навошта яго затрымліваць? Ён да вас і прыйшоў…

К а р а л ё ў. Хай заходзіць…

Нервова прыбірае на стале пачкі з грашыма.

Дурдом… Дурдом…

Уваходзіць К і м.

К і м. Добры дзень…

К а р а л ё ў. Салют, салют… Што ж гэта такое, га? Кімблінклінтан! Я для яго за вадой пабег, як афіцыянт таннага кафэ, а ён змыўся. Чаго ты збег?

К і м. Мне стала сорамна.

К а р а л ё ў. Што такое?

К і м. Даруйце.

К а р а л ё ў. За што?

К і м. Я падманваў вас…

К а р а л ё ў. Бывае…

К і м. І мне надзвычай пагана ад гэтага…

К а р а л ё ў. У жыцці, Кім, з малога трэба пачынаць, а ты адразу пяцьдзясят тысяч долараў.

К і м. Пра што гэта вы?

К а р а л ё ў. Я так разумею, што хворай сястры ў цябе няма, як няма і Моні з Графіняй.

К і м. Моні з Графіняй няма.

К а р а л ё ў. Ну во!

К і м. Піня з Баранесай ёсць. І сястра ў мяне сур'ёзна хворая… І на лячэнне за мяжой ёй патрэбна гэтая сума.

К а р а л ё ў. Дык у чым жа тады твой падман?

К і м. Я не ваш сын…

К а р а л ё ў. Чый жа ты, хлопчык?

К і м. Адкуль мне ведаць. У мяне ваша гісторыя… Толькі не з вакзалам звязаная, а… Ды якая розніца… Калі жыў у дзетдоме, вы ж ведаеце, кожны выдумляе сабе бацькоў… У кожнага або лётчык, або геолаг, або вадалаз…

К а р а л ё ў. Мой шпіёніў для роднай дзяржавы ў Лаосе… Аднойчы адзін паскуднік падлавіў: «Як за ён там моза спіёніць, калі там усе маленькія і з вузкімі вацыма. Там за ўсе кітайцы».

К і м. А сапраўды?

К а р а л ё ў. Што сапраўды? Што сапраўды… Гісторыю трэба ведаць, троечнік! Там тады былі амерыканцы і ён шпіёніў сярод амерыканцаў.

К і м. А-а-а…

К а р а л ё ў. Бэ-э-э…

К і м. Я пра бацьку нічога не выдумляў, няма і няма… А вось маці ў мяне была… Альпіністка… З прыгожым імем Эльвіра… І я быў зусім маленькі, калі яна загінула пры ўзыходжанні на Эльбрус…

К а р а л ё ў. Распранайся, зараз абедаць будзем.

К і м. Не, я спяшаюся.

К а р а л ё ў. Куды?

К і м. Піню з Баранесай трэба забраць з садзіка. Сёння скарочаны дзень.

К а р а л ё ў. Я пашлю машыну, іх забяруць.

К і м. Вы што, ні з кім яны нікуды не пойдуць. Бывайце. І… яшчэ раз даруйце…

К а р а л ё ў. Чакай. Яшчэ пару пытанняў назасыпку. Скажы *(паказвае фотаздымак у рамачцы)*, ты калі-небудзь бачыў гэты здымак?

К і м. Не. Адкуль жа?

К а р а л ё ў. На каго ты тады паказваў?

К і м. Вось. Другі рад. Пятая злева.

К а р а л ё ў. Чаму на яе? Менавіта на яе?

К і м. Ну-у… Можа таму, што ўсе глядзяць у аб'ектыў, а яна на вас… І позірк такі… Мне здаецца, яна вас кахала…

К а р а л ё ў *(нервова)*. Яе завуць Эльвіра!!!

К і м. Абалдзець можна…

К а р а л ё ў. Не спяшайся! Гэта мелката! Далей не абалдзець, далей па ўсіх законах трэба чокнуцца.

К і м. Ну?

К а р а л ё ў. Яна сапраўды займалася альпінізмам! І іх групу накрыла лавінай пры ўзыходжанні на Эверэст…

К і м *(разгублена)*. На Эльбрус…

К а р а л ё ў. Не, на Эверэст! Усе загінулі. Нікога не знайшлі… І гэта яшчэ не ўсё! Яна нарадзіла дзіця трынаццаць год таму, але малое памерла праз некалькі месяцаў!

К і м. Адкуль вы ўсё гэта ведаеце?

К а р а л ё ў. Пасля твайго першага візіту я хоць і быў на сто працэнтаў упэўнены, што ты вешаеш мне на вушы лапшу, усё ж такі вырашыў даведацца, што за краля стаіць у другім радзе пятая злева… Сябры мне гэту інфармацыю і выдалі!

К і м. А… адкуль яна? З якога горада?

К а р а л ё ў. Расанск… Ну? Чаго ты вачыма лыпаеш?

К і м. Першыя гады… я жыў у Расанскім Доме дзіцяці… Містыка…

К а р а л ё ў. Гэта не містыка!

К і м. А што?

К а р а л ё ў. Чартаўшчына! І гэта яшчэ не ўсё! Ты не ведаеш таго, што я не хачу, каб ты ведаў...

К і м. Даруйце… Я пайду…

К а р а л ё ў. Ну, а цяпер як на духу: сястра сапраўды хворая?

К і м. Хворая.

К а р а л ё ў. Нешта прыдумаем… Гэта яна цябе прыслала?

К і м. Яна.

К а р а л ё ў. І як яе завуць?

К і м. Юля…

К а р а л ё ў. Юля?!

Клініка. Ю л я і Л е н а.

Л е н а. Слухай, мілая, ты паводзіш сябе, як сямікласніца!

Ю л я. Паклёп! Я паводжу сябе, як пяцікласніца!

Л е н а. Чым ты займалася?

Ю л я. У класікі гуляла з унучкай акуліста.

Л е н а. А на працэдуры я за цябе павінна хадзіць?

Ю л я *(абдымае сяброўку)*. Ленка-а-а…

Л е н а. Што Ленка?

Ю л я. Не бубні…

Л е н а. Я не бубню!

Ю л я. А што ты робіш?

Л е н а. Зайздрошчу. Хто выйграў?

Ю л я. Я.

Л е н а. Дзіцёнка пакрыўдзіла. Марш у сёмы кабінет! Бегаць за табой яшчэ трэба! Хуценька! Апаратура перагрэлася!

Ю л я. Бягу, бягу!

Выходзіць. З'яўляецца К а р а л ё ў.

Л е н а. Ігар Міхайлавіч! Якім ветрам?

К а р а л ё ў. У вашай клініцы гэтага… аддзялення няма?

Л е н а. Якога аддзялення?

К а р а л ё ў. Ну гэтага… дзе прыдуркаў лечаць.

Л е н а. Не-е, гэта ж за горадам… У нас толькі неўралогія. А што вы захварэлі?

К а р а л ё ў. Я нарадзіўся хворым.

Л е н а. Тады ўсё о'кэй. Вы ведаеце, калі чалавек пачынае выздараўліваць?

К а р а л ё ў. Ну?

Л е н а. З таго самага моманту, калі скажа сам сабе, што ён хворы.

К а р а л ё ў. А калі чалавек разумнець пачынае па тваёй логіцы? З таго самага моманту, калі прызнае сам сябе крэцінам?

Л е н а *(смяецца)*. Мабыць, так.

К а р а л ё ў *(не смяецца)*. Я — крэцін.

Л е н а. З выздараўленнем вас, Ігар Міхайлавіч!

К а р а л ё ў. Называй мяне проста Кім…

Л е н а. Чаму Кім?

К а р а л ё ў. Ведаеш, што такое абрэвіятура?

Л е н а. Не.

К а р а л ё ў. Двоечніца. Загалоўныя літары, якімі нешта ці нехта называецца. СССР, КПСС, НКВД, ОПРЭСЭТЭ… ЁКАЛЭМЭНЭ…

Л е н а. А гэта што такое?

К а р а л ё ў. Не ведаю. І ведаеш, усё, што называецца абрэвіятурай, надзвычай нетрывалае. Усё распадаецца… І я распадаюся…

Л е н а. А чаму вы Кім?

К а р а л ё ў. Маё прозвішча Каралёў, завуць Ігар Міхайлавіч.

Л е н а. А-а-а…

К а р а л ё ў. Што тут смешнага?

Л е н а. У мяне ёсць знаёмы Кім.

К а р а л ё ў. Гэта міліцыянер твой?

Л е н а. Не-е, у яго іншая абрэвіятура *(і раптам пачынае істэрычна рагатаць)*. Ой, не магу!

К а р а л ё ў. Чаго гэта цябе разабрала?

Л е н а *(рагоча)*. Не магу…

К а р а л ё ў *(пахмурна)*. Хопіць рагатаць!

Л е н а. Чаго гэта вы?

К а р а л ё ў. Не магу без злосці глядзець на тых, хто смяецца!

Л е н а. Я вас слухаю. Зноў аналіз крыві трэба зрабіць?

К а р а л ё ў. Я і без аналізу ведаю: кроў мая сапсаваная ўшчэнт…

Л е н а. Што за песімізм!

К а р а л ё ў. Значыць так: у вобмарак не падаць і ніякіх пытанняў не задаваць. О'кэй?

Л е н а. Ес, сэр!

Каралёў дастае з кішэні пачкі грошай… Адну, другую, трэцюю… Пяць.

К а р а л ё ў. Пяцьдзясят тысяч. Тут у вас лечыцца…

Л е н а. Божа…

К а р а л ё ў. Ты абяцала ў вобмарак не падаць!

Л е н а *(заплакала)*. Ігар Міхайлавіч, мілы… Вы ведаеце…

К а р а л ё ў. Ведаю! Вось перадай ёй запіску… Толькі сама не чытай…

Л е н а. Ды за каго вы мяне…

К а р а л ё ў. Усё! Ніякіх пытанняў. Ты абяцала.

Л е н а. Можна я вас пацалую?

К а р а л ё ў. Не хачу.

Л е н а. Чаму?

К а р а л ё ў. Ты з міліцыянерамі цалуешся.

Выходзіць.

Л е н а *(перакладае пачкі, потым закрывае іх газетай і шэпча, прыціскаючы запіску да грудзей)*. Госпадзі, Святы Божа! У першы раз звяртаюся да цябе… Дзякуй Табе, дзякуй Табе… дзякуй.

З'яўляецца К і м.

К і м. Ба-а! Грэшніца ўзносіць малітвы… Чароўная Алена, праз якую грэкі разбабахалі Трою, зрабілася Марыяй Магдалінай!

Л е н а *(кідаецца да хлопчыка і пачынае яго цалаваць)*. Кім! Кім! Кім!

К і м *(вырываецца)*. Вашы «деяния», сястра, падпадаюць пад крымінальны кодэкс! Гвалтоўная спроба, спакушэнне непаўналетняга. Стацця саракавая, пункт трэці, абзац другі. Ад двух да сямі з канфіскацыяй маёмасці.

Л е н а. А маёмасць за што?

К і м. Каб не было дзе спакушаць іншых. Што гэта з вамі? Міліцыянеру генерала далі?

Л е н а. Не-е, на канфіскацыю маёмасці за такое брыдкае качаня, як ты, я не згодная.

К і м. А што ў вас можна канфіскаваць? Уся маёмасць — адзін халат.

Л е н а *(гулліва)*. Ты ўпэўнены?

К і м. Ды й халат казённы…

Л е н а. Значыць так: у вобмарак не падаць і з глузду не з'язджаць. Дамовіліся?

К і м. Зараз ты скажаш, што ў цябе закахаўся прынц Самшытавых астравоў…

Л е н а. Але-е оп! *(Рэзка адхінае газету.)* Толькі спакойна.

К і м *(глядзіць на грошы і пасля паўзы)*. Міліцыя нуль адзін ці нуль тры?

Л е н а. Нуль два.

К і м. Званю. Я тваім падзельнікам быць не збіраюся… Тут не ад двух да сямі… Гэта пажыццёвая катарга…

Л е н а. Грошы, Кім, абсалютна чыстыя. Іх перадалі на яе лячэнне. Прынёс адзін чалавек.

К і м. А ты не здагадалася папытацца ў яго даведкі?

Л е н а. Якой даведкі?

К і м. З псіхбальніцы.

Л е н а. А ў цябе хіба пыталіся даведку, калі ты хадзіў па багатых дамах і выдаваў сябе за сына, выпрошваючы грошы на яе лячэнне? Ды там і даведкі пытацца не трэба было, і так ясна, што… *(Круціць каля скроні.)*

К і м. Адкуль ты ведаеш?

Л е н а. Юля сказала… Толькі прасіла, каб я табе нічога не гаварыла… Я слова ёй дала.

К і м. Ты сваё слова стрымала.

Л е н а. Ладна, гэта я ад радасці… Можа менавіта ты і зрабіў гэта. Клянуся, я не верыла, што можна знайсці такія грошы. І Юля не верыла. Толькі ты верыў.

К і м. Ты пералічыла іх?

Л е н а. Што тут лічыць? У пачцы сто штук па сто. Дзесяць тысяч.

К і м. І колькі пачак?

Л е н а. Ты што да пяці лічыць не ўмееш?

К і м. Не трэба ёй пра гэта гаварыць.

Л е н а. Згодная.

К і м. Толькі на гэты раз дай слова і завяжы свой язык марскім вузлом.

Л е н а. Магіла, Кім…

К і м. Скажы яшчэ век свабоды не відаць… Што ў цябе за лексікон? Во што значыць з міліцыянерамі якшацца.

Л е н а. Заткніся, ты!!!

К і м. Ціха! Яна ідзе…

З'яўляецца Ю л я.

Ю л я. Хлопчыкі-дзевачкі, я як новенькая. Прывітанне, Кім! *(Цалуе Кіма.)* А што гэта з вамі?

К і м. А што?

Л е н а. Што?

Ю л я. Нейкія вы напружаныя…

Л е н а. Гэта табе здаецца.

К і м. Нічога не здаецца. Юля, я зрабіў Лене прапанову.

Ю л я. Якую?

К і м. Праз пятнаццаць гадоў выйсці за мяне замуж. Яна думае…

Л е н а. От, балда!

Ю л я. Няўжо не згодная?

Л е н а. Не!

К і м. Слава Богу! Ты ж праз пятнаццаць гадоў старая будзеш. Як гэта я пра гэта не падумаў.

Л е н а. Слухай, Юля, калі б я жыла, як ты, з такім балбесам пад адным дахам, клянуся, я б даўным даўно яго атруціла чым-небудзь…

К і м. І гэта кажа медык… Прадстаўнік самай гуманнай прафесіі. Бедныя хворыя!

Л е н а. Табе пошта. Танцуй.

Ю л я. Якая пошта?

Л е н а. Пісьмо.

Ю л я. Ад каго?

Л е н а. Спадзяюся, што ён падпісаўся.

Падае Юлі пісьмо. Юля расканвертоўвае і чытае. Выраз твару яе паступова мяняецца.

Ю л я *(застагнала)*. Кі-і-ім…

І як падкошаная звалілася пад ногі да Кіма.

Л е н а і К і м *(кідаюцца да яе)*. Юля!!! Юля!!!

Дом Каралёва. К а р а л ё ў п’яны сядзіць на падлозе сярод пустых бутэлек.

К а р а л ё ў *(гучна дэкламуе)*. Я вас любил… В душе моей угасла не совсем… Но пусть она вас больше не тревожит… *(Крычыць.)* Я не хочу!!! Чаму не хачу? Хачу… *(налівае, п’е)*.

Г о л а с. Шэф, вы ў парадку?

К а р а л ё ў. У парадку.

Г о л а с. Мне падалося, што вы крычалі.

К а р а л ё ў. Я займаюся мастацкай самадзейнасцю. Не перашкаджай.

Г о л а с. Даруйце.

К а р а л ё ў. Стой! Серж, ты жанаты?

Г о л а с. Не.

К а р а л ё ў. Пашчасціла табе. Калі б ты быў жанаты, я б цябе… звольніў зараз.

Г о л а с. Сапраўды пашчасціла.

К а р а л ё ў. І ведай, як толькі жэнішся — ты без работы. Жанчыны нам напаскудзілі яшчэ ў біблейскія часы… Яблычка ёй захацелася, а цяпер мучайся!

Г о л а с. Пра каго вы?

К а р а л ё ў. Пра Еву.

Г о л а с. Гэта ваша знаёмая?

К а р а л ё ў. Знаёмая… І твая таксама.

Г о л а с. У мяне Евы не было.

К а р а л ё ў. Ну і не трэба. Што гэта я хацеў табе сказаць. А! Калі я задумаю жаніцца, ты мяне павінен будзеш застрэліць. Усёк?

Г о л а с. Як загадаеце, шэф… даруйце, да вас прыйшлі.

К а р а л ё ў. Хто?

Г о л а с. Хадзееў...

К а р а л ё ў. Хай заходзіць.

Г о л а с. У яго можа быць зброя.

К а р а л ё ў. Хоць атамная бомба. Прапусці. *(Дэкламуе.)* Но пусть она вас больше, не тревожит… Я! Не! Хо! Чу!

Уваходзіць Х а д з е е ў. Аглядае пакой.

Х а д з е е ў. Харо-о-ош!

К а р а л ё ў. Выпіць хочаш?

Х а д з е е ў. Я за рулём.

К а р а л ё ў. З твайго дазволу!.. *(П’е.)*

Х а д з е е ў. Слухай, Каралёў, ты псуеш маю рэпутацыю…

К а р а л ё ў. Што пс... псую?..

Х а д з е е ў. Мой аўтарытэт.

К а р а л ё ў. А як гэта я яго... пс… ну, гэта…

Х а д з е е ў. Ты Атаманава ведаеш? Учора ў клубе ён пытаецца ў мяне: «Што ж ты, Хадзееў, хоць і былога, але

сябра і прыстойнага чалавека (гэта цябе!) давёў да адчаю?» Гэта я цябе давёў да адчаю! Дык вось, мне такія размовы не патрэбны.

К а р а л ё ў. Ну, блінклінтан! Ты ж хацеў мяне забіць, ледзь не забіў, а цяпер размоў баіцца...

Х а д з е е ў. Мне такія размовы не патрэбны!

К а р а л ё ў. Ды што, я іх размаўляю?! Якое сёння чысло?

Х а д з е е ў. Дваццаць першае.

К а р а л ё ў. А дзень?

Х а д з е е ў. Аўторак. Месяц і год ведаеш?

К а р а л ё ў. Я два тыдні ні з кім не размаўляў! Я з дому не выходзіў! Я тэлефон разбіў! Якія і з кім размовы?

Х а д з е е ў. Я яшчэ раз кажу: мне такія размовы не патрэбны! Чым я магу табе дапамагчы?

К а р а л ё ў. Аддай мне маю кніжачку.

Х а д з е е ў. Гэта кніжачка не твая. Я яе купіў у цябе...

К а р а л ё ў. Тады прадай!

Х а д з е е ў. Прадаваць яе я не хачу і не буду.

К а р а л ё ў. Добра. Тады зрабі для мяне адну важную паслугу.

Х а д з е е ў. Якую?

К а р а л ё ў. Пайшоў вон!

Х а д з е е ў. Значыць, сёння аўторак. Можаш яшчэ п'янстваваць да канца тыдня.

К а р а л ё ў. А ў мяне гарэлка скончылася.

Х а д з е е ў. Забяспечу. *(Націскае кнопку.)* Серж, падыдзіце, калі ласка, да маёй машыны і вазьміце ў багажніку, ён адкрыты, скрынку «Абсалюта». Цытрон падыдзе?

К а р а л ё ў. Кла-ас!

Г о л а с. Шэф, мне выконваць?

К а р а л ё ў. Ды ты ашалеў! Хто такое не выконвае?

Х а д з е е ў. Значыць, у нядзелю ты павінен толькі лёгка пахмяліцца. Калі я застану цябе ў такім стане ў панядзелак, ты ў Навінках...

К а р а л ё ў. А што я там буду рабіць?

Х а д з е е ў. Не ты будзеш рабіць, а з табой.

К а р а л ё ў. Што?

Х а д з е е ў. Прыводзіць у чалавечае аблічча. Будзь здароў. *(Выходзіць.)*

К а р а л ё ў *(дэкламуе)*. Ну пусть она вас больше не!.. Тревожит!

Г о л а с. Шэф, да вас жанчына.

К а р а л ё ў. Што ёй трэба?

Г о л а с Л е н ы. Мне трэба цябе!!!

К а р а л ё ў. Ну трэба дык трэба. Заходзь. *(Спявае.)* Я не хочу!.. Печалить вас ничем...

Уваходзіць Л е н а.

К а р а л ё ў. Чым магу?

Л е н а *(кідае канверт)*. Вось. Забяры, што даваў мне на мікраскоп.

К а р а л ё ў. Калі гэта мы пілі з табой брудэршафт? Чаму гэта ты на ты?

Л е н а. Я са жлаб'ём размаўляю толькі на ты!

К а р а л ё ў. Я і пакрыўдзіцца магу...

Л е н а. Оё-ёй! Як я перажыву? Ён пакрыўдзіцца! Пляваць я на цябе хацела, Каралёў! Калі ты хоць пальцам мяне зачэпіш, сюды заявіцца мой Гэ-А-Дэ са ўзводам амонаўцаў і скруціць і цябе, і тваіх бандзюг у барані рог!

К а р а л ё ў. Ну, са ўзводам канечне. Гэ-А-Дэ — гэта ГАД.

Л е н а. Трымай жлоб! *(Выкідвае з сумачкі пачак за пачкам.)* Ёй ужо нічога ў гэтым мярзотным свеце не патрэбна і нічога не дапаможа. Тым больш ад цябе! Абрэвіятуру сваю не выкарыстоўвай. Які ты Кім? Вазьмі сабе лепш Гэ-А-Дэ... А лепш пакінь адно Гэ. З цябе хопіць... Пералічы свае грошы, а то яшчэ потым скажаш, што ў цябе купюру сцягнулі... Яна кахае цябе! Кахае большую частку свайго жыцця! Госпадзі! Было б каго! Хворая на галаву! А ты мог падумаць, што яна спецыяльна хадзіла за табой па барах, каб спакусіць і хапануць з цябе грошы на лячэнне. Што яна спецыяльна падаслала да цябе Кіма!

К а р а л ё ў. Ён мне так сказаў.

Л е н а. Ідыёт! Ён збіраў для яе грошы, а калі яна даведалася, то прымусіла яго ва ўсіх, каго ён спрабаваў падмануць, ва ўсіх папрасіць прабачэння... Яна паслала яго прасіць прабачэння! Паслала прасіць прабачэння!!!

К а р а л ё ў. Кім — мой сын...

Л е н а. Такія, як ты, не могуць і не павінны размнажацца. Ты яго больш ніколі не ўбачыш… Ён яе на цябе не прамяняе, нават калі ты яму Эйфелеву вежу купіш! Яна сабрала каля сябе гэтых няшчасных дзетак, яны жывуць з апошняга, калі вы абжыраецеся. Але яны шчаслівыя… шчаслівыя! А тваё шчасце толькі, каб напіцца і пажэрці! Пажэрці і напіцца. Яна зубамі выцягнула з тваіх грудзей атручаную кулю…

К а р а л ё ў. Гэта была яна?!

Л е н а. Яна! Дура! Трэба было ўзяць малаток і закалаціць яе далей… У самае тваё сабачае сэрца! Ты грошы свае паганыя пералічваць будзеш?

К а р а л ё ў. Ну буду. Чаму яна сама мне пра ўсё не расказала?

Л е н а. Што яна табе магла расказаць? *(Блазнуе.)* «Мілы! Каханы мой адзіны! Ты разумееш, я з клінікі, у мяне дрэнная кроў, рэгулярна калоцца трэба, бываюць прыпадкі, я ў любы момант затрэсціся магу. А цяпер пацалуй мяне і дай баксаў на лячэнне…» Гэта яна павінна была табе сказаць?! Жлоб… *(Выходзіць.)*

К а р а л ё ў нейкі час сядзіць нерухома. Потым націскае кнопку.

Г о л а с. Слухаю, шэф…

К а р а л ё ў. Набяры нуль дзевяць…

Г о л а с. Зараз.

Чуваць доўгія гудкі, потым адказвае жаночы голас.

Ж а н о ч ы г о л а с. Сорак сёмая.

К а р а л ё ў. Справачная?

Ж а н о ч ы г о л а с. Справачная.

К а р а л ё ў. Скажыце, калі ласка, чаго гэта мне апошнім часам гэтак не шанцуе?

Дом Юлі і Кіма. Ю л я ў ложку. К і м стаіць перад акном. Л е н а рыхтуе ін’екцыю.

К і м. Дзень павялічыўся на тры гадзіны дваццаць мінут.

Ю л я. І да Новага года засталося дзесяць месяцаў і адзін дзень…

Л е н а. Давай руку *(робіць укол)*.

Ю л я. Дзе дзеці?

К і м. На вуліцы гуляюць.

Л е н а. Я пайду. Мне яшчэ па трох адрасах трэба быць.

Ю л я. Зайдзі пасля дзяжурства. Кім нешта смачнае гатуе.

Л е н а. Зайду. Кім, прасачы, каб гэта было выпіта да вечара.

К і м. Будзе выпіта.

Л е н а. Чао!

Л е н а накіроўваецца да выхаду і сутыкаецца з Каралёвым.

Л е н а *(да Кіма.)* Чаму ты ніколі не зачыняеш дзверы?

К і м. А хто апошнім заходзіў, я ці ты?

Л е н а. Я. Чаму ты за мной не зачыніў?

К а р а л ё ў. Юля, мне трэба з табой пагаварыць…

Ю л я. Выйдзіце…

Л е н а *(да Каралёва).* Ты чуў? Вый-дзі-це! Гэта яна цябе на вы называе… Выйдзіце!

Ю л я. Лена…

Л е н а. Што Лена? Што Лена? *(Каралёву.)* Тры хвіліны. Роўна тры хвіліны… Пайшлі на кухню, Кім.

Выходзяць. К а р а л ё ў павольна падыходзіць да Ю л і.

Ю л я. Не плач…

К а р а л ё ў. Я не плачу…

Ю л я. Плачаш…

К а р а л ё ў раптам грымнуўся на калені перад ложкам і зарыдаў.

Ціха-ціха-ціха-ціха… Супакойся. Гэта не праз цябе, я б усё адно…

К а р а л ё ў *(плача).* Я не ведаю, я не ведаю, што на мяне найшло, што накаціла… Зацьменне нейкае, гіпноз… Я ж глядзеў у твае вочы… Скаціна… Я нават прабачэння не буду прасіць, бо не хачу, каб ты мне даравала… Не хачу...

Ю л я. Я не пакрыўдзілася… Я проста страшна спалохалася, што больш ніколі цябе не пабачу… А астатняе… Усё, што ёсць, тое і было. Ніякія грошы не дапамогуць.

К а р а л ё ў. Выходзь за мяне замуж...

Ю л я. Дурненькі… Мне засталося ад сілы паўтара месяца…

К а р а л ё ў. Вось і добра! Усё жыццё марыў стаць удаўцом… Хаця чорта лысага! Я цябе адаб'ю, выцарапаю, вырву з лапаў і Люцыфера, і Вельзевула і Лопэ дэ Вегі…

Ю л я. Ну, а яго ў гэтую кампанію за што?

К а р а л ё ў. І калі табе наканавана памерці — пры родах памрэш… Калі будзеш раджаць дзявятага дзіцёнка…

Ю л я. Я не супраць…

К а р а л ё ў. Тады паехалі…

Ю л я. Куды?

К а р а л ё ў. У манастыр! Да святых сясцёр… Я ім некалі машыну цэглы прывёз, яны мне кніжачку падаравалі… Кніжачка маё сэрца ўратавала… Калі ўжо такога, як я, нечыя малітвы ўратавалі, што пра цябе казаць. Паехалі! Я стану на калені, і яны павянчаюць нас.

Ю л я. Ты з глузду з'ехаў.

К а р а л ё ў. У нас мала часу… У нас зусім яго няма… Я цябе люблю… Я кахаю цябе!

Ю л я. Кі-ім…

Каралёў ахінае яе коўдрай, бярэ на рукі і выносіць з пакоя.
Праз нейкі час. Аэрапорт. Ю л я, К а р а л ё ў і Л е н а каля барнай стойкі п'юць каву.

К а р а л ё ў. Вось, каб не забыць… Вазьмі размоўнік. Тут па ўсіх тэмах асноўныя фразы і ў нашай транскрыпцыі… Я, калі ездзіў, карыстаўся.

Л е н а. Юля, табе адну адзіную фразу трэба запомніць: іх лібэ діх! Іх лібэ діх… Паўтарай яе ўсім без выключэння мужчынам, потым з тых, хто клюне, выберы якога-небудзь фрыца і настаў яму *(паказвае на Каралёва)* вось такія рогі…

К а р а л ё ў. Слухай, я цябе ведаю ўсяго пару месяцаў, а ты мне надакучыла так, быццам гадоў трыццаць была маёй цешчай.

Л е н а. Гэта не ўсё-ё… Я яшчэ гадоў пяцьдзясят кумой тваёй буду.

К а р а л ё ў. Якой кумой?

Л е н а. Ну, а хто ж тваіх дзяцей хрысціць будзе?

К а р а л ё ў. Не-е! Хто заўгодна, толькі не ты!

Ю л я. Лена! Ігар! Ну, Божа мой! Я ад вас стамілася. Колькі можна? *(Паўза.)* Кім не прыедзе?

К а р а л ё ў. З дзецьмі застаўся... Заявіў, што доўгія провады — лішнія слёзы...

Л е н а. Перажывае момант адчурання.

Ю л я. Які момант?

Л е н а. Ты ж для яго была і сястрой і маці, а цяпер вунь каго песціш.

К а р а л ё ў. Зноў?

Л е н а. Камплексуе падлетак...

Паўза. Юля застагнала.

К а р а л ё ў. Што такое?

Ю л я. Мне дрэнна...

Зацiскаючы рукой рот, выбягае.

К а р а л ё ў. Юля!!! *(Да Лены.)* Чаго ты сядзіш?!

Л е н а. А што мне рабіць?

К а р а л ё ў. Ёй дрэнна!

Л е н а. Ну й што?

К а р а л ё ў. Як што? Ёй жа моташна стала!

Л е н а *(абыякава)*. На здароўе...

К а р а л ё ў. Ты... Памажы ёй!

Л е н а. Чыя гэта жонка? Мая ці твая? Сам дапамагай...

К а р а л ё ў. Чым я ёй дапамагу?!

Л е н а. Агуркоў салёных купі на дарогу!

К а р а л ё ў *(пасля паўзы)*. Што... Што...

Л е н а. Сто! Я ж казала, што ты жлоб...

К а р а л ё ў *(насоўваецца на яе і шэпча радасна)*. Лена... Лена-а-а...

Л е н а. Што такое? Не чапай мяне! Пусці! Пусці табе сказана!

К а р а л ё ў *(абдымае яе)*. Ленка!

З'яўляецца Х а д з е е ў.

Х а д з е е ў. Што тут адбываецца?

Л е н а. А вы не бачыце. Гвалт над чэснай дзяўчынай у міжнародным зале аэрапорта.

Х а д з е е ў. А дзе Юля?

Ю л я *(з'яўляецца)*. Я тут.

К а р а л ё ў. Як ты?

Ю л я. Нармальна.

Х а д з е е ў. Дакладваю. Нас з табой сустракаюць. Я забіраю дачку і гэтым жа рэйсам вяртаюся. Ты будзеш жыць у яе пакоі. Гэта два крокі ад клінікі. Прафесар Шварц рэкамендуе дзённы стацыянар.

К а р а л ё ў. Гэта што?

Л е н а. Як што? Увесь дзень лечышся, а потым усю ноч здароўе гробіш.

Х а д з е е ў. Ужо абвесцілі рэгістрацыю. Лена, пайшлі багаж афармляць. Мы каля пятай стойкі будзем.

Х а д з е е ў і Л е н а выходзяць.

Ю л я. Што гэта з табой?

К а р а л ё ў. Нічога...

Ю л я. А чаго ты так глядзіш?

К а р а л ё ў. Та-ак... Я праз тыдзень у адведкі прыеду.

Ю л я. Навошта табе грошы траціць!

К а р а л ё ў. Грошы трэба не эканоміць! Грошы трэба зарабляць! У цябе ж свой пакой будзе. Ты днём у стацыянар, а я ў піўбар... А ноччу буду сачыць за тым, каб ты сваё здароўе не гробіла...

З'яўляецца К і м, ведучы за рукі хлопчыка і дзяўчынку. Канечне ж гэта Піня з Баранесай.

К і м. Яны дасталі мяне!

Ю л я. Кім!

К і м. Калі я сказаў, што ты паехала ў аэрапорт, яны такі вой паднялі... Увесь пад'езд на вушы паставілі! Суседка выклікала міліцыю, бо падумала, што я іх забіваю... Адразу дваіх...

К а р а л ё ў. І што?

К і м. Міліцыя нас і прывезла сюды. Вунь машына стаіць. *(Да дзяцей.)* Ну што? Вось ваша мэм... Цалуйцеся!

Юля падбягае і абдымае спачатку маленькіх дзяцей, а потым Кіма. Так яны і стаяць абняўшыся.
Каралёў павольна-павольна падыходзіць да іх. На гэтым мы з імі і развітаемся. Дай вам Бог шчасця!

К а н е ц

1. Хто, на вашу думку, з'яўляецца галоўным героем п'есы? Чаму вы так лічыце? Абгрунтуйце сваю думку.
2. Як вы ставіцеся да таго, што Кім хадзіў да багатых людзей, выдаваў сябе за іх сына і выпрошваў грошы на лячэнне Юлі?
3. Паназірайце за мовай Кіма і падумайце, ці дапамагае яна лепш зразумець характар падлетка.
4. Якім чалавекам вам уяўляецца Юля?
5. Што ў характары Ігара Каралёва вы ўхваляеце, што — асуджаеце?
6. Якія жыццёвыя, маральныя праблемы ўздымаюцца ў п'есе Аляксея Дударава «Кім»?
7. «Дамалюйце» словамі фінал п'есы. Як, на ваш погляд, будуць (або могуць) складвацца жыццёвыя лёсы герояў твора?
8. У чым вы бачыце жанравую адметнасць п'есы?

Пытанні і заданні да раздзела

1. Прыгадайце з пройдзенага ў сёмым класе або паглядзіце ў слоўніку літаратуразнаўчых тэрмінаў, што азначаюць наступныя паняцці: «паэзія» і «проза», «лірыка» і «эпас». Параўнайце і адзначце падабенства і адрозненні паміж паняццямі «паэзія» і «лірыка», «проза» і «эпас».

2. З мэтай паглыблення ведаў пра тэму, ідэю, праблему твора яшчэ раз прачытайце артыкул, змешчаны пасля твора «Дзяльба кабанчыка». Ахарактарызуйце пералічаныя паняцці, падмацаваўшы адказ разважаннямі аб усіх трох творах. Як гэтыя паняцці выяўляюцца ў творах розных літаратурных родаў? У якіх творах ідэя нібы фармулюецца самім аўтарам, у якіх яе трэба «вывесці» самому чытачу з апісанняў, разважанняў, выказванняў аўтара і герояў, карцін твора?

3. Вы ўжо сустракаліся з такімі паняццямі, як аповед, апісанне, партрэт, пейзаж, дыялог, маналог. Знайдзіце адпаведныя прыклады ў разгледжаных творах і пакажыце, у якім родзе літаратуры яны сустракаюцца часта і ў якім амаль зусім не сустракаюцца. Чаму?

ГОЛАСАМ ДУШЫ І СЭРЦА

ЛІРЫЧНЫЯ ЖАНРЫ

Лірычныя творы адлюстроўваюць жыццё праз пачуцці аўтара. Калі ў эпасе на першым плане падзея, то ў лірычным творы — эмоцыя, перажыванне. Лірыцы ўласціва вобразнае выяўленне самых разнастайных адчуванняў і думак.

Паняцце пра ***лірыку***, як і пра эпас, прыйшло да нас з антычных часоў. Словам «лірыкос» старажытныя грэкі называлі вершы, якія чыталіся пад акампанемент ліры. Сваю музычную прыроду лірыка захавала і сёння, і гэта важна памятаць, гаворачы пра павышаную эмацыянальнасць, інтанацыю, меладычнасць, рытмічныя асаблівасці верша.

Лірычная паэзія заўсёды раскрывае перад намі ўнутраны свет чалавека, і чым ён багацейшы, прыгажэйшы, тым больш цікавы і важны для нас, бо ў ім — дабрыня і справядлівасць, любоў і спагада, вера і надзея на лепшае.

У адрозненне ад эпічнага, лірычны твор, як правіла, не мае сюжэта, не паказвае чалавечыя характары ў іх развіцці і разнастайных сувязях. Лірычны твор звычайна пішацца ў форме маналога. Ён невялікі па аб'ёме. Але затое кожнае слова, кожны гук у вершы маюць асаблівае значэнне, глыбокі сэнс.

Паэт дзеліцца сваімі думкамі, перажываннямі шчодра і шчыра, давярае чытачу самае патаемнае, асабістае, што патрабуе асаблівай чуласці і суперажывання. Чытанне лірычных твораў — не толькі задавальненне, гэта і праца, якая ўзнагароджваецца радасцю ўзаемаразумення з людзьмі і суперажывання з паэтам.

Мова лірычных твораў найчасцей вершаваная: рытм, рыфма, разнастайныя сродкі мастацкай выразнасці (эпітэты, параўнанні, метафары) дапамагаюць перадаць у невялікім творы невычэрпнае багацце чалавечай душы.

НАРОДНЫЯ ПЕСНІ

Песня — вершаваны твор пераважна лірычнага або ліра-эпічнага характару, меладычны па сваім інтанацыйным малюнку і прызначаны для спявання.

Народныя песні з'яўляюцца вытокам, шчодрай крыніцай лірычнай паэзіі. Здаўна яны адпавядалі спрадвечнай патрэбе чалавека ў выяўленні пачуццяў і перажыванняў, сугучных яго настрою. Каб зразумець лірычную прыроду народных песень, звернемся да гісторыі іх узнікнення.

У далёкай старажытнасці мастацтва было адзіным і арганічна ўключала ў сябе танец, гульню, музыку і словы. Вядучую ролю ў агульным танцы-гульні адыгрываў рытм. Паступова эмацыянальныя словы-воклічы пачалі складвацца ў цэласныя тэксты. Так нарадзілася харавая песня. Змест песень адпавядаў канкрэтнай жыццёвай сітуацыі, таму сярод іх можна выдзеліць ***калядныя, веснавыя, купальскія, жніўныя, вясельныя, жартоўныя, любоўныя***. З хору вылучаліся салісты — першыя паэты-лірыкі, якія ўмелі мяняць тэкст, рабіць яго больш прыгожым і выразным, перадаючы словамі свае мары і спадзяванні, свой погляд на прыроду і чалавека. Пісьменнасці яшчэ не было, песні перадаваліся вусна ад чалавека да чалавека, з пакалення ў пакаленне. У народнай памяці заставаліся самыя яркія, удалыя варыянты песень, у якіх кожнае слова, кожны вобраз былі адшліфаваны народнай мудрасцю і талентам.

«Народныя песні валодаюць магічнымі чарамі ўздзеяння на пачуцці людзей, бо нясуць у сабе самае дарагое і запаветнае з таго, што напаўняла народную душу, чым яна жыла і жывілася, чым яна пакутавала і цешылася, да чаго імкнулася і што адмаўляла» *(Ніл Гілевіч)*.

БЯРОЗА З ЛІСТОМ...

Бяроза з лістом
Усю восень шумела:
— Мая бяроза, мая белая!
Як жа мы расстанемся?
— Ты мой лісточак,
Ты мой зялёны,
Так мы расстанемся:
Ветры павеюць,
Лісток абвеюць,
А я застануся.
— Не бойся, бяроза,
Не бойся, белая!
Я ж цябе не пакіну.
Цяпер я ападу,
А вясной прыйду,
З табой шумець буду.
Мамулька з дачкой
Усю ночку гаварыла:
— Мамулька ж мая родная!
Як жа, мы расстанемся?
— Сваты прыйдуць
І цябе вазьмуць,
А я застануся.
— Мая мамулька,
Мая родная!
Я ж цябе не пакіну:
Хоць замуж пайду,
Я ў госці прыйду,
З табой гукаць буду.

ЗЕЛЯНЕЮЦЬ, ЗЕЛЯНЕЮЦЬ ЛУГІ, СЕНАЖАЦІ...

Зеляненюць, зелянеюць
Лугі, сенажаці,
Пытаецца сын у мацеры,
Ды каторую ўзяці.

А ці тую багатую,
Што хораша ходзіць,
А ці тую сірацінанчку,
Што ўсё добра робіць?

А ці тую багатую,
Што валы, каровы,
А ці тую сірацінанчку,
Што чорненькі бровы?

Багатая, няўдалая
У садочку гуляла,
А бедная сірацінанчка
Ўжо тры копы нажала.

У багатай, нехарошай
Валы паздыхаюць,
А ў беднай сірацінанчкі
Бровы не зліняюць.

1. Праслухайце народныя песні ў музычных запісах.
2. Успомніце, што вам вядома пра віды народных песень (сямейна-абрадавыя, каляндарна-абрадавыя, лірычныя). Да якога віду

адносяцца песні, з якімі вы пазнаёміліся, у якіх жыццёвых сітуацыях яны выконваліся?

3. Уважліва перачытайце тэкст песні «Бяроза з лістом». Звярніце ўвагу на тое, як многа ў ёй памяншальна-ласкальных слоў, пяшчотных зваротаў. Якія перажыванні выклікаюць гэтыя словы?
4. Вызначце агульнае ў будове народных песень. З чым звязаны паралелі са светам прыроды, пастаянныя звароты да яе сіл?
5. Якая з народных песень спадабалася вам найбольш? Што сугучнае свайму настрою вы ў ёй пачулі? Якія выяўленчыя сродкі (эпітэты, параўнанні, метафары) робяць гэтую песню прыгожай і выразнай?
6. Паслухайце народныя песні ў жывым выкананні. Прыгадайце, з якімі падзеямі яны звязаны. Запішыце тэкст адной песні.

Паралелізм

Чалавек у народнай песні непадзельны з прыродай, ад сіл якой заўсёды залежала яго жыццё. Таму аўтары народных песень бралі вобразы найперш з навакольнага свету. Песня часта ўяўляла сабой адно вялікае разгорнутае параўнанне, у якім падзеі чалавечага жыцця супастаўляюцца са з’явамі прыроды. Такі мастацкі прыём называецца ***паралелізмам***.

Сапраўды, у песні ідуць дзве паралельныя лініі: прыроды і чалавечага жыцця. Не перасякаючыся ў творы, яны зліваюцца, аднак, у адзінае ўражанне ў нашым уяўленні. Так, песня «Бяроза з лістом» будуецца на супастаўленні з’явы прыроды (лістападу) і развітання маці і дачкі. У свеце народнай фантазіі прырода і чалавек нібы роўныя: бяроза з лістком размаўляюць, сумуюць, як і маці з дачкой. Такое адухаўленне прыроды стварае асаблівы настрой, асаблівую пранікнёнасць песні.

У якіх вядомых вам народных песнях выкарыстоўваецца паралелізм? Растлумачце яго ролю ў песні.

«Я — СЫН СВАЁЙ ЗЯМЛІ, НАШЧАДАК БЕЛАРУСАЎ...»

ГРАМАДЗЯНСКАЯ ЛІРЫКА

Янка Купала

СПАДЧЫНА

Ад прадзедаў спакон вякоў
Мне засталася спадчына;
Паміж сваіх і чужакоў
Яна мне ласкай матчынай.

Аб ёй мне баюць казкі-сны
Вясеннія праталіны,
І лесу шэлест верасны,
І ў полі дуб апалены.

Аб ёй мне будзіць успамін
На ліпе бусел клёкатам
І той стары амшалы тын[1],
Што лёг ля вёсак покатам[2];

І тое нуднае ягнят
Бляянне-зоў на пасьбішчы,
І крык вароніных грамад
На могілкавым кладзьбішчы.

І ў белы дзень і чорну ноч
Я ўсцяж раблю агледзіны,
Ці гэты скарб не збрыў дзе проч,
Ці трутнем ён не з’едзены.

Нашу яго ў жывой душы,
Як вечны светач-полымя,
Што сярод цемры і глушы
Мне свеціць між вандоламі[3].

---

[1] *Амша́лы тын* — пакрытая мохам агароджа.
[2] *По́катам* — адзін ля аднаго, без асаблівага парадку.
[3] *Вандо́лы* — равы, канавы.

Жыве з ім дум маіх сям'я
І сніць з ім сны нязводныя…
Завецца ж спадчына мая
Ўсяго Старонкай Роднаю.

1. У вершы «Спадчына», напісаным у далёкім 1918 годзе, калі ў час Першай сусветнай вайны большая частка Беларусі была акупіравана нямецкімі войскамі, паэт разважае пра лёс роднага краю. Што трывожыць яго, што дае надзею?
2. Растлумачце сэнс слова «спадчына». Што разумее пад сваёй спадчынай Янка Купала? Якія параўнанні знаходзіць ён, каб перадаць сваю любоў да «Старонкі Роднай» і замілаванне ёю?
3. З якіх канкрэтных малюнкаў паўстае перад намі вобраз роднага краю? Які настрой яднае гэтыя малюнкі ў адзінае цэлае?
4. Перачытайце апошнія радкі верша. Чаму словы «Старонкай Роднаю» напісаны з вялікай літары? Якое значэнне мае слова «ўсяго» перад імі?
5. Паэт неаднаразова паўтарае займеннікі «я», «мне», «мая», што падкрэслівае глыбока асабісты характар лірычнага перажывання. Паразважайце, як звязана грамадзянская значнасць тэмы і шчырае выказванне ўласнай чалавечай пазіцыі.
6. Праслухайце запіс песні «Спадчына» на музыку Ігара Лучанка ў выкананні ансамбля «Песняры». Як звязаны мелодыя песні і інтанацыя верша?
7. Разгледзьце на форзацы 1 ілюстрацыю Міхася Басалыгі да верша Янкі Купалы «Спадчына». Якія агульныя вобразы і якія адрозненні вы заўважылі ў творах паэта і мастака? Які вобраз на пярэднім плане ў карціне М. Басалыгі, што хацеў сказаць гэтым аўтар? У папярэдніх класах вы знаёміліся з маляўнічымі беларускімі пейзажамі М. Савіцкага, П. Данелія, П. Масленнікава і інш. Чым адрозніваецца ад іх твор М. Басалыгі, выкананы ў тэхніцы графікі?

Лірычны герой

Лірыка, у адрозненне ад эпасу, не малюе канкрэтныя жыццёвыя сітуацыі і вобразы-персанажы. Яна стварае вобраз лірычнага героя. У гэтым вобразе перададзены найперш думкі і пачуцці, настрой і перажыванні паэта, яго характар. Аднак, хоць у лірычных творах аўтар часцей за ўсё гаворыць ад свайго імя, знак роўнасці паміж паэтам і лірычным героем

ставіць нельга. ***Лірычны герой*** — абагульнены вобраз, які ўзнікае ў думках чытача пасля прачытання верша і аб'ядноўвае ў сабе рысы, уласцівыя многім людзям, пачуцці, знаёмыя ўсім. Менавіта таму мы так лёгка знаходзім у лірычным творы настрой, адчуванні, сугучныя з нашымі.

Так, лірычны герой верша «Спадчына» — патрыёт, лёс якога непарыўна звязаны з лёсам Радзімы. Ён шчыра любіць свой край і трывожыцца за яго будучыню. Менавіта такім уяўляецца і сам аўтар верша — Янка Купала. Разам з тым пачуцці, выказаныя ў вершы, блізкія і зразумелыя кожнаму беларусу.

Максім Багдановіч

СЛУЦКІЯ ТКАЧЫХІ

Ад родных ніў, ад роднай хаты
У панскі двор дзеля красы
Яны, бяздольныя, узяты
Ткаць залатыя паясы.
І цягам доўгія часіны,
Дзявочыя забыўшы сны,
Свае шырокія тканіны
На лад персідскі ткуць яны.
А за сцяной смяецца поле,
Зіяе неба з-за акна, —
І думкі мкнуцца мімаволі
Туды, дзе расцвіла вясна;
Дзе блішча збожжа ў яснай далі,
Сінеюць міла васількі,
Халодным срэбрам ззяюць хвалі
Між гор ліючайся ракі;
Цямнее край зубчаты бора...
І тчэ, забыўшыся, рука,
Заміж персідскага узора
Цвяток радзімы васілька.

1. Уважліва разгледзьце фотаздымкі слуцкіх паясоў (гл. уклейку). Якія вобразы беларускай прыроды вы заўважылі ў прыгожым арнаменце? Якія колеры пераважаюць у слуцкіх паясах?

2. Верш Максіма Багдановіча «Слуцкія ткачыхі» расказвае пра далёкае XVIII стагоддзе, калі на Беларусі ў майстэрнях-«персіярнях» вырабляліся слуцкія паясы, якія сталі шырока вядомымі ў свеце. Чаму, на вашу думку, паэт звярнуўся да гэтай тэмы?
3. Прачытайце верш і паназірайце, як мяняецца яго настрой.
4. Намалюйце словамі той светлы малюнак роднай прыроды, які мы разам з паднявольнымі жанчынамі нібы бачым з акна чужога дома. Чаму ў гэтым малюнку столькі прывабнасці? Якія эпітэты, параўнанні і метафары дапамаглі вам уявіць карціну? Запішыце іх у сшытак і растлумачце ролю гэтых мастацкіх сродкаў у творы.
5. Якія вобразы супастаўляюцца ў вершы? Прачытайце ў слоўніку літаратуразнаўчых тэрмінаў, што такое антытэза. Растлумачце, як выкарыстоўваецца прыём антытэзы ў вершы «Слуцкія ткачыхі».
6. У вершы паэт разважае не толькі пра несправядлівасць у грамадстве, але і пра сутнасць мастацтва, сапраўдную прыгажосць. Як даводзіць паэт думку пра нацыянальную адметнасць мастацтва? Ці заўсёды мы ўмеем цаніць сваё, роднае?
7. Верш «Слуцкія ткачыхі» стаў народнай песняй, на яго словы пісалі музыку і кампазітары. Як вы думаеце, чаму?

Пра верш «Слуцкія ткачыхі»

Верш М. Багдановіча «Слуцкія ткачыхі» выразна дзеліцца на дзве супрацьпастаўленыя часткі і своеасаблівае падагульненне, вывад.

З першых слоў непрымірыма сутыкнулася ў творы роднае, сваё, з чужым, панскім.

Ад родных ніў, ад роднай хаты
У панскі двор дзеля красы…

Чуеш жывы боль развітання ў гэтым звароце яшчэ і яшчэ раз да слова «родны», што бязлітасна змяняецца на «панскі»… Размежаванне «роднага» і «чужога» арганізуе ўсю будову, рытмічную аснову твора. А наступныя радкі адкрыта пачынаюць выказваць варожасць паміж «панскім дваром» і «роднай хатай»:

Яны, бяздольныя, узяты
Ткаць залатыя паясы.

Тут ужо гучыць думка пра прымус, тым больш што слова «ўзяты» інтанацыйна ўзмацняецца як канцавое слова радка: у ім выразна відаць яго «залежны» стан, у ім жыве сваімі супярэчнасцямі рэальны свет — той, дзе высокае мастацтва здабываецца так не па-чалавечы, гвалтам, прымусам.

І як чыста, вырываючыся сваім «лёгкім» гучаннем ад іншых, не такіх «галасістых» радкоў, нібы ўспамін аб рыфме «дзеля красы», гучыць радок:

Ткаць залатыя паясы.

У ім разбягаюцца ўдалеч галосныя а-а-а-ы(й)а-а(й)а-ы, як песня, як недасяглая мара аб вольным, дзеля сапраўднай чалавечай красы, мастацтве.

У першай частцы верша перамагае «чужая» тэма. Яна праходзіць, адольваючы ўсё, што звязвае з родным, нават дзявочыя сны. І як вынік гэтага — першая частка заканчваецца такімі радкамі:

Свае шырокія тканіны
На лад персідскі ткуць яны, —

дзе ў цэнтры ўвагі персідскі ўзор. Другая частка верша звязваецца з папярэдняй праз новую тэму — «А за сцяной смяецца поле...». Як вольна, як бы вырваўшыся з-за сцен панскага палаца, імкнуць на волю радасныя думкі! І зноў, як працяг роднай тэмы, ажывае ў думках малюнак прыроды:

А за сцяной смяецца поле,
Зіяе неба з-за акна, —
І думкі мкнуцца мімаволі
Туды, дзе расцвіла вясна;
Дзе блішча збожжа ў яснай далі,
Сінеюць міла васількі,
Халодным срэбрам ззяюць хвалі
Між гор ліючайся ракі;
Цямнее край зубчаты бора...

Гэтыя радкі як бы вымаўлены на адным дыханні. Падтрыманыя парывам захаплення, яны ад перапоўненасці пачуцця аж пераплёскваюцца праз край. І як вяршыня тэмы роднага краю ўзнікае матыў васількоў. Тут бачым наступ

роднай тэмы, якая ўжо зраўнялася ў сваёй моцы з чужой. Радкі гучаць больш дынамічна, упэўнена, чым у першай частцы. У іх рытме чуваць хада перамогі.

Прыгожа, раздольна разаслаўся ў марах пейзаж слуцкім поясам, зайграўшы ўсімі колерамі, прашумеўшы жытам, абдаўшы халодным срэбрам ракі, мільгануўшы зубчастым арнаментам беларускага бору… І пры радках аб хвалях «ліючайся ракі», здаецца, пояс сам сплывае з рукі.

І вось — як заключны акорд верша — выхапленая з агульнага малюнка рука, якая не здольна на здраду і тчэ, «забыўшыся». Цяпер ужо забыўшыся і на забарону роднага, і сваіх дзявочых сноў — міжвольна і неадольна, бадай, як і ўсё наша мастацтва, праз нягоды стагоддзяў, — тчэ ўзор свае Бацькаўшчыны:

Заміж персідскага узора
Цвяток радзімы васілька.

Як перамога, закрасаваў жывы «цвяток радзімы васілька» над мёртвым персідскім узорам.

Паводле Анатоля Клышкі

У чым сакрэт мастацкай дасканаласці верша М. Багдановіча «Слуцкія ткачыхі»?

Сімвал

Сімвал (у пер. з грэч. — умоўны знак) — умоўнае абазначэнне з’явы праз прадмет, які нечым яе нагадвае. Так, у народных песнях калінка, рабінка, лілея сімвалізуюць дзявочае хараство. У многіх паэтычных творах ноч абазначае гора і няшчасце, а сонца — наадварот, шчасце і дабрабыт. За сімваламі значэнне замацоўваецца трывала, паўтараецца ў многіх творах, таму лёгка пазнаецца і ўспрымаецца.

У вершы «Слуцкія ткачыхі» вобраз васілька — сімвал Бацькаўшчыны, народнага мастацтва. «Багдановічаўскі “цвяток радзімы васілька” стаў сімвалам нацыянальнай адметнасці беларускага мастацтва. Гэта сімвал нацыянальны, які народжаны самой гармоніяй прыроды, “жывой красой” неба, жытняга поля, ракі, лесу, і ўзнікае ў творы мастацтва

як бы падсвядома, сам па сабе... Ён убачаны нібы ў “яснай далі”, узбуйнена, святочна, у светлым ззянні і харастве роднай зямлі» *(Тамара Чабан)*.

1. Чаму васілёк, а не іншая кветка, стаў сімвалам беларускага мастацтва?
2. Прывядзіце прыклады сімвалаў з вядомых вам вершаў, народных песень і растлумачце, чаму гэтыя вобразы сталі сімвалічнымі.

Уладзімір Караткевіч

БЕЛАРУСКАЯ ПЕСНЯ

Дзе мой край? Там, дзе вечную песню пяе Белавежа,
Там, дзе Нёман на захадзе помніць варожую кроў,
Дзе на ўзвышшах Наваградскіх дрэмлюць
суровыя вежы
І вішнёвыя хаты глядзяцца ў шырокі Дняпро.
Ты ляжыш там, дзе сіняя Прыпяць ласкава віецца,
Дзе Сафія[1] плыве над Дзвіною, нібы карабель...
Там, дзе сэрца маё з першым крокам,
як молат, заб’ецца,
Калі б нават сляпым і глухім я прыйшоў да цябе.
Што сляпым? Нават мёртвым успомню высокія зоры,
Над ракою чырвонай і цьмянай палёт кажаноў,
Белы ветразь на сініх, на гордых, як мора, азёрах,
І бары-акіяны, і неба — разлівы ільноў.
Дзе мой край?
Там, дзе людзі ніколі не будуць рабамі,
Што за поліўку[2] носяць ярмо ў безнадзейнай турме,
Дзе асілкі-хлапцы маладымі ўзрастаюць дубамі,
А мужчыны, як скалы — ударыш, і зломіцца меч.
Дзе мой край?
Там, дзе мудрыя продкі ў хвоях паснулі,
Дзе жанчыны, як радасны сон у стагах на зары,

---

[1] *Сафі́я* — будынак старажытнага сабора ў Полацку.

[2] *По́ліўка* — суп з якой-небудзь прыправай (мучной, бульбяной, крупяной і г. д.); тут: сродак фізічнага існавання.

А дзяўчаты, як дождж залаты. А сівыя матулі,
Як жніўё з павуціннем і добрае сонца ўгары.
Там звіняць неўміручыя песні на поўныя грудзі,
Там спрадвеку гучыць мая мова, булатны клінок.
Тая гордая мова, якую й тады не забудзем,
Калі сонца з зямлёю ў апошні заглыбяцца змрок.
Ты — наш край. Ты — чырвоная груша
над дзедаўскім домам,
Лістападаўскіх знічак густых фасфарычная раць[1],
Ты — наш сцяг, што нікому, нікому на свеце, нікому
Не дамо абсмяяць, апаганіць,
забыць ці мячом зваяваць.
Мы клянёмся табе баразной сваёй першай на полі
І апошняй раллёй, на якую ўпадзём у журбе.
Мы клянёмся табе, што ніколі,
Ніколі,
Ніколі,
Так,
Ніколі не кінем,
Не кінем,
Не кінем цябе.

1. У чым адметнасць інтанацыі гэтага верша?
2. Якое пытанне паўтарае паэт? Якія звесткі з гісторыі Беларусі дапамагаюць знайсці адказ на гэтае пытанне? Якія прыкметы роднага краю з'яўляюцца ўстойлівымі сімваламі Радзімы, народнымі святынямі?
3. Якія эпітэты і параўнанні, ужытыя для характарыстыкі роднай мовы і песні, дапамагаюць зразумець галоўную думку твора?
4. Паспрабуйце даць адказ на пытанне «Дзе твой край?». Што вы ведаеце пра тую вёску ці горад, якія лічыце сваёй радзімай?
5. Чаму верш «Беларуская песня» заканчваецца радкамі клятвы роднаму краю? Прачытайце іх уголас. Як тут выяўляецца грамадзянская пазіцыя паэта?
6. Вызначце памер верша. Звяртайце ўвагу на радкі, па якіх зрабіць гэта лягчэй, напрыклад: «І вішнёвыя хаты глядзяцца ў шырокі Дняпро». Як вершаваны памер дапамагае стварыць інтанацыю твора?

---

[1] *Раць* — войска; тут: вялікая колькасць.

7. Прачытайце ў Слоўніку літаратуразнаўчых тэрмінаў, што такое ода. Ці можна назваць одай верш Уладзіміра Караткевіча «Беларуская песня»? Абгрунтуйце сваю думку. Якія яшчэ творы велічнага, узнёслага гучання, у якіх услаўляецца родная зямля, мова, песня, вам вядомы з папярэдніх класаў або з самастойнага чытацкага вопыту?
8. Падумайце, якія з вобразаў роднага краю, створаных у прачытаных вамі вершах, найбольш блізкія вам. Выкарыстоўваючы іх, намалюйце словамі карціну «Мой родны край».
9. Пазнаёмцеся па кнізе «Памяць зямлі беларускай», стваральнікам якой быў Уладзімір Караткевіч, з архітэктурнымі помнікамі Беларусі. Архітэктуру называюць «застылай музыкай». Паспрабуйце паразважаць, якая мелодыя гучыць у строгім абрысе Белай вежы, у вытанчаным сілуэце Сафійскага сабора ў Полацку, у класічных мурах Мірскага замка (гл. уклейку).

Вучымся выразна чытаць верш

Перад чытаннем верша трэба вызначыць яго ідэю, асноўную інтанацыю гучання і мэту, якую ставіць перад сабой чытальнік.

Ідэя верша «Беларуская песня» — клятва вернасці свайму краю, асноўная інтанацыя — велічная, узнёсла-ўрачыстая.

Мэта чытання — перадаць захапленне прыгажосцю, слаўнай гісторыяй і народам Беларусі.

Вылучаем сэнсавыя часткі твора і складаем партытуру чытання. У кожнай частцы паэт шукае адказ на пытанне «Дзе мой край?». Слова «край» выдзяляецца лагічным націскам і кожны раз гучыць з новым падтэкстам. Першая частка дае адказ на пытанне, расказваючы пра гістарычныя і геаграфічныя сімвалы Беларусі. Новыя і сэнсава важныя паняцці, паўторы, параўнанні, парушэнне прамога парадку слоў выдзяляюцца лагічным націскам (падкрэсліваем словы) і лагічнымі паўзамі (ставім у залежнасці ад працягласці паўзы значок | або ||).

Калі нечаканы выраз, трапная метафара патрабуюць эмацыянальнага вылучэння, ставім значок псіхалагічнай паўзы (V). Павышэнне і паніжэнне тону голасу абазначаем стрэлачкай над словам.

Дзе мой край?| Там,| дзе вечную песню пяе Белавежа,‖
Там, дзе Нёман| на захадзе| помніць варожую кроў,
Дзе на ўзвышшах Наваградскіх| дрэмлюць суровыя вежы‖
І вішнёвыя хаты| глядзяцца ў шырокі Днярпо.
Ты ляжыш там, дзе сіняя Прыпяць‖ ласкава віецца,‖
Дзе СафіяV плыве над Дзвіною,| нібы карабель...
Там,| І дзе сэрца маё з першым крокам,| як молат, заб’ецца,|
Калі б нават сляпым і глухім я прыйшоў да цябе.
Што сляпым? Нават мёртвым успомню высокія зоры,|
Над ракою чырвонай і цьмянай палёт кажаноў,
Белы ветразь на сініх, на гордых,| як мора, азёрах,|
І бары-акіяны, і неба — разлівы ільноў.

Асэнсуйце прапанаваную партытуру чытання першай часткі верша, падумайце, ці з усім вы згодны, прапануйце свае варыянты, калі яны ёсць. Зрабіце самастойна партытуру чытання наступных частак твора і падрыхтуйце дома выразнае чытанне верша.

*Шандар Пецёфі
(1823—1849)

Венгерскі паэт, рэвалюцыйны дэмакрат, аўтар лірычных вершаў, паэм, публіцыстыкі.

ПАТРЫЯТЫЧНАЯ ПЕСНЯ

Я сэрцам і душою твой,
Мая краіна!
Бо прысягнуў табе адной
Любоўю сына.

Мая душа — прасветлы храм,
Яснота неба.
Я за цябе яе аддам,

* Тут і далей зорачкай пазначаны творы, рэкамендаваныя праграмай для чытання і абмеркавання.

А калі трэба,
Няхай з грудзей юначых кроў
Струменем хлыне,
Каб шчасце вечнае было
Маёй Айчыне.

Я назаўсёды прысягаў
Высокай мэце,
Бо толькі ты адна ў мяне
На гэтым свеце.

Я друг і следам за табой
Усюды крочу,
Не так, як цень, а ў ясны дзень
І цёмнай ноччу.

І ўжо калі гусцее змрок
І дзень канае,
Расце ў душы мой горкі сум,
Любімы краю.

Я да тваіх іду сыноў,
І песняй роднай
Мы молімся, каб ты заўжды
Была свабоднай.

Пераклад М. Хведаровіча

1. Верш выдатнага венгерскага паэта Шандара Пецёфі «Патрыятычная песня» напісаны ў далёкім XIX стагоддзі, калі яго народ змагаўся за незалежнасць ад Аўстрыйскай імперыі. Растлумачце, чаму твор так названы, якую галоўную думку ён сцвярджае.
2. Як звязаны з назвай твора яго інтанацыя, лёгкае, напеўнае гучанне?
3. Што аб’ядноўвае і што розніць вершы Шандара Пецёфі «Патрыятычная песня» і Уладзіміра Караткевіча «Беларуская песня»? Чаму ў Уладзіміра Караткевіча песня менавіта беларуская?

«ПАЗНАЦЬ, ЗНАЙСЦІ СЯБЕ Ў БЯЗМЕЖНЫМ»

ФІЛАСОФСКАЯ ЛІРЫКА

Максім Танк

ШЧАСЦЕ

Простае шчасце людское,
Так, як і наша з табою,

Пэўна, складаецца з солі,
З хлеба, сабранага ў полі,

З поту, з дарожнага пылу,
З роднага небасхілу,

З дружбы, мацнейшай ад смерці,
З песні... І так мне здаецца:

Каб з чаго іншага скласці,
Дык ці было б яно шчасцем?

1. Вы не раз чулі, як людзі жадаюць адзін аднаму шчасця. А ці задумваліся, што такое шчасце?
   Падбярыце сінонімы да гэтага слова.
2. Раскрыйце сэнс паэтычных вобразаў, з якіх Максім Танк «складае» чалавечае шчасце.
   Чаму менавіта гэтыя паняцці найперш вылучае паэт?
3. Чаму пасля слоў «З песні...» стаіць шматкроп'е? З чаго яшчэ, на вашу думку, складаецца «простае шчасце людское»?
4. Вызначце вершаваны памер твора, адкажыце, як рытм звязаны з апавядальнай інтанацыяй верша.
5. Як трэба чытаць гэты верш: гучна і пафасна ці ўдумліва і разважліва? Падрыхтуйцеся да выразнага чытання твора.

*Сяргей Грахоўскі

* * *

Чалавеку патрэбна не слава,
А людская увага і ласка,
І сардэчнае шчырае слова,
І вясёлая добрая казка.

Чалавеку патрэбна усмешка
Незнаёмых вачэй і знаёмых,
Каб дажджамі размытая сцежка
Стала лёгкай на кручах[1] і стромах[2].

Чалавеку не трэба спагады, —
Дабрата чалавеку патрэбна,
Каб, мінаючы прорвы і спады,
Узбірацца на стромкія грэбні,

Каб сяброў сустракаў клапатлівых
На дарогах, далёкіх ад дому,
І каб сам быў заўсёды шчаслівы,
Калі шчасце прыносіш другому.

1. З якіх дэталяў, своеасаблівых «мікравобразаў», ствараецца ў вершы метафара жыццёвага лёсу чалавека?
2. Што патрэбна чалавеку, каб яго шлях быў больш светлым і радасным?
3. У чым, на думку лірычнага героя, сэнс чалавечага жыцця? Адкажыце радкамі верша.
4. Вершы Максіма Танка «Шчасце» і Сяргея Грахоўскага «Чалавеку патрэбна не слава...» з'яўляюцца роздумам аб сэнсе чалавечага жыцця, прызначэнні чалавека. Пакажыце, што ў гэтых творах думка зліта з пачуццём (звяртайце ўвагу на эпітэты «сардэчнае шчырае», «вясёлая добрая» і г. д.).
5. Што збліжае і што адрознівае лірычных герояў верша Сяргея Грахоўскага «Чалавеку патрэбна не слава...» і Максіма Танка «Шчасце»?

[1] *Кру́ча* — крутое месца, круты бераг, спуск.
[2] *Стро́ма* — круты схіл, абрыў.

*Васіль Зуёнак

* * *

Дала прырода мне ваду і цвердзь,
Дала агонь, каб не блукаў я слепа,
Дала жыццё, а з ім дала і смерць...
Дала зямлю — а я глядзеў у неба...

А каб агонь свяшчэнны не патух,
Каб зноў не захлынуўся чорнай багнай,
Дала прырода мне высокі дух.
А я ствараў багоў — я неба прагнуў...

Я шмат чаго тады не разумеў,
Я і цяпер, бадай, не разумею.
Я іх ствараў, і з імі я старэў.
Як і цяпер ствараю і старэю.

Усё, што сёння ісцінай слыло,
Назаўтра толькі рэхам адгукнецца.
І сіняй птушкі сіняе крыло
Кавалкам неба ў сэрцы разаб'ецца.

Загадкі непазнаных берагоў...
Адказ — адна ў мяне самаахова.
Адказу не было — ствараў багоў,
Каб потым іх забыць і ўславіць новых.

Бог — невядомасць. Вечны вораг мой.
Яго ствараю і яго звяргаю.
Бясконцы з ім і ўсеадольны бой.
Яго кляну, яму ж і прысягаю.

Быў атам — «непадзельны» — атам-бог.
Цяпер — цяпер ажно дыханне зойме,
Калі ступаю праз яго парог —
Галактыку адкрыць у пі-мезоне[1].

[1] *Пі-мезóн* — элементарная часціца *(фіз.)*.

Якое неба заўтра засялю?
З якіх арбіт пабачацца мне цуды?
Не ведаю. Адно скажу: зямлю —
Вось гэту, грэшную, ніколі не забуду.

Як ёсць яна — я сэнс вышынь лаўлю.
Ствараю неба — сонечны паганец[1].
А дайце неба — я ствару зямлю,
І пойдзе ўсё зваротнымі кругамі.

1. Як у творы асэнсоўваецца стваральная сіла чалавечага розуму?
2. Выраз «сонечны паганец» вяртае нас да старадаўніх, дахрысціянскіх вераванняў нашых продкаў. Чаму, на вашу думку, лірычны герой так сябе называе?
3. Якія навуковыя тэрміны ўжыты ў творы? З якой мэтай?

*Леанід Дайнека

За крокам крок. І дзень за днём.
Усход жыцця. Жыцця змярканне.
Нас паліць стоеным агнём
Вялікай страты прадчуванне.

Дзе той парог апошні, дзе?
Чаму мацнее сум у сэрцы?
Жывем каля магіл людзей
І вечна марым аб бяссмерці.

1. Які радок верша перадае хуткаплыннасць чалавечага жыцця? Растлумачце сэнс ужытай у ім метафары.
2. Да каго звернуты пытанні, якія ёсць у творы? З якой мэтай аўтар ужывае такі прыём?
3. Чаму чалавек павінен задумвацца аб тым, як хутка бяжыць час?

---

[1] *Сонечны пага́нец* — тут: прыхільнік язычніцкіх вераванняў, адухаўлення прыроды.

Анатоль Вярцінскі

* * *

Жыццё даецца, каб жыццё тварыць.
Каб светла-залатую яго ніць
віць і далей — любоўю, справай дзейнай
ды словам, што ад справы неаддзелена.
Тварыць!

Жыццё даецца, каб жыццё тварыць.
Надзеяй, праўдай, мужным парываннем,
высакародным, дружным намаганнем,
што потым зоркай у вяках гарыць.
Тварыць!

Жыццё даецца, каб жыццё тварыць.
Маральны самы, самы натуральны
пачатак гэты вось жыццестваральны.
Інакш — якая ад жыцця карысць?
Тварыць!

Жыццё даецца, каб жыццё тварыць.
Не марнаваць, не нішчыць, не бурыць, —
Тварыць!

1. Чаму лірычны герой верша надае такое значэнне стваральнаму пачатку? Паразважайце, ці заўсёды людзі прытрымліваюцца такой жыццёвай пазіцыі.
2. Чаму непарыўная ніць жыцця ўяўляецца паэту менавіта светла-залатой?
3. Гэты верш з'яўляецца глыбокім роздумам аб прызначэнні чалавека на зямлі і адначасова заклікам да людзей жыць актыўна і асэнсавана. Якое значэнне ў творы мае рытарычнае пытанне «інакш — якая ад жыцця карысць?»
4. Якую ролю ў вершы адыгрывае паўтор аднаго і таго ж слова-сказа ў канцы кожнай страфы? Чаму гэты сказ ужываецца з клічнай інтанацыяй?
5. Пазнаёміўшыся з вершамі-разважаннямі, паспрабуйце і самі на нейкі час стаць філосафамі. Дапішыце адным радком-падагульненнем верш Максіма Танка:

Я спытаў чалавека,
Які прайшоў праз агонь,
І воды,
І медныя трубы:
— Што самае цяжкое
На гэтым свеце?
І ён адказаў:
— ...

Параўнайце свае варыянты з вершам Максіма Танка, змешчаным у дадатку на с. 347, і паразважайце, чаму паэт даў менавіта такі адказ.

«ТЫ МНЕ ВЯСНОЮ ПРЫСНІЛАСЯ...»

ІНТЫМНАЯ ЛІРЫКА

Максім Багдановіч

РАМАНС

Зорка Венера ўзышла над зямлёю,
Светлыя згадкі з сабой прывяла...
Помніш, калі я спаткаўся з табою,
Зорка Венера ўзышла.
З гэтай пары я пачаў углядацца
Ў неба начное і зорку шукаў.
Ціхім каханнем к табе разгарацца
З гэтай пары я пачаў.
Але расстацца нам час наступае;
Пэўна, ўжо доля такая у нас.
Моцна кахаў я цябе, дарагая,
Але расстацца нам час.
Буду ў далёкім краю я нудзіцца,
У сэрцы любоў затаіўшы сваю;
Кожную ночку на зорку дзівіцца
Буду ў далёкім краю.

Глянь іншы раз на яе, — у расстанні
Там з ёй зліём мы пагляды свае…
Каб хоць на міг уваскрэсла каханне,
Глянь іншы раз на яе…

1. Зорку Венеру, якая носіць імя грэчаскай багіні харaства, беларусы завуць яшчэ і Мілавіцай. Што сімвалізуе сабой гэта зорка? Чаму яе ўзыход звязваецца з успамінамі пра каханне?
2. Якое значэнне мае эпітэт у выразе «светлыя згадкі»? Прасачыце яго сувязь з агульным уражаннем ад верша.
3. Як адносіны да каханай дзяўчыны характарызуюць лірычнага героя верша?
4. У гэтым на дзіва светлым і даверлівым вершы гучыць шкадаванне з-за расстання з каханай, аднак галоўная думка аптымістычная і жыццесцвярджальная. Паспрабуйце яе сфармуляваць, выкарыстоўваючы радкі з твора.
5. Якія радкі паўтараюцца ў вершы? З якой, на вашу думку, мэтай? Якімі яшчэ сродкамі ствараецца напеўнае, меладычнае гучанне твора?
6. Вызначце памер верша. Паразважайце, як звязаны ён са зместам твора (звярніце ўвагу, што вершы, напісаныя трохскладовымі памерамі, гучаць звычайна больш спакойна, павольна).
7. Праслухайце раманс «Зорка Венера» (музыка С. Рак-Міхайлоўскага) і скажыце, як адпавядае яго мелодыя зместу і інтанацыі верша Максіма Багдановіча.
8. Прачытайце ў Слоўніку літаратуразнаўчых тэрмінаў, што азначае слова «раманс» і зрабіце вывад аб тым, ці з'яўляецца верш М. Багдановіча класічным рамансам.

Аркадзь Куляшоў

БЫВАЙ…

Бывай, абуджаная сэрцам, дарагая.
Чаму так горка, не магу я зразумець.
Шкада заранкі мне, што ў небе дагарае
На ўсходзе дня майго, якому ружавець.

Ці помніш першае нясмелае прызнанне?..
Над намі жаўранкам звінеў і плакаў май.
Назаўтра золкае, туманнае світанне,
Суровы позірк твой і мой нямы адчай…

Пайшла, пакінуўшы мне золкі і туманны,
Палынны жаль смугой ахутаных дарог,
Каб я хвілінны боль і горыч гэтай раны
Гадамі ў сэрцы заглушыць сваім не мог.

Пайшла, ніколі ўжо не вернешся, Алеся.
Бывай, смуглявая, каханая, бывай.
Стаю на ростанях былых, а з паднябесся
Самотным жаўранкам звініць і плача май.

1. Верш «Бывай» Аркадзь Куляшоў напісаў, калі яму было чатырнаццаць гадоў, а потым на працягу ўсяго жыцця вяртаўся да твора, дапрацоўваючы і ўдасканальваючы яго. Як разумееце вы пачуцці лірычнага героя верша? Якімі словамі яны падкрэслены?
2. Як адпавядаюць малюнкі прыроды душэўнаму стану чалавека?
3. Імя дзяўчыны, як самотны ўздых, вырываецца з грудзей лірычнага героя толькі ў самым канцы верша. Якімі ж эпітэтамі называе каханую паэт? Якой яна вам уяўляецца?
4. Праслухайце песню «Алеся» (музыка Ігара Лучанка) у выкананні ансамбля «Песняры». Якіх радкоў няма ў песні? Падбярыце эпітэты, якімі можна характарызаваць мелодыю песні.
5. Прачытайце ў Слоўніку літаратуразнаўчых тэрмінаў, што такое элегія, і дакажыце, што верш «Бывай...» можна назваць элегіяй.
6. Ці ведаеце вы музычныя творы, якія маюць назву «элегія»? Што аб'ядноўвае гэтыя жанры ў музыцы і ў паэзіі?

*Сяргей Грахоўскі

* * *

Як я жыў без цябе?
І не ведаў, што недзе на свеце,
За глухімі лясамі,
За сотнямі ўзгоркаў і меж,
Не на дальнім сузор'і,
А ў нас на планеце
Ты ў зялёным і ціхім
Завулку жывеш.

Як я жыў без цябе?
А маглі ж не сустрэцца ніколі,

За паўкроку адно
Аднаго абмінуць,
Разысціся,
Як сцежкі расходзяцца ў полі,
І не знаў бы,
За страту каго папракнуць.

Мабыць, трэба было
Праваліцца ў пекла,
Траціць блізкіх,
Пакутаваць, мерзнуць, гарэць,
Ратавацца,
Каб лютая сцюжа не ссекла,
Каб цябе
Пад Палярнаю зоркай
Сустрэць,
І пазнаць,
І адразу забыцца аб крыўдзе,
Каб убачыць праменьчыкі
У зрэнках тваіх,
Нарадзіцца ізноў
І паверыць, што прыйдзе
І збавенне, і шчасце
Адно на дваіх;
Падабрэць, памякчэць,
Назаўсёды скарыцца
Непадкупнай
Суровай тваёй чысціні,
Каб істоты тваёй адкрываць
Таямніцы,
Каб душу гартаваць
На высокім агні.

Час ляціць і ляціць,
Завіруха завеяла скроні,
Пакідаюць насечкі
Гады на ілбе.
Я гляджу на цябе,
Я дзіўлюся і сёння,
Чым я жыў без цябе,
Як я жыў без цябе?

1. Чаму лірычны герой паўтарае адно і тое ж пытанне, якім верш і пачынаецца, і заканчваецца? Што падкрэслівае такая кальцавая кампазіцыя твора?
2. Прачытайце радкі верша, у якіх сцвярджаецца думка, што каханне робіць чалавека лепшым.
3. Якія вобразы сведчаць аб тым, што верш напісаны ад імя немаладога чалавека? Ці захаваў ён адчуванне непаўторнага цуду кахання?
4. З якога параўнання ўзнікла метафара «завіруха завеяла скроні»? З якой мэтай яна ўжыта ў творы?

*Міхась Шушкевіч

ТЫ МНЕ ВЯСНОЮ ПРЫСНІЛАСЯ

Летняя ночка купальная
Яснай растаяла знічкаю.
Падаюць зоры світальныя
Ў чыстыя воды крынічныя.

Ой ты, дзяўчыначка мілая,
Як жа ты свет упрыгожыла.
Ластаўка ты легкакрылая,
Светлы мой сон растрывожыла.

Ты мне вясною прыснілася
Неразгаданымі чарамі,
Сэрца парыўна забілася
Вольнымі крыламі-марамі.

Пэўна, цябе, ненаглядная,
Стрэў я часінай удалаю.
Ты мая доля спагадная,
І не шкадую німала я.

1. Аўтар верша, які вы прачыталі, не займаўся спецыяльна літаратурнай творчасцю. Па яго прызнанні, гэты верш быў напісаны пад уражаннем першага спаткання з каханай дзяўчынай. Якім настроем прасякнуты твор?
2. Як ствараецца ў вершы адчуванне чысціні, прыгажосці, музыкі?
3. Падбярыце адно, але самае змястоўнае і пяшчотнае слова, якое магло б стаць назвай гэтага верша.
4. Праслухайце песню (музыка Ю. Семянякі) на верш Міхася Шушкевіча «Ты мне вясною прыснілася», вызначце адметнасць яе інтанацыі.

Інверсія

Каб падкрэсліць сэнсава важнае слова, паэт часта адступае ад звычайнага, прамога парадку слоў у сказе. Так, ён гаворыць: «Ой ты, дзяўчыначка мілая...», хоць пры агульнапрынятым парадку слоў трэба было б сказаць «мілая дзяўчыначка». Эпітэт «мілая» тут вылучаецца інтанацыяй. Аўтар нібы замірае, запавольвае дыханне перад гэтым словам, якое нельга вымавіць адразу. Слова, якое стаіць не на прывычным месцы, заўсёды выдзяляецца паўзай (напрыклад, дзеясловў з метафарычным значэннем «упрыгожыла» ў наступным радку). Нельга, немагчыма аднавіць прамы парадак слоў у вершы Міхася Шушкевіча — тады знікла б паэзія. Незвычайны парадак слоў у сказе, які дапамагае зразумець ідэю твора і стварае своеасаблівы ўсхваляваны настрой, называецца ***інверсіяй*** (ад лац. — перастаноўка).

Прывядзіце прыклады інверсіі з прачытаных вамі раней вершаў і растлумачце яе ролю ў творы.

«З ПРЫРОДАЙ ЗЛІЎШЫСЯ ДУШОЙ...»

ПЕЙЗАЖНАЯ ЛІРЫКА

Якуб Колас

(Урывак з паэмы «Сымон-музыка»)

* * *

О, край родны, край прыгожы!
Мілы кут маіх дзядоў!
Што мілей у свеце божым
Гэтых светлых берагоў,
Дзе бруяцца срэбрам рэчкі,
Дзе бары-лясы гудуць,
Дзе мядамі пахнуць грэчкі,
Нівы гутаркі вядуць;

Гэтых гмахаў[1] безгранічных
Балатоў тваіх, азёр,
Дзе пад гоман хваль крынічных
Думкі думае прастор;
Дзе увосень плачуць лозы,
Дзе вясной лугі цвітуць,
Дзе шляхом старым бярозы
Адзначаюць гожа пуць?..

1. У чым адметнасць і прывабнасць беларускіх пейзажаў (гл. уклейку з рэпрадукцыяй карціны Г. Вашчанкі «Мір зямлі маёй»)?
2. Пакажыце, як праз зрокавыя, гукавыя і нават пахавыя вобразы Якуб Колас стварае адчуванне паўнаты і радасці жыцця.
3. Якія радкі сведчаць аб духоўнай сувязі лірычнага героя твора з продкамі, аб яго любові да роднай зямлі, замілаванні ёю? Якое значэнне мае эпітэт у выразе «светлыя берагі»?
4. Якую ролю ў творы адыгрывае адухаўленне прыроды? Прывядзіце прыклады з тэксту.
5. Гэты твор, па сутнасці, з'яўляецца адным разгорнутым пытаннем, звернутым да чытача. Які адказ вы можаце даць на яго?
6. Зрабіце ілюстрацыю (ці вусны слоўны малюнак) да гэтага ўрыўка з паэмы Якуба Коласа «Сымон-музыка». Абгрунтуйце ваш выбар вобразаў, колераў, мастацкіх дэталяў.

Максім Багдановіч

* * *

Цёплы вечар, ціхі вецер, свежы стог,
Улажылі спаць мяне вы на зямлі.
Не курыцца светлы пыл усцяж дарог,
Ў небе месяца прагляну ў бледны рог,
Ў небе ціха зоркі расцвілі.

Знічка коціцца агністаю слязой,
Прашумела мякка скрыдламі сава;
Бачу я, з прыродай зліўшыся душой,
Як дрыжаць ад ветру зоркі нада мной,
Чую ў цішы, як расце трава.

[1] *Гмах* — велічны будынак, тут: бязмежная прастора.

1. Ахарактарызуйце радкамі верша душэўны стан лірычнага героя. Якія выразы найярчэй перадаюць злітнасць чалавека з прыродай?
2. Як вы разумееце выраз «знічка коціцца агністаю слязой»?
3. Якую мастацкую ролю адыгрывае паўтарэнне зычных гукаў «ц — ц — ц — с — с» у першым радку верша? Як выкарыстоўваецца гукапіс у наступных радках?
4. Якімі сродкамі ствараецца мелодыя верша? Як бы вы вызначылі яе танальнасць, рытм?
5. Паслухайце накцюрн «Ноч» Анатоля Багатырова (ці «Накцюрн» Фрыдэрыка Шапэна) і параўнайце ўражанні ад верша Максіма Багдановіча і музыкі.

*Поль Верлен
(1844—1896)

Французскі паэт-сімваліст. Увёў у лірычную паэзію складаны свет пачуццяў, перажыванняў. Надаў вершу тонкую музыкальнасць. Аўтар шматлікіх зборнікаў вершаў.

ШАРАЯ ГАДЗІНА[1]

Месяц чырвоны над нізкім туманам,
Нізкі туман карагодзіць над лугам,
Там, дзе чароты зялёным паўкругам
Глухнуць у крэхаце жаб несціханым.

Вейкі заплюшчылі зноўку лілеі,
Стойкія, стромкія, далечна ў полі,
Як таямнічыя знакі, таполі,
І светлячок па-над лозамі тлее;

Совы, разняўшы цяжэзныя крылы,
З прыцемкаў мякка вяслуюць і шэра,
Млечны Шлях пенячы, ціха Венера
Долу сыходзіць... Ноч наступіла.

Пераклад Алега Лойкі

---

[1] *Шарая гадзіна* — час перад змяркканнем.

Параўнайце пейзажныя вершы Максіма Багдановіча і французскага паэта Поля Верлена па наступным алгарытме:

- настрой твораў;
- уважлівасць паэтаў да канкрэтных дэталяў;
- колеры, якія выкарыстоўваюцца аўтарамі;
- меладычнасць гучання, інтанацыя твора.

*Васіль Зуёнак

* * *

Над зямлёю
　　　　　　шугае верасень —
Восені ветразь!..
І плывуць у блакіце чыстым
Ключы галасістыя...
Цеплыня адплывае,
　　　　　крылом узмахнуўшы аслаблым —
Летам бабіным...
Не трымайце ж мяне сягоння,
Сцены хат,
　　　　　　у лагодным палоне:
Над зямлёю шугае верасень —
Восені ветразь!..
Не шукайце, сябры і родныя,
Не гукайце на сцежках пройдзеных...
Не сустрэнемся — слёз не ліце.
«Ён жа быў летуценнік, — скажыце, —
Ён таксама паплыў
　　　　　　　　　　пад вераснем,
Ён —
　　　пад ветразем...»

1. Якія ўражанні ў вас звязаны з надыходам ранняй восені? Ці адпавядае верш вашаму ўспрыманню гэтай пары года?
2. Прасачыце, як умела карыстаецца паэт гукапісам. Звярніце асаблівую ўвагу на гучанне ключавога вобраза «восені ветразь», які некалькі разоў паўтараецца ў вершы.
3. Як вы разумееце выраз «шугае верасень»?
4. Як характарызуюць лірычнага героя твора словы «ён — пад ветразем»?

5. Параўнайце верш Васіля Зуёнка «Над зямлёю шугае верасень...» і рэпрадукцыю карціны Леаніда Шчамялёва «Асенні кліч» (гл. форзац 2). Які настрой і якія вобразы іх аб'ядноўваюць? Якія колеры пераважна выкарыстоўвае мастак? Як перададзены ў карціне парыў аўтара да высокай мары, яго летуценні?
6. Праслухайце, калі ёсць такая магчымасць, музычную п'есу «Верасень» са зборніка «Поры года» Пятра Чайкоўскага (ці «Поры года» Антоніа Вівальдзі). Параўнайце ўражанні ад музыкі, верша Васіля Зуёнка і твора пейзажнага жывапісу. Якія агульныя выяўленчыя сродкі ў гэтых розных відаў мастацтва?

***Алесь Наўроцкі**

ЧАТЫРОХГРАННАЯ ВАЗА

Чатырохгранная ваза — гэта прырода,
дзе чатыры грані — поры года.

I

Зіма

Зноў заснежыла. Можа, ў раз соты.
Хоць бы ўгледзець душу адну.
Белыя скруткі калючага дроту
кідае мяцеліца мне на спіну.

Дрыжыць агеньчык. Можа, там прыстану?
Сярод шалёнага енку-выцця
ў неаглядна-сівым акіяне
змагаецца кропля жыцця.

II

Вясна

Не мыльная пена зляцела з коней былінных —
дзе-нідзе бялее набраклы вадою снег.
І не шабельны звон зазвінеў над лагчынай —
ручаі звіняць, з узгорка ўзяўшы разбег.

Пазіраеш — і травы зямлю пакрылі.
І куды вачыма ні кінь —

начапілі бярозы зялёныя крыллі
і ўзлятаюць пад неба сінь.

III

Лета

Знаёмы малюнак, сэрцу блізкі:
прападае сцежка ў прасторах палёў.
Жыта то нахіляецца нізка,
то выпрамляецца зноў.

Вунь хмарка плыве над лесу дзялянкай,
грымоты далёкія нараслі.
Эх, як жа пасля ўсмешак маланкі
лёгка дыхаць зямлі!

IV

Восень

Лета, зматвай свае вудачкі!
Дрэвы выплаўляюць руду.
Вецер свістаў спачатку ў дудачку,
потым у дудку, а ўжо затым у дуду.

Адзвінелі промняў сонечныя прыіскі,
адзвінеў дажджоў серабрысты апад,
адзвінелі лісты і ляжаць залацістым прысакам[1], —
што прайшло, не вернеш назад.

Чатырохгранная ваза — гэта прырода,
дзе чатыры грані — поры года.

1. Як мяняецца інтанацыя ў кожнай з чатырох частак верша? Чым гэта абумоўлена?
2. Для кожнай пары года паэт знаходзіць зрокава выразныя вобразы, афарбаваныя ў пэўны колер. Знайдзіце іх у тэксце, паразважайце над іх прызначэннем. Чаму, на вашу думку, у вобразах навальнічнага лета не вылучаны нейкі адзін колер?

---

[1] *При́сак* — гарачы попел.

3. У вершы мы не толькі «бачым», але і «чуем» кожную пару года. Якія слыхавыя вобразы дапамагаюць нам у гэтым? Чаму, прапануючы нам паслухаць, напрыклад, мелодыю восені, аўтар ужывае такую метафару: «Вецер свістаў спачатку ў дудачку, потым у дудку, а ўжо затым у дуду»? Прасачыце, як па-майстэрску выкарыстоўвае паэт магчымасці гукапісу, свядома паўтараючы ў карцінах пор года пэўныя зычныя і галосныя гукі.
4. Паспрабуйце намаляваць рознакаляровую чатырохгранную вазу прыроды. Магчыма, гэта будзе букецік: замерзлая галінка, коцікі вярбы, кветка васілька і яркі кляновы ліст... А можа, нешта іншае, што будзе толькі намёкам, згадкай?

Паэтычныя тропы

Словы, якія набываюць у вершы пераносны сэнс, называюцца ***тропамі***. Яны надаюць паэтычнай мове асаблівую выразнасць, падкрэсліваюць самыя характэрныя прыкметы прадметаў і з'яў.

З тропаў вам ужо вядомы асноўныя, якія складаюць «табліцу множання» паэтычнай мовы (менавіта множання, бо яны значна ўзмацняюць уздзеянне слова). Гэта ***эпітэты*** («светлыя згадкі», «простае шчасце людское»), ***параўнанні*** («дзяўчаты, як дождж залаты»), ***сімвалы*** («цвяток радзімы васілька»), ***метафары*** («у небе ціха зоркі расцвілі»). Разнавіднасцю метафары з'яўляецца ***адухаўленне*** («вецер вые ў сотні труб») і ***ўвасабленне*** («колас з коласам гутарку дзіўную завялі...»). Часта верш будуецца як адно разгорнутае ўвасабленне.

У аснове паэтычнага тропа заўсёды перанос прыкмет адной з'явы ці прадмета на другую. Гэты перанос можа адбывацца не толькі на аснове падабенства, але і на аснове іншых сувязей. Так узнікае ***метанімія*** (ад грэч. «перайменаванне») — замена аднаго слова ці выразу іншым на аснове знешняй ці ўнутранай сувязі паміж з'явамі. Напрыклад, Васіль Зуёнак гаворыць «не трымайце ж мяне сягоння, сцены хат, у лагодным палоне», маючы на ўвазе пад выразам «сцены хат» звыклы ўклад чалавечага жыцця.

Разнавіднасцю метаніміі з'яўляецца ***сінекдаха*** — мастацкі троп, заснаваны на замене множнага ліку адзіночным

ці часткі цэлым (або наадварот). Памятаеце, гаворачы пра слуцкіх ткачых, Максім Багдановіч выхоплівае з іх вобліка толькі адну дэталь: «тчэ, забыўшыся, рука...». Зразумела, што не толькі рука тчэ ўзор, ды тым больш яна не можа «забыцца». Вобраз, спецыяльна ўзбуйнены, служыць для абазначэння ўсёй асобы чалавека.

Паэтычныя тропы — аснова мастацкай выразнасці мовы.

Прывядзіце прыклады метаніміі і сінекдахі з прачытаных вамі раней вершаў, растлумачце сувязі, якія ляглі ў іх аснову, і ролю гэтых тропаў у творах.

Максім Багдановіч

САНЕТ

Замёрзла ноччу шпаркая крыніца;
Твая пара, зімовая нуда!
Цяпер няма ўжо руху ні сляда,
І нават зверху слоем снег лажыцца.

Ды ўсё дармо, бо там, пад ім, струіцца
Магутная, жывучая вада.
Чакай! Яе йшчэ прыйдзе чарада!
Здалее хваляў хор на вольны свет прабіцца.

Прыклаў я гэты сімвал да сябе,
Схіліўшыся ў надсільнай барацьбе,
І разгадаў прыроды роднай словы.

Як — прамаўчу, бо кожны з вас — паэт.
Рассейце ж самі лёгкі змрок прамовы,
Сваёй душы туды праліце свет!

1. Згадзіўшыся са словамі Максіма Багдановіча аб тым, што кожны з вас — паэт, паспрабуем разгадаць загадку «шпаркай крыніцы». Перачытайце першую частку верша і падумайце, як мог узнікнуць гэты вобраз.
2. У першай частцы «Санета» Максім Багдановіч развівае тэму «шпаркай крыніцы», у другой — прапануе кожнаму прыкласці гэты сімвал да сябе і зрабіць вывад. Якім ён атрымаўся ў вас?

3. Дакажыце на аснове радкоў з твора, што яго лірычны герой, нягледзячы на тое, што жыццёвы лёс яго складваўся няпроста, аптымістычна ставіцца да жыцця.
4. Вызначце колькасць радкоў у творы і асаблівасці яго кампазіцыі.
5. Успомніце, што такое рыфма. Вызначце, якія радкі рыфмуюцца ў першай частцы верша, якія — у другой. Абазначце аднолькавыя сугуччы аднолькавымі літарамі і запішыце своеасаблівую формулу — рыфмаграму верша.
6. Прачытайце ў Слоўніку літаратуразнаўчых тэрмінаў, чым вызначаюцца змест і форма санета. Ці адпавядае верш Максіма Багдановіча гэтым патрабаванням?

*Уільям Шэкспір
(1564—1616)

Буйнейшы англійскі драматург і паэт, стваральнік санетаў, аўтар трагедый «Рамэа і Джульета», «Гамлет», «Атэла», «Кароль Лір» і інш.

САНЕТ

Мастак цудоўны, незраўнаны час,
Нам творыць дзівы дзіўныя няспынна.
І ён жа ўсё, што захапляе нас,
Нібы тыран, знішчае ў міг адзіны.

Пазбыўшы лета, ён зіму вядзе
Ў наш засмучоны свет, такі знямелы,
Дзе ані кветкі, ні лістка нідзе,
Адзін прасцяг сцюдзёны, снежна-белы.

І каб не кветак хараство за шклом,
Зачыненых у ільдзяной вязніцы,
На цуды, створаныя мастаком,
Маглі б, напэўна, мы ураз забыцца.

Зіхценне кветкі страцілі зімой,
Але душа іх з той жа пекнатой.

Пераклад Уладзіміра Дубоўкі

1. Які вобраз у санеце Уільяма Шэкспіра перадае ідэю неўміручасці душы, вялікую сілу прыгажосці?

2. Чым блізкія санеты Уільяма Шэкспіра і Максіма Багдановіча па галоўнай думцы?
3. Санеты звычайна пішуцца адным вершаваным памерам. Вызначце яго на прыкладзе гэтага твора.
4. Параўнайце колькасць радкоў у санетах і іх падзел на страфы і сэнсава закончаныя часткі.

*Адам Міцкевіч
(1798—1855)

Славуты польскі паэт, аўтар шматлікіх балад, рамансаў, санетаў, паэм і паэтычных аповесцей.

ДА НЁМНА

Нёмне, рэчка мая радаводная, дзе
Тыя воды, што браў я ў маленстве ў далоні,
Па якіх потым плыў у самотным палоне
Сэрца ахаладзіць, што зайшлося ў нудзе?

Цень красы тут Лаура сачыла ў вадзе,
Валасы заплятала і ўквечвала скроні,
Вобраз вабны яе ў срэбных хваляў на ўлонні
Я слязамі ў запале муціў у жудзе.

Радаводная рэчка мая, дзе твае
Маладыя крыніцы, што білі няспынна,
Дзе нявінных гадоў навіна і правіна?

Дзе бунтоўнасць, якой мне цяпер не стае?
Дзе Лаура мая? Дзе былая сябрына?..
Знікла ўсё, што ж не высахлі слёзы мае!

Пераклад Рыгора Барадуліна

1. Адам Міцкевіч нарадзіўся на Навагрудчыне і ўсё жыццё апяваў сваю радзіму ў паэзіі. З чым звязаны для лірычнага героя ўспамін пра раку Нёман?
2. Знайдзіце ў вершы зваротак і растлумачце яго ролю.
3. Чаму выраз «рэчка мая радаводная» паўтараецца двойчы, як гэта звязана з кампазіцыяй санета?
4. Параўнайце твор Адама Міцкевіча з прачытанымі санетамі Максіма Багдановіча і Уільяма Шэкспіра.

Анатоль Грачанікаў

* * *

Свяці, кахання чыстая зара!
Свяці — пачуццяў сэрцаў не азмрочвай —
Над доляй плугара і песняра
І над высокай доляю жаночай.
Усіх людзей пара табе, пара,
З'яднаць чароўнай сілаю прарочай.
Бо, сапраўды, на свеце без кахання
Жыцця няма — ёсць толькі існаванне.

1. Які настрой пануе ў гэтым творы? Падбярыце адпаведныя выразы з тэксту.
2. Раскрыйце сэнс метафары, якую ўжывае паэт, каб вызначыць пачуццё кахання. У якіх яшчэ з вядомых вам вершаў каханне звязвалася з вобразамі зоркі, заранкі?
3. У вершы арганічна спалучаюцца філасофскія і інтымныя матывы. Прачытайце радкі, у якіх сфармулявана галоўная думка твора. Чаму, на вашу думку, аўтар ужывае слова «сапраўды»? Да каго яно звернута?
4. Вызначце асаблівасці рыфмоўкі радкоў у творы.
5. Верш А. Грачанікава «Свяці, кахання чыстая зара!» — гэта актава. Прачытайце ў Слоўніку літаратуразнаўчых тэрмінаў, у чым адметнасць актавы як класічнай формы верша. Чаму яна мае такую назву, якая супадае з музычным тэрмінам?

Максім Багдановіч

ТРЫЯЛЕТ

Калісь глядзеў на сонца я,
Мне сонца асляпіла вочы.
Ды што мне цемень вечнай ночы,
Калісь глядзеў на сонца я.
Няхай усе з мяне рагочуць.
Адповедзь вось для іх мая:
Калісь глядзеў на сонца я,
Мне сонца асляпіла вочы.

1. Так сапраўды бывае: глянеш на сонца — і на нейкі час у вачах становіцца цёмна. Але праз імгненне яшчэ ярчэй відаць тое, што вакол. Чаму паэт звярнуўся да такой з'явы?
2. Здаецца, што паэт ведае нейкую таямніцу, недаступную тым, хто смяецца з яго. Як вы думаеце, што ён мае на ўвазе, калі гаворыць пра сонца і «цемень вечнай ночы»? Што перамагае?
3. Некаторыя радкі гэтага верша паўтараюцца, несучы іншы настрой і падтэкст. Раскрыйце яго і падрыхтуйце выразнае чытанне твора.
4. Прачытайце ў Слоўніку літаратуразнаўчых тэрмінаў, што такое трыялет. Праверце, ці адпавядае верш Максіма Багдановіча класічнай кампазіцыі трыялета.

*Данута Бічэль

ТРЫЯЛЕТ

Лёгкія сняжынкі у цішы
Долу апускаюцца нясмела…
Светла ў полі, светла на душы…
Лёгкія сняжынкі у цішы…
Спіць сасна ў бахматым шалашы,
А навокал так бялютка-бела…
Лёгкія сняжынкі у цішы
Долу апускаюцца нясмела.

1. Знайдзіце ў вершы слова, якое найлепш перадае настрой твора.
2. Як суадносяцца ў вершы стан прыроды і чалавечай душы?
3. Якім вам уяўляецца лірычны герой гэтага верша?
4. Паслухайце пачатак сімфоніі Пятра Чайкоўскага «Зімовыя летуценні». Якія вобразы, малюнкі, адчуванні ўзніклі ў вашым уяўленні? Ці пераклікаюцца яны з вершам Дануты Бічэль?
5. Які радок у вершы Дануты Бічэль паўтараецца тройчы? З якой, на вашу думку, мэтай?
6. Паслухайце твор Сяргея Рахманінава «Вясеннія воды». Якія вобразы, малюнкі прыроды выклікала музыка? Чаму б і вам не паспрабаваць свае сілы ў стварэнні прыгожага? Паспрабуйце напісаць трыялет, які перадаваў бы захапленне сонечным веснавым днём, радасць абуджэння прыроды, вашы надзеі на лепшае. Першыя радкі (а значыць, і якія яшчэ?) няхай гучаць так, як у вершы Сяргея Чыгрына:

Чыстая, вясёлая вада
З красавіцкім сонейкам у згодзе...

Параўнайце свае спробы з творам паэта, змешчаным у дадатку на с. 347.

7. Разгледзьце рэпрадукцыю карціны Вітольда Бялыніцкага-Бірулі «Ранняй вясной» (гл. форзац 1). Якія вобразы і якія колеры ствараюць радасны настрой надыходу вясны?

Жанры лірыкі

Калі вы знаёміліся з канкрэтнымі творамі, то заўважылі, што існуе пэўная заканамернасць паміж тым, пра што расказвае твор, і яго мастацкімі асаблівасцямі. Змест і форма ў вершы ўзаемазвязаны і ўзаемаабумоўлены.

Паводле зместу і формы лірыка дзеліцца на наступныя жанры: філасофска-медытатыўныя[1], велічальныя, песенныя, сатырычна-выкрывальныя. З філасофска-медытатыўных жанраў вам ужо знаёмыя ***медытацыя*** — верш, у якім аўтар разважае на нейкую важную тэму («Трэба дома бываць часцей...» Р. Барадуліна, «Як я жыў без цябе?» С. Грахоўскага), ***філасофскі верш*** — твор, у якім асэнсоўваюцца філасофскія праблемы сэнсу чалавечага жыцця («Шчасце» М. Танка, «Жыццё даецца, каб жыццё тварыць...» А. Вярцінскага), ***элегія*** — верш, у якім выяўляецца смутак, жаль з прычыны грамадскай несправядлівасці або асабістага няшчасця («Бывай» А. Куляшова). Многія вершы пра Радзіму, беларускі народ, з якімі вы пазнаёміліся ў папярэдніх класах, адносяцца да ***велічальных жанраў***. Гэта ***ода*** — урачысты, узнёслы верш у гонар нейкай з'явы, падзеі ці асобы («Беларуская песня» У. Караткевіча, «Зямля Беларусі» П. Броўкі, «Мы — беларусы» Р. Барадуліна, «Продкі» А. Пісьмянкова). Своеасаблівай разнавіднасцю оды з'яўляецца ***рэквіем*** — урачысты верш у гонар памерлых («Рэквіем па кожным чацвёртым» А. Вярцінскага).

---

[1] *Медыта́цыя* — разважанне, роздум.

З ***песенных жанраў*** вам вядомы ***раманс*** — невялікі верш напеўнага характару пра каханне — і ***песня*** («Раманс» М. Багдановіча, «Ты мне вясною прыснілася…» М. Шушкевіча).

Сатырычна-выкрывальныя вершы ў дасціпнай форме высмейваюць заганы ў жыцці грамадства і чалавечым характары.

Жанры лірыкі склаліся вельмі даўно, яшчэ ў старажытнасці, таму нават назвы іх па паходжанні пераважна грэчаскія. Межы паміж асобнымі жанрамі лірыкі даволі ўмоўныя, у адным вершы могуць спалучацца розныя жанравыя прыкметы. Так, у вершах «Бывай» А. Куляшова і «Раманс» М. Багдановіча спалучаюцца рысы элегіі і песні, у вершы Я. Купалы «Спадчына» — медытацыі і оды.

Класічная паэзія выпрацавала ўстойлівыя віды верша — так званыя «цвёрдыя» страфічныя формы: санет, трыялет, актава і інш. Для іх характэрна дакладна вызначаная колькасць радкоў у вершы, пэўная сістэма рыфмоўкі, якую вы паспрабавалі вызначыць пры вывучэнні канкрэтных твораў, і адметная для кожнага віда верша кампазіцыя. Так, ***санет***, які складаецца з чатырнаццаці напісаных ямбам радкоў, выразна дзеліцца на дзве часткі: у першых васьмі радках падаецца развіццё тэмы, у наступных — кульмінацыя і развязка, падагульненне. У ***трыялеце*** (ад васьмірадковага верша, у якім два першыя і два апошнія, а таксама першы і апошні радок аднолькавыя) радок, які паўтараецца тройчы, завастрае ўвагу чытача на асноўнай думцы твора. ***Актава*** — таксама васьміp радковы верш, шэсць першых радкоў у якім звязаны перакрыжаванай рыфмоўкай, а два апошнія — сумежнай, што прыцягвае ўвагу да галоўнай думкі твора. Класічныя віды верша існуюць на працягу многіх стагоддзяў ва ўсіх еўрапейскіх літаратурах, апрацаваны талентам выдатных майстроў слова і заключаюць у сабе законы прыгажосці і гармоніі. Таму яны актыўна ўжываюцца і ў сучаснай лірыцы.

Пытанні і заданні да раздзела

1. Ахарактарызуйце асноўныя асаблівасці эпасу і лірыкі як літаратурных родаў.

2. Як звязаны паміж сабой народныя песні і лірычная паэзія?

3. Якія тэматычныя групы можна вылучыць сярод лірычных твораў? Прывядзіце прыклады вершаў.

4. На якія жанры дзеляцца лірычныя творы? Успомніце вершы, якія вы чыталі ў папярэдніх класах, і паспрабуйце вызначыць, да якога жанру лірыкі іх можна аднесці. У якіх з вядомых вам вершаў спалучаюцца прыкметы розных жанраў?

5. Якімі сродкамі ствараецца рытм у вершы? Якую мастацкую ролю ён адыгрывае?

6. Што такое паэтычныя тропы? Раскажыце пра іх, прывядзіце прыклады з вывучаных вершаў. Чаму менавіта для лірыкі характэрна багатае ўжыванне паэтычных тропаў?

7. Якую ролю ў вершы адыгрывае гукапіс? Пакажыце на прыкладзе магчымасці гукапісу ў стварэнні мастацкага вобраза.

8. Якія класічныя віды верша вам вядомы? Чаму, на вашу думку, яны існуюць многія стагоддзі і папулярныя сёння?

9. Якую форму верша вы выбралі б, калі паспрабавалі б напісаць верш пра каханне?

10. Што збліжае лірыку і музыку, лірыку і жывапіс? Прывядзіце прыклады.

11. Напішыце водгук пра верш, які вам найбольш запомніўся, уразіў вас. Пастарайцеся перадаць сваё захапленне вершам, раскрыць сакрэт яго мастацкай дасканаласці і растлумачыць, чаму ён вам спадабаўся. Узорам для вас няхай будзе артыкул А. Клышкі «Пра верш “Слуцкія ткачыхі”».

ПАВОЛЬНАЯ ПЛЫНЬ АПОВЕДУ

ЭПІЧНЫЯ ЖАНРЫ

Роды і жанры літаратуры склаліся не адразу. Узнікалі яны ў працэсе гістарычнага развіцця літаратуры, у прамой, непасрэднай залежнасці ад духоўных запатрабаванняў чалавека эстэтычна пазнаваць свет і самога сябе, выказваць свае думкі і настрой, пачуцці, свае ўяўленні аб прыгожым і непрыгожым у жыцці. Перш чым з'явіцца ў літаратуры, роды і жанры складваліся ў вуснай творчасці народа, у фальклоры. Менавіта з фальклору прыйшлі ў літаратуру, набыўшы новыя якасці, апавяданне — з народнай казкі, лірычны верш — з народнай песні.

Асаблівасцю эпічных твораў з'яўляецца шматбаковы паказ жыцця чалавека ў разнастайных яго праявах. Вобразы герояў раскрываюцца пры апісанні пісьменнікамі іх учынкаў і паводзін, партрэта, мовы, ролі пейзажу ў стварэнні вобраза, у аўтарскай характарыстыцы. Эпічныя творы даюць шырокія замалёўкі дзейнасці чалавека, паказваюць шматграннасць праяў яго жыцця. Аснову эпічных твораў складае аўтарскі аповед пра падзеі і людзей. Эпічныя жанры адрозніваюцца адзін ад аднаго шэрагам асаблівасцей: большым або меншым ахопам жыцця, складанасцю жыццёвага матэрыялу, характарам сюжэта, кампазіцыі. У адпаведнасці з гэтым адрозніваюць эпічныя жанры буйной формы (раман), сярэдняй формы (аповесць), малой формы (апавяданне, навела, казка і інш.). У аснову твораў малой эпічнай формы часцей за ўсё кладзецца які-небудзь эпізод. Сюжэт буйны́х і сярэдніх эпічных твораў ахоплівае цэлы шэраг эпізодаў, падзей, якія не заўсёды маюць паслядоўную кампазіцыю, могуць перамяжацца ў часе, у падзеях.

Якуб Колас

ХМАРКА

Не шукай ты шчасця, долі
На чужым далёкім полі.
Янка Купала

Ніякага клопату і гора не ведала гэта прыгожая белая Хмарка. Яна не ведала, з чаго і як радзілася на свет, адкуль узялася яна; не ведала нават, ці ёсць у яе маці. Можа, затым яна і была такая шчаслівая, што нічога не ведала аб белым свеце.

Той дзень, праўдзівей, тая раніца, калі з'явілася яна на небе, была вельмі ж ціхая — такая ціхая, што нават чутно было, як спявалі, седзячы на круглым лісціку зялёнай лотаці, два прыўдалыя конікі. Сіваваронка, снуючыся каля таўшчэразнага жаралістага дуба, дзе было яе гняздо, трашчала, бы тая трашчотка, на ўвесь луг, сварачыся з цыбатым і даўганосым Буслам, які, праўда, і вухам не вёў на ўсю гэту плявузготу сярдзітай суседкі, а любоўна цешыўся са сваіх дзетак, што таксама сядзелі ў гняздзе на тым жа дубе. Дзесь у небе жалобна пішчэў галодны каршун, і гукі яго далёка расплываліся ў нерухомай цішы летняй раніцы.

У ветра, відаць, было нейкае свята ў гэту раніцу, або добра нагуляўся ён дзе за ўчарашні дзень, бо яшчэ не варушыўся і спаў, хоць сонейка падбіралася пад поўдзень.

І гарачая была гэта раніца. Грэчка, якая зачынала ўжо зацвітаць, і даўно акучаная бульба проста млелі ад гарачыні і ў знемажэнні тужліва паапускалі свае лісце. І лісточкі іх таксама пачыналі жаўцець. Маленькі беленькі камячок, якім спярша была гэтая Хмарка, пачынаў тым часам павялічвацца, шырыцца і рабіцца болей грузкім.

Добра было гэтай Хмарцы плыць высока-высока ў безгранічных разлогах светаў і акідаць поглядам прыгожыя малюнкі зямлі, што ляжала пад ёю.

З тэй страшэннай высачыні, на якой плыла Хмарка, усё выглядала вельмі хараша, вельмі прыгожа: здалёку ўсё з'яўляецца нам іначай, як яно ёсць папраўдзе, бо такая

ўжо натура і схільнасць нашай душы — бачыць усё добрае і прыгожае ў тым, што далёка ад нас, што не з намі. І паплыла паволі шчаслівая Хмарка ў далёкую-далёкую дарогу, дзе застанаўляючыся, як прыемная думка, дзе кіруючыся на малюнкі, што найбольш зацікаўлялі яе: і поле з пясчанымі схіламі сваіх узгоркаў, зялёныя лугі з пакручастымі стужкамі бліскучай вады, адвечныя лясы-бары — адным словам, усе тыя з’явы, якія першымі кінуліся ў вочы нованароджанай Хмарцы, заставаліся ўсё далей і далей, і сама гэта даль адкрывалася ў намітку сіняватай смугі. Уласнае шчасце бязроднай Хмаркі (яна не памятала роду) не давала ёй мажлівасці прымеціць чужое гора. Ёй здавалася, што ўсе на свеце, як і сама яна, радуюцца і цешацца сваёй доляй. Па гэтай прычыне Хмарка не ведала, якую тугу і жаласць пакідае яна за сабою на зямлі, з якой прагавітасцю чакала поле задаволення свае смагі. Унь там, за вёскаю, чуць-чуць калышацца ў межах пажоўклае жыта. Гэта вецер, толькі што абудзіўшыся, пачынае пазяхаць, пацягацца. Бедныя каласкі пільна прыглядаюцца да Хмаркі. Калі-нікалі іх ажыўляе надзея ўздужаць з ласкі шчодрай Хмаркі. Але Хмарка ідзе далей, толькі цянёк ад яе праплыве, як здань якая, па жыце, і яно нікне каласкамі, стаіць, нікому не скардзіцца, як бы самлеўшы. І сумна рабілася ўсюды, і нейкая крыўда і жаласць бруіліся над усім, што пакідала Хмарка. Два прыўдалыя конікі перасталі спяваць і пахаваліся пад лісток лотаці. Гэта яны спявалі песню ў чэсць Хмаркі, а яна так зняважыла іх.

Пташкі таксама змоўклі, а маленькі ручаёк, здавалася, панёс свой жаль у зямлю пад каменні, у цень альховых кустоў.

А Хмарка, шчаслівая, радасная, ясная, як майская раніца, усё ішла, ішла далей і далей да невядомых краёў свету, і толькі ёй рабілася крыху сумна, ёй шкода было пакідаць тыя малюнкі, да якіх ужо прывыкла, але жывая натура гнала яе і гнала, не даючы супачынку.

Так ішла яна ўвесь дзень. Пад вечар, як сонейка схілілася блізка да захаду, Хмарка зайшла ў такі край, які непадобен быў да тых краёў, адкуль яна выбралася ў дарогу.

Перад ёю пачаліся высокія горы, вярхі якіх пакрывалі адвечныя снягі. Сонейка пачало хавацца за край зямлі, апошнія стрэлы яго праменняў ахварбавалі яе ў агнявісты колер і патухлі. Востры холад пустых і жудасных верхавін дзікіх гор моцна сціснуў Хмарку. Яна скурчылася ўся, зрабілася маленькай і тонкай, знайшла зацішак між гор і спынілася, прыхіліўшыся да старой Скалы. Страшна стала Хмарцы.

— Адкуль прыпаўзла, нябога? — спытала Скала Хмарку.

Яшчэ большы страх агарнуў яе.

— Не ведаю, — боязна адказала яна.

— Што робіш, чым займаешся? Хмарка зрабілася яшчэ меншай і маўчала.

— Я люблю паслухаць, што робіцца на свеце, — апраўдвала Скала сваё пытанне. — Што ж ты бачыла, раскажы мне.

Хмарка крыху асмелілася і пачала расказваць, як хараша на зямлі, як усе там шчаслівы і радасны, як спяваюць мошкі, конікі, травы, збажына.

— Хто сам шчаслівы, таму здаецца, што і ўсе шчаслівы, — сказаў Арол на гутарку Хмаркі. — Быў і я ў тых краях, адкуль прыблуталася імасць[1]. Там, гаворыш, — шчасце? А што ж, па-твойму, няшчасце? Там палі выплакалі апошнія слёзы, каб даць табе жыццё, шчаслівая Хмарка! І цяпер там нават расы не бывае. Але не для таго назначаліся слёзы, каб радзіць цябе на свет для бадзяння па чужых краях... — І доўга яшчэ гаманіў Арол, наракаў на Хмарку.

Слухала Хмарка нараканні Арла, і прыкра зрабілася ёй. Прайшла ноч, зачаўся новы дзень, зноў пайшла ў дарогу Хмарка. Цяпер яна ўжо не чула сябе шчаслівай і вольнай, як наўперад: так глыбока запалі ёй арліныя словы.

Дні ішлі, праходзілі тыдні, а яна, як заклятая, усё хадзіла па свеце. І дзе толькі не была яна! Якога гора не прыйшлося зажыць[2] ёй у дарозе! Насілася яна над пустэлямі, перад ёю рассцілаліся моры, якія не мелі берагоў. Ганялі яе ветры, ірвалі на кусочкі яе тонкія валаконцы. І нідзе

---

[1] *І́масць* — пані, ваша вялікасць.

[2] *Зажы́ць* — тут: перажыць, адчуць.

на свеце не было ёй супакою. І вярнулася яна зноў у той край, адкуль і выйшла. Пажоўклыя палі, сухія травы, пагарэлая збажынка гаротна віталі Хмарку; пацямнела яна, зажурылася, паапускала пасмы і заплакала халоднымі слязьмі над роднымі палямі...

Стары Дуб, абмыўшыся дажджом, павесялеў і сказаў да Бусла, з якім даўно ўжо быў у дружбе:

— От навука для тваіх дзяцей. Моцна ж накажы ты ім, дружа, каб не лёталі дарэмна па свеце, не бадзяліся: у сваім родным кутку работы досыць для кожнага.

Бусел маўчаў. Відаць, ён іначай пазіраў на гэту з'яву, а можа, і не дачуў слоў свайго сябра.

Пра твор Якуба Коласа «Хмарка»

Вы прачыталі твор Якуба Коласа «Хмарка». Несумненна, гэта твор апавядальны, г. зн. эпічны. Але сярод эпічных жанраў мы знойдзем і казку, і легенду, і апавяданне. З названых трох эпічных жанраў, мабыць, найбольш падыходзіць тут азначэнне «казка», бо ў творы расказваецца пра з'яву прыроды — прыгожую Хмарку. Пісьменнік звяртаецца да алегорыі, да іншасказання, як гэта робіцца звычайна ў казках ці байках. Пацвярджаецца такое меркаванне і тым, што сам Якуб Колас уключаў гэты твор у кнігу пад назвай «Казкі жыцця». Але «Хмарку» можна назваць і ***апавяданнем***, бо тут усё як у апавяданні: і герой, і сюжэт, і розныя іншыя адзнакі названага жанру (разгорнутыя апісанні, характарыстыкі, дыялог). Толькі гэта не звычайнае апавяданне, а ***алегарычнае***. У ім удала спалучаецца рэальнае і казачнае. Апавяданне можна таксама назваць ***філасофскім***, у якім не проста расказваецца пра нейкі выпадак з жыцця, а раскрываецца праз алегорыю вельмі важная агульнажыццёвая праблема — адносіны чалавека да сваёй зямлі, да радзімы. Пра Хмарку і яе паводзіны пісьменнік гаворыць то з лёгкім гумарам, то з прыхаваным сумам.

Калі вы чыталі твор «Хмарка», то, напэўна, згадвалі верш Рыгора Барадуліна «Трэба дома бываць часцей», п'есу «Вечар» і інш.

Сапраўды, гэта творы блізкія па тэме, шмат у чым падобныя па сваім змесце, па аўтарскай думцы — ідэі.

Прыгожая белая Хмарка, пра якую расказваецца ў апавяданні, нагадвае нам пра герояў тых твораў, у прыватнасці дарослых дзяцей, якія, пакінуўшы свой родны кут і сваіх бацькоў, раз'ехаліся па свеце ў пошуках лёгкага жыцця, забыліся на свае сыноўнія абавязкі перад домам, перад роднымі. «Яна (Хмарка), — піша аўтар, — не ведала, з чаго і як радзілася на свет, адкуль узялася яна; не ведала нават, ці ёсць у яе маці». Жыла і цешылася жыццём, паглядаючы на ўсё з вышыні.

«Уласнае шчасце бязроднай Хмаркі (яна не памятала роду) не давала ёй мажлівасці прымеціць чужое гора. Ёй здавалася, што ўсе на свеце, як і сама яна, радуюцца і цешацца сваёй доляй».

Вось так характарызуе Хмарку аўтар.

1. Сваімі словамі перадайце, як пачувала сябе Хмарка ў падарожжы, з кім яна сустрэлася і якую праўду аб жыцці пачула.
2. Што змянілася ў поглядах Хмаркі на жыццё пасля доўгага і далёкага падарожжа?
3. Якую ролю ў творы адыгрывае пейзаж, малюнкі прыроды? У залежнасці ад чаго змяняюцца фарбы, адценні ў абмалёўцы прыродных з'яў? Параўнайце пейзаж у пачатку твора і ў канцы. Чым яны адрозніваюцца?
4. Якая галоўная думка (ідэя) твора і як яна суадносіцца з эпіграфам?
5. Падумайце, як ставіцца пісьменнік да Хмаркі, з якім пачуццём гаворыць пра яе.
6. Ці адрозніваецца літаратурная казка Якуба Коласа «Хмарка» ад народных казак? У чым, на ваш погляд, яе мастацкая своеасаблівасць, прыгажосць?
7. Якую ролю адыгрывае алегорыя ў мастацкім паказе жыцця, характарыстыцы персанажаў?

Уладзімір Караткевіч

ПАРОМ НА БУРНАЙ РАЦЭ[1]

(Урывак з рамана «Нельга забыць»)

Дарогу на поўнач ад горада кантралявалі інсургенты[2], ездзіць па ёй было небяспечна. Таму ганцам, каб трапіць у размяшчэнне коннага палка, даводзілася скакаць з захаду, перапраўляючыся ўброд праз Друць, або — гэтая дарога была карацейшая, але яшчэ больш небяспечная — праз Дняпро, каб адчуць сябе спакойна пад аховаю ўрадавых войск. Да пэўнай ступені спакойна.

На пяцьдзясят вёрст выгінастага рэчышча быў толькі адзін паром, на вярсту вышэй ад горада. Яго нельга было аддаць у рукі паўстанцам, якія маглі б такім чынам парушыць сувязь паміж часцямі карных войск і біць іх паасобку. Дзеля гэтага на левы, процілеглы гораду бераг Дняпра генерал Фікельмонт выслаў роту выпрабаваных у баях салдат пад камандай капітана Пора-Леановіча. Капітану не вельмі верылі як нашчадку сепаратысцкай[3] фаміліі і ўраджэнцу Магілёва. Таму «ў дапамогу яму» і на «адпачынак» паставілі таксама капітана, Юрыя Горава, карэннага русака са старой маскоўскай фаміліі.

Гораў быў ранены ў левую руку ў сутычцы з атрадам паўстанцаў пад Ракавам і адасланы «ў тыл» на лячэнне і адпачынак.

---

[1] *«Паром на бурнай рацэ»* — твор пра падзеі паўстання 1863—1864 гадоў пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага. Гэта псіхалагічна вельмі насычаны і дынамічны аповед, дзе пісьменнік, абапіраючыся на сямейнае паданне пра свайго родзіча, удзельніка тых падзей, апісвае час, калі паўстанне ўжо затухала. Праўда, разрозненыя групы паўстанцаў яшчэ блукалі па лясах. Яны былі ўжо не такімі баяздольнымі, як у разгар паўстання. Тым не менш пагроза для ўрадавых войск яшчэ існавала. Таму паром на Дняпры ахоўваўся ротай салдат. Тут у бурлівую жнівеньскую ноч 1863 года і разгортваюцца трагічныя падзеі *(Паводле Алеся Марціновіча)*.

Умоўна гэты невялікі эпічны твор, у аснову якога лёг канкрэтны эпізод, можна аднесці да жанру апавядання.

[2] *Інсурге́нт* — паўстанец.

[3] *Сепараты́ст* — прыхільнік адасаблення нацыянальнай меншасці.

Тылу не было. У гэты трывожны жнівень 1863 года вайна была ўсюды. «Белыя» спрачаліся з «чырвонымі», беларусы не хацелі мірыцца з шавінізмам «белага жонду»[1]. Успыхвала, згасала і зноў выбухала абурэнне палітыкай цара.

Пераспелае жыта плакала зярнятамі, а ў жыце стаялі шыбеніцы. І не ўстаў ніхто, і не сказаў людзям, што няможна рэзаць адзін аднаго, што свет вялікі і на кожнага хопіць ніў, што хлеб аднолькава смачны, на якой мове яго ні называй. Не мог сказаць...

Справа ішла больш чым пра хлеб. Справа ішла пра свабоду.

Становішча было трывожнае. У канцы ліпеня генерал Фікельмонт даў загад знішчыць на Дняпры ўсе чаўны. Асобныя атрады выканалі загад. У чаўнах, віцінах[2] і шугалеях[3] да апошняй душагубкі[4], папрасякалі днішчы. Было спалена бярвенне, з якога інсургенты маглі б звязаць плыты. Прыбярэжнае насельніцтва, якое жыло найбольш з рыбнай лоўлі, было асуджана на голад.

Кардон[5], які абараняў паром, жыў нервова і напружана.

А між тым баяцца не было прычыны. Цэнтр паўстання даўно перамясціўся на захад. Галоўны атрад паўстанцаў Прыдняпроўя быў разгромлены яшчэ на пачатку лета, і генералу Фікельмонту гэта не магло не быць вядома...

Кіраўнік атрада, Усяслаў Грынкевіч, быў узяты ў палон і асуджаны на смерць. Цяпер ён сядзеў на гарадской гаўптвахце і чакаў. Яго павінны былі вылечыць, выспаведаць перад Збаўцам ад грахоў і толькі потым застрэліць, як сабаку.

Але асобныя дробныя атрады яшчэ блукалі па пушчах. І пагудкі перабольшвалі іх сілу. Ніхто нічога не ведаў, як заўсёды на вайне, і кардон калаціла ліхаманка трывогі і жаху.

---

[1] *Жонд (пол.)* — урад.

[2] *Віці́на* — крытае судна для перавозкі збожжа.

[3] *Шугале́я* — лодка, выдзеўбаная з аднаго кавалка дрэва.

[4] *Душагу́бка* — рыбацкі човен.

[5] *Кардо́н* — пагранічны або загараджальны атрад, месца, дзе ён размяшчаецца.

Таму нікога не здзівіла, што 18 жніўня на кардон прыляцеў улан[1] на ўспененым кані і нешта хутка перадаў Пора-Леановічу. Гораў пераправіў конніка на другі бераг (загад Фікельмонта прадугледжваў абавязковую прысутнасць на плывучым пароме аднаго з афіцэраў пры чатырох салдатах) і са шкадобаю глядзеў, як жывёла, амаль па-чалавечы стогнучы, выносіла ўлана на стромы чырвоны адхон.

Гэта было надвячоркам. Парыла так нясцерпна, што салдаты і капітан абліваліся потам.

Цьмянае ад сонца люстра ракі здавалася мёртвым. Не боўтала рыба, і шэрыя чаплі на водмелях стаялі змораныя, падобныя на пачварных вядзьмарак, апранутых у лахманы. Толькі ластаўкі ў быстрым лёце чыркалі крыламі ваду, ды недзе за бясхмарным гарызонтам бурчаў нябачны пярун. Бурчаў упарта, раз-пораз.

«Будзе вераб'іная ноч», — падумаў Гораў.

Быццам адказваючы яму, адзін з салдат уздыхнуў:

— Залье нас сёння. Як вясной, будзем куваць на востраве...

А ў Маскве цяпер цішыня. Масква толькі пачынае ажываць: вяртаюцца з дач і маёнткаў людзі. На ліпах Няскучнага саду першыя жоўтыя лісцікі: з багатых восеньскіх рынкаў даносіцца пах «валовых мордачак» (улюбёныя яблыкі маменькі). Маменька, пэўна, паехала цяпер у манастыр, маліцца за здраві́е воіна Юрыя і каб Бог дараваў яму веру. Едзе паўз Круціцкае падвор'е ў сваёй нехлямяжай, падобнай на гарбуз брычцы. Фурман Сідар з вялізным — на траіх — задам крычыць на сустрэчных страшным голасам: «Адзі, сцеражыся!» А ў блакітным небе сляпуча блішчаць купалы сабораў і плыве лягусенькі контур Круціцкага церамка.

А вось і сам ён, Юрый, выходзіць з парадных дзвярэй, праходзіць дарожкай пад ліпамі, з насалодаю дыхаючы празрыстым і ўжо схаладнелым паветрам. Ванька з прарэхам пад пахай трусіцца на козлах.

— Гэй, Ванька!

І вось ляціць, ляціць брычка. Спачатку па Цвярской, потым бульварам, потым на Арбат. І ўзмывае, захлынаецца ў

---

[1] *Ула́н* — салдат або афіцэр коннай арміі.

грудзях ад радасці сэрца. Так, вайна скончана, вайны ніколі больш не будзе. І ліпы! І Арбат! І цудоўныя асабнячкі... І Nadine ўстае яму насустрач у гэтай сваёй белай сукенцы...

— Гэта вы? Божа мой, як я рада!

І зноў — занадта паспешліва — апускае да вышывання свае нявінныя цёмна-сінія дзівосныя вочы. Што з таго, што яны толькі двойчы абмяняліся некалькімі словамі, што яны амаль незнаёмыя. Усё адно — гэта Масква, і сонца, і дзень без крыві і стрэлаў. І Масква — гэта і ёсць Nadine, Надзенька, Надзейка, як кажуць тут.

Што з таго, што ён цэлы год не бачыў яе, што яны мала знаёмыя. Вось ён бачыць яе валасы колеру ржавых кляновых лісцяў, такія пушыстыя, мяккія, лягусенькія, падзеленыя белым радком, яе рот з прыпухлай ніжняй губкай.

— Надзенька, каб вы толькі ведалі, як я сумаваў па вас, як нясцерпна мне было без вас на гэтай зямлі, што стаптана капытамі конных палкоў.

Яна ўсміхаецца. І цішыня. Недзе ўдарыў і змоўк у шкляным паветры далёкі звон. Шчасце! Масква! І цішыня, цішыня ў шатах ліп. Цішыня.

Стрэл.

Гораў ад неспадзяванкі спатыкнуўся аб корань, які — д'ябал ведае нашто — выпер акурат на дарозе...

Сярод двара тварамі да забітай брамы стаялі два чалавекі: салдат-дзяншчык і афіцэр. Салдат трымаў скрынку з пісталетамі і распачатую калоду карт. Афіцэр браў са скрынкі пісталеты і, амаль не цэлячыся, страляў у браму, у белы чатырохкутнічак, прыбіты да шула.

— А-а, камрад... Да зброі, вісусы-гусары... Горава каторы ўжо раз уразіў яго сухі прыгожы твар, белыя валасы і бакенбарды і, галоўнае, страшнаватыя блакітныя вочы, у якіх відна была пагарда да ўсяго. І яшчэ рэзкі шрам паўз брыво і левую скронь.

Калі пры першай сустрэчы ён запытаўся ў Пора-Леановіча, адкуль узялася гэтая адмеціна, той неахвотна буркнуў:

— Шпагаю тут адзін... падурэў...

— Ну і што? — спытаў тады Гораў.

— Паспадзяваўся занадта на французскую школу, — з жахлівай іроніяй сказаў Леановіч, — у славутага, бачыце, Мерсье вучыўся.

Гораў ведаў, што чалавек, з якім звёў яго лёс, мае славу першага ў палку, і не толькі ў палку, брэцёра[1], што ён страляе толькі дуэльнымі пісталетамі, але за такім заняткам, як сёння, застаў Леановіча ўпершыню.

— Руку набіваў, — сказаў Пора-Леановіч з паблажлівай ласкавасцю, — адвучвацца нельга…

Гораў глядзеў, як пальцы Пора-Леановіча з незвычайнай пяшчотай мацалі сталь, і здзіўляўся, чаму нешматслоўны, заўсёды іранічны калега сягоння такі гаваркі, быццам баіцца пакінуць язык хоць на хвіліну без работы.

А Леановіч ужо скончыў з пісталетамі, палажыў іх у футляр і сеў да стала.

— Сёння я нап'юся, — вельмі сур'ёзна сказаў ён.

Гораў сеў за стол з другога боку. Ён толькі прыгубіў першую чарку: піць не хацелася.

За акном пякло, аж нельга было трываць. Грозны Дняпро ледзь варочаў у разамлелых берагах цяжкія, як расплаўленае волава, плыні. Пярун бурчаў ужо зусім блізка, гнеўна, амаль без перапынку.

Гэтае чаканне жахлівага, разлітае ў млявай прыродзе, прыгнятала нервы. Кроў здавалася густой і цяжкай, як ртуць. Яна цякла павольна, нараджаючы паныла-злосныя, амаль ліхаманкавыя думкі. А Леановіч куляў чарку за чаркай, як быццам усё памятаючы, што яму трэба напіцца да моцы божай…

Задуха стала нясцерпная. І нясцерпным стала чаканне.

Толькі Леановіч, здавалася, не адчуваў нічога. Яго нахабныя і страшныя вочы гарэлі вясёлым шаленствам. І Гораў, успомніўшы яго сённяшнюю забаўку, зразумеў, што чалавек, які сядзіць насупроць яго, — страшны, вельмі небяспечны чалавек, драпежнік, у якога, пэўна, зусім няма ў душы месца для так званых пакут сумлення…

Вераб'іная ноч за акном ужо ўзяла свае правы. Неяк вельмі хутка. Дождж паліў так, што здавалася, паветра было менш, чым вады. Маланкі крэслілі неба так часта, што жоўты агеньчык свечкі стаў зусім няпэўны і непатрэбны. У сінім агні бліскавіц Гораў бачыў мярцвячы твар, укрыты кропелькамі поту…

---

[1] *Брэцёр* — заўзяты дуэлянт.

Увайшоў Іван, той самы, з якім Гораў размаўляў на пароме. Рэзкі чырвоны твар Іванаў, твар сапраўднага салдафона, быў мокры. З-пад салдацкай бесказыркі вісела пасма рэдкіх засівелых валасоў. І, нягледзячы на тое, што ён быў мокры, хоць выціскай, што з шыняля капала на падлогу вада, кожны пазнаў бы ў ім старога, бывалага салдата. Бо выраз ягонага твару быў выразам афіцыйнай адданасці і пачцівасці, праз які відочна праглядала лёгкая пагарда і свая, незамаскіраваная, думка аб усім.

— Чаго табе? — спытаў Леановіч.

— Ваша высакароддзе, вада прыбывае. Рака пайшла старыкам[1]...

Гораў мог бы пабажыцца, што на твары ў Леановіча мільганула радасць.

— Брашы больш, — з недапушчальнай фамільярнасцю[2] сказаў капітан, — што ж, за гадзіну залівені магло так раку наліць?

— Мабыць, у вярхоўях не адну гадзіну ліло, ваша высакароддзе. Вадамерная рэйка напалову пад вадою.

— Ну і што з таго?

— Праз паўгадзіны яна схаваецца ўся. Старык залье. Будзем на востраве.

— Ну і добра. Дні два можам не чакаць мяцежнікаў... Ідзі да д'ябла.

І, убачыўшы, што салдат усё яшчэ стаіць, спытаў:

— Ну, чаго табе яшчэ?

— Прахожыя могуць сунуцца ў ваду на звычайным пераездзе цераз старык... Дазвольце там каравул паставіць... Могуць патапіцца.

— Табе што да таго? — іранічна спытаў капітан. — Няхай не суюцца ў ваду, няхай варочаюцца ў Збароў і там начуюць... Ніякіх каравулаў.

— Слухаюся — ніякіх каравулаў, — сказаў Іван і выйшаў.

Леановіч яшчэ хвіліну маўчаў, гледзячы за акно, дзе ў сінім святле маланак буйна скакалі па зямлі густыя вадзяныя бізуны...

---

[1] *Ста́рык* — старое перасохлае рэчышча.

[2] *Фамілья́рнасць* — развязнасць, бесцырымоннасць.

— У вас ёсць народ, — ціха сказаў Гораў. — Ёсць павага да чалавека, любоў да яго. Хіба гэтага мала? Я ведаю, многа дрэннага робяць улады, але ж людзі не вінаватыя.

— Мы вельмі любім народ, — сказаў Леановіч, усміхаючыся краёчкам прыгожых губ. — Каб зручней залазіць яму ў кішэнь. Не-е, вы, Юрый Аляксандравіч, з вашай слінявай вераю ў чалавека ідзіце — ведаеце куды? Гэта быдла па галаве трэба біць. І ваша, і наша, і польскае, і ўсякае. Іншага яны не варты... Шкадаваць? Каго? За што? За тое, што яны мэкаюць і бобам сыплюць? За тое, што ў іх спіна прыстасавана для сядла? За тое, што іхнія зады самі пэндаляў просяць? Не-е, Юрый Аляксандравіч, будзем шчырыя... Ёсць мой мозг і мая рука, што кожнага здолее ўзяць за глотку. Я іду! Хіліся!.. І нікога не шкадуй для сваёй мэты... Пакуль у сілачку не ўваб'ешся — маўчы, слухайся і паступова прывучай усіх баяцца сябе... А там — не шкадуй. Ні жанчын, ні дзяцей. Ідзі па трупах, і добра табе будзе. З людзьмі ўсякія сродкі добрыя. Здрада, атрута, данос, а пасля нож, бізун, турма... І не трэба саромецца. Я не саромлюся. На прыгожыя словы — пляваць. Я такіх брыдот нараблю, што ўсіх ванітаваць будзе. Вас будзе ванітаваць, а я тым часам на кожнага пятлю накіну. І зацягну...

Жудасны чалавек сядзеў перад Горавым. Страшны, як шалёная рысь. І Гораў, не хочучы паказаць свайго адчування, няшчыра пазяхнуў і спытаў:

— Вы на французскую хваробу ніколі не хварэлі, капітан? Бо нешта мне здаецца, такія словы сведчаць аб размякчэнні спіннога мозгу.

— Нават слоў маіх баіцеся, — жорстка засмяяўся Пора-Леановіч. — Не, капітан, я не хварэў на французскую хваробу. Ніколі. І продкі мае не хварэлі. Зберагалі для мяне сваю сілу.

— Ішлі б вы лепей спаць, капітан.

— А вы што?

— Я не хачу вас слухаць. Я афіцэр. Што б я ні думаў, я звязаны прысягай і законамі гонару.

— Псу пад хвост, — сказаў Леановіч.

Ён устаў і шырока пацягнуўся, выпростваючы мускулы, засмяяўся:

— Галоўнае — стаць на той бок, які выйграе. Гораў адышоў ад стала, успёрся локцямі на падваконне і прыціснуў лоб да халоднага шкла.

Дождж ліў так, што ўся зямля ў сляпучым святле бліскавіц укрывалася сінім мільгаценнем кропель. Быццам поле нізкіх, ля самай зямлі, кветак вырастала і зноў згасала ў цемры. Білі грымоты. Нехта люта сваволіў, ломячы ў хмарах тоўстыя дрэвы.

Праз шум дажджу пачуліся шоргат колаў па хліпкай зямлі і глухія галасы.

Гораў угледзеўся ў цемру.

«Нехта прыехаў».

Ён накінуў плашч і выйшаў.

Сярод двара ў касым святле, што падала з акон, стаяла запрэжаная пара. Дымелі спіны замораных коней, а за імі ледзь вымалёўваўся цёмны сілуэт лёгкай брычкі з падузнятым верхам. Фурман, сівавусы чалавек, падобны ў плашчы на натапыраную птушку, завіхаўся ля коней. Ад маланак цень яго, вялізны і нягеглы, кідаўся ва ўсе бакі.

Фіранка брычкі адшмаргнулася, з-за яе ступіла на прыступку невялічкая нага. Жанчына, высокая і зграбная, у цёмным плашчы, стала проста ў ваду, якая плыла па ўсім двары, і азірнулася.

— Сюды, пані, — спяшаючыся з ганка ёй насустрач, галасна сказаў Гораў.

Ён адчыніў перад жанчынаю дзверы. Тая пераступіла парог і адкінула капюшон, мружачы вочы ад сляпучага — пасля цемры — агеньчыка свечкі.

Здзіўлены Леановіч глядзеў на жанчыну вялізнымі вачыма.

Глядзець было на што. Ніколі яшчэ Гораў не бачыў такога аблічча.

Густыя цёмныя бровы, якія здаваліся б амаль мужчынскімі, каб не агромністыя, як чорныя азёры, бліскучыя вочы і прыпухлы маленькі рот. Прамы невялічкі нос, мяккі авал трохі асіметрычнага аблічча, якому самая гэтая асіметрычнасць надавала дзіўны выраз мяккай жаночай пакорлівасці і адначасова ўладнасці, нават прывычкі ўладарыць...

— На той бераг, калі ласка, — сказала жанчына. Леановіч глянуў на гадзіннік. Было адзінаццаць.

— Сядайце, піце чай, — спакойна сказаў Пора-Леановіч.— Сымон, фурману шклянку гарэлкі. Коней — выцерці.

— Дзякуй вам за добрыя словы, але я не магу.

— Не пярэчце, калі ласка, — ветліва, але цвёрда сказаў Леановіч.

Жанчына прыўзняла на яго вочы, быццам здзіўленая гэтай нечаканай цвёрдасцю. Але ўсё ж паслухалася, села.

Гораў паспешліва згроб разам з абрусам рэшткі вячэры і выпіўкі. Адной рукой. Правая вісела на перавязі. Яна зусім загаілася, але не магла доўгі час вісець, зацякала.

Сымон паспешліва, відаць, з большай ахвотаю, чым для афіцэраў, збіраў на стол.

Увесь гэты час жанчына безуважна глядзела ў акно. І нават потым, калі пілі чай, не дакранулася да ежы, як ні прымушаў яе Леановіч. Толькі пагрэла рукі аб шклянку, глынула некалькі разоў гарачага чаю. Леановіч павольна і з відочнай асалодаю сёрбаў бурую ад заваркі вадкасць.

Калі Сымон прыбраў са стала, капітан зручна сеў, прыхіліўшыся спіною да сцяны, і, спытаўшы дазволу, закурыў.

— Дык чаго б вы хацелі, пані?

— На той бераг. Я вельмі спяшаюся, — усхвалявана сказала яна. — За ўсю дарогу я толькі тут на цэлую гадзіну затрымалася.

— Давядзецца чакаць да раніцы, — спакойна сказаў Леановіч.

— Чаму?

— Загад генерала Фікельмонта — уначы абараняць паром, не падпускаць чужых людзей. Тым больш цывільных[1]... Пераначуйце тут. Пакой мы аддамо вам.

— Мне нельга.

— Вельмі шкадую, пані. Загад Фікельмонта. Ваенны час, пані. Інсургенты.

— Я не інсургент. Я толькі жанчына, маці.

— Захварэла дзіця? — пацікавіўся Пора-Леановіч.

— Не. Я спяшаюся да мужа.

---

[1] *Цыві́льны* — невайсковы.

— Шкадую, пані, але дапамагчы не магу. Палявы суд — непрыемная штука. І ёсць загад Фікельмонта, — як малому дзіцяці, зычліва тлумачыў Леановіч.

— У мяне таксама загад. Яго сіяцельства. Прачытайце.

Ніхто не папрасіў назваць прозвішча. У гэты час на Беларусі было толькі адно «сіяцельства», падпарадкоўваючыся волі якога, рухаліся палкі, ганцы заганялі да смерці коней, людзі мучылі людзей.

— Так, загад Мураўёва, — сцвярджальна сказаў Леановіч, гледзячы на паперу.

Гораву здалося, што выгляд у Леановіча не вельмі здзіўлены.

— Ого, — сказаў Леановіч, — дык вы жонка Усяслава Грынкевіча. Таго?

— Але, — сказала жанчына, — вы ж бачыце, што я вязу памілаванне. Будзьце літасцівы. Замянілі пажыццёвай катаргай. Гэта такое шчасце! Такое...

Яна ўпершыню ўсміхнулася. Не было нічога прыгажэйшага за гэту ўсмешку...

Леановіч маўчаў, нешта абдумваючы. Зірнуў на гадзіннік. Машынальна глянуў і Гораў. Дванаццаць гадзін. Быццам у адказ, праз грымоты навальніцы данесліся глухія ўдары саборнай званіцы горада.

— І яшчэ адна прычына, — сказаў нарэшце Леановіч.— Вераб'іная ноч. Рака ўсхадзілася. Можна ўтапіць паром і вас. І людзей.

— Зразумейце, яго кожную хвіліну могуць забіць.

Гораў бачыў: яшчэ дзесяць хвілін такога катавання — і жанчына можа заплакаць. Другія на яе месцы плакалі б ужо.

Пора-Леановіч з той самай дагодлівасцю на сухім прыгожым твары накінуў на плечы жанчыне плашч.

— Выйдзем, пані... Гораў, хадзем з намі. Дождж пачынаў сціхаць, затое ўзняўся і гразіўся яшчэ больш памацнець вецер...

Рака шалела. Нізавыя парывы вятрыскі раскалыхалі вялікія, у рост чалавека, хвалі. Яны каціліся супраць плыні, шоргаючы белымі грабянцамі. Хвалі ішлі адна за адной, і процілеглы бераг губляўся ў чарнільнай навальнічнай цемры.

Але і адтуль, са змроку, далятаў усхваляваны, нізкі гук вады. Рака таўклася ў берагі, хочучы вырвацца з іх. Праз пляму святла на вадзе слізгануў па хвалях дзіравы кошык, потым — цэлае дрэва, яблыня, вымытая з карэннямі. Дзіўна было бачыць на яе галінах, апырсканых пенай, галінах, якія круціліся, то знікаючы пад вадой, то зноў выплываючы, два ці тры зеленаватыя яблыкі.

Леановіч моўчкі паказаў рукою, што трэба вяртацца ў пакой. Толькі там, у разамлелай цеплыні начнога чалавечага гнязда, ён сказаў:

— Вы самі бачыце, пані. Паром немінуча знясе. Пачакайце да раніцы.

— Але ён чакае, — сказала яна.

— Ён чакаў два месяцы. Некалькі лішніх гадзін нічога не паправяць, — абыякава, аж да здзеклівасці, сказаў капітан.

«Не можа ж ён не разумець яе становішча, — думаў Гораў. — Што гэта? Здзек або халодная подласць?»

Жанчына, здавалася, не заўважала інтанацый Леановіча.

— Для асуджанага кожная гадзіна чакання — гэта лішнія маральныя пакуты, — проста і сурова сказала яна. — Вы ведаеце гэта...

— Вы можаце загінуць пры пераправе.

— Я не баюся гэтага.

— Я за вас таксама не баюся, — спакойна сказаў Леановіч.— Але я адказваю за жыццё салдат. У іх таксама жонкі.

— Я магу паехаць з ёю, — нечакана для самога сябе сказаў Гораў.

— Вы адзін не здолееце, — са спакойнай усмешкай на прыгожых і жорсткіх вуснах сказаў Пора-Леановіч. — Не звяртайце ўвагі, пані. Гэты парыў сведчыць аб добрым сэрцы, але ў капітана Горава раненая рука... у бітве з інсургентамі.... Дарэчы, у гэтай бітве ён паказаў сябе героем.

Гэта быў несумленны ўдар, але Гораў змаўчаў: ён не хацеў сказаць, што ранены пад Ракавам, а не тут, ён наогул не хацеў апраўдвацца.

— Так, — сказаў ён, — але можна спытаць у салдат, хто захоча.

— Салдацкая самадзейнасць? — спакойны тон Леановіча межаваў са здзеклівасцю. — Ну, не... А адказваць — мне.

— Мне здаюцца падазронымі вашы паводзіны, — сказаў Юрый.

— Капітан Гораў, — не павышаючы голасу, сказаў Леановіч. — Я забараняю вам... Вы пакуль што падначалены.

Гораў змоўк. Ён зразумеў, што капітана не зрушыць, што ён мацнейшы за каменны мур. І такі ж раўнадушны.

— Я паплыву, — сказала жанчына, — я добра плаваю.

Зірнуўшы на яе рашучы твар, Гораў зразумеў, што гэта не пустая пагроза.

— Я не дазволю вам гэтага, — сказаў Леановіч. — Вы забылі, што я мужчына і, воляй лёсу, адказваю за жыццё дамы, за ваша жыццё.

— Вы мужчына? — горка сказала яна. — Сапраўдны мужчына сам паплыў бы са мною, калі не хоча рызыкаваць салдатамі і гэтым паромам. Вы проста баязлівец.

— Я дзесяць разоў стаяў на бар'еры пад кулямі, — рэзка сказаў Леановіч. — І я тройчы ранены на вайне.

Яна кінулася да яго, потым бяссільна апусцілася на лаўку.

— Майце літасць, пан капітан.

Слухаць маўчанне, якое настала пасля гэтых слоў, было нясцерпна. Гораў выйшаў на ганак і доўгі час стаяў, затуліўшыся ад халоднага ветру, за рогам хаты. Потым, ледзь вырываючы ногі з раскіслага глею, пайшоў да брамы пад рэдкім, як слёзы, дажджом.

Далёкія чырвоныя бліскавіцы ўсё яшчэ ўспыхвалі на вяршынях чорных вольхаў. Вецер не сціхаў. Рака ўтрапёна плёскалася пад адхонам.

Гораў абышоў пасты — усюды яго сустракалі воклічамі. Кардон не спаў.

...У гадзіну ночы, агледзеўшы ўсё, што трэба і не трэба, Гораў усё яшчэ хадзіў пад дажджом.

Падыходзячы нарэшце да ганка паўз асветленыя вокны хаты, ён убачыў у акне твар Леановіча, жахлівы, відавочна пастарэлы твар. Леановіч глядзеў у цемру.

У акне бакоўкі Гораў убачыў постаць жанчыны. Тая кідалася ў бакі, як зняволеная. Стала, ударыла кулачком па печцы.

Гораў апусціў галаву. Яму не хацелася больш ісці ў хату.

Зноў рака, зноў відовішча звар'яваных хваль. Зноў двор, — чортаў дождж, плашч пачынае прамакаць! — зноў месца за рогам і агеньчык запалкі ў руцэ.

Палова на другую.

Якраз у гэты час Грынкевічава выйшла на ганак. За ветрам Гораў невыразна пачуў:

— Божа, Божа, Божа...

За яе спіною з'явіўся ў цемры аранжавы прастакутнік дзвярэй і ў ім — цёмная постаць.

— Зайдзіце ў пакой, — зычліва ледзяным голасам сказаў Леановіч, — я адказваю за вас.

Яна нехаця паслухалася, і Гораў, адчуваючы, што зараз можа адбыцца нешта жахлівае, пайшоў за імі ў пакой, зноў убачыў змучаны, без крывінкі, твар.

— Майце літасць...

І раптоўна ўся сіла гэтай натуры, уся яе палкая страснасць выбухнула парывам гора, падобнага чымсьці на экстаз:

— Няўжо ў вас не было кахання... хоць маленькіх успамінаў?! Яшчэ тры гады таму ён быў толькі маім жаніхом! Разумееце вы, ці ў вас лядзяш замест сэрца?! Быў май, і мы гулялі ў гарыпні... Такі смех быў над паплавамі... А цяпер ён заўчасна сівы, змучаны. Яму нельга!..

І гэтыя словы вярнулі яе да прытомнасці.

— А-а-х-х, вы! Чаго вы варты? — з невымоўнай пагардай сказала яна. — Фронт забіў вашу душу.

Вы не разумееце нават, што ён не за сябе, што ён за народ, за вас, за гэтых бедных людзей. Ён не дзеля грошай, не дзеля ўлады. Ён чысты, як... неба. Каб народ быў вольны. Гэта і ваш народ, пан капітан... Воля патрэбна ўсім. А нам, беларусам, рускім, палякам, — больш за ўсіх. Бо мы штодня без яе паміраем у пакутах.

Твар Леановіча скрывіўся нейкай жудаснай грымасай:

— Пані, я адпраўлю вас не на другі бераг, а з аказіяй[1] у Магілёў, калі пачую яшчэ хоць слова ў гэтым стылі.

Жанчына паківала галавой:

— Які ж вы нізкі чалавек!

Ляснулі за ёю дзверы бакоўкі...

---

[1] *Ака́зія* — зручны выпадак для якой-небудзь справы.

Але на вуснах у начальніка кардона зноў з'явілася прыязная і страшнаватая ўсмешка.

— Капітан, — сказаў ён, — гэта, здаецца, вас прыставілі наглядаць за мною, а не мяне за вамі. Мне здаецца, яны зрабілі дрэнны выбар.

Гораў аслупянеў. Ён ніколі не ведаў, ніколі нават не мог падумаць, што на яго можа ўпасці такое падазрэнне. Ён стаяў, моўчкі хапаючы ротам паветра. Бялявыя хвалістыя валасы прыліплі да спатнелага лба, глыбокія сінія вочы сталі жаласныя.

Быццам атрымаўшы ўдар пад грудзі, ён з хвіліну моўчкі хапаў ротам паветра, а потым кінуўся прэч з пакоя.

Стоячы за рогам хаты, адчуваючы, як мокры ліст высокай вяргіні часам гладзіць яго па шчацэ, ён у думках пагражаў Леановічу самай жахлівай помстай і ў той самы час ведаў, што нічога ён яму не зробіць, што гэты брэцёр з халоднымі вачыма робіць правільна, затрымліваючы жанчыну да раніцы, што на баку гэтага чалавека — права, права вайны, якой яны абодва служаць...

Было дваццаць хвілін на трэцюю.

Ля плота, непадалёк, стаяў Іван, трымаючы нешта за пазухай.

Гораў глыбока ўздыхнуў — нясцерпна было вось так, аднаму, стаяць у цемры — і падышоў да яго. Салдат трымаў за пазухай адну руку. На яго цёмным твары блішчалі вочы пад кашлатымі бровамі.

— Што гэта ў цябе?

— А галчаняткі... бедныя. Познія, — сіпатым голасам сказаў Іван.— Гняздо раскідана. Страшная штука ўраган. Дзе хавацца? На якой зямлі?

Яны памаўчалі. Іван глядзеў за пазуху.

— Ты адкуль, Іван? — ціха спытаў Гораў.

— Маскоўскі.

— Землякі, — з нечаканай для сябе пяшчотай сказаў Юрый.

Зноў запанавала маўчанне. Толькі шапацеў па дзядоўніку дождж...

— Галчаняткі вы... дурныя. Бач, вачыма лыпаюць.

І раптам Гораў, амаль нечакана для сябе, сказаў:

— Іван, як пераправіцца цераз раку?

Іван спадылба глянуў на афіцэра, павагаўся, а потым адказаў:

— Яно можна.

Тон ягоны быў не зусім упэўнены.

— Ты не думай, — заспяшаўся Гораў. — Я сам з табою паеду…

— Вядома, загад, барын, іначай нельга, — сурова сказаў Іван. — Можна б і ў начальніка кардона спытаць, але ён, відаць, заснуў.

І дадаў:

— Мы човен схавалі.

— Човен? Як асмеліліся? А загад?

— А адкуль у вас рыба ў юшцы? — амаль груба спытаў салдат. — Што ж нам, на кашы сядзець? Калі самі сабе не паможам…

— Добра, добра, — сказаў Гораў і пасуровеў. — Што ж, Іван, са мной паедзеш?

— Цяжка ўтраіх, — уздыхнуў Іван, — але паспрабаваць трэба.

— Едзем.

— Ну-к, што ж, — Іван памаўчаў, потым падаў голас камусьці ў цемру: — Сідар, а Сідар, галчанятак вазьмі…

Гораў ужо цёпаў прэч ад яго па глыбокай гразі. Спыніўся пад акном бакоўкі, паскроб у шкло пальцам. І амаль адразу ўбачыў за каламутнымі шкельцамі яе твар з пашыранымі вачыма. Гораў прыклаў палец да губ, і яна здагадалася, бязгучна расчыніла акенца.

— Збірайцеся, — шэптам сказаў ён, — і дзьмухніце на свечку: хай думаюць, што вы спіцё.

Бакоўку адразу агарнула цемра. Белы твар наблізіўся да вачэй Горава.

— Памажыце мне.

Дзве цёплыя рукі абвілі шыю Горава. Падтрымліваючы жанчыну за стан, ён павольна пацягнуў яе на сябе — акенца было вельмі вузкае. Перагнуўшыся назад, ён адчуў, як на яго ключыцы ляглі цвёрдыя жаночыя грудзі. У наступную хвіліну яна стаяла поруч з ім.

— Дайце мне руку, — шэптам сказаў ён, — хадзем.

Маленькія цёплыя пальцы ўсунуліся ў яго далонь. Гораў, спяшаючыся, павёў жанчыну да берага, спачатку амаль на дыбачках, потым бягом…

— Іван, дзе ты? — шапянуў ён, нахіліўшыся з адхону.

— Тут, — прагучаў сіпаты голас.

Салдат стаяў на невялічкай утаптанай сцежцы.

— Хутчэй, — сказаў ён, і яны ўсе пабеглі берагам да высокіх зараснікаў лазы.

…Гораў трапіў нагою па калена ў ваду, балюча накалоў руку на сухую і вострую, як косць, лазіну ў гушчары. Іван узяў жанчыну з рук Горава і, занадта гучна боўтаючы нагамі па вадзе, панёс яе некуды ў нетры прыдоннай лазы.

— Ёсць, — сказаў ён, вярнуўшыся, — дайце руку.

І пацягнуў Горава.

Ударыўшыся каленямі аб борт чоўна, Гораў пераваліўся ў хісткую пасудзіну.

— Чакайце, — буркнуў Іван, — толькі сцябла схаваю.

— Якое сцябла?

— Ну, тутэйшае слова, латок, на які нерат[1] укладваюць… Хлопцы, калі згубім, не пахваляць.

Ён яшчэ з хвіліну вазіўся ў лазе, як вялізны бабёр, потым сунуў у руку Горава вясло.

— А другое?

— Гэта вам не катанне на Яўзе… Тут адным трэба ўпраўляцца. Вяслуйце ў самага борта, а потым злёгку падайце канец убок і ўгору.

— Дайце я, — сказала жанчына, — ён не ўмее.

— Сілы пашкадуй, дзіцятка, — грубым голасам сказаў Іван. — Да конскіх могілак дзве вярсты… у цемры.

Конскімі могілкамі называлася месца, ля якога стаяла гаўптвахта.

Іван моцным штуршком выкінуў човен з лазы. І адразу — спачатку слаба, потым мацней — пасудзіну пачало гайдаць, а потым кідаць на хвалях.

— Чорт, — сказаў салдат. — Наўскос бяры, не стаў бокам да хвалі.

— Нічога не бачу.

---

[1] *Не́рат* — рыбалоўная прылада.

Бледная бязгучная маланка якраз у гэту хвіліну заліла няпэўным дрыготкім святлом абшар Дняпра, пасівелага ад ярасці, імклівыя грабянцы хваль, далёкі чорны бераг. Вёслы Горава і Івана апусціліся ў ваду, ружовую ад святла бліскавіцы. І адразу вада стала чарнільнай, а на людзей цяжка наваліўся змрок. Потым, быццам хочучы памагчы, неба разпораз пачало раздзірацца ўспышкамі святла. Гораў бачыў твар жанчыны, якая з прагай, з чаканнем, зусім без усведамлення небяспекі, толькі з імкненнем наперад, да волі, глядзела на другі бераг, які амаль не набліжаўся.

Шкарлупінку кідала ў правалы паміж хваль, вецер адкідваў цёмны шаль на жанчыне, як вялізныя імпэтныя крылы...

Гораву здавалася, што гэта цягнецца вечнасць, што цемры і страшным ударам у борт душагубкі ніколі не будзе канца. Човен, пэўна, моцна адносіла.

І ўсё ж надышоў момант, калі хвалі сцішыліся, шкарлупінка плаўна загайдалася ў зацішку, за высокай касой процілеглага берага.

— Ну, барын, — уздыхнуў Іван, — думаў, патонем.

— Мы не маглі патануць, — упэўнена сказала яна. — Як жа нам патануць, калі мы неслі жыццё.

Слізнучы на чорнай гліне абрыву, яны ўзвялі жанчыну на роўнае месца.

— Ідзіце, — сказаў Іван, — туды... Мы не можам праводзіць вас...

І цень жанчыны паглынуў змрок...

...Гораў спусціўся ўніз і знайшоў пад адхонам Івана. Нацягнуўшы са стажка сухога сена, той наклаў на яго сухіх леташніх галін лазы, прыплаўленых у повень Дняпром, і паспеў раскласці ў лагчынцы невялічкае, але зыркае вогнішча.

— Сушыцеся, — сказаў ён, — потым самі будзеце веславаць. Я пераплыву... Не трэба, каб нас бачылі разам, ваша высакароддзе.

Яны моўчкі сушылі вопратку каля агню. А пасля, калі размялі рукамі сухую, пакарабачаную тканіну, заўважылі, што над Дняпром толькі завязаўся світанак.

У гэтым жаўтавата-шэрым брудным святле вялікая рака сціхла, быццам засаромеўшыся таго, што нарабіла ў

мінулую ноч. Усё яшчэ было ветрана, але нізавы вецер даў месца верхавому, і той сагнаў хвалю, разгладзіў сваім подыхам нахмураную паверхню ракі. Яшчэ падалі кроплі дажджу, але відно было, што дзень хутка ўсміхнецца ўсімі сваімі прамытымі і цёплымі барвамі[1]. Ды і дождж быў такі рэдкі, што незразумела было: ці то падалі скупыя кроплі, ці небывала дружна хадзіла жорам верхаводка.

Іван скруціў вопратку ў вузел і, трымаючы яе на паднятай руцэ, сказаў:

— Дык я паплыву, ваша выскароддзе... Прыйду потым на кардон паплавамі.

І сказаў, быццам даравання прасіў, быццам не афіцэр падбіў яго на процізаконны ўчынак:

— Вайна вайною, а баб шкада... Вельмі баб шкада...

...Калі Гораў, не зусім спрытна валодаючы вяслом, перабраўся цераз Дняпро і паплыў каля нізкага берага, дзень вось-вось павінен быў перамагчы світанне. Раскашавала мокрая лаза, цяжкія някошаныя травы на берагах дымелі, з улоння Дняпра плыла сытая па́ра, як ад вядра з сырадоем.

«Божа, — падумаў Гораў, — нават рэкі цякуць малаком. І на гэткай зямлі, поўнай даброшчаў, паміраць? І такой светлай раніцай чакаць смерці? Ну не, няхай хоць на дзве гадзіны скараціць такое чаканне — і то добра. Я не шкадую».

За паваротка ракі адкрыўся, зусім непадалёку, кардон. На паромным прычале стаяў, успёршыся на балясы[2], млявы Пора-Леановіч з цыгаркаю ў зубах.

Паплёўваў у ваду. Іранічным позіркам глядзеў на човен, які набліжаўся, выплываў з імглы.

Гораў прывязаў човен у лазе, выбраўся з яе на сухі бераг і пайшоў паўз прычал. Леановіч глядзеў на зграбную постаць маладога чалавека нейкімі дзіўнымі, саркастычна-пагардлівымі вачыма. І гэтыя вочы прымусілі Горава зрабіць выгляд, што нічога не было, што яны толькі што развіталіся.

— Баюся, што вы дарэмна пайшлі на парушэнне прысягі, капітан Гораў.

---

[1] *Ба́рва* — колер; густа-чырвоны колер.

[2] *Баля́сы* — агароджа з точаных фігурных слупкоў.

Юрый спыніўся. Вочы яго спакойна сустрэлі позірк вачэй Леановіча.

— Тут не прысяга. Вайсковы загад не можа датычыцца жанчыны, якая вязе літасць свайму мужу. І той не афіцэр, хто не паможа жанчыне ў такіх абставінах.

— Вы яшчэ хлопчык, капітан… І як лёгка яна вас абдурыла.

— У яе загад графа Мураўёва.

— Святая нявіннасць…

— У яе загад. І нельга гуляць жыццём памілаванага.

На вуснах Пора-Леановіча з'явілася іранічная ўсмешка.

— Вы лічыце, што наш граф так лёгка выпускае з пятлі людзей?

— Н-не разумею вас.

— Яму проста апрыкралі жаночыя просьбы. Яму да слёз хочацца, каб яго лічылі высакародным, каб хоць адна прыгожая жанчына лічыла вылюдкам не яго, а Фільку.

— Што?

— Ён замяняе страту пажыццёвай катаргай і пасылае жанчыну. А за дзве гадзіны да гэтага з губернатарскай поштай пасылае фельд'егера[1], каб на месцы паспяшаліся.

Гораў сцяў зубы:

— Калі гэта праўда, то ён падлюга.

— Ён чалавек, — сказаў Леановіч. — Чаго ад людзей чакаць?

— Што далей? — сурова спытаў Гораў.

— Жанчына, відаць, не шкадавала грошай: яна ехала, наступаючы яму на пяты. Як яна магла зрабіць такую дарогу за сорак восем гадзін — не ведаю. Гэта трэба быць жалезным чалавекам… І ўсё ж фельд'егер вырваўся з апошняй станцыі, узяўшы апошняга каня. Ён апярэдзіў яе не больш чым на дзве гадзіны.

Твар Горава быў белы як палатно.

— Не лічыце графа дурным, — раўнадушна сказаў Леановіч.

Ён памаўчаў хвіліну.

---

[1] *Фельд'е́гер* — ваенны кур'ер.

Гораў не мог болей вытрымаць:

— Дзе той фельд’егер?

— Вы самі яго перавезлі цераз Дняпро надвячоркам... Гэты ўлан прывёз мне загад: што б там ні было, затрымаць гэтую жанчыну да трох гадзін раніцы. Хопіць, каб прыняў апошнюю літасць ад ката, памаліўся апошнюю ноч і ўдосталь пакачаўся на шворцы[1].

— А ў яе вечныя пакуты сумлення, што спазнілася на паўгадзіны?

— Магчыма, — сказаў Леановіч.

— Ну што ж, — сказаў Гораў, — я парушыў ваш план — яна ўсё ж паспее. І гэта дрэнна — што вы зрабілі, гэта вельмі несумленна.

— Не мне ж іх шкадаваць. Як кажуць, воўк ваўку — чалавек. А вы парушылі абавязак і гонар афіцэра.

— Гонар афіцэра не ў тым, каб быць катам, — ускіпеў Гораў. — А жанчына паспее, яна не можа не паспець.

Леановіч не слухаў яго:

— Для самазаспакаення думайце, што гэты інсургент быў крыклівы кар’ерыст, а яго жонка — распусніца.

— Гэта ганебна, тое, што вы кажаце.

— Ідзіце па трупах, дарагі Гораў. Ідзіце па трупах... А пакуль што... — Ён пазяхнуў. — Пакуль што ідзіце лепей выспіцеся... Бадай што, і я пайду.

Падсвядома, нейкімі глыбінямі душы Гораў разумеў, што гэты чалавек падобны на сціснутую спружыну, якую лёгка выпусціць з палону, і тады яна б’е — да смерці. Не варта было рызыкаваць, калі апошняя дзея ўсё ж асталася за ім, Горавым. Юрый як мага спакойна паглядзеў у яго лянівыя вочы, поўныя жахлівай пагарды да ўсяго і пустаты, на рэзкі шрам паўз брыво.

— Бадай што, ваша праўда, — сказаў ён, — я добра папрацаваў у тыя дзве гадзіны, што вы спалі. Трэба адпачыць.

І ён пайшоў угору, да паромшчыкавай хаткі. Пора-Леановіч глядзеў яму ў спіну цяжкім позіркам.

Гораў спаў да дзесяці гадзін. Калі ён, умыты, ружовы ад сну і заспакоены, выйшаў з хаты на бераг, дык убачыў

---

[1] *Шво́рка* — вяровачка, павадок.

Леановіча ў той самай паставе — ён стаяў, абапёршыся на парэнчы паромнага прычала. Цыгарка дыміла ў яго тонкіх спакойных губах, быццам не гадзіны прайшлі з іх ранішняй размовы, а толькі некалькі імгненняў. Юрый стаў ля парэнчаў, за некалькі крокаў ад яго.

— Выспаліся? — спытаў ён.

— Анягож, — быццам нічога паміж імі не адбылося, адказаў Леановіч.

— Ну вось і добра, — сказаў Гораў, — зараз снедаць будзем. Сымон ужо і гарэлку на стол паставіў... Чаму не пагаманіць пра месца чалавека на зямлі?

Леановіч пакасіўся на яго:

— Сумленне ў мяне, пан Юрый, спакойнае, чаму і не пагаманіць.

Яны моўчкі стаялі. Леановіч паплёўваў у ваду. Гораў абдзіраў кару з ліпавага прутка.

На процілеглым беразе, над адхонам, з'явілася лёгкая параконная брычка. Фурман, асцярожна трымаючы коней за аброць, заводзіў яе да пераправы. Колы брычкі небяспечна падскаквалі па размытых каляінах. На заднім сядзенні сядзеў нехта ў вайсковай форме.

— Трэба будзе даслаць салдат, каб падправілі спуск, — абыякава сказаў Леановіч. — І каго гэта яшчэ нясе?..

Зрок у Горава быў не горшы, чым у сапсана[1].

— Учарашні ўлан едзе, — сказаў ён і не стрымаўся: — Мазалі, відаць, набіў на паўшар'ях, як пірагі.

— Гэ-эй! — пралунаў над ракою зычны голас. Афіцэры стаялі моўчкі. Перад імі плыла імкліва-спакойная скаламучаная плынь. Дзень раздумаў пагодзіцца, і светлаватыя хмары віселі над ракой.

— Гэ-эй! — крычалі з таго боку два галасы. — Па-ро-ом, па-ром, паром!!!

Леановіч ляніва павярнуўся да Івана.

— І чаго гарлаюць? — незадаволена сказаў ён. — Бяры, Іван, трох салдат і перавязі гэтых гарлапанаў сюды.

— Хто з афіцэраў паедзе, ваша высакароддзе?

— Ніхто, — сказаў Леановіч.

---

[1] *Сапса́н* — сокал.

...Увесь час, пакуль паром пераплываў раку, афіцэры стаялі моўчкі.

І толькі калі ўлан падышоў да іх і адказыраў, Леановіч спакойна кінуў недакурак цыгаркі ў раку і адразу ж закурыў новую.

Улан стаяў перад імі, кучаравы («Ванька-ключнік», — падумалася Гораву), з румянымі вуснамі і нахабнымі светлымі вачыма.

— Паспеў? — спытаў Леановіч.

— Так точна.

— Што новага?

— Генерал Фікельмонт выказвае вам удзячнасць за дасканала выкананы загад.

— Што? — яшчэ нічога не разумеючы, спытаў Гораў.

Улан стаяў «стрункай», але з той няўлоўнай вольнасцю, якая ўласціва фельд'егерам і дазваляе думаць аб лёгкай пагардзе да «пехтуры», хоць бы і афіцэраў.

— Папа клікаць не давялося, — усміхнуўся ўлан, — але апошні ліст напісаў.

— Дзе было пакаранне смерцю? — спакойна спытаў Леановіч. — Стойце вольна.

Улан трошкі адставіў нагу.

— За абвахтай, — сказаў ён. — На конскіх могілках. А палове чацвёртай.

У Горава як абарвалася нешта ў грудзях. Белы, як снег, ён спытаў:

— Жонку бачылі?

— Так точна. Спазнілася хвілін на дзесяць. Яна амаль да абвахты падышла, а тут на задворках як каленкор ірванулі... То яна бегла, а тут пайшла, як сонная... А гэты, вядома, яшчэ цёплы быў.

— Плакала? — спытаў Гораў.

— Не, зусім не плакала. Толькі і сказала: «Божа, пакарай іх...» Не шкадавала. Я б такую бабу, што мужа не шкадуе, кожны дзень лейцамі аходжваў.

— У цябе тваёй думкі не пытаюць, — суха сказаў Леановіч.

— Дазвольце ісці?

— Ідзі.

Фельд’егер скочыў у брычку. Коні пацягнулі яе на адхон, слізгаючы капытамі і ссоўваючы ўніз чырвоны, як кроў, глей.

Потым колы заляскаталі паўз хату, па паплаўцы за ёю, па беразе старыка.

А потым брычка знікла.

Леановіч нахіліўся над вадой і спакойна сплюнуў у раку недакурак цыгаркі.

Тонкі нясцерпны звон напоўніў вушы Горава. Ён мацнеў, мацнеў, мацнеў. Адчуваючы, што прытомнасць знікае кудысь, Гораў варухнуў непаслухмянымі вуснамі. Голас, на яго здзіўленне, быў моцны і звонкі.

І тады, ступіўшы крок наперад, Гораў выразна адчаканіў:

— Капітан Пора-Леановіч, вы нягоднік.

Леановіч рэзка павярнуў галаву, адарваўся ад парэнчаў. Яго халодныя вочы з цікавасцю разглядалі Горава.

— Гораў, вы забыліся на туз, — холадна сказаў ён.

— Вы падлюга і нягоднік! — сказаў Гораў.

— На тры крокі, — іранічна сказаў Леановіч. — Каб разбэшчаная знатнасць не абражала нявіннасці і чысціні.

І раптам пасур’ёзнеў, на гладка выгаленых шчоках набраклі каменныя жаўлакі.

— Што ж, гэтым рана ці позна павінна было скончыцца. Мы занадта перашкаджалі адзін аднаму... Зайдзіце ў хату, вазьміце стрэльбу і чакайце мяне на сцежцы ў Турск, ля вярбы. Я вас дaганю... Раю ўлічыць, мы ідзём на сяброўскае паляванне. На качак.

І спакойна павярнуўся да Горава спіною. Нават не паглядзеў на яго, калі той накіраваўся да хаты...

Яны ішлі рука да рукі, як сябры. Ніхто, нават вартавы ля пераправы цераз старыцу, не мог бы падумаць, што гэта не ўчарашнія камрады[1], а ворагі. Леановіч дружалюбна падтрымліваў Горава, калі яны ішлі кладкаю.

Хата паромшчыка знікла за густымі вербамі, пад якімі ляжала старыца. Хлюпаючы ботамі, яны ішлі далей і далей у лугі. А над імі высока вісела шэрае нізкае неба.

— Пойдзем да Камарына. Там зручней.

---

[1] *Камра́д* — таварыш.

Камарынам зваўся другі старык, другое старое рэчышча Дняпра — доўгае і вузкае возера ў лугах. Яго здалёк адзначалі цёмна-зялёныя шапкі дубоў. Гораву было ўсё адно куды ісці, ён ведаў, што гэта яго апошняя дарога, і таму згодна кіўнуў галавой.

Пора-Леановіч са спакойнай усмешкай сказаў:

— Біцца будзем без секундантаў. На гонар. У ваенны час за такую справу, якой мы хочам заняцца, пагражае цытадэль. Таму той, каму пашанцуе забіць другога, не павінен гаварыць пра дуэль, або, як казалі продкі, двабой. Забітага — на інсургентаў.

Гораў прагна дыхаў вільготным паветрам, тым паветрам, якое ў дні жніўня выразна прадчувае раскошную цёплую восень.

Крычалі кнігаўкі, малілі аб вадзе, хоць яе досыць было на залітых лугах. І іхні енк аддаваўся недзе глыбока пад сэрцам.

— Пі-іць, пі-іць, — крычала адна, але Гораву здавалася, што гэта яна ў смяротнай скрусе плача — жы-ыць, жы-ыць.

Няўжо можна проста хадзіць па лугах, не думаючы, што чакае смерць? Вось качка ўзнялася з сітнягоў, паказала рабую грудзіну. Напэўна, сэрца яе абарвалася ад жаху, калі яна ўбачыла за спінамі людзей трубкі, што вывяргаюць полымя і смерць. Адкуль ёй было ведаць, што людзі занятыя больш важнай справаю.

— У вас правая не ў парадку. Не пужайцеся, я таксама буду левай.

— Я не пужаюся, — сказаў Гораў і, хоць зусім не думаў пра гэта, дадаў з паважнасцю: — Я хачу толькі хутчэй стрэліць у вас. Вы мне абрыдлі.

Недзе далёка скупы прамень сонца прабіўся праз хмары і палажыў на мокрай траве ізумрудную пляму. Каржакаватыя дубы над Камарынам патыхалі вільгаццю. Бліснула стужка затокі.

Здзічэлы конь — іх многа было ў тое лета — чуйна ўзняў галаву ад вады (з цёмных шэрых губ падалі кроплі) і кінуўся прэч. Коні баяліся людзей. Ад людзей пахла не хлебам, а крывёю, як ад ваўкоў.

— Досыць, — сказаў Пора-Леановіч, — далей не пойдзем. У выпадку чаго будзем казаць, што забілі з хмызоў пад дубамі.

Хмызы былі крокаў за дзвесце. А вакол былі мокрыя лугі з высокай перастаялай травой.

Леановіч дастаў з ягдташа[1] скрыначку з дуэльнымі пісталетамі.

— Мае, — сказаў ён, — дагледжаныя, выбірайце першы лепшы.

І, кінуўшы на зямлю плашч, пачаў мераць ад яго крокі.

— Дзесяць крокаў, спадзяюся, не многа? — са злоснай іроніяй спытаў ён.

Гораў сурова кіўнуў галавою.

І ад бар’ера яшчэ пяць крокаў, на падыход.

Яны разышліся на крайні след.

— Па першаму крыку кнігаўкі, — крыкнуў Леановіч.

За дваццаць крокаў, зусім блізка, Гораў бачыў постаць ворага з пісталетам у апушчанай руцэ. Бачыў страшныя блакітныя вочы, прыгожы рот, сціснуты ў змрочнай і жорсткай усмешцы. І ён ведаў, што, як бы ні хацелася жыць, ён, Гораў, не стане на бар’еры бокам да ворага, не захіліць грудзей пісталетам, хоць правілы дуэлі і дазваляюць гэта. Бо было нешта большае за страх, які жыў у ім.

Кнігаўкі, спуджаныя крокамі, стаіліся, але потым пачулі цішыню і пачалі ўзлятаць.

Каўкнула першая.

— Пара, — сказаў Леановіч.

Гораў пайшоў, уздымаючы пісталет. Як праз сон, ён бачыў усё бліжэй і бліжэй пустыя блакітныя вочы.

Крок. Яшчэ крок. Яшчэ.

Мокрыя травы пакідалі на ботах бледна-зялёныя сцяблінкі і пялёсткі перастаялых кветак. І Гораў з жахлівай выразнасцю, як ніколі ў жыцці, бачыў гэта.

І яшчэ бачыў, як са спакойнай усмешкай ішоў на яго вораг і ягоны пісталет быў амаль ужо на ўзроўні грудзей.

І тады, ведаючы, што даволі ісці, што гэта апошняя хвіліна жыцця, і пакутуючы гэтым, не шкадуючы ні аб чым,

[1] *Ягдта́ш* — паляўнічая сумка.

Гораў удыхнуў гаркаватае паветра і, не цэлячыся, націснуў курок.

Лёгкі дымок празрыстым камячком вэлюму паплыў на ўзроўні яго вачэй. Праз гэты дымок здзіўленыя вочы Горава ўбачылі, як Пора-Леановіч таргануўся наперад, быццам наткнуўся грудзьмі на нешта нябачнае, і стаў.

Хіснуўся, неяк дзіўна заводзячы руку з пісталетам і гледзячы на Горава. А потым моцным узмахам рукі адкінуў свой пісталет у балоціну.

Нейкая страшная сіла хіліла да зямлі яго дужае цела. Ён змагаўся, але яна паставіла яго на дрыготкія калені і потым шпурнула на траву сваёй магутнай рукой.

І Гораў кінуўся на дапамогу, забыўшы ўсё: ірвануў мундзір, раздзёр сарочку на грудзях і ўбачыў нізка пад левым саском маленькую круглую ранку.

Гэта было зусім не страшна, толькі адна-дзве кроплі крыві. Але Горава здзівіла не гэта. Яго здзівілі вочы Леановіча, у якіх цяпер не было пустаты, а было мярцвянае здзіўленне.

Леановіч варухнуў вуснамі.

— Пісталет... пісталет у багну, — заспяшаўся ён. Здзіўленыя, неяк па-дзіцячы светлыя вочы спыніліся на Гораве, які калаціўся ад непапраўнасці зробленага.

Пора-Леановіч засноўдаў рукамі па грудзях і раптам, на апошнім дыханні, сказаў ясным і чыстым голасам:

— Дзякуй вам... Дзякуй...

Потым ягоныя вусны замерлі, а позірк здзіўлена і безуважна спыніўся на шэрым небе, пад якім усё яшчэ лёталі і малілі аб літасці кнігаўкі.

— Усё, што я вам расказаў, — праўда, — сказаў Гораў.

Гэта было праз два дні пасля двабою. За кардонам, у лугах, непадалёк ад той вярбы, ля якой яны стрэліся ў дзень дуэлі, стаяла на збароўскай дарозе добра знаёмая параконная брычка. Жанчына ў чорным сядзела на заднім сядзенні, прылажыўшы да рота чорную карункавую[1] хустачку. Гораў стаяў адной нагою на прыступцы брычкі. У абаіх былі празрыстыя ад бледнасці твары.

---

[1] *Кару́нкі* — ажурныя, сятчастыя вырабы з ільняных, шаўковых і іншых нітак для аздобы бялізны, адзення і падобнага.

— Вам не варта паказваць жалобу, — сказаў Гораў, — вы ж ведаеце, што Мураўёў забараніў насіць жалобныя ўборы, ён і тут бачыць жалобу не па забітых, а па радзіме. Вас могуць з гэтай прычыны абразіць на дарозе...

Ён падняў на яе веі і ўбачыў вялізныя змучаныя вочы.

— Мне ўсё адно, — сказала жанчына.

— І ўсё ж накіньце плашч другога колеру. Пасты на дарогах падвоены з прычыны забойства афіцэра.

— Вы расказалі мне жахлівую рэч, — сказала жанчына.— Я і сама здагадвалася, што з гэтым мураўёўскім памілаваннем не ўсё добра. Зараз я пераканалася ў гэтым. Але чаму цяпер менавіта вы начальнік кардона?

— Я ж казаў: пасты на дарогах падвоены з прычыны забойства капітана Пора-Леановіча.

— Хто яго забіў? — уважліва гледзячы на Горава, спытала жанчына. — Няўжо інсургенты зноў з'явіліся?

— Яго забіў я, — цвёрда і сумна сказаў Гораў. — Не трэба непакоіцца. Мы страляліся на сумленнай дуэлі.

— Не варта было. Ён толькі выконваў загад.

— Варта было, — сказаў Гораў, — для яго самога.

Жанчына моўчкі глядзела на мокрыя лугі, што драмалі ў плямах скупога сонечнага святла. Потым нахілілася, выцягнула з дарожнага куфра цёмна-сіні плашч і накінула яго зверху жалобнага адзення.

— Мабыць, ваша праўда, — сказала яна. — Я была зусім разбітая, але вы сваёй мужнасцю далі мужнасць і мне. Я ведаю, што мне рабіць.

— Куды вы цяпер?

— У Вільню. Да Мураўёва. Я даб'юся ў яго аўдыенцыі і не пабаюся сказаць, што думаю пра яго.

— Гэта вельмі небяспечна. А вы яшчэ такая маладая, і для вас не цяпер, але магчыма шчасце.

Нясцерпны жаль і нямое замілаванне ахапілі душу Горава, калі яна ўзяла яго руку ў свае.

— Я ведаю, ёсць многа добрых людзей, — сказала яна, — людзей з усёабдымным, з чалавечым сэрцам. Такіх, як вы. Але што я магу зрабіць, калі мне ўсё жыццё будуць трызніцца тыя дзесяць хвілін, на якія я спазнілася. Калі

сэрца чалавечае не можа забыць... Дарагі мой чалавек. Я ведаю — у мяне ўсё канфіскуюць. Мяне, хутчэй за ўсё, чакае Сібір.

Яна схіліла галаву, а праз імгненне ўскінула на Горава цёмныя веі.

— Але мне лягчэй. Людзі заўсёды людзі. Людзі ўсюды людзі... Дай вам Бог шчасця за добрае сэрца. Шчасця з невядомай мне рускай жанчынай, такой самай добрай, як вы.

— Не трэба, пані, — сказаў Гораў.

— Маўчыце, — сказала яна амаль сурова. — Чым я магу аддзякаваць за ўсё? Толькі словам. Дай вам Бог шчасця. І вам, і дзецям, і ўсім нашчадкам вашым. Дай Бог, каб мае ўнукі ніколі не варагавалі з вашымі.

Ён схіліў галаву.

— Рушай, — сказала яна фурману пасля хвіліны цяжкага маўчання. — Бывайце, дарагі.

— Бывайце.

Брычка павольна пакацілася па дарозе...

А ён стаяў і глядзеў, як брычка, зрабіўшыся цёмнай кропкай, знікала недзе пад чорнымі хмаркамі, ад якіх цягнуліся да зямлі шэрыя завесы дажджу...

1. Пра якія падзеі з гісторыі Беларусі расказваецца ва ўрыўку з рамана?
2. Які канкрэтны жыццёвы эпізод лёг у аснову апо612веду? Як у гэтым эпізодзе праз паводзіны і выказванні галоўных герояў (Пора-Леановіча, Горава, жонкі кіраўніка паўстанцкага атрада Грынкевіча) раскрываюцца іх адносіны да падзей, іх чалавечыя характары?
3. Перадайце сваімі словамі сюжэт апавядання, знайдзіце ў ім завязку, момант найвышэйшага напружання (кульмінацыю) і развязку.
4. Чаму твор заканчваецца смерцю Пора-Леановіча? Ці можна было чакаць такой развязкі? Чаму Пора-Леановіч дзякуе Гораву за сваю смерць?
5. Як вы ацэньваеце паводзіны царскіх сатрапаў, генералаў Мураўёва і Фікельмонта, якія выдалі жонцы Грынкевіча дакумент аб памілаванні мужа і ў той жа час далі загад падначаленым зрабіць так, каб яна спазнілася і Грынкевіч быў пакараны смерцю?
6. Як пра такія паводзіны разважае Пора-Леановіч і як адрэагаваў на гэта Гораў? Якія асаблівасці характараў гэтых людзей тут выявіліся?

7. Ахарактарызуйце жонку Грынкевіча як асобу і як жанчыну. У доказ сваіх меркаванняў прывядзіце прыклады з апісаннем яе паводзін, выказванняў.
8. Як паказана ў апавяданні прырода? Чаму ў цэнтры твора знаходзіцца апісанне «вераб'інай ночы»? Як гэта апісанне звязана з падзеямі жыцця, з перажываннямі і пачуццямі герояў твора? Як малюнкі прыроды суадносяцца з сітуацыяй дуэлі?
9. Як бы Вы сфармулявалі галоўную думку — ідэю твора?
10. Калі б вы былі мастаком, які эпізод з апавядання вы выбралі б для ілюстрацыі твора.
11. Як вы думаеце, ці можна на аснове гэтага апавядання стварыць кінафільм?

Генрых Далідовіч

ГУБАТЫ

1

...Ласяня, нечакана прачнуўшыся, пачула, што нехта сюды ідзе. Хоць яшчэ мала пражыло на свеце, але ўжо адчула, што гэта тупае не той малы рудаваты, але шпаркі і спрытны, дужы ў нагах, з учэпістымі зубамі звер, які нядаўна, зваліўшы з ног, цяў яго за кумпяк, што цяпер ablіваўся нечым цёплым і соладка пахкім ды балюча ныў. Той звер падпоўз зусім нячутна, насупраць ветру, а пасля, як яно крыху адстала ад маці, неспадзявана выскачыў з-за кустоў, збіў з ног; тым болей гэта ішла не лёгкая даўгахвостая знаёмая ліса, якая часта блізка падыходзіла і доўга пазірала на іх, дужую маці і яго — свавольніка, і не баязлівы заяц-сусед, не буравата-шэры, з белаю мызаю барсук-валацуга, якіх маці ніколі не баялася і не адганяла, якія любілі пастаяць ля іх і самі пасля адыходзіліся. Валокся нехта цяжка, ломячы галінкі і парыпваючы, тупаючы; а пасля, калі гэтыя шаргавітыя крокі пачуліся зусім блізка, хтосьці, рассякаючы паветра, лёгка шуснуў сюды, да ягонай схованкі — пад густы лазовы куст, і ласяня, адплюшчыўшы вочы, са страхам убачыла праз папаратныя камлі амаль такога ж невысокага, толькі другога колеру — не рыжаватага, а чорна-белага — звера, які нядаўна разарваў яго сцягно.

Стомленае, аслабелае ласяня не магло ўжо ўцякаць, яно толькі торгнулася, крышку праехаўшы ўперад на складзеных пярэдніх нагах і жываце, і зноў заплюшчыла вочы, чакаючы ўдару, за якім ягонае цела зноў ірвануць вострыя клыкі, — адчуваючы, як зайшлося ад страху сэрца, шурхне, збягаецца і халаднее скура. Звер, які чамусьці амаль не пахнуў лесам, дзікім сіверам,ператраўленым пахам дзічыны, а меў нейкія чужыя, як палявыя, пахі, не накідаўся, а патаптаўся паблізу, нават не датыкаўся, а пасля залівіста, аж заклала ў вушах, забрахаў.

І праз брэх чуваць было, што гучныя крокі ўсё набліжаліся, цяжэлі, ад іх аж пачало, здаецца, бухаць у вушах; нарэшце заціхлі, у гэтую хвіліну змоўк і брэх — і спачатку халодны цень, а пасля і нешта вялікае, пахкае і лесам, дымам, смалою, і гэтым чорна-белым зверам, і яшчэ нечым зусім не звярыным, не дзікім, прысела над ім, мякка лэпнула па здаровым сцягне, ад чаго ласяня ўздрыгнула, моцна заплюшчыла вочы і адчула: ну, вось і няма сіл уратавацца, вось і прыйшла смерць!.. І яно абыякава падумала: што будзе, хай тое і будзе. Ад слабасці і адчаю апала галава, тыцнулася зубамі ў зямлю, аж забалелі губы і набілася ў рот сырога пяску.

Яно плюшчыла вочы, аж уздрыгвалі бровы, сціскалася ў камячок, чакаючы ў любое месца цела балючага ўдару, але ўдару не было. І тады яно з цяжкасцю адплюшчыла вочы і як скрозь вільготны туман, відаць, праз слёзы, убачыла, што сядзіць каля яго на каленях невядомы яму звер, трымаючы пярэднія ногі з доўгімі пальцамі высока над зямлёю. І гэтыя ногі, і твар звера былі белыя, зусім без шэрсці, добра кранутыя загарам. Доўгая шэрсць была толькі на круглай галаве з высокім белым ілбом.

— Дальбуг, плача па-чалавечаму… — са здзіўленнем пачулася ад таго, і ласяня ўспомніла, што і ў лесе, і за лесам, за рэчкаю, ужо не раз чула такія далёкія гукі, і здзіўлялася, які ж звер іх вымаўляе, хацела пачуць лепш, убачыць таго, але маці зводзіла падалей, балюча таўхалася, каб яно ніколі не імкнулася ісці на гэтыя галасы, і вось яно цяпер пачула, убачыла, хто так гукае (пачула, але нічога не разумела, як не ведала, што гэта ніякі не звер, а чалавек, і не абы-які чалавек, а тутэйшы ляснік).

— Ну, што з табою, маё цялятка? Ножку зламала, гойсаючы, ці матка цябе кінула?.. — і яшчэ рукою палэпаў яго па спіне, ад чаго яно зноў заплюшчыла вочы, задрыжала, сціснулася.

Той раптам, як толькі даткнуўся да раны, адхапіў — як ад агню — руку, што стала чамусьці чырвона-яркай, абцёр яе аб зямлю.

— Ды вось яно што!.. — усклікнуў. — Ваўке цябе парвалі… Беднае ты маё, бязвіннае…

І ён хуценька ўстаў, нарваў паблізу травы і ёю, прыціскаючы, выцер ніжэй раны, кінуў убок, зноў вырваў і працягнуў жмут да калена — услед за яго рухам нага запякла, зайшлася ад болю. Адляцелі і зазвінелі мухі.

— Трэба ратаваць цябе, цяля маё, — сказаў ляснік, падсунуў пад жывот ласяняці спачатку адну, а пасля і другую руку, падцягнуў, выносячы з-пад куста, пасля падкінуў, высока падняў, што ў ласяняці не толькі абвіслі доўгія белаватыя ногі і не маглі дастаць зямлі, але і закружылася ад непрывычкі галава, і панёс, блытаючыся ў роснай папараці, што па грудзі рабіла вільготнай яго вопратку.

Паперадзе іх пабег сабака — падаўся не скачкамі, аж выцягваючыся, як беглі сёння ваўкі, а задрабязіў, часта прыпыняючыся і нюхаючы зямлю: там, прыходзячы з поля, жылі мышы, рыўся, вываротваючы чорна-жоўтыя купіны, стары крот.

За драбналессем, якое ўжо высыхала ад ранішняга, але вельмі цёплага сонца, пачалося знаёмае канюшыннае поле, дзе ласяня з маці не раз ласаваліся смачнаю травою, а калі не было надта горача, то і ляжалі, адпачывалі, напіўшыся вады ў блізкай рэчцы і вяртаючыся ад яе ў лес.

Хутка яны падышлі да зарослай кустамі, аерам старой рэчкі, дзе закіданая гніллём вада была нясмачная, абагнулі яе і апынуліся ля амаль безбярэжнай, стромкай новай рэчкі-канавы, за якой — у цемнаватай зелені і сярод мноства дамоў — чуліся тыя знаёмыя галасы. Яны з маці часта стаялі тут, на беразе, і з вялікай цікавасцю глядзелі туды, гадаючы, што там за жыццё…

Чалавек прайшоў берагам і апынуўся ля кладкі, неакораных, але гладкіх зверху жэрдак, перакінутых з аднаго берага

на другі. Ступіўшы, ён пагойдаўся і паволі, калышучыся, бокам падаўся на другі бераг, дзе яно ні разу не было: страх і боязь за сваё жыццё праходзілі, але незнаёмыя мясціны з дзіўнымі галасамі, з дзіўным, не лясным, пахам, таемная будучыня так расхвалявалі, што ад усяго гэтага ўзрушэння заслязіліся вочы і пачалі падаць з іх на зямлю буйныя кроплі...

2

Ляснік, прыйшоўшы дамоў не вуліцай, а сцежкай, праз загадзя адчыненыя жонкай дзверы ўнёс ласяня ў хату, за парогам якой стаяла вялікая печ, дзе шугала полымя і кіпела вада ў гаршках. Тут стаяў зусім незнаёмы для ласяняці дух, якім яшчэ там, у прылеску, пахнуў гэты чалавек.

Ласяня апусцілі і палажылі ў кут на цвёрдую падлогу, а сам носчык разагнуўся і памахаў, мусіць, здранцвелымі рукамі.

— Дзе ты яго ўзяў? — спытала невысокая поўненькая гаспадыня. — Такое ж яшчэ малюсенечкае...

— Падабраў у Каралёвым бары, — адказаў муж, высокі, плячысты, сярэдніх гадоў мужчына. — Ваўке зад парвалі, а матку, відаць, уходалі. Каб яшчэ з гадзіну якую, то і яму капцы былі б: крывёю сышло... Трэба спіртам абмыць рану ды падбелам прыкласці. Схадзі ты, Маня, нарві...

— Божа, ты мой божа! — пабедавала гаспадыня, збіраючыся выходзіць на двор. — Гэтакае маленечкае, колькі яшчэ там пажыло, а ўжо такі боль... Хай яе з такой доляй!.. Хоць дзікі звер, але як шкода...

Жанчына, накульгваючы, падалася з хаты, а мужчына падышоў да ляжанкі-печы, палэпаў па ёй, намацаў белую анучу, страсянуў яе, што пасыпаўся пыл, пагамтаў у руках, падышоў да вузкай высакаватай шафкі, адцягнуў верхняе шкло і дастаў бутэлечку, у якой напалавіну было празрыстай вадкасці. Адкаркаваўшы зубамі бутэльку, ён пачаў ліць з яе на анучку, якая ўвачавідкі памакрэла — з яе ўпалі долу кроплі, запахлі незнаёмым хмелем, намнога мацнейшым, чым пахне паслядажджовы ліcцвяны лес.

Паставіўшы на месца бутэльку, мужчына падышоў да яго, ласяняці, нагнуўся і прыклаў халодную анучку да раны — ад чаго яго сцягно, здаецца, апалілі агнём.

Яно дзіка замукала, спрабавала ўскочыць, але ляснік паклаў другую дужую руку на спіну і прытрымаў, супакойваючы: «Ну, пацярпі, маё цялятка, папячэ яшчэ трохі і сціхне!..» — і вадзіў ды вадзіў, выціраючы, латкаю па ране і вакол яе, раз за разам перакручваючы анучку, хаваючы ў сярэдзіну камячка крывяныя плямы. Выціраў, трымаў спіну і сам ад нечага крывіўся, робячы зусім маленечкія вочкі.

Ласяня моцна-моцна заплюшчыла вочы і зайшлося ад болю, ад якога закалола ў скроні, думала, што вось ужо напраўду наступіў канец. Але пасля — і нават нечакана — боль пачаў пациху слабець, пакідаючы толькі пра сябе напамінак, шчымлівы зуд, і здалося, што параненая нага, якая торгала, палягчэла, стала лёгкая-лёгкая. Мужчына гладзіў яго па галаве, шыі, і яно сцішылася, ткнулася галавою да цвёрдага долу, стомлена, але з палёгкаю заплюшчыла вочы, адчуваючы, што будзе жыць, што небяспека праходзіць, прападае, а замест яе прыплывае спакой ды суцяшэнне, што стала менш балець, а пасля раптам захацелася есці: сёння маці не паспела яго пакарміць з-за ваўкоў, збегла недзе з поўным вымем. Ад успаміну пра цёплае салодкае малако ў ласяняці сабралася ў роце сліна, і тая, якую не паспела пракаўтнуць, пацякла на ніжнюю губу...

— Ці не естачкі ты хочаш? — лагодна запытаў ляснік. — Зараз знойдзем табе малачка, напоім, каб падужэў, — і адышоў да белай шафкі.

Адчыніў дзверцы, узяў з палічкі збанок, трымаючы яго вялізнай рукою за горлачка, пакруціўся, нешта шукаючы, пасля ўзяў міску, наліў у яе малака і паднёс, даў ласяняці. Яно пачула знаёмы малочны пах (хоць ён быў не зусім такі, як у мамы-ласіхі), адразу ткнулася ў міску, ды так няўдала, што свежае, відаць, яшчэ нядаўна надоенае малака залілося ў ноздры, ад чаго прыйшлося некалькі разоў фыркнуць і апырскаць чалавека ды падлогу.

— Ды ты не ўмееш яшчэ піць з місы... Ты яшчэ, брат, зусім нягеглы, — усё так жа лагодна сказаў ляснік, устаў і зноў падаўся да шафкі.

Узяў там бутэльку і, нагінаючы, ільючы на стол, пачаў пераліваць у яе з міскі малако.

Ласяня, шкадуючы, што так хутка прапаў ласунак, аблізала языком губы, бараду, адчуўшы, што і гэтае малако

смачнае, з радасцю праглынула ўсё, што трапіла ў рот, яшчэ больш распаляючы голад.

Ляснік хутка вярнуўся, несучы ў руках бутэльку з чырвонаю соскаю, даў яе, халодную, мяккую, і ласяня, скрывіўшыся ад непрыемнага гумавага паху, пацягнула і адчула, што малако палілося ў рот тонкім струменьчыкам. Ад радасці яно ледзь не захлынулася, памкнулася ўсхапіцца, але яго працяў боль у назе, і прыйшлося аціхнуць, перачакаць, калі стане лягчэй, тады ўжо смактаць далей, выцягваючы шыю і стараючыся не выпусціць слізкай соскі.

І ўжо смокчучы, яно бачыла, як з другой, адгароджанай палавіны хаты, адчыніўшы дзверы, зайшло двое заспаных босых дзяцей — худаваты, але высокі хлопчык гадоў сямі і поўненькая, у доўгай белай кашульцы, дзяўчынка гадоў пяці. Спачатку, тручы ручкамі вочы, яны з дзівам пазіралі на бацьку і на яго, а пасля ажывіліся, пайшлі сюды хутка-хутка — і ў іх адразу прапаў сон, шырока адплюшчыліся вочы і паадкрываліся роцікі.

— Гэта другое цялятка? — запытала мякенькім, далікатным голасам дзяўчынка. — Дзе ты яго ўзяў?

Бацька нічога не адказваў, пасміхаўся.

— Гэта не цялятка, — сказаў хлопчык, пакручваючы на голым вострым плечуку шлейку ад майкі. — Гэта маленькі лось. Так, татусь?

— Так, дзеці, — сказаў ляснік. — І цяпер ён будзе жыць у нас, пакуль не вылечым яго.

— Лёсь, лёсь! — прысеўшы каля ласяняці і гладзячы яго маленькаю ручкаю па спіне, гаварыла дзяўчынка, а пасля зайшла з другога боку і пацягнулася да бутэлькі... — Дай я, татусь...

І як той згадзіўся, узяла бутэльку і трымала яе абедзвюма ручкамі.

Ласяня, з цікавасцю пазіраючы на маленькіх дзяцей, высмактала ўсё малако, нават доўга патрымала пустую соску, ад чаго тая засвістала, а пасля зліплася. Як забралі яе з рота, яно пацмокала языком, адчула, што зусім змарылася, што самі пачалі ліпнуцца вочы.

...Ноччу — пасля таго як яго рану прыклалі падбелам, зноў напаілі і яно спала — прытрызнілася, што паблізу блукае маці, ціхенька падклікае яго — самотна мычыць.

Яно прахапілася, прыслухалася — мыканне прапала. Толькі, здаецца, дзьмухнуў, адбіўся ад сцяны вецер. Як яно суцішылася, пачынала засынаць — зноў пачулася жалобнае мыканне.

Ласяня напялася, абаперлася на пярэднія калені, каб стаць на заднія ногі, а пасля падняць ужо адну і другую пярэднія, але задняя не ўперлася, як у лесе, аб зямлю, а паехала, зарыпела капытом па падлозе. На нагу аб'ехала з плячэй старая фуфайка, і яно заблыталася ў ёй і ў падасланай, але ўжо збітай набок дзяружцы.

— Ужо хвост падняло, га? — пачуўшы яго грукат, азваўся гаспадар, які ў майцы і ў трусах прыйшоў сюды са спальні і ўключыў святло, асляпіўшы зусім ласяня. — Ужо і сіла ест? Га? Гэта добра, але каб не нарабіла ты нам бяды, я адгараджу цябе, — і ён, прыпаднімаючы, прывалок перад сабою і паставіў наўскасяк высакаваты столік. — А заўтра, маё даражэнькае, я цябе ў дрывотню затарабаню. Там табе будзе воля... — пастаяў крыху, упёршыся грудзінай на столік, пагладзіў па спіне і, выключыўшы святло, пашлэпаў назад у спальню.

3

Прайшло некалькі тыдняў.

Ласяня акрыяла, падужэла, пачула, што ў яго залячылася рана — спачатку зацягнулася цвёрдаю, тоўстаю, бураю ад крыві нарасцю, а пасля гэтая нарасць пачала сушэць, свярбець і адлушчвацца ды абвісаць.

У падпаветцы — на ахапку сена — яно спала ноччу, а днём гуляла па двары, пазнаёмілася з усімі яго насельнікамі. Палюбіла шчыра гаспадара, добрага і спагадлівага чалавека, мірна ўжылося з таварыскім сабакам, са свавольнікам цялём, амаль равеснікам, з якім гойсала па двары; з катом, з курамі — драбнатой — яму было нецікава, і яно без ніякай злосці, толькі дзеля жарту не адганяла тых, а наўмысна бегала за імі, нясмелымі, пудкімі, бачачы, як яны баязліва ўцякаюць, і гаспадар, заўважыўшы гэта, у першы раз накрычаў, кажучы, што ката чорт не возьме, а вось курэй не трэба гэтак палохаць: яны і пер'е губляюць, і «адбіваюцца», не нясуцца. З вялікай — амаль з ласіху — каровай адразу ж,

у першую хвіліну сустрэчы, ніякага сяброўства не выйшла: яно памкнулася да яе, да вымя, пачуўшы пах малака, але тая балюча трэснула задняю нагою, і яно, плачучы ад болю, больш не падышло да яе, як і тая ганарліва не звяртала ніякай увагі.

Найбольш ласяня пасябравала з гаспадаровымі дзецьмі — з хлопчыкам і дзяўчынкаю. Яно не ведала, каго больш з іх любіла. Відаць, абаіх пароўну. З імі яно і дурэла, бегала па двары, брала з іхніх рук смачны хлеб, салодкія цукеркі і пернікі, ад іх яно атрымала смешную, нават дураслівую мянушку — Губаты.

Прыдумаў гэта хлопчык. Усё дзівіўся, што ў яго, ласяняці, такая гарбатая морда, абвіслая верхняя губа, а пасля і выдумаў: «Губаты!» Падклікалі яго адным з цялём клічам: «Цяля-цяля!» — а мянушку вось далі такую.

Спачатку называлі так дзеці, а пасля пачалі гэтак падклікаць і сталыя.

У адзін з апошніх летніх дзён, у яшчэ раннюю, сівую ад туману раніцу, да якой яго рана стала цвёрдай, зарубцавалася, ужо не трэскалася і не балела, толькі крышачку саднела, хоць так і не зарасла шэрсцю, чамусьці зрання прынёс яму вядро з пойлам не босы, яшчэ заспаны хлопчык, а сам гаспадар. Ён быў ужо ў аброшаных кірзавых ботах, старым пінжаку, на плечы якога начаплялася шмат лясной павуціны, і ўвесь ён пахнуў вільготнымі грыбамі.

Прынёс па паўвядра пойла яму і цяляці, якое сёння чамусьці ўсё яшчэ не выводзілі ў поле і з якім яны дасюль елі з цабэрка свежую траву.

Хлопчык заўсёды стаўляў перад ім вядро, апускаў у яго руку, і Губаты, ловячы пальцы, хлябтаў смачнае цёплае пойла, а пасля ўжо языком вылізваў наліплае да дна салодкае цеста. Цяпер Губаты тыцнуўся ў вядро, шукаючы мяккіх пальчыкаў, абліў да вачэй морду і, нічога не абмацаўшы, не мог піць, толькі выплёхваў усё долу.

Ляснік моўчкі пазіраў, але пальцаў сваіх не даваў і за такую марнату не крычаў. Стаяў і курыў зацяжкамі, моршчыўся. Быў ён сёння нейкі задумлівы, надта сур’ёзны.

Як цяля выпіла і вылізала сваю долю, ласяня абы-як гэтаксама апаражніла вядро, ляснік узяў з плота зматаны

ланцуг, надзеў ашыйнік на цялячую шыю, адчыніў брамку і павёў яго з двара. У тыя разы, калі выводзіў цяля на пашу, зачыняў брамку перад самым носам Губатага, якому гэтаксама хацелася пайсці разам, не заставацца аднаму, а сёння чамусьці не пасняшаўся гэтага зрабіць, і Губаты — спачатку нясмела, як не верачы, што яму гэта можна, а пасля смялей — памкнуўся следам.

Яны падаліся па выцэментаванай сцежцы ля хаты; ідучы, Губаты ўбачыў, што ў запацелае ад цяпла акно пазірае гаспадыня, глядзіць самотна і нават, здаецца, нечага жалобіцца — выцірае рогам белай хусцінкі вочы.

За яшчэ адной брамкаю амаль адразу пачаўся бела-шэры брук, на якім Губаты ледзь не спатыкнуўся, не могучы ісці па камянях. За брукам ляжаў неабгароджаны вялізны — ад вуліцы да лесу — выган, амаль увесь ужо выгаралы ад сонца, рыжы, але мясцінамі, у лагчынках, яшчэ зеленаваты. Гаспадар прывёў іх да зелянейшай лапіны, па дарозе вырваўшы з зямлі калок, да якога, відаць, раней прывязвалі цяля.

Як гаспадар прыпыніўся, нагнуўся, пачаў забіваць каменем у дол сплясканы зверху калок, пятлёю надзеўшы яго на ланцуг, стала і ласяня, здзіўленае такім вялікім прасторам, над якім, здаецца, намнога пабольшала і блакітнае, з лёгкай парнасцю неба.

— Ну што, Губаты? — кінуўшы вобзем камень, ляснік падняўся, атрапаў аб штаніны рукі, а пасля пагладзіў яго па спіне. — Стаў ты ўжо дужы, здаровенькі, то ідзі ў свой дом, так сказаць, і жыві, дзе ўсе твае сваякі жывуць... Бо цяперака, покуль ты яшчэ малое, табе добра ў нас, а скора будзе нядобра... Ідзі, покуль дзеці спяць... — сказаў так і падштурхнуў у зад. — Ідзі, звярок, мілы, да свайго, а пра нас забудзь... Так будзе табе ж лепей...

Губаты адышоўся, пхнуў мызаю цяля — і яны, як штодня ў двары, імтанулі адсюль. Але хутка цяля, ірвануўшыся, стала: яго, напяўшыся, затрымаў ланцуг. Ляснік, які шлэпаў у ботах за імі, замахаў вялікімі рукамі — і Губаты, зусім не спалохаўшыся, а дурасліва і як дражнячыся, падскочыў, брыкнуў заднімі нагамі і гайцануў далей, імгненна п’янеючы ад вялікай прасторы, бегу, адчуваючы, як яму ўсяго гэтага дасюль не хапала.

За выганам пачаўся малады лес, які знаёма запахнуў зеленню, смалой, расою, — і ў душы Губатага нешта як варухнулася, захацелася бегчы, і ён, ужо нічога не помнячы, не азіраючыся, мінуў маладняк і памчаў у глыб лесу. Стары сасоннік яшчэ болей завабіў нечым невядомым, родным, мілым, што ён адчуў такое вялікае шчасце, якое, здаецца, не толькі поўніла грудзі, але і ахмяліла зусім. Ён прабег яшчэ, тыцнуўся ў высокую траву і нечакана, зморшчыўшыся, спыніўся: гэта былі калючыя ажыны.

Губаты хутка выблытаўся назад, адчуваючы, як гараць агнём падрапаныя ногі, прайшоў крыху, асцярожна дакрануўся мордай да высакаватага густога ядлоўцавага куста — і зноў хуценька адскочыў, адчуваючы, што запякла наколатая далікатная мыза. Ап'яненне воляй прайшло, і ён адчуў, што шмат чаго тут не ведае, а вось леснікоў двор знае ўжо да драбніц, адчуў, што і лес сустрэў яго непрыхільна. Падаўся далей паволі, баючыся, каб зноў не наткнуцца на што калючае.

І тут ён пачуў, што яго жаласна кліча хлопчык: «Губаты, дзе ты, Губаты?» — а гэтаксама тоненька, як камар, плача дзяўчынка: ён зразумеў, што далёка адбегся, пакінуў адных сваіх сяброў. Падумаў так і затрусіў назад.

Выскачыўшы з лесу, згледзеў, што ляснік трымае на руках і спрабуе несці дамоў дзяўчынку, якая вырываецца і румзае.

— Губаты, Губаты! — радасна закрычаў хлопчык — босы, у кароткіх трусіках ды майцы, — а пасля хутка-хутка пабег насустрач.

Убачыўшы гэта, ляснік апусціў на зямлю дзяўчынку ў кароценькай кашульцы, босую, і яна гэтаксама падалася сюды за хлопчыкам, крышку смешна віхляючы нібы крывуватымі ножкамі. Бегла і нешта радасна крычала.

Яны сутыкнуліся з хлопчыкам і пакаціліся долу (Губаты падаў першы, каб не пакалечыць малога); хлопчык хутка ўсхапіўся, абняў за шыю, прытуліўся, шэпчучы: «Губаты мой! Губаценькі!» Падбегла, гопнулася на яго дзяўчынка, гэтаксама абхапіла шыю мякенькімі маленькімі ручкамі, а пасля і прытулілася поўненькаю шчочкаю — і Губаты не вытрымаў, заплакаў, што ў яго такія верныя, мілыя маленькія сябры...

— Ты маніў нам... — папракнуў хлопчык бацьку, калі той паволі падышоў. — Губаты не ўцёк сам, а ты яго выпусціў. Як выпусціў бусла, зайчыкаў, дзікіх парасят... Але Губатага мы не адпусцім, ён будзе жыць у нас... Я яго буду карміць...

— І я буду кальміць... — паўтарыла за ім дзяўчынка, гэтаксама з папрокам пазіраючы на маўклівага, як вінаватага, бацьку сваімі вялікімі вачамі, поўнымі слёз. — Ты нядоблі, татусь...

— Добра вы робіце, дзеці, і нядобра... — зморшчыўся, нарэшце азваўся ён. — Хараша і люба, што гледзіцё так Губатага, але блага, што трымаеце. Ён звер і павінен жыць у лесе. Там яго дом... Пасцель, яда, воля... Цяжка бывае дзікаму зверу, калі яго залішне прыручаць людзі... Гора бывае, бяда... Я ж ведаю...

Губаты, нічога не баючыся, падхапіўся, гарцануў і пабег да яшчэ аднаго сябрука — да цяляці. За ім, не слухаючы, а можа, зусім не разумеючы сталых, сур'ёзных бацькавых слоў, памчаліся і шчаслівыя дзеці.

5

Губаты — так ужо выйшла — застаўся ў лесніковай гаспадарцы. Летам і ранняй восенню ненавязаны пасвіўся з цялём на выгане, бегаў у лес паласавацца лісцем і карою, прывык да вёскі, да машын, людзей, аббегаў усе наваколіцы, і да яго прывыклі надта дзеці. Начаваў у падпаветцы.

На зіму яго паставілі ў невялікую загарадку ў хляве, да якога ён доўга не мог прывыкнуць: неяк муляла суседства з каровай і свіннямі. Тыя не хацелі падружыцца з ім — надта ж палахліва свінні рохкалі і пудзіліся яго, — цяжка было пераносіць пах гною і цеснату ў маленькай загарадцы, усё ж у душы яму хацелася волі, прастору, бегатні, чаго яму даводзілася мець вельмі рэдка і не памногу, толькі тады, калі выганялі паіць яго з каровай і цялём да абмерзлай лёдам студні.

За зіму ён зусім змяніўся — выцягнуўся, пастрайнеў і памацнеў у нагах, ударам капытоў мог ужо адбіваць жэрдкі, падаўжэў у спіне ды пацяжэў, аброс густой, доўгай, амаль чорнай поўсцю, адчуў неспакойны сверб у галаве вышэй ілба — там, няйначай, раслі, касцянелі рогі.

Вясною, калі спала талая вада, патужэла вільготная халодная зямля і пачала ядрана пахнуць яшчэ нябачная маладая лістота, Губаты засумаваў, не мог больш стаяць у паменшанай ад гною загарадцы, многа есці, спаць ці паціху хадзіць па двары, як хадзілі цяжкая, сытая, палінялая карова і падрослы, пазласнелы і не такі ўжо сябрук бычок-выхваляка, а яго зноў, але мацней, як восенню, завабілі воля, прастор, лес. Ён, падрослы, не так ужо цягнуўся дурэць з дзецьмі, і тыя за зіму неяк да яго пахаладзелі, пачалі баяцца яго штуршкоў, ад якіх яны адляталі, як снапы.

І ён, калі апынуўся на двары, нервова хадзіў па ім, цёрся ля высокага плота, пакідаючы на стрэмках пабурэлую ўжо поўсць, а аднойчы пад'юшчыла гэтая самота, жаданне волі — і ён разагнаўся, стукнуўшыся галёнкай, перагойснуў загарод і радасна пабег па знаёмым выгане ў лес.

...Ляснік, як сонца паднялося над хатай, разліло маладое цяпло на сінім небе, уехаў у двор з калясьмі, увайшоў сюды, у хлеў, пагладзіў Губатага, якому надакучыла стаяць аднаму ў загарадцы, па шыі, а пасля амаль нячутна завязаў на яе пастронак[1] і за яго, адчыніўшы перакошаныя варотцы, вывеў з пустога хлява на двор, прывязаў да калёс. Ён тыцнуўся да воза, панюхаў сена, галінкі з альховым і лазовым лісцем, шчыпнуў, але з неспакоем адчуў, што гаспадар сёння задумаў з ім нешта дасюль яшчэ не вядомае.

Да воза падышлі гаспадыня, дзеці, моўчкі пазіралі на іх.

Гаспадар гэтаксама моўчкі сеў на воз, пацягнуў за лейцы — і маленькі рудаваты конік з белаватымі нагамі крануўся. Пастронак нацягнуўся — і павалок за сабою. Губаты, непакоячыся, але не адчуваючы яшчэ ніякага страху, нехаця падаўся, здзіўляючыся, куды яго вядуць: спяшаўся за калясьмі і не мог азірнуцца, убачыць, што гаспадыня з дзецьмі выйшлі на вуліцу і развітальна махаюць рукамі...

У лесе ляснік прыпыніўся, неяк крадучыся, падышоў, прылашчыў, даючы ўзяты з кішэні выкачаны ў махорку акраец хлеба, і нечакана накінуў яму на галаву мех. Ён

[1] *Пастро́нак* — тут: частка збруі, якая выкарыстоўваецца пры запраганні каня ў плуг.

спачатку спалохаўся неспадзяванай цемнаты, чакаючы раптоўнага ўдару па галаве, затрапятаўся, ірвануўся, але пастронак перацiснуў горла, і ён ледзь не задыхнуўся.

— Не бойся, Губаты, — заспакоіў яго ляснік. — Ніц благога я табе не зраблю... — зноў паехаў, прымусіўшы яго бегчы ўслед.

Ехалі яны так доўга. І па мяккай, і па тупкай, з карэннямі дарозе, у адным месцы перамінулі мост — Губаты там вельмі насцярожыўся, ішоў баязліва — пасля яшчэ многа, можа, гадзіны са тры, падаваліся то ўлева, то ўправа, затым паехалі лесам, па сухім імху і верасе, што Губаты некалькі разоў спатыкаўся аб пні і ў вырытых, мусіць, дзікамі ямінках.

Нарэшце ляснік прыпыніўся, падышоў да яго, зняў мех, ад якога ўвапрэлі галава і карак, адвязаў пастронак. Губаты паварочаў мызай, зафыркаў і адышоўся. Ляснік у гэты час махнуў вяроўчынай: уцякай, маўляў, вось твой дом, у якім ты цяпер павінен жыць!

Губаты не спалохаўся гэтага ўзмаху, ведаючы, што гаспадар ніколі яго не біў, але яшчэ далей адышоўся, адчуваючы нядобрую перамену да сябе, стаў і пачаў глядзець, што ж будзе далей, убачыў, што чалавек зноў садзіцца на воз і ад'язджае. Ён памкнуўся следам, не хочучы заставацца тут, у незнаёмым лесе, адзін, але мужчына спыніўся, нагнуўся, падняў тоўстую, з аблезлай карой галіну і запусціў у яго.

— Пайшоў! — закрычаў ён, а пасля — ужо ціха сказаў сабе: — Пайшоў, родны... Цяпер не прападзеш. Гэта летась, як быў малы, і я шкадаваў разам з дзецьмі, баяўся, што не ўцалееш... Каб ты не прыбег, я наўмысля выпусціў не за нашымі Янковічамі, а прывёз сюды, у Налібоцкую пушчу... Жыві тут сабе на здароўе... У нас табе не жыццё... І нам клопату з табою...

Губаты, пакрыўдзіўшыся, больш не памкнуўся наўздагон, адстаў, адвярнуўся і паціху пакрочыў па чужым, ціхім, зусім далёкім ад вёсак лесе, чуючы, як аддаляецца ляскат колаў. Але ён наўмысна, не ўслухоўваючыся, ішоў, куды вялі ногі.

...Ужо к вечару ён, не раз пад'еўшы і напіўшыся ў невялікай лужынцы зеленаватай нясмачнай вады, спалохаўшы зайца, сямейку цецерукоў, найшоў на лася.

Той, высокі, буры, рагаты, стаяў уперадзе і, падняўшы галаву, чакаў яго, а пасля злосна зафыркаў, грабянуў стройнаю дужаю нагою зямлю. Губаты і спалохаўся, і радасна памкнуўся да свайго ляснога аднакрэвіча, але той, моцна раздзімаючы ноздры, грозна насупіўся, апусціў рагатую галаву, а пасля, бачачы, што аднаго яго пагрознага выгляду мала, подбегам падаўся насустрач. Губаты ледзь паспеў адскочыцца, ухіліцца ад вострых цвёрдых рагоў, зразумеўшы, што ён тут чужы, лішні, замінае, бо той — хоць у лесе ўсяго шмат і ўсім любога хопіць — гэтаксама хоча мець тут нязводны харч, быць гаспадаром удалай мясціны... Таму вось так не хочуць, каб яшчэ быў і ён, адганяюць, каб блукаў недзе падалёку, у горшых мясцінах...

Губаты мусіў уцячы з багатага на лісце і траву глухога кутка, вярнуцца ў той лес, куды яго прывёў ляснік, думаючы, што трэба ўсё яшчэ шукаць і сабе лепшага прытулку. Нервова патаптаўся, здзіўляючыся і абураючыся, што яго тут так непрыхільна сустрэлі, а пасля зашыўся ў густую папараць і лёг, спрабуючы заснуць. Але не мог. Спачатку здавалася, што вельмі мулка ляжаць, ён шмат круціўся, поўзаў, выбіраючы мякчэйшае месца, пасля стала холадна, стыла ад зямлі, што ў яго збеглася, пакрылася буйнымі зярняткамі скура. А з густою, як ад накрытага на лес вялізнага гаршка, цемнатою прыйшоў страх — сполах ад адзіноты, ад савінага прарэзлівага крыку, — і ён засумаваў па цёплым хляве, па маленькай загарадцы, якія яшчэ ўчора патаемна недалюбліваў, а цяпер так помніў, шкадаваў, хацеў зноў трапіць туды.

Яму не цярпелася ўскочыць і пабегчы туды, да людзей, і калі гэтая думка, ад якой аж зашумела ў галаве і нечым гарачым аблілося сэрца, ледзь не падняла на ногі, нечакана прыйшла другая, цвярозая, халодная, ад якой адліла кроў ад галавы і сэрца: падумалася, што можна не знайсці туды дарогі — самае важнае — там ён зусім не патрэбны...

Прывыкаючы да лесу, кожны міг шукаючы ў ім сабе сябра, але ўсё яшчэ пастаянна ратуючыся бегам ад таго бурага і другіх вялікіх аднакрэвічаў, толькі маладой смеласцю ўры-

ваючы ў іхніх кутках крыху лісця і травы, Губаты пачаў жыць у пушчы.

Ён стаў пакрысе дзічэць. Можа, і зусім здзічэў бы, вырас у дужага вялікага лася, заваяваў бы пакрысе сабе добрае для харчу, сну, гулянак месца, меў бы сярод ласёў славу, калі б не людзі.

Губаты не мог яшчэ зусім ад іх адвыкнуць. Аднойчы, як пачуў неспадзявана далёкія людскія галасы, ён, усхваляваны, радасны, нават адурнелы ад шчасця, пабег да іх на злом галавы праз стары лес. Знайшоў, убачыўшы некалькі жанчын у гумавых ботах, з клункамі і граблямі. Чакаючы смачнага хлеба і аж пускаючы слінкі, кінуўся да іх, падбрыкваючы ад радасці, але яны, пачуўшы яго тупат, азірнуліся, нарабілі дзікага піску і сыпанулі хто куды. І як ён ні стараўся дагнаць якую кабету, прылашчыцца, усе ад яго ўцякалі, нема крычалі, азіраючыся (твары іх аж пасінелі ад страху), а пасля, асмеліўшыся, сабраліся разам, схаваліся за тоўстую хвою, злосна махалі на яго граблямі, кідалі галлё, зямлю...

...Гэтых двух маладжавых мужчын — высокага, чарнявага, гарбаносага на шырокім загарэлым твары, і маларослага, рыжаватага, дробненькага, у гумавых высокіх ботах і фуфайках, — яны ішлі не па блізкай, тупкай пасля дажджу дарозе, а ціха, зладзеявата азіраючыся, падаліся лесам — Губаты ўбачыў першы. Ён стаяў у яшчэ макраватым, парным алешніку і скуб лісце. Як лавіў ротам галінку і цягнуў да сябе, заплюшчваўся: дрэва траслося і абкідвала густымі кроплямі, ад якіх у яго была ўжо вільготная спіна. Убачыўшы мужчын, што неслі ў апушчаных руках стрэльбы, паскі ад якіх амаль цягнуліся па зямлі, чапляліся за кусцікі, ён ужо не думаў выбягаць насустрач, але і не збіраўся ўцякаць. Паразважаў: няхай ідуць сабе на здароўе, куды ім трэба.

— Гавораць, што недзе во тут ходзіць той падлетак, ідзе да людзей, — сказаў высокі.

— Страшнавата неяк, халера... — дрыготкім голасам прамовіў маларослы. — Закон жа ест строгі!

— Бо ідзеш так у першы раз... — хіхікнуў высокі, змахваючы вольнаю рукою з твару мокрае павуцінне і паднімаючы вышэй стрэльбу. — Але паўплятаеш на поўную губу раздругі дармавога смачнага мяса — і варанага, і паранага, і катлетак, і шметак, — то асмелішся, яшчэ панясешся ў лес. Стой! — Ён раптам стаў, як укамянеў, схапіў за плячо спадарожніка. — Дальбуг, вунь ён стаіць...

— Дзе? — усхвалявана пытаў той, плюшчыў маленькія вочкі.

— Па кубельцу, брат, будзя... — прашаптаў высокі, ціха здымаючы з плечука сумку і апускаючы яе долу. — Так што не лгалі людзі, бачылі-такі...

Губаты ўсё стаяў і пазіраў, здзіўляючыся, што самі нарэшце ідуць да яго людзі, углядаюцца; ён пачуў пагрозлівы парахавы пах са ствалоў, але не збаяўся, помніў, што яшчэ чуйней пахла і леснікова стрэльба, якая ніколі не зрабіла яму нічога благога.

— Э-э, стралок! — грэбліва прашаптаў высокі мужчына меншаму. — Ды ў цябе рукі калоцяцца і губы дрыжаць, як у зайца... То я пальну... Калі не ўкладу, то ты тады бі... — і паволі, стараючыся не шумець, не рабіць лішніх рухаў, сцяў поўныя вусны, што яны пасінелі, прыціснуў прыклад да плечука, прыплюшчыў левае вока, паварочваючыся сам і ведучы ў яго бок ствалом.

Губаты дажаваў лісце, губляючы долу зялёную сліну, хацеў падацца адгэтуль і толькі сабраўся адводзіць галаву, як на міг пачуў, што нешта моцна ляснула, а пасля асляпіла, зваліла з ног, і больш ужо ён нічога не мог уцяміць: яго ахутала глухая цемната...

1. Якія пачуцці і думкі выклікала ў вас гэта апавяданне?
2. Твор падзелены на часткі. Прыдумайце назву кожнай частцы, перакажыце іх змест. Якая вас найбольш уразіла і чаму?
3. Уважліва прачытайце першую частку. Знайдзіце ў тэксце словы, з якімі ляснік звяртаецца да ласяняці. Якім чалавекам, мяркуючы па гэтых словах, уяўляецца вам ляснік?
4. Раскажыце пра жыццё Губатага ў сям'і лесніка. Як малюе пісьменнік дзяцей, жонку лесніка? Якімі словамі перадае адчуванні і думкі Губатага?

5. Ці згодны вы са словамі лесніка, якія ён гаворыць сваім дзецям, калі яны не адпусцілі Губатага на волю: «Добра вы робіце, дзеці, і нядобра...»?
6. Першыя ўражанні Губатага ад жыцця на волі. Знайдзіце радкі пра гэта і прачытайце іх уважліва. Аб чым яны сведчаць?
7. Падрыхтуйце вуснае разгорнутае паведамленне пра Губатага, выкарыстоўваючы пры гэтым мастацкі тэкст. Як пейзажныя малюнкі дапамагаюць раскрыць адчуванні ласяняці?
8. Фінал апавядання трагічны. Падумайце, як пісьменнік ставіцца да таго, пра што расказвае. Што яго хвалюе, што ён асуджае?
9. Складзіце план апавядання і ў адпаведнасці з ім напішыце сачыненне па адной з прапанаваных тэм: «Чалавек і прырода — непадзельнае цэлае», «Мы ў адказе за тых, каго прыручылі».

АПАВЯДАННЕ І НАВЕЛА

У залежнасці ад складанасці сюжэта, шырыні ахопленых падзей, у якіх раскрываюцца чалавечыя характары, вызначаюцца некалькі асноўных эпічных жанраў.

Нярэдка ў творы герой паказваецца ў адным эпізодзе, праз асобную падзею ў яго жыцці. Прыгадаем вядомыя вам творы: «Незагойная рана» Васіля Быкава, «Васількі» Міхася Лынькова, якія вы вывучалі ў папярэдніх класах. Такія невялікія творы, у якіх характар чалавека раскрываецца праз асобныя падзеі, здарэнні ў яго жыцці, называюцца ***апавяданнямі***.

Разнавіднасцю апавядання з'яўляецца ***навела*** — невялікі твор, які расказвае аб незвычайным, выключным здарэнні ў жыцці чалавека і мае нечаканую развязку. Прыкладам таму можа паслужыць вывучаны ў папярэднім класе твор «На Каляды к сыну» Змітрака Бядулі. Вельмі коратка нагадаўшы пра адзінокае, гаротнае жыццё старой Тэклі, аўтар паказвае толькі адзін эпізод — нямоглая маці ідзе ў горад да свайго багатага, «вучонага» сына з надзеяй, што ён яе прытуліць, паспагадае, суцешыць. Сын жа выправаджвае маці са свайго дому, як надакучлівую жабрачку.

Васіль Быкаў

Калі чытаеш Быкава, «...цябе палоніць суровая праўда вайны, бачыш жывых людзей, пранікаешся трывогай за іхні лёс, табе перадаецца аўтарскі настрой — стрыманае захапленне непаказной, некрыклівай мужнасцю сапраўдных патрыётаў, непрымірымая пагарда і нянавісць да шкурнікаў і прыстасаванцаў...» *(Янка Брыль).*

ЖУРАЎЛІНЫ КРЫК

(Скарочана)

1

Гэта быў звычайны чыгуначны пераезд, якіх нямала параскідана на сталёвых шляхах зямлі...

...Захінуўшыся ад ветру каўнярамі зашмальцаваных, аблепленых глінай шынялёў, шасцёра салдат стаялі купкай ля зламанага шлагбаума. Тулячыся адзін да аднаго, яны маркотна пазіралі ў восеньскую далеч і слухалі камбата, які ставіў ім баявую задачу.

— Дарогу трэба перакрыць на суткі, — сіпатым, прастуджаным голасам казаў капітан, высокі кастлявы чалавек з зашчаціненым, зморaным тварам. Вецер злосна лескатаў рогам плашч-палаткі па яго запэцканых ботах, матляў на грудзях доўгія матузы завязак. — Заўтра, як сцямнее, адыдзеце за лес. А дзень трымацца...

Там, у полі, куды яны невясёла ўглядаліся, высіўся касагор з дарогай, ля якой траслі пажоўклым лісцем дзве вялізныя каржакаватыя бярозы, і за ім, дзесьці на краявідзе, заходзіла нябачнае сонца. Вузенькая шчылінка святла, прарэзаўшыся ў хмарах, як лязо вялізнае брытвы, матава блішчала на небе. Сумны восеньскі адвячорак поўніўся шэрасцю фарбаў, надакучлівай сцюдзёнай золлю і ўсёабдымнай трывогай навіслай над краем бяды.

— А як жа з шанцавым інструментам? — грубаватым басам запытаў старшына Карпенка, камандзір гэтай невялічкай групы. — Рыдлёўкі ж патрэбны.

— Рыдлёўкі? — задуменна перапытаў камбат, узіраючыся ў бліскучую палоску захаду. — Пашукайце што самі. Няма рыдлёвак. І людзей няма, не прасі, Карпенка, сам ведаеш...

— Ага, і людзей не шкодзіла б, — падхапіў старшына. — А то што пяцёра? І то вунь адзін — навенькі ды гэты «вучоны» — ваякі мне! — злосна бурчаў ён, стоячы бокам да камандзіра.

— Супрацьтанкавыя гранаты, патроны к пэтээру, колькі можна было, вам далі, а людзей няма, — стаяў на сваім камбат. Ён яшчэ паўглядаўся ўдалячынь, зачараваны бляскам захаду, а пасля, устрапянуўшыся ад задумы, павярнуўся к Карпенку — мужнаму, прысадзістаму, шыракатвараму, з рашучымі вачыма і цяжкімі скіўіцамі. — Ну, браткі, жадаю ўдачы.

Ён падаў руку, агорнуты новым клопатам, старшына раўнадушна паціснуў яе. Гэтак жа стрымана паціснуў халодную камбатаву далонь і «вучоны» — у акулярах, высокі, сутулы баец Фішар; без крыўды, шчыра зірнуў на камандзіра другі няўдака, на якога скардзіўся старшына, — малады, са свежымі сумнымі вачыма радавы Глечык. «Нічога, чорт не здрадзіць — свіння не з'есць», — бесклапотна пажартаваў пэтээравец Свіст, белабрысы, расшпілены на ўсе кручкі і гузікі, жулікаваты з выгляду хлопец. Спаважна падаў сваю пухлую далонь непаваротлівы, мардаты Пшанічны і пачціва, прыстукнуўшы бруднымі абцасамі, развітаўся чарнявы, прыгожы Аўсееў. Паддаўшы плячом аўтамат, камандзір батальёна нялёгка ўздыхнуў і коўзкім, няспрытным па гразі крокам пайшоў даганяць калону.

Яны засталіся ўшасцёх, агорнутыя самотай ростані, і нейкі час моўчкі пазіралі ўслед капітану, батальёну, кароценькая, зусім не батальённая калона якога, мерна пагойдваючыся ў вячэрняй імгле, хутка аддалялася к лесу.

Старшына быў незадаволены, сярдзіты, унутры яго тужліва варушылася невыразная, шчымлівая трывога за іх лёс і за тую нялёгкую справу, дзеля якой яны засталіся тут. Але ён хутка прыдушыў у сабе нудлівы душэўны гук і прывычна закрычаў на людзей:

— Ну, што стаіце? Гэць да працы! Глечык, пашукай, мо дзе ламачына якая. У каго ёсць малыя, давай капаць. Пакуль відно...

Спрытным рыўком ён ускінуў на плячо цяжкі кулямёт і, з хрустам ломячы ссохлы быльнёг, пайшоў над канавай. Байцы адзін за другім неахвотна падаліся за сваім камандзірам.

— Ну вось, адсюль і пачнём, — сказаў Карпенка, укленчыўшы ля канавы і зазіраючы па-над чыгункай на касагор. — Давай, Пшанічны, фланговым будзеш. Лапатка ў цябе ёсць — пачынай.

Камлюкаваты Пшанічны развалістай хадою ступіў наперад, зняў з-за спіны вінтоўку, адклаў яе ў быльнёг і пачаў вымаць засунутую за пояс лапатку. Адмераўшы ад яго якіх дзесяць крокаў уздоўж канавы, Карпенка зноў прысеў, паглядзеў сюды-туды і азірнуўся, шукаючы вачыма, каго прызначыць на новае месца. З яго грубаватага твару не сыходзілі заклапочанасць і злосная незадаволенасць тымі несамавітымі сіламі, якія яму далі.

— Ну, каму тут? Вам, Фішар? Хаця ж у вас лапаткі няма. Во мне яшчэ ваякі! — злосна бурчаў старшына, устаючы з калена. — Колькі дзён на фронце, а лапаткі яшчэ не прыдбаў. Што, мо чакаеце, калі старшына дасць? Ці мо немец у падарунак прышле?

Фішар не апраўдваўся і не пярэчыў, але, бянтэжачыся ад непрывычнай вымовы, толькі няўклюдна горбіўся і без патрэбы папраўляў акуляры ў чорнай металёвай аправе.

— Урэшце, чым хочаце, а капайце, — злосна кінуў Карпенка, пазіраючы некуды ўніз і ўбок. — Мая справа маленькая, але каб пазіцыю абсталяваў як мае быць.

Ён рушыў далей — моцны, эканомны ў рухах, з такім выглядам, быццам быў не камандзірам узвода, а па меншай меры камандзірам палка. За ім пакорліва і абыякава падаліся Свіст і Аўсееў. Азірнуўшыся на заклапочанага Фішара, Свіст саўгануў на брыво пілотку і, выскаляючы белыя зубы, бяскрыўдна пакпіў:

— От задачка прафесару, ярына зялёная! Дасца ў знакі...

2

На змярканні з-за лесу напаўзлі шызыя змрочныя хмары. Сваім шчыльным цяжарам яны зусім загрувасцілі неба, затулілі блішчастую шчыліну над касагорам; стала пагрозліва, трывожна і сцюдзёна. Вецер з шалёнай восеньскай лютасцю абтрасаў бярозы над шляхам, церабіў, вымятаў лісцвяны маладняк прысадаў, гнаў цераз чыгунку ў шэрую далеч шапатлівыя статкі лісця. Каламутная вада ў

лужыне ад напору ветру аж выплёсквалася з дарогі і пырскала на ўзмежак сцюдзёнымі бруднымі кроплямі.

Байцы на пераездзе рупна ўляглі ў работу — капалі, дзяўблі, угрызаліся ў сцвярдзелую залеж зямлі. Пшанічны ледзь не па самыя плечы закапаўся ў рудую кучу гліны; далёка навокал адкідваючы рассыпастыя камякі, зухавата і весела асталёўваўся разгарачаны Свіст. Ён зняў з сябе ўсе папругі і вопратку і, застаўшыся ў гімнасцёрцы, спрытна сыпаў з яміны малой пехацінскай лапаткай. У дваццаці кроках ад яго, таксама над лініяй, час ад часу спыняючыся, адпачываючы і аглядваючыся на сяброў, крыху з меншым стараннем акопваўся Аўсееў. Ля самай будкі спрактыкавана ладзіў кулямётную пазіцыю старшына Карпенка; на другі бок ад яго старанна дзёўб зямлю расчырванелы, потны Глечык. Нарыхліўшы жалезінай грунт, хлопец рукамі выкідваў яго, пасля прыгаршчамі выгортваў пясок і зноў дзёўб. Адзін толькі Фішар без справы самотна сядзеў у быльнягу, дзе яго пакінуў старшына, і, тулячы ў рукавы азяблыя рукі, гартаў нейкую кніжку.

За гэтым заняткам і ўбачыў яго Карпенка, калі, прыпыніўшы працу, выйшаў з-за старажоўкі. Старшына быў змораны, заклапочаны і адразу ж перасмыкнуў тварам, убачыўшы бяздзейнасць свайго падначаленага. Вылаяўшыся, ён накінуў на спацелую спіну скарэлы ад гразі шынель і накіраваўся па-над канавай да няўдакі-байца.

— Ну, што? Доўга вы будзеце сядзець? Можа, думаеце, што калі няма лапаткі, дык я вас у батальён адпраўлю, у бяспечнае месца?

З выгляду абыякавы да ўсяго, Фішар разгублена заміргаў пад акулярамі блізарукімі вачыма, няспрытна ўзняўся з долу і, заікаючыся ад хвалявання, хутка-хутка загаварыў:

— М-м-можаце не т-т-турбавацца, таварыш камандзір, гэта выключаецца. Я н-н-не менш за вас разз-з-зумею свае абавязкі і зраблю тое, шт-т-то трэба без лішніх эксцэсаў[1]. Вось...

Крыху здзіўлены і астуджаны нечаканым выпадам гэтага ціхага чалавека, старшына не знайшоў што сказаць далей, толькі перадражніў:

— Іш ты: эсцэксаў!

[1] *Эксцэ́с* — вострае сутыкненне, парушэнне грамадскага парадку.

Яны стаялі так адзін супраць аднаго: усхваляваны, з дрыжачымі рукамі, вузкаплечы баец і ўжо супакоены, упэўнены ў сабе, каржакаваты, уладарны камандзір. Карпенка, нахмурыўшы калючыя бровы, з хвіліну гадаў, што зрабіць з гэтым няўмекам, а пасля, успомніўшы, што трэба на ноч выставіць які-ніякі дазор, ужо спакайней сказаў:

— Вось што: бярыце вінтоўку і марш за мной. Фішар не запытаў, куды і навошта, а з падкрэсленай абыякавасцю запіхнуў за пазуху кніжку, уздзеў на плячо вінтоўку з прымкнёным штыхом і, спатыкаючыся, пакорліва пабрыў за старшыной. Карпенка на хаду апранаў у рукавы шынель, аглядаў, як акопваліся астатнія. Мінаючы сваю ячэйку, ён коратка кінуў байцу:

— Вазьмі ж лапатку.

Яны выйшлі на пераезд і па заследжанай сотняю ног гразкай дарозе накіраваліся на пагорак з дзвюма бярозамі.

Тым часам паволі цямнела. Неба над лесам зусім счарнела ад хмар, якія шчыльна абклалі прастор і згусціліся на небасхіле змрочнай суцэльнай масай. Вецер усё не сціхаў і злосна шкуматаў полы шынялёў, сівернай сцюжай пранікаў за каўнер, у рукавы, выпякаў з вачэй сцюдзёныя слёзы.

Карпенка крочыў хутка, не вельмі разбіраючы дарогі і не дужа шануючы свае кірзавыя новыя боты — адзіную адзнаку яго камандзірскай годнасці. Затуляючыся ад ветру каўняром шыняля, у нацягненай на вушы пілотцы, за ім шкандыбаў Фішар. Баец зноў набыў свой звычайны, абыякавы да ўсяго выгляд і, скіраваўшы позірк у загусцелую гразь дарогі, асцерагаўся паварушыць забінтаванай, балючай ад скулаў шыяй. У канавах шапацела на ветры лісце, наўкола тапырылася ржышча асірочанага восенню поля.

З сярэдзіны касагора Карпенка азірнуўся, каб агледзець зводдаль пазіцыю свайго ўзвода, і ўбачыў, што яго падначалены адстаў далёка і ледзьве плёўся, зноў чытаючы на хаду сваю кніжку. Міжвольна падзівіўшыся з гэткай кніжнай цікаўнасці, Карпенка спыніўся і чакаў, пакуль той дагнаў яго.

...Яны яшчэ прайшлі далей, Фішар ужо трымаўся побач, і Карпенка скоса разы два зірнуў на яго. Худы, з запалымі грудзьмі, у кароткім, падпяразаным пад хлясцік шынялі, з

забінтаванай шыяй і зашчаціненым тварам, баец меў вельмі ніякаваты выгляд. Адны толькі чорныя вочы пад тоўстымі шкельцамі акуляраў цяпер неяк ажылі і свяціліся адбіткам далёкай стрыманай думкі. Старшына падзівіўся тайком з таго, што вось за гэткім несамавітым выглядам хаваецца адукаваны і, здаецца, неблагі чалавек. Праўда, Карпенка быў упэўнены, што ў ваеннай справе Фішар не многа варты, але ў глыбіні старшыновай душы нешта ўжо расслабла і падабрэла да гэтага байца.

Праз сотню крокаў ад дарогі Карпенка спыніўся на ржышчы, паглядзеў у бок вёскі, азірнуўся назад. Пераезд у нізіне ўжо ледзьве шарэў у вячэрнім паўзмроку, але адгэтуль яшчэ быў відзён, і старшына падумаў, што месца для сакрэта тут будзе здатнае. Ён прытупнуў абцасам аб мяккую зямлю і, пераходзячы на звычайны свой камандзірскі тон, загадаў:

— Вось тут. Капай. Ноччу спаць ні-ні. Глядзі і слухай. Пойдуць — страляй і адыходзь на пераезд.

Фішар зняў з-за пляча вінтоўку і, аберуч узяўшыся за кароткі тронак старшыновай лапаткі, неяк няўмела калупнуў іржышча.

— Эх ты! Ну хто так капае! — не стрываў старшына. — Дай сюды.

Ён выхапіў у байца лапатку і, лёгка ўразаючыся ёю ў рыхлую зямлю нівы, спрытна растрасіраваў адзіночную ячэйку.

— Вось на... Так і капай. Ты што — кадравай не служыў?

— Не, — прызнаўся Фішар і першы раз шчыра ўсміхнуўся. — Не давялося.

— Яно і відаць. А цяпер вось гора з вамі, гэтымі...

Ён хацеў сказаць «вучонымі», але змоўчаў, не жадаючы ўкладваць у гэтае слова свой былы з’едлівы сэнс. Пакуль Фішар не дужа ўмела калупаўся ў зямлі, Карпенка прысеў у ржышчы і, тулячыся ад ветру, пачаў скручваць цыгарку...

Захінаючы ад ветру трафейную запальніцу, старшына згорбіўся, каб прыкурыць, але раптам яго твар уздрыгнуў і трывожна насцярожыўся. Высунуўшы з каўняра жылістую шыю, Карпенка азірнуўся на пераезд, Фішар таксама ўчуў нешта і як быў, укленчыўшы на ржышчы, так і здранцвеў у напружанай позе. На ўсходзе за лесам, што быў за іх

пераездам, прыглушаная ветрам, зладна раскацілася ўдалечыні хуткастрэльная кулямётная чарга. Неўзабаве на яе адгукнулася другая, радзейшая, відаць, з нашага «максіма», а затым слабым далёкім водсветам, парушыўшы вячэрні змрок, загарэлася і пагасла мігатлівая чарада ракет.

— Абышлі! — з сярдзітай прыкрасцю сказаў старшына і вылаяўся.

Ён ускочыў, паўзіраўся ў далёкі сцямнелы краявід і зноў са злосцю, роспаччу і трывогай пацвердзіў:

— Абышлі, гады! Халера на іх галаву!

І занепакоены, каб там, на пераездзе, чаго не здарылася без яго, Карпенка шпарка пайшоў па нізе ў напрамку да недалёкай дарогі.

3

На пераездзе першы ўчуў нядобрае баец Пшанічны. Да змяркання ён ужо выкапаў глыбокі, у свой рост, акопчык, прыладзіў на дне прыступак, каб можна было страляць і выглядаць, а таксама яміну ўбок, каб пры патрэбе спрытней выбрацца наверх.

Тут было зацішна і даволі ўтульна. Кінуты на спод ахапак быльнягу засцерагаў ад зябкай сырасці, Пшанічны захінуў ім свае ногі ў стаптаных брудных чаравіках, выцер аб палу шыняля запэцканыя рукі і развязаў рэчавы мяшок. Там баец трымаў на галодны час акраец здабытага ў нейкай вёсцы сялянскага хлеба і добры кавалак сала. Ён даўно ўжо прагаладаўся і хацеў есці, але на людзях усё не наважваўся рабіць гэта, бо тады трэба было б падзяліцца, а дзяліцца Пшанічны не хацеў.

Са смакам жуючы не вельмі спраўнымі, пашчэрбленымі ўжо хваробай і часам зубамі, Пшанічны думаў, што трэба было б яшчэ назбіраць быльнягу, каб закапацца ў яго і «прыкімарыць», як кажа Свіст, якую гадзіну ўначы. Праўда, узводны трапіў дужа прыдзірлівы і вельмі службісты, гэты прыдумае яшчэ якую работу да ранку, але Пшанічны не такі прастак, як той Глечык ці падслепаваты Фішар, каб са шчырасцю рабіць усё, што ад яго дамагаюцца. Ва ўсякіх абставінах ён зробіць не болей як для адводу вачэй і як-небудзь сябе не пакрыўдзіць.

Гэтыя павольныя і разважныя ў цішы думкі чалавека раптам прыпыніліся ад далёкіх пакацістых стрэлаў. Пшанічны ад нечаканасці прыціх з напханым ядою ротам, услухаўся, потым, хуценька згарнуўшы ў кішэню хлеб і сала, узняўся ў акопе. Над лесам выслізнула ў неба рассыпістая гронка ракет, асвяціла на момант чорныя зубцы лясных верхавін і знікла.

— Гэй! — закрычаў баец да сваіх таварышаў. — Чуеце? Акружаюць!

Вакол ужо стала зусім цёмна. Беленымі сценамі трошкі шарэла старажоўка, вырысоўваўся яшчэ ў небе зламаны дышаль шлагбаума, чутна было, як капаўся побач у яміне рупны Глечык і ля чыгункі дзяўблі зямлю Свіст з Аўсеевым.

— Аглухлі, ці што, — не чуеце? Немцы ў тыле! Глечык учуў, выпрастаўся ў сваёй неглыбокай яшчэ яміне, выскачыў з акопа Аўсееў і, прыслухаўшыся, цераз бульбянішча накіраваўся да Пшанічнага. Недзе ў цемры мудрагеліста вылаяўся Свіст.

— Ну што? — казаў з акопа Пшанічны. — Дакапаліся! Каб не я, дык і праваронілі б. Чакалі падмогі з тылу, а там ужо немец.

Аўсееў неяк паныла маўчаў, стоячы побач і ўслухоўваючыся ў адзнакі далёкага бою. Неўзабаве ля яго з цемры з'явіўся Свіст, падышоў і спыніўся ззаду насцярожаны Глечык.

А там, удалечыні за лесам, зачыналася грымотная начная бойка. Да першых кулямётаў далучыліся іншыя, чэргі іх, напаўзаючы адна на другую, зліліся ў далёкае, прыглушанае ветрам грымоцце, бязладна і нетаропка загрукалі вінтовачныя стрэлы. У чорнае паднябессе яшчэ ўзляцела ракета, потым — другая і дзве разам. Дагараючы, яны знікалі за змрочнымі вярша́лінамі дрэў, а на нізкім захмараным небе яшчэ нейкі час мігалі няяркія палахлівыя водсветы.

— Ну? — не сціхаў усё Пшанічны, звяртаючыся да насцярожаных прымоўклых людзей. — Што?

— Што ты нукаеш? Ну, што нукаеш, мурло? — злосна азваўся Свіст. — Дзе старшына?

— Фішара ў сакрэт павёў, — сказаў Аўсееў.

— А тое нукаю, што трэба нешта рабіць. Акружылі ж, вось і ну, — не збавіўшы тону, гарачыўся Пшанічны.

Яму ніхто не адказаў, усе стаялі і слухалі, апанаваныя наплывам благіх прадчуванняў. А там, у далёкай цемры ночы, усё разлягаліся чэргі, бухалі гранаты, ветрам разносілася ўдалячынь нягучнае здалёк рэха. Людзі змаркатнелі, самі сабой апусціліся долу іх натруджаныя рукі, ліхаманкавая трывога ўрывалася ў думкі.

У гэтай панылай маўклівасці і застаў іх старшына, які, цяжка дыхаючы ад доўгага бегу, з'явіўся ля старажоўкі. Ён, вядома, разумеў, што сагнала людзей да гэтай крайняй ячэйкі, ведаў, што ў такіх выпадках самае лепшае без лішняй разважнасці пусціць у ход сваю ўладарнасць і цвёрдасць. І яшчэ здалёк, не тлумачачы нічога і не супакойваючы, старшына са знарочыстай злосцю закрычаў:

— Ну, што пасталі, як тыя слупы на ўзбочыне? Чаго спалохаліся? Га? Падумаеш: страляюць! Вы што — не чулі стрэлаў? Ну што, Глечык?

Глечык сумеўся ад таго грубаватага звароту, варухнуў у цемры плячыма.

— Ды вось акружаюць, таварыш старшына.

— Хто сказаў: акружаюць, — зазлаваў Карпенка. — Хто?

— Што акружаюць — факт, не булка з макам, — буркліва зазначыў Пшанічны.

— А ты маўчы, таварыш баец! Падумаеш — акружаюць! Колькі ўжо акружалі? У Тодараўцы — раз, у Баровічах — два, пад Смаленскам тыдзень выбіраліся — тры. І што?

— Дык то ж усім палком, а тут што? Шасцёра, — азваўся з цемры Аўсееў.

— «Шасцёра»! — перадражніў Карпенка. — А гэтыя шасцёра, што, дзеўкі? Ці байцы Чырвонай Арміі? Нас вунь у фінскую на востраве трое засталося, два дні адбіваліся, ад кулямётаў снег да моху растаў, і нічога — жывы. А то — шасцёра!

— Дык то ў фінскую...

— А то ў нямецкую. Усё роўна, — ужо крыху спакайней сказаў Карпенка і змоўк, аддзіраючы ад газеціны на цыгарку.

Пакуль ён ладзіў папяросу, усе маўчалі, пабойваючыся выказваць невясёлыя здагадкі і пільна ўслухоўваючыся ў

гукі бою. А там, здаецца, пакрысе рабілася цішэй, ракеты болей не ўзляталі, страляніна прыкметна радзела.

— Вось што, — сказаў старшына, слінячы цыгарку, — няма чаго мітынгаваць. Давай капаць кругавую. Ячэйкі злучым траншэяй.

— Слухай, камандзір, а можа, лепей адыдзем, пакуль не позна? Га? — памяркоўна спытаў Аўсееў, зашпільваючы шынель і бразгаючы спражкай папругі.

Старшына грэбліва гмыкнуў, даючы знаць, што яго здзіўляе такая незразумелая прапанова, і з прыкрасцю запытаў:

— Загад ты чуў? Закрыць дарогу на суткі. Ну і выконвай, няма чаго балбатнёй займацца.

Усе нявесела маўчалі.

— Ну, даволі. Давай капаць, — больш бадзёра і ласкава сказаў камандзір. — Акапаемся, і заўтра як у мамкі за пазухай будзем.

— Як у Мурла ў торбе, — жартоўна зазначыў Віцька Свіст. — І суха, і цёпла, і гаспадар шануе. Ха-ха! Пайшлі, паніч, давай брацца за справу, ярына зялёная, — тузануў ён за рукаў Аўсеева, і той нехаця падаўся за суседам у змрок ночы.

Глечык таксама пайшоў на сваё месца, а старшына моўчкі пастаяў, зацягнуўся разы два махорачным дымам і прыцішана-строга сказаў Пшанічнаму:

— А ты ў мяне наклічаш бяды. Я з цябе скуру спушчу за твае штучкі. Папомніш...

— Якія штучкі?

— Такія, — пачулася з цемры. — Сам ведаеш.

4

Злосны на старшыну за такую пагрозу і ўзрушаны небяспекай, Пшанічны нерухома пастаяў з хвіліну, разбіраючыся ў пачуццях, а потым, амаль раптам прыняўшы нейкае рашэнне, нягучна кінуў у цемру:

— Хопіць!

Так, хопіць. Хопіць мясіць гразь па гэтых разбітых дарогах, хопіць гібець на сцюжах, галадаць, хопіць пакутаваць ад страху, капаць-перакопваць зямлю, глухнуць у баях, дзе толькі кроў, раны і смерць. Даўно ўжо Пшанічны прыглядаўся, чакаў зручнага выпадку, вагаўся і баяўся, але

цяпер, трапіўшы ў тую мышалоўку, канчаткова рашыўся. Свая рубашка бліжэй да цела, а жыццё для яго даражэй за ўсё, і захаваць яго можна, толькі кінуўшы зброю і здаўшыся немцам. Авось не заб'юць, дарма што столькі баюць пра іх — Пшанічны не дзіця і ведае, што і немцы — людзі.

Вецер усё гудзеў у вушах, астуджаў твар, і, каб затуліцца ад яго і аддацца думкам, Пшанічны зноў схаваўся ў акопе...

У зацішку акопа чутна, як непадалёку дзяўбе зямлю Глечык, зрэдку парыпваюць на ветры дзверы старажоўкі, шуміць і высвіствае сваю восеньскую песню ссохлы быльнёг у канаве. Пшанічны даеў вынятыя з кішэні рэшткі сала і, сашчапіўшы рукі, сцішыўся — аддаўся журбоце думак.

Няладна і гаротна склалася яго недарэчнае жыццё.

...Бацьку раскулачылі — забралі ў сельсавет увесь іхні набытак, апісалі будынкі, а самога з маткай саслалі. Іван тую зіму жыў у мястэчку ў дзядзькі і вучыўся ў сямігодцы. Дзядзька быў неблагі чалавек, майстравіты на ўсе рукі, з пляменнікам ён абыходзіўся нараўне са сваімі трыма дочкамі і нічым не дакараў яго. Але па няўлоўных прыкметах і дробязях юнак згадваў, што ён усё ж тут лішні, што ён чужы, і ад таго Івану не было радасці. Вучыўся ён няблага, разумеў і любіў матэматыку і пасля сямігодкі падаў дакументы ў настаўніцкі тэхнікум. Ён чакаў экзаменаў, чакаў і марыў, бачыў у сваім студэнцтве адзін шчаслівы выхад з таго ліха, у якое яго загнала жыццё. Але на экзамены яго не выклікалі, дакументы неўзабаве вярнулі, і ў казённай паперы холадна тлумачылася, што прыняць яго ў тэхнікум нельга, бо ён — сын кулака.

Гэта было вялікім горам для маладога Пшанічнага, больш за тое раскулачванне, якога яму не давялося бачыць, першай, сапраўды незагойнай крыўдай душы. Іван падумаў, што ён не такі, як усе, што бацькаў цень, як праклён, цяпер будзе засціць жыццёвы шлях сына. Але перайначыць што, здавалася яму, ужо было позна.

Пасля няўдалай спробы вучыцца далей Пшанічны — ужо рослы, прывычны да працы дзяцюк — з год прызвычайваўся каля дзядзькі да мулярскае справы, а затым пайшоў у горад шукаць свайго хлеба і свайго шчасця.

У Бранску ён паступіў у мулярскую арцель, трапіў у брыгаду такіх, як сам, маладых хлопцаў, мураваў фабрычныя гмахі, па вузкіх дашчаных сцежках ганяў тачкі з рошчынай, па страмянках цягаў на паверхі цэглу. Сябе ён не шкадаваў, працаваў з запалам, з бацькавай цягавітасцю, і гэта неўзабаве заўважылі сябры і начальства. Яго хвалілі на сходах, ставілі ў прыклад іншым, і хлопец пакрысе пачаў забывацца на сваю ўшчэрбнасць і няшчаснасць. Пра бацькоў ён не гаварыў нічога, пісьмаў ад іх не атрымліваў і не ведаў, дзе яны і што. Часам, калі ўночы снілася што-небудзь з дзяцінства, тады агартала жаласлівасць да ціхай, забітай маткі, бацьку ён не спагадаў, ведаў: ён і там гэткі ж сквапны, злы і зацяты.

У той час на будоўлі стварылі камсамольскую ячэйку, многія хлопцы паўступалі ў камсамол і, вядома, пацягнулі туды і лепшага муляра Пшанічнага. Ён падумаў, крыху разважыў, а пасля, заахвочаны давер'ем і павесялелы ўжо ад былое нягоды, паверыў, што і ён можа стаць чалавекам, і напісаў заяву. На сходзе запатрабавалі расказаць усё пра сябе, бацькоў і радню, і калі пачулі, што ён сын кулака-хутаранца, у прыёме Пшанічнаму адмовілі.

Ён цяжка перажываў, дзён колькі не хадзіў на працу, пластом ляжаў у інтэрнаце. Здарылася так, што не знайшлося нікога, хто быў бы да яго бліжэй за ўсіх, суцешыў у тую хвіліну, абнадзеіў. Да яго раптам перамяніліся ўсе дружбакі, пачалі чужацца хлопца, трымацца асобна сваёй камсамольскай кампаніяй. Гэта была незабыўная да смерці крыўда. Іван Пшанічны ўжо канчаткова ўверыўся ў сваю адвержанасць, і яго ўпартае сэрца прагнула нейкай помсты.

Ён паехаў з Бранска, жыў колькі часу ў Данбасе, працаваў на шахтах і ўсюды памятаў, што ён не раўня іншым, што ён — класавы вораг, што між ім і людзьмі пралегла глыбокая праваліна ў жыцці. Часам ён імкнуўся забыцца на гэта ў працы, часам у гарэлцы, але яна не забывалася, неміналася ніяк і нідзе. Аб гэтым яму напаміналі ў ваенкамаце, калі прызывалі ў войска. «Ты — сын кулака і будзеш служыць у рабочым батальёне», — сказаў заклапочаны мітуслівы капітан. І Пшанічны стаў чырвонаармейцам працоўнага батальёна — трохі вучыўся вайсковай справе, а

больш працаваў: будаваў чыгункі, масты, тунэлі. Гэта было ў Сібіры, узімку ён налаўчыўся ездзіць на лыжах, у спаборніцтвах аднойчы заняў першынство. І калі неяк сталі арганізоўваць агітацыйны прабег на 200 кіламетраў, то ў ліку лепшых лыжнікаў запісалі і Пшанічнага. Ён быў рады вылучыцца хоць гэтай сваёй якасцю, але і тут чорным катом з'явілася на яго дарозе мінулае. Ужо са старту яго вярнуў камісар, сказаў, што яму ехаць нельга, бо ў яго, чырвонаармейца Пшанічнага, не ўсё ў парадку з біяграфіяй.

Пасля яшчэ было многа дробных і вялікіх крыўд, якія параджаліся яго бацькоўскім мінулым, і Пшанічны скарыўся, саступіў убок, не лез болей туды, дзе былі не такія, як ён, людзі. Толькі — сам сабе, сам для сябе, наперакор усім — такі воўчы дэвіз засвоіў пакрысе Іван Пшанічны. Ён не грэбаваў нічым, — калі тое трэба было — хлусіў, краў, ашукваў, да слабейшых у яго заўжды накіпала нянавісць, дужэйшых ён пабойваўся і ненавідзеў. Ён разумеў, што рабіўся нягодны, нялюдскі, злы і нядобры, як бацька, але перайначыць сябе ўжо не мог і каціўся ўсё болей туды, куды гналі чалавека ягоная крыўда і злосць.

Калі пачалася вайна і нямецкія войскі хлынулі на рускія землі, сярод вялізнага мора бяды і слёз быў адзін чалавек, які таемна радаваўся. Гэтым чалавекам быў баец запаснога батальёна Іван Пшанічны, які затым стаў франтавіком і сёння вось займеў канчатковы намер здацца ў палон...

6

Ужо, відаць, пад поўнач выгнутая дугой траншэя сяктак злучыла пяць стралковых ячэек. Не ўсюды яна была патрэбнай глыбіні — на дзялянцы Пшанічнага, якому разам з Глечыкам выпаў яшчэ і Фішараў участак, яна даходзіла не болей чым да калена. А пра зграбнасць ужо не было чаго і казаць — выйшла яна крывая і нягладкая — вядома, начная работа, ды на гэта цяпер не дужа зважалі ні байцы, ні іх камандзір.

Яны ўсе дужа намоклі, і апоўначы Свіст, першы скончыўшы сваю працу, зайшоў у старажоўку, затуліў нейкім рыззём абодва акенцы і ўзяўся распальваць у грубцы. Старшыне, які прыйшоў туды следам, гэтае самаўпраўства не

вельмі падабалася, але ён усё ж не пярэчыў ні Свісту, ні Аўсееву, калі той неўзабаве далучыўся да гэтага занятку. Карпенка разумеў, што як-ніяк, а людзям трэба адпачыць да ранку, бо заўтра чакае іх нямала іншага клопату і іншай, куды больш цяжкай справы.

Так спакваля ў гэтую пакінутую людзьмі будыніну сышліся яны ўсе пяцёра. У расчыненай грубцы весела гарэлі хвойныя сухія шчэпкі, і дбайны Свіст усё нешта трушчыў на падлозе сваёй незаменнай пехацінскай лапаткай.

Утульнасці тут было небагата: дзьмула з вокан, дым не хацеў ісці ў комін і, расплываючыся пад нізкай столлю, выядаў людзям вочы, але ўсё гэта здалося ім раем пасля той непагадзі, ад якой яны схаваліся сюды. Галоўнае — тут было суха, макрата і холад засталіся з таго боку дзвярэй і напаміналі аб сабе толькі невыразным шорхатам ветру і лёскатам кропель па даху.

Карпенка прылёг на тапчане, выцягнуў аблепленыя гразёй ногі. Цела адразу адолела салодкая знямога, так і карцела заплюшчыць вочы і сцішыцца, задрамаць колькі хвілін. Каля печкі, бы зачараваныя, уставіліся на мігатлівы агонь Аўсееў і Свіст, у прыцемках ля парога, крэкчучы і сапучы, пераабуваўся Пшанічны. Ззаду за ўсімі прыткнулася цьмяная постаць Глечыка.

— Эх, ярына зялёная, думаю калі і дзіўлюся, як гэта бязладна чалавек зроблен, — разважна казаў Віцька Свіст, калупаючы шчэпкай у прыску. — Калі ёсць многа, дык хочацца яшчэ больш. А калі няма нічога, дык якая драбніца — мара. Надоечы пад Шчарбакамі, калі нас пласталі танкі, я толькі і марыў: каб сцямнела хутчэй. Здавалася, усё аддаў бы за адну хвіліну цемры. А цяпер вось і немца няма, і танкаў не чуваць, дык хочацца яшчэ і цяпла і сухога месца. Дзіўна...

— Адкрыў Амерыку, — буркнуў Аўсееў. — Яшчэ Шэкспір пісаў: «Каня, каня! Паўцарства за каня!» Разумееш? За каня. Прыпячэ, дык мусіш.

Ён ашчаперыў калені белымі пальцамі і сядзеў так, пазіраючы ў грубку, — змораны, раздражнёны і невясёлы.

— А што гэта немец сёння: згубіўся ці заблудзіў? Не чуваць нешта, — накручваючы абмотку, асцярожна зазначыў Пшанічны.

Свіст злосна зірнуў на яго:

— Гэ, чакай, заблудзіць ён табе. Прыйдзе ранак — пачуеш.

Ён яшчэ папароў трэскай у печы і раптам ускрыкнуў:

— Хлопцы! Ідэя! Давайце вячэру згатуем. А то, брат, кішка з кішкай сварыцца. Пшанічны, даставай свой кацялок!

— А што зварым?

— Ну, браце, — што ў каго ёсць. У мяне — паўпачкі пшонкі.

— У мяне гарохавага канцэнтрату трохі было, — азваўся Глечык.

— Цудоўна. Давай кашаварыць на згубу фашызму, — разахвоціўся Свіст. Яго белабрысы, танкагубы твар поўніўся захапленнем ад новае справы. — Мурло, нясі вады, ды чыстай набяры, як з-пад крана.

— Дзе яе набярэш цяпер чыстай? Усюды гразь.

— Эх, дзівак, ярына зялёная. Пад дах падстаў. Забыўся, як баба начоўкі налівала, а ты салдацкага кацялка не набярэш?

Пшанічнаму не хацелася зварушвацца з месца, але не было ахвоты і заводзіцца з гэтым Свістам, і ён нязграбна ўзняўся з падлогі, завязаў сваю тарбіну і выйшаў. Як толькі за ім зачыніліся дзверы, Віцька ўраз падхапіў гэты напакаваны мяшэчак і спрытна запусціў туды руку.

— Так, папружку камандзірскую на канец вайны Мурло прыпасае, нейкая банка, новая кашуля, сухія анучкі — на, салага, на падмену трымай, — ён тыцнуў Глечыку пару ануч і зноў расхінуў торбу. — Ага, вось ён, акрайчык, так, так... цукру драбок... о, братва, сала! Ура Пшанічнаму, от малайчына, не ўсё з’еў. Каша будзе з салам.

Ён хуценька завязаў лямкі гэтай тарбіны і шпурнуў яе ў кут.

— Слухай, Свіст, нядобра робіш, — сказаў з тапчана Карпенка. — Трэба спытацца.

— Ого, спытацца! Скулу ты з яго возьмеш: скнара.

Неўзабаве прыйшоў з вадой Пшанічны, падаў кацялок Свісту і ціха сеў на сваё месца ў куце.

Свіст, міргнуўшы белымі вейкамі, хітравата паглядзеў на яго:

— Братачка Пшанічны, ці няма ў цябе якога куса да агульнай кучы?

Пшанічны моўчкі пакруціў галавой. Свіст зноў падміргнуў сябрам:

— Ну, што ж... Абыдземся грэчка-аўсянай сумессю.

Хутка кацялок з вадой, уціснены ў грубку, зашыпеў на вуголлях, а Свіст на разасланай пале шыняля пачаў церці ўсохлыя кавалкі канцэнтрату. Аўсееў паныла глядзеў у агонь, спаважна туліўся за спіной Свіста Глечык, і ў куце невыразна варушылася шырокае аблічча Пшанічнага. Старшына, падпёршы голаў рукою, ляжаў на баку, пазіраў на свой малалікі ўзвод і думаў. Хто ведае, як ім пашанцуе заўтра справіцца з той задачай, дзеля якой іх пакінулі тут? Ці хопіць у іх сілы і ўмельства, ці ўсе адолеюць страх, каму суджана будзе датрываць да канца? Камандзір усё не мог пагадзіцца, што людзей яму далі без выбару, першых, што трапіліся камбату, а гэта, на яго думку, было няправільна. Старшыне не падабалася сённяшняя надзьмутасць Аўсеева, не шмат чаго здатнага чакаў ён ад Глечыка, ведаў, што заўтра трэба будзе яго, камандзірскі, нагляд за ўсім і за ўсімі. Яму даспадобы быў Свіст, ён нядрэнна паводзіў сябе за гэтыя тыдні адступлення, але хто яго ведае?.. Чалавек сядзеў у турме, і хоць з выгляду вясёлы і адданы, але невядома, што ён носіць у сабе.

Яшчэ думалася пра Фішара. На момант старшыне чамусьці стала шкада таго вучонага, разумнага чалавека, непрызвычаенага да нягод ваеннага жыцця, слабага і кволага. Як яны ад батальёна, так і Фішар ад узвода падстаўлены цяпер пад першы ўдар, ад якога, хто ведае, ці будзе які паратунак. Думалася, каб ён хоць не заснуў там пад ранак, бо тады можа здарыцца ліха, ад якога і ім не ўратавацца. Пра сябе Карпенка дбаў не надта, ён сам для сябе быў зразумелы і просты і без ніякіх сумненняў ці ваганняў ведаў, што калі панадзеяліся на яго камбат і камандзір палка, дык ён спраўдзіць гэтыя надзеі. Можа, заб'юць яго, можа, паранаць, але калі застанецца цэлы, дык ён зробіць усё, што ад яго патрабуецца.

Гудзела, пырскала іскрамі грубка, за сцяной недзе цурчала з даху вада, шумеў у завуголлі вецер, і вельмі хацелася спаць. Але старшына напружаннем волі адганяў дрымоту і ляжаў. Байцы сядзелі на падлозе і пільна глядзелі за кацялком у грубцы.

— Так, так… Уліплі мы на гэтым чортавым пераездзе, — тужліва сказаў Аўсееў, кладучы падбародак на скурчаныя калені. — Гэта ўжо аксіёма.

Яму ніхто не азваўся — ні запярэчыў, ні падтрымаў тых невясёлых думак, толькі Глечык уздыхнуў у цішыні ды Пшанічны гучна высмаркаўся.

— Аўсееў, — глухаватым, але рашучым голасам пасля паўзы сказаў Карпенка, — бяры вінтоўку і — на варту.

Аўсееў крута павярнуўся на падлозе.

— А чаго я? Што я, горшы за ўсіх?

— Без размоў.

— Давай, давай, паніч, — загаварыў Свіст. — Не бойся, кашы не празяваеш. Пакінем, клянуся салёным агурком з хвастом асяледца.

Аўсееў пасядзеў яшчэ, пасля нетаропка зашпіліўся і неахвотна выйшаў, мацней чым трэба прыстукнуўшы дзвярыма.

Каша выдалася надзіва смачная. Свіст неўзаметку паклаў на спод кацялка выцягнутае ў Пшанічнага сала, ад чаго ўсё гэта несалёнае месіва атрымалася вельмі тлустае і наварыстае. Елі ўсе разам, з адной пасудзіны, згодна шкрэбаючы драўлянымі і алюмініевымі лыжкамі, а Свіст — нават трафейным відэльцам на тронку лыжкі. Калі ўжо на сподзе засталося нямнога, Карпенка аблізаў лыжку і сказаў:

— Годзе. Рэшта Аўсееву і Фішару…

— Ну, братка Мурло, як кашка? — хітравата спытаў Свіст.

— А нішто. З галадухі сама ў роце растае, — задаволена сказаў Пшанічны. На яго мардаты, з тлустымі вуснамі твар лягла ленаватая сытасць.

— За гэта дзякуй самому сабе. Добрае ў цябе было сальца.

Пшанічны здзіўлена залыпаў вачыма, здагадаўся і адразу ўхапіўся за торбу.

— Зладзюга ты, Свіст, вось хто, — злосна кінуў ён з цемры, мацаючы свой напакаваны мяшок. — За такія ўчынкі табе трэба морду біць, блатняга.

— Для твайго ж бруха, дзівак, — жартаваў Свіст. — А то кокнулі б цябе заўтра, галоднага, і які-небудзь Ганс пакроіў бы тваё сала тоненькімі скрылікамі на свой бутэрброд. А так вось і жысць павесялела, бы сто грамаў прапусціў.

Пшанічны яшчэ бурчаў нешта ў сваім куце, а разmoраны сытасцю Свіст соладка разлёгся на падлозе, раскінуўшы крываватыя ногі.

— Ну вось і цудоўна, — казаў ён, пагладжваючы свой жывот. — Даўно такой асалоды не меў. Хіба тады, як з лагера выйшаў, от.

— Слухай, Свіст, а завошта ты ў лагер трапіў? — спытаў Карпенка, скручваючы цыгарку. Ён зноў размясціўся на тапчане, таксама падабрэў ад цяпла і ежы і стаў па-хатняму просты, свойскі, прыязны — такі, як і ўсе.

— Ат, доўгая гісторыя. Гісторыя з геаграфіяй. Была справа, ага.

— Можа, нізавошта?

— Не скажу, — адразу пасур'ёзнеўшы і нешта ўспамінаючы, сказаў Свіст. — Было за што. Маглі б і болей прыпаяць, адбрыкаўся двума гадамі. Магу расказаць, калі цікавіць...

7

— Дурны я чалавек... вось. Шалёны, безгаловы... — казаў Свіст. — Наогул абармот. Толькі цяпер зразумеў гэта... Жыў у Саратаве, на Манастырцы. Любата гарадок, скажу вам, першы сорт — Саратаў... так... — Ён памаўчаў, летуценна прыпамінаючы штось і ўсё пазіраючы ў грубку. — Чатыры гады ўжо, як не быў, душа занылася. Так... Дык вось, вучыўся троху. Вучыцца не любіў. Ды і з дысцыплінай не ладзілася...

Падрос крыху, зашыўся ў кампанію — дружкі-мілушкі, ярына зялёная. А ўсё ж ладны быў час. Раздолле, асабліва ўлетку. Маці на працы (на падшыпнікавым заводзе рабіла), а я — бы ў раі. Па магілках у вайну гуляем — дарэчы, там у нас Чарнышэўскі, пісьменнік, пахаваны, — дзелавіта па-

ведаміў Свіст, паварочваючыся да Карпенкі. — Дык вось на могілках, на Лысай гары, у сасняку, а калі вырвемся і на Волгу. От, браце, шчасце, ярына зялёная, сто чарцей і бочка рому.

Пасля пайшоў працаваць. — Віцька ўздыхнуў, запхнуў у грубку канец нейкай дошкі, заклапочана пашураваў там шчэпкай. — Спачатку Рыгор Сымонавіч, сусед наш, мяне да такарнай справы прыладзіў. Працаваў на тым жа падшыпнікавым, утулкі рабіў. Спярша нішто, а пасля абрыдлі — гарчэй за рэдзьку. Уранку — утулкі, увечары — утулкі, учора — утулкі і заўтра — утулкі, зімой і летам — адны ўтулкі... З нуды да гарэлкі прыладзіўся. Выпіваў. Неяк у піўной пазнаёміўся з адным чалавекам — Фраловым звалі, каб яму дышла ў пуза! Так лоўка да мяне пад'ехаў, і так і сяк, гляджу — мілы чалавек. І грошай не шкадуе. Пілі. Спрытна ён мне жытуху атруціў, і не прыкмеціў, як ачмурыў дурня. Ты, кажа, свой хлопец, нашто табе мазоль натруджваць? Хочаш уладжу, работка — лахва. І што ж? Уладзіў прадаўцом у хлебны магазін. Працую месяц, другі. Не скажу, каб вельмі падабалася. Нудная праца, знай, рэж кілаграмы...

Хацеў ужо драла даць з гэтага шчасця, ды аднойчы з'явіўся гэты Фралоў. Кажа, прыходзь у «Паплавок», справа будзе. Прыходжу. Сядзяць у куце пад пальмай — мой Фралоў і яшчэ адзін, дзядзькам Агеем звалі. Што, думаю, за справа? Выпілі, закусілі, нічога не кажуць, яшчэ выпілі, закусілі — маўчаць. Яшчэ і яшчэ. А пасля Агей і кажа: так і так, маўляў, падкінем пару пудзікаў звыш накладной — прадасі? Прадам, кажу, не залежыцца: тавар ходкі. А не ведаў таго, ярына зялёная, што сёння — пару пудоў, а заўтра дзясятак, а пасля — тонамі падкідваць мне хлябец будуць. Спачатку скрабло ў мяне на сэрцы, думаю — да дабра не дойдзе. Але пасля грошы тыя збілі з панталыку — павалілі кучай. Не прывык столькі мець, што рабіць з імі?

— Ну, гэта ты брэшаш, — уставіў Пшанічны. — З грашамі яшчэ ніхто не меў клопату.

— Не меў? — з'едліва перапытаў Свіст. — Што ты разумееш, Мурло, душа капеечная...

— Ладна, годзе вам. Давай далей, — абарваў сварку Карпенка.

— Ага. Ну, тут разгарэлася мая фантазія, захапіўся я фота. Купіў апарат, усякія да яго прычындалы, пачаў псаваць паперу і пласцінкі. Здымаў... Абрыдла фота, купіў байдарку і ўвечары, у выхадныя — на Волзе. О, гэта я любіў. Відаць, душа такая: заўсёды на прастор лезе. Фралоў з Агеем таксама калі прыходзілі, катаў... Туды ж адзін раз прывезлі яны Лёльку. Дзеўка, брат, такая, ярына зялёная, во! Пальчыкі абліжаш. Агнявая, баявая, вясёлая, і захмялела мая галава ў адзін вечар — і гарэлкі не трэба...

Закруціла мяне любоў з гэтай Лёлькай, месца сабе не знайду. Кажу, давай пажэнімся, жыць будзем па чэсці, а яна толькі смяецца. Ходзіць да мяне на спатканні, цалуецца, але ўсё тайком, каб Фралоў не ведаў...

У нейкае свята дамовіліся сустрэцца, прыходжу, а яна стаіць ля танцпляцоўкі ў парку з гэтым самым Фраловым. Пачуў я нядобрае, але падышоў, а Фралоў бярэ мяне за локаць і выводзіць на бакавую алейку. Думаю, нешта будзе, а ён гэтак мне кажа: кінь Лёльку, не чапай: не твая. Лютасць ва мне забушавала. А чыя, кажу, мо твая? Мая, кажа, і вочы, як у воўка, гараць, а рука ў кішэні нешта намацвае. Ну, а я не зважыў на гэта, злаўчыўся ды ладна яму сападануў у скулу. Распачалі мы бойку, парнуў ён мяне фінкаром у лапатку, але і я кулака адважыў. Пазбягаліся людзі, закрычала Лёлька, ну, нас і ўзялі. Прывялі ў аддзяленне — пратакол і так далей. Гляджу — гэты сабака чужое нейкае прозвішча падстаўляе за сябе і дакумент у яго адпаведны ў кішэні.

Узбунтавалася ва мне кроў — ах ты, гад, думаю, зноў некім засланіцца хоча. Вядзі, кажу канвою, да галоўнага. Паклікалі начальніка, узяў я і расказаў усё — і пра хлеб, і пра Агея, і пра нашы шахер-махеры...

Ну і вот, судзілі. Цэлую шайку. Як глянуў я на судзе, дык аж спалохаўся. Ярына зялёная, аказваецца, я толькі кончык ніткі падаў, а ўвесь клубок разматалі без мяне. Чалавек дваццаць розных зладзюг...

Ну, далі каму колькі. Фралову — 10, Лёльцы — 3, мне — 5. Пасля папаўзла жысць турэмная, лагерная. У Сібіры лес пілаваў. Трудна было. Пасля прывык. З залікамі адбыў два гады. Выпусцілі... Падаўся на ўсход. На Сахалін прыбіўся, парабіў у шахтах — не спадабалася. Успомніў Волгу — пайшоў матросам на сейнер.

І тут вайна...

У старожцы пацямнела, пад столлю клубіўся дым, часам залятаў у вокны вецер. Карпенка курыў, лежачы на спіне, усе маўчалі.

— Так, зазнаў ты, відаць, ліха, — сказаў Карпенка. — Гэта не салодка — турма. Але было за што: вінаваты, як ні круці.

Свіст неяк заварушыўся ад гэтых слоў, відаць было, яны блізка кранаді нешта набалелае ў яго затоенай душы.

— Было за што — гэта праўда. Далі пяць — згадзіўся. Далі б дзесяць — ні слова б не сказаў. Усё б адбыў. Чорт з ім: заслужыў — атрымаў па справядлівасці. Толькі, ведаеш, не хачу, каб увесь век папракалі. Што было, то мінула, трэба — яшчэ адсяджу, стрываю, толькі без біркі, без штэмпеля — чалавек я, ярына зялёная... І хоць злыдзень, безгаловы, дурны, але чую не горш за многіх — ціхенькіх, роўненькіх... Вот...

Карпенка на гэта не сказаў нічога, усе маўчалі, і чуваць было, як выў у завуголлі несціханы восеньскі вецер.

8

Выйшаўшы са старажоўкі, Аўсееў спыніўся і прыслухаўся. Пасля святла з грубкі, хоць і мізэрнага, у гэтай цемрадзі нічога не было відаць — адно шапаценне дажджу ды сутаргавыя парывы ветру. Байца адразу ахапіла восеньская начная няўтульнасць, цела скаланулася ад волкіх дрыжыкаў, ён наставіў каўнер і нерашуча ступіў у змрок ночы.

Пад чаравікамі чвякала гразь, лапацеў і лапацеў дождж па намоклай спіне, пілотцы, і невясёлае прадчуванне ўсё глыбей і глыбей караскалася ў душу байца.

Адно з двух, думаў Аўсееў, ці ўсе яны на чале з старшынёй — круглыя асталопы, ці ён сам — ныцік і трус. Але трусам ён не палічыў бы сябе ніколі, бо памятаў у жыцці выпадкі, калі Алік Аўсееў наважваўся на такія ўчынкі, на якія іншыя зусім не былі здольны. Проста ён разумеў тое, чаго не хацелі або не маглі разумець ні старшына, ні Свіст, ні Глечык, ні Фішар, і гэта не на жарт трывожыла яго. Ну, вядома ж, іх пакінулі ў заслон не для таго, каб яны, пасядзеўшы спакойна суткі, маглі затым дагнаць батальён. Калі ўжо паставілі на гэтай дарозе, то, значыць,

тут ёсць небяспека — пойдуць нямецкія сілы, ад якіх хоча засцерагчыся полк. Але што яны, шасцёра, могуць зрабіць той фашысцкай навале, калі з ёй чацвёрты месяц не зладзіць уся наша армія? З першага ж удару іх тут прыб'юць, як таго камара на лбе. І хто гэта надумаў такое ахвяраванне? Яўны пралік, дурная зацея, нікчэмная мера, і толькі. І гэты цвердалобы, недалёкі Карпенка ўпёрся, як баран у новыя вароты, і толькі ведае: загадана — дык выконвай.

Аўсееў прайшоў разы два па ўзмежку, далёка не адыходзячыся ад старажоўкі, прыслухаўся і зайшоў пад страху. Калі так прыціснуцца да самай сцяны, дык трошкі можна засцерагчыся ад макраты і халоднага ветру. Адубелыя рукі самі шукаюць цяпла за пазухай і ў кішэнях, са старажоўкі чуецца размова, нешта там апавядае балбатун Свіст. Нейкі незразумелы ён чалавек, гэты Свіст. Сам быццам і нішто — разумны, спрытны і свету пабачыў, а ніякага крытычнага падыходу да абставін. Дзіўна нават, як ён, блатняк па натуры, можа так згодна падпарадкавацца ўсякаму начальству? Спачатку, калі ён толькі з'явіўся ў іх роце, Аўсееў хацеў пасябраваць з ім, бо болей нікога здатнага тут не было — усё нейкія нехлямяжыя дзецюкі, калгаснікі, з якімі — ні паразважаць, ні ўспомніць. Але спакваля Аўсееў пераканаўся, што гэты Свіст болей горнецца да іншых, любіць трымацца кампаніі, і Аўсееў махнуў рукой — чорт з ім.

Аўсееў у палку жыў сам па сабе, гэта было не дужа весела, але хлопец проста не бачыў паблізу нікога вартага, усё здавалася яму, што ён куды разумнейшы, вышэйшы густам, пачуццём, чым усе тыя, хто ў гэтым армейскім жыцці быў побач з ім. Многімі ён пагарджаў, на іншых, такіх, як Глечык, проста не звяртаў увагі.

Пакрысе прызвычаіўшыся да цемры, Аўсееў стаў бачыць цьмяную лінію чыгункі, невыразныя слупкі на пераездзе, чуў, як маркотна шумелі маладыя прысады. На гары, на дарозе ўсё было ціха, сапраўды, немцы чагосьці замарудзілі ці мо заначавалі дзе па такой непагодзе — а то было б ліха. А можа, было б лепш? Уначы дык яны яшчэ здолелі б адарвацца ад ворага, схавацца ў цемры, адысці, а вось заўтра — наўрад. Заўтра будзе пагібель — гэта пэўна.

А гінуць, пражыўшы толькі дваццаць год неблагога жыцця, Аўсееў зусім не хацеў. Усё яго нутро, кожная часцінка цела нема пратэставалі супраць пагібелі і прагнулі — жыць, жыць. Да д’ябла гэта вайна, да д’ябла мукі і кроў, калі чалавеку трэба адно толькі — жыць. Гэтулькі асалод у гэтым жыцці — пазнаных і яшчэ не пазнаных, — гэтулькі радасці і шчасця, што гінуць у самым яго пачатку — злачынства ў адносінах да сябе. Гэты цвердалобы Карпенка гатовы разбіцца ў шчэпкі, каб толькі выканаць які бязглузды загад, Аўсееў жа заўсёды прывык разважаць, рэвізаваць, думаць і знаходзіць лепшае для сябе з усёй сумы магчымага.

Такія звычкі ён набыў даўно, яшчэ ў школе, калі ўразумеў, што большага часам можна дасягнуць малымі сродкамі. Ён шмат чытаў, вучыўся лёгка і сярод настаўнікаў і таварышаў лічыўся здольным, развітым вучнем. Без асаблівых турбот даваліся яму гуманітарныя навукі, матэматычныя ён таксама ведаў, але чым далей вучыўся, тым болей іх недалюбліваў. Яны патрабавалі карпатлівасці, настойлівасці, уедлівасці да дробязей, а гэта было не па нутру легкадумнай натуры Аліка. Бясконцыя хатнія заданні па алгебры, трыганаметрыі, фізіцы атручвалі яго вольны час, які патрэбны быў для спорту, асалод і забаў. І ён змовіўся з аднакласнікам Шугайлам — недалёкім перарослым вучнем, які нядрэнна спраўляўся з матэматыкай і другагоднічаў у восьмым класе з-за абсалютнай няздольнасці да моваў. Гэты Шугайла рабіў за Аліка ўсе хатнія заданні па матэматыцы, пісаў за яго кантрольныя, аблягчаў усе яго матэматычныя абавязкі. Алік дапамагаў яму на дыктантах і сачыненнях, але рабіў гэта хітра, і калі па матэматыцы адзнакі ў іх былі аднолькавыя, то па моўных работах ацэнка ў Шугайлы мала калі ўзнімалася да 4. Алік жа чацвёркі меў рэдка, ён быў выдатнік.

Бацька яго, ваенны ўрач падпалкоўнік Аўсееў, у справы юнака-сына ўмешваўся мала, ён быў поўны ўласных клопатаў, затое маці, ужо немаладая і вельмі сардэчная жанчына, даглядала адзінага свайго сынка за пяцярых бацькоў і пяцярых матак. З маленства яна бачыла ў Аліку тысячу талентаў і незвычайных здольнасцей. Варта было маломy, дурэючы, крануць клавішы піяніна, як маці ўжо захапля-

лася і хвалілася перад бацькам, суседзямі, знаёмымі: «Ён жа цуда дзіця — узяў акорд! О, ён будзе кампазітар!» Калі Алік пэцкаў на паперы пасліненым алоўкам якія крывулякі — маці падхоплівала тую паперку і бегла паказваць іншым — во якія здольнасці ў яе сына! Калі сынок крыўдзіў каго з малых на двары і на яго скардзіліся суседкі, тая, зачыніўшы дзверы, казала: «Малайчына, сынок. Не дазваляй, каб над табою бралі верх».

...Вучачыся ў дзясятым класе, Алік зразумеў, што мастацтва — музыка, жывапіс, а таксама спорт — гэта не яго стыхія, бо там трэба фанатычная бязлітаснасць да сябе, упартасць і праца. А ўсё тое, што даецца вялізным намаганнем, праз цяжкасці, тое — ведаў Аўсееў — перастае несці асалоду, радасць таго засмучаецца цяжарам дасягнення. Вайсковае ж вабіла яго рамантыкай жыцця і прыгожасцю формы. Ён любіў глядзець на чырвонаармейскі строй у час парадаў, яму падабаўся зухаваты выгляд маладых камандзіраў, апяразаных рамянямі, з сумкамі і пісталетамі на баку, любіў магутнасць баявых машын і захапляўся пазнанымі з кніг геройскімі ўчынкамі ў часе вайны. Бацька не пярэчыў супраць гэтай схільнасці юнака Аўсеева, маці ж, ва ўсім дагаджаючы сыну, саступіла са сваіх ранейшых жаданняў наконт яго мастацкай будучыні, і за год да вайны Аўсееў стаў курсантам ваеннага вучылішча.

Але сталася так, што з першых жа дзён свайго вайсковага жыцця курсант Аўсееў адчуў расчараванне. Камандзірам аддзялення, у якое залічылі Аўсеева, назначылі мешкаватага тугадума Тодарава. Гэты няўклюдны чалавек з тупой упартасцю і асаблівым стараннем імкнуўся выканаць усё, што ад яго патрабавалася, не зважаючы ні на чые і ні на якія турботы. Ён зусім не хацеў бачыць, што Аўсееў разумнейшы за яго і за многіх курсантаў, што ён болей развіты і спрытнейшы, куды лепш выхаваны. Дарэчы, гэтага не хацелі заўважаць і старшына, і камандзір узвода — яго школілі так, як і ўсіх. І калі ён спрабаваў вылучыцца, паказаць свае веды і здольнасці, даказаць, што ён варты лепшага, тады яго неўзлюбілі таварышы.

Праўда, тыя нягоды хутка скончыліся. Улетку, калі пачалася вайна, яго ў ліку вялікай групы курсантаў адклікалі

з вучылішча і з маршавай ротай накіравалі на фронт. Аўсееў спачатку ажно ўзрадаваўся і, па пыльных дарогах дабіраючыся да перадавой, быў поўны рашучасці на які-небудзь геройскі ўчынак, усё карцела яму паказаць людзям, на што здатны Аўсееў. Але ў першым жа баі яго аглушыла грымоццем страляніны, асляпіла страхам блізкае смерці, апаліла болем няўдачы і разгрому. «Не, — сказаў сабе Аўсееў, — гэта не для мяне...»

Дагэтуль яму сяк-так шанцавала, але, здаецца, прыйшоў канец яго ўдачам. Аўсееў вельмі непакоіўся за заўтрашні дзень, чула яго сэрца — будзе непапраўнае ліха, і ўсё думалася, што зрабіць, каб як абмінуць пагібель...

10

За гэту страшную пару нязмерных людскіх пакут Глечык ужо парадкам агрубеў нутром і перастаў заўважаць дробныя нягоды жыцця. Не вельмі дапякалі хлопцу маршы і акопы, сцюжа, голад, прызвычаіўся ён да патрабавальнасці камандзіраў, і толькі адно вялікае перажыванне, ніколі не сціхаючы, дзень і ноч тачыла яго душу.

Ён быў нясмелы і маўклівы хлопец, зважлівы да старэйшых і байчэйшых за яго, ніколі нікому не адкрываў сваіх пакут, усё слухаў другіх, думаючы, што ягонае гора — не гора. Праўда, ад таго не было лягчэй, і ўсё чарнела ўнутры ад непазбыўнага болю мінулага...

Эх, каб можна было спыніць час, перайначыць жыццё спачатку, «сабраць з дарог камяні тыя, што губяць сілы маладыя!». Не зрабіў бы, можа, і Глечык тае крыўды роднаму, найбліжэйшаму чалавеку — маці, крыўды, ад якой так балюча ў яго душы.

Ціхае і прыгожае было маленства Васількі Глечыка. Цагельны завод на краі пасёлка, агромністыя старыя кар'еры з шырокімі лужынамі жоўтай вады, доўгія сушыльныя павеці і мноства цэглы — сырой, падсохлай і абпаленай...

Глечыкаў бацька, вядома, меў дачыненне да таго завода, ён працаваў абпальшчыкам — гаспадаром доўгай, як пячора, абпальнай гофманскай печы, якая заўжды патыхала пылам і жарам. Бацька быў добры, ніколі не лаяў Васю, у палучку прыходзіў трошкі пад хмелем, прыносіў яму цацкі і

цукеркі. Маці тады хмурылася, і малы Васілька ніяк не мог зразумець, чаму яна сярдуе на бацьку — ён жа ў такія часіны быў яшчэ ласкавейшы, дабрэйшы і весялейшы, чым заўсёды.

Ну, але калі маці крыўдзілася, то і Васілька не мог адчуваць сябе шчаслівым, і ён таксама перажываў тое і трохі наракаў на бацьку. Васілька вельмі любіў маці — дужа ласкавую, прыгожую і добрую жанчыну, з якой усе людзі ў пасёлку абыходзіліся вельмі прыветна. Яна ніколі не ведала сярдзітага, грубага слова, была заўжды вясёлая — бывала, кожны, хто сустракаўся з ёю, адразу радасна і светла ўсміхаўся. Ім вельмі шчасліва жылося тады на гэтым заводзе. Васілька вучыўся ў школе, быў па матцы старанны, сумленны і зважлівы і да пятнаццаці год не ведаў, што такое сапраўднае гора.

Але гора здарылася — нечаканае, недарэчнае і страшнае. Аднойчы ў дажджлівы, як сёння, восеньскі вечар яны ўсе — бацька, маці, Васілька і трохгадовая Настачка — сядзелі ў пакоі за сталом і слухалі тыдзень таму назад куплены патэфон. Бацька асцярожнымі, не прывучанымі да драбніц пальцамі ўстаўляў у мембрану іголку і асцярожна апускаў яе на пласцінку. Маці слухала, аблакаціўшыся на падаконнік, — яна была вельмі прыгожая тады, нейкая летуценная і ціхая. І вось у такі час знадворку пачуўся дзікі, нечалавечы крык.

Яны ўсе здрыгануліся, бацька кінуўся да акна, затым — да дзвярэй, сунуў ногі ў боты і як быў — у адной кашулі, без шапкі — скочыў на вуліцу. Васілька таксама выбег следам і адразу за рогам ля плота ў святле недалёкага ліхтара ўбачыў страшнае. З мокрага ад дажджу невысокага слупа электрасеткі спаўзаў уніз чалавек, іх сусед Трошкін, а на зямлі, распластаўшыся ў гразі, ляжаў нерухомы бацька. Васілька кінуўся туды, закрычаў, выбегла маці, пазбягаліся людзі. Але ўжо нічога нельга было зрабіць ці дапамагчы — бацьку забіла токам.

У той вечар скончылася Васількава шчаслівае дзяцінства, і ён зазнаў пачатак вялікага гора. Бацьку пахавалі, маці счарнела ад пакутаў і слёз. Васілька таксама плакаў, але рабіў гэта, хаваючыся ад усіх, нечакана ён адчуў сябе мацнейшым па характары ў гэтай асірацелай сям'і і стрымліваўся як мог. Ім стала цяжка, сумна і пакутна. Ён тады скончыў сямігодку,

але маці хацела, каб сын вучыўся далей, а сама пайшла на завод фармаваць чарапіцу. Зарабляла яна няшмат, грошай на ўсё не хапала, і яны ашчаджалі кожную капейку і як-кольвечы жылі. Васілька таксама зарабляў дзе мог — збіраў металалом, памагаў рамантаваць ваганеткі, грузіў на машыны цэглу. Маці патроху ачуняла ад гора, супакоілася і калі-небудзь, паклаўшы спаць Настачку, садзілася да сына і казала: «Нічога, не бядуй, сынок, як-небудзь пражывём. Усё ж нас двое, работнікаў». Поўная замілаванай пяшчоты, яна гладзіла яго па каротка астрыжаных віхрах, а Васільку было вельмі ніякавата ад той яе ласкі, і ён сарамяжліва ўхіляўся. Але ў тыя хвіліны хлопец гатовы быў на ўсялякія турботы, каб хоць трошкі аблегчыць спакучанае жыццё маці. Пасля смерці бацькі ён стаў любіць яе ўдвая болей.

Толькі маці неўзабаве павесялела сама. Неяк у пагодлівы выхадны дзень яна добра прыбралася, надзела свае белыя, некалі купленыя бацькам туфлі, узяла маленькую сумачку і пайшла, наказаўшы Васільку дагледзець Настачку і нікуды не ісці з дому. Вярнулася яна пад вечар, вясёлая, жвавая, па-ранейшаму прыгожая і ласкавая. Яна доўга і радасна забаўлялася з Настачкай, пагладзіла па галаве Васільку, але ў сынавай душы раптам узнялася да яе незразумелая, крыўдлівая варожасць. Ён тады не сказаў ёй нічога, пайшоў к кар'еру і да змяркання праседзеў на абрыве.

Праз колькі дзён тая крыўда забылася, маці была добрая, шмат працавала, увечары прыходзіла змораная і суцішаная. Але аднойчы на нейкае свята яна ўстала дужа раненька, збегала ў краму, старанна прыбрала ў пакоі, нарыхтавала посуд і сказала Васільку, што ён, калі хоча, можа пагуляць, бо да іх прыйдзе госць. Васілька адчуў нядобрае, насупіўся, гуляць не пайшоў, а, залезшы на дах хлеўчука, пачаў выглядаць таго ненавіснага госця. Госцем аказаўся Кузьмічэнкаў — бухгалтар іхняга завода, не дужа ўжо малады чалавек, які заўсёды ездзіў на веласіпедзе з прышпіленым да рамы партфелем. Васілька зноў уцёк на кар'ер і да поўначы не паказваўся дадому.

А маці ў той вечар доўга не клалася спаць: усё чакала яго. Яна, пэўна, ужо нешта згадала ў яго настроі, уздыхнула, калі ён, прыйшоўшы, моўчкі заваліўся на ложак, пасля паплакала крыху і сказала, што ён яшчэ малы і не разумее

ўсяго, што трэба было б зразумець. Тады нейкая жаласць да маці коратка варухнулася ў яго душы, але зразумець яе зусім ён сапраўды не мог, а галоўнае — не хацеў.

Нешта ў ім заартачылася, ён страціў сваю былую шчырасць, пазбягаў заставацца з ёй адзін на адзін. І калі год назад маці прывяла да іх таго Кузьмічэнкава і сказала, што ён цяпер будзе іх бацькам, Васілька зразумеў, што тут яму жыць нельга.

Праз дзень ці два ён узяў сваю новую рубашку, зімовую бацькаву шапку, тры чырвонцы надоечы атрыманых ім грошай і пайшоў на станцыю. Там ён сеў у прыгарадны цягнік і прыехаў у Віцебск. У кішэні яго была пацёртая газета з аб’явай аб прыёме навучэнцаў у школы ФЗН. Так праз пару дзён Васіль Глечык узбіўся на свой хлеб і адцураўся матчынай ласкі.

Дома ён не сказаў нікому, куды паехаў, чаму і на каго пакрыўдзіўся. Маці, відаць, нямала перажыла, пакуль знайшла яго ў Віцебску, прыехала, прасіла вярнуцца, а галоўнае — не крыўдаваць, але ён маўчаў, ні слова не сказаў ёй пры сустрэчы, не адказваў на пісьмы. Калі ж пачалася вайна, ён даведаўся, што Кузьмічэнкаў пайшоў у войска, а маці з Настачкай засталіся адны. І хлопец тады завагаўся. Ён ведаў, што ён патрэбны там, што неяк трэба ратаваць маці ад той навалы, якая няспынна рацілася на ўсход, але былая крыўда не давала яшчэ забыцца на яе.

Пакуль ён разважаў і вагаўся, немцы падышлі да Віцебска, і трэба было ратавацца самому.

Васілька прычапіўся на станцыі да апошняга вагона апошняга цягніка і дзе пехатой па шпалах, а дзе ў эшалонах дабрыў да Смаленска. Відаць, у людскіх нягодах вялікае буры растварылася хлопцава крыўда і засталося толькі балючае ўсведамленне ўласнай несправядлівасці да маці, якая так любіла яго.

...Глухая цемра запанавала ў старажоўцы, патухлі апошнія іскрынкі ў грубцы, стала халадней. Дружна спалі хлопцы, прыхрапваў старшына, а Глечык шырока раскрытымі вачыма нерухома пазіраў у змрок і нудзіўся. Заўтра, можа, здарыцца з ім што цяжкае, ён можа загінуць, гэта будзе першы яго бой з ворагам, але не страх смерці, не жаль да сябе дапякалі хлопцу ў гэтыя апошнія хвіліны спакою.

— Маці, адзіная мая, дарагая матуля, — шаптаў у бяздонную цемру Глечык, — ці даруеш ты мне маё непаслушэнства, мае дураслівыя выбрыкі? Чаму я такі быў дурны, не разумеў твайго сэрца, якое хацела свайго чалавечага шчасця, навошта пакінуў цябе — родную, адзіную маю? Як ты цяпер там, у варожым палоне, адна? Што з табой зробяць крывавыя вылюдкі і хто заступіцца за цябе?..

11

...Так, нялёгкае было жыццё сялянскага хлопца Карпенкі. Адслужыўшы тэрміновую памочнікам камандзіра ўзвода, ён застаўся яшчэ і год з дзесяць служыў старшыной роты. Неспакойная гэта служба, хто ведае — не пазайздросціць старшынскаму хлебу. Цяжкавата было Карпенку, але неяк прывык, уцягнуўся ў бясконцыя казарменныя клопаты. Ды і мусіў цягнуць, бо вяртацца дадому на Арлоўшчыну не выпадала, у бацькавай хаце жыў са сваёй вялікай сям'ёй Аляксей, усе астатнія браты разбрыліся па свеце. Праўда, пасля стаў калгас, не трэба была свая гаспадарка, зямля, але калгас той доўгі час ледзьве ліпеў, з цяжкасцю становячыся на ногі. І ўсё ж да мірнага працоўнага жыцця вельмі цягнула старшыну Карпенку. Пакрысе жыццё наладжвалася, станавілася лягчэй і ў вёсцы і ў горадзе, але тады распачалася вайна з фінамі. На ёй Карпенку давялося сербануць ліха, яго параніла, пасля ён атрымаў баявы медаль і ўрэшце здзейсніў свае даўнія мары — звольніўся ў запас. Як удзельніка вайны і ўзнагароджанага, яго прызначылі намеснікам дырэктара льнозавода, далі добрую кватэру ў другой палавіне папоўскага дома, дзе была заводская кантора, і Карпенка неўзабаве ажаніўся з Кацяй, або Кацярынай Сымонаўнай, маладзенькай настаўніцай тутэйшай пачатковай школы.

Заводскія справы яго захапілі. Па старой вайсковай звычцы ён не шкадаваў сваёй працы, часу, стараўся разам з дырэктарам, аднарукім чырвоным партызанам Шорацам, і іх завод быў адзін з лепшых у раёне. Ён стрымана, па-свойму, без асаблівай ласкі, але моцна кахаў сваю Кацю — Кацярыну Сымонаўну — і з незвычайнай, ніколі не адчуванай пяшчотай чакаў неўзабаве малога.

І тут зноў — вайна.

Цяжка і няўдала пачалася яна, кожнага дня гінулі сотні людзей, але Карпенку на фронце ўсё ж шанцавала. Іх дывізію ўлетку разбілі пад Лепелем, аднак рэшткі палка, у якім служыў старшына, неяк выкарабкаліся з акружэння, вынеслі зброю і сцяг. Праўда, загінулі ў баях тры камандзіры яго роты, змянілася некалькі камбатаў, ужо зусім мала засталося тых, з кім старшына вытрымаў першы бой, а Карпенка ўсё быў цэлы. Урэшце ён ужо прывык да сваёй неўязвімасці, дбаў пра іншых і ніколі асабліва не клапаціўся аб сабе. Здаралася, ён заставаўся на нядоўга камандзірам батальёна, даўжэй — камандзірам роты, немцы асабліва яго нідзе не білі, звычайна выходзіла так, што і Карпенка, налаўчыўшыся, даваў добрай здачы. Ён не вельмі палохаўся сам, пільна сачыў за боем, не даваў спуску баязліўцам, байцы трошкі крыўдавалі на яго за лішнюю строгасць, але ў баях цанілі крыклівага старшыну.

Карпенка дакурыў цыгарку, паляжаў яшчэ. Сон болей не ішоў, у старажоўцы па-ранейшаму было цёмна, але чуйны да часу старшына здагадваўся, што хутка наступіць ранак. Ён зноў узняўся, захінуўся ў шынель і, пераступіўшы цераз Свіста, расчыніў дзверы.

На двары марудна світала. Змрок паволі радзеў, адпаўзаў з пераезда, ужо прыкметны быў насып чыгункі, дарога з блішчастай лужынай. Чорнай расплывістай паласой цягнуліся ў шэрасць прысады. Вецер уціх, пацяплела, з лагчыны цераз пуці сунуліся шэрыя космы туману.

Старшына агледзеўся, шукаючы вартавога Пшанічнага, але таго нідзе не было. Ён абышоў старажоўку, зазірнуў у траншэю, гукнуў. «Дзіўна, — падумаў Карпенка, — няўжо задрамаў дзе?» Ён яшчэ паазіраўся, вылаяўся ад прыкрасці, і тады на шляху за бярозамі чуйную ранішнюю ціш прарэзала гулкая кароткая чарга.

12

Застаўшыся адзін у вячэрнім ветраным полі, Фішар нейкі час слухаў далёкую страляніну за лесам, глядзеў на палахлівае мігценне ракет і думаў, што іх справы тут, відаць, кепскія. Калі ўжо немцы зайшлі з тылу, дык утрымаць тую

дарогу наўрад ці будзе магчыма. Праўда, зайсці ў тыл магла і невялікая група фашыстаў, асноўныя ж іх сілы не мінуць гэтай адзінай, прыгоднай для аўтамабіляў дарогі. Калі толькі рынуцца яны і якія гэта будуць сілы, ці ўдасца ім, шасцярым байцам, утрымаць пераезд на суткі? — вось гэтыя думкі-сумненні ўсё настойлівей турбавалі байца.

Калі страляніна за лесам сціхла, Фішар схамянуўся ад свае трывожнай задуменнасці і схапіў лапатку...

Ад тае аднастайнай працы і ветранай начной цішыні да Фішара прыйшла прывычная патрэба развжаць — дабірацца да сэнсу з'яў і акалічнасцей яго вайсковага лёсу.

Супярэчлівае і незразумелае пачуццё мроілася ў ім у адносінах да старшыны Карпенкі. Фішар не паважаў гэтага чалавека, яго прыгнятала пастаянная нязменная патрабавальнасць старшыны, крыклівая злоснасць яго салдацкай натуры. Часта, калі старшына грубым, бесцырымонным тонам за якія-небудзь дробязі крычаў на байцоў, Фішару карцела абурыцца, патрабаваць добразычлівых, роўных адносін да людзей. Карцела, але ні Фішар, ні хто іншы з тых, што сам сабе абураўся старшыновымі наскокамі, не наважыўся зрабіць гэта. Самаўпэўненасць старшыны абяззбройвала, блакіравала волю, і Фішар адчуваў часам, што ён проста пабойваецца ўзводнага. Карпенка, відаць па ўсім, не любіў інтэлігентаў-разумнікаў і, як натура элементарна простая, ніколі не таіў гэтых сваіх адносін. Фішар часам пагарджаў старшыной, часам ненавідзеў, але варта было таму хоць на хвіліну проста, па-людску падысці да яго, стаць Карпенкам-таварышам — і Фішар ужо забываўся на сваю непрыязнасць і гатовы быў дараваць яму ўсе ранейшыя крыўды.

Вось і цяпер, пасля кароткай іх стычкі на пераездзе, стычкі, у якой, накапіўшыся, выбухнула даўняе Фішарава абурэнне, варта было Карпенку загаварыць з байцом проста і зважліва — і той адразу абмяк. І хоць яму было вельмі няёмка тут, у гэтым сцюдзёным, ветраным полі, — і самотна, і боязна, і гарэлі на далонях свежыя мазалі ад лапаткі, і недзе марнела маленькая крыўда — чаго на такую справу прызначылі яго, а не іншага, — але баец маўкліва цярпеў. Ён ведаў, што гэта патрэбна палку, батальёну, ім шасцярым на пераездзе, ён разумеў гэта, але яшчэ было і затоенае жаданне — дагадзіць камандзіру...

Дзіўна, думаў Фішар, як гэта атрымліваецца, што ён, малады, здольны, як раней прызнавалі многія, вучоны, знаўца шматлікіх мастацкіх ісцін, хоць таемна, але ўсё ж такі хоча спадабацца нейкаму малапісьменнаму салдафону, якім здаваўся яму старшына. Няўжо справа ў грубай сіле ці ў тых дысцыплінарных правах, якія дае камандзіру Статут, або ў нахабнаватай самаўпэўненасці гэтага чалавека? Здавалася, што гэта не так. Цьмяна неяк адчувалася, што Карпенка мае нейкія сапраўдныя перавагі над ім, нейкую патэнцыяльную сілу, на якую абапіраецца і ён, баец Фішар, але ў чым была тая сіла, Фішар зразумець не мог. Не мог жа дапусціць ён, што гэты старшына разумнейшы за яго ці болей і лепш разбіраецца ў вайсковых абставінах, ад якіх штосчас залежаў іх лёс. Фішар хоць і не быў вайскоўцам, але за час франтавога жыцця навучыўся ўжо разбірацца ў ваенных абставінах, як ён думаў, не горш за гэтага саманадзейнага служаку Карпенку.

Дождж усё настойлівей лапатаў па спіне, пілотцы, па твары сцякалі сцюдзёныя кроплі, змокла перавязка на шыі. Фішар выпрастаўся, выцер гарачай далонню мокрыя калючыя сківіцы і жаласліва паглядзеў у неба, нібы там можна было што ўбачыць. Затым ён прымерыўся да глыбіні — бруствер яшчэ не дасягаў і грудзей, але ўжо браўся граззю. У той гразі выпацкаліся мокрыя полы шыняля, рукі, пудовыя камякі наліплі да чаравікаў. Нідзе не было ў гэтую ноч паратунку ад сцюдзёнай агіднай макраты, якая напоўніла сабой усё наваколле.

Фішар пастаяў хвіліну, аддыхаўся і рашыў, што ўжо годзе. Не вылазячы на адкрыты вецер з ямы, ён разгарнуў сяк-так бруствер, дастаў з іржышча абсыпаную зямлёй вінтоўку, наставіў каўнер і скурчыўся на дне сховішча.

Неадольная, усёабдымная стома апанавала чалавека, адразу пахілілася яго галава — вельмі захацелася спаць. Але спаць было нельга, ды і зморанае разагрэтае цела неўзабаве скаланулі першыя дрыжыкі. Холад з кожнай хвілінай усё далей запускаў сваю ледзяную руку, прымушаў байца сціскацца, туліцца і дробна дрыжаць. Дождж гусцеў, ужо зусім змокла пілотка, зябла на ветры нядаўна астрыжаная галава. Сашчапіўшы ў рукавах рукі, Фішар дрыжаў, варушыў пля-

чыма, тупацеў нагамі і паныла думаў, як бы паменшыць свае пакуты. Але сагрэцца не было як.

І з часам, пэўна, прызвычаіўшыся да таго з-за безвыходнасці ці мо ўжо атупеўшы ад холаду, ён неяк змірыўся з пакутамі і хоць мёрз усё болей, але ўвага яго аддалася новым адчуванням-развагам.

Вось ужо некалькі дзён у прывычныя пакутлівыя пачуцці яго — пачуцці гора і болю за вялікія няўдачы вайны, адступленне — неяк пастутова ўваходзіла невыразная нотка незадаволенасці сабою, цьмянае адчуванне нейкай сваёй памылкі. Як след разабрацца ў гэтым усё было некалі — то бамбёжкі, то марш, кароткія баі на выпадковых рубяжах і зноў адступленне. Ён баяўся прызнацца сабе самому, але, здаецца, недзе надламаліся несакрушальныя дагэтуль асновы яго быцця, асновы, якія змалку засвоіў сабе Барыс Фішар і на якіх ладзіў сваё жыццё.

Ён ужо быў не надта малады — нядаўна мінуў чалавеку трэці дзясятак, і за ўсе пражытыя гады ні на адзін момант не з'явілася ў яго сумненне ў спрадвечнай сіле мастацтва. Усё самае цудоўнае, самае вечнае бачыў ён у вышэйшым праяўленні чалавечага духу — у мастацтве.

Ён гадаваўся ў Ленінградзе. У яго бацькі, старога доктара Фішара, была каштоўная бібліятэчка манаграфій пра вялікіх мастакоў свету, і першыя малюнкі, якія захапілі хлопчыка, былі рэпрадукцыі з альбомаў жывапісу і скульптуры. Барыс рос ціхім, не па гадах сур'ёзным хлопчыкам, неахвотна і рэдка спускаўся ў цесны, захламлены двор, у якім заўжды было сцюдзёна і сыра, і часта падоўгу разглядаў малюнкі ў бацькавых кніжках.

Пасля ён сам з трапяткой нецярплівасцю ў сэрцы ўзяўся за пэндзаль і фарбы, маляваў тое, што бачыў з акна кватэры — дамы, вуліцы, коней, сабак. Людзі хвалілі, а хлопчыку хацелася плакаць ад прыкрасці, што ўсё так прыгожа было ва ўяўленні і так дрэнна выходзіла на паперы. Наперакор людскім перакананням аб яго здольнасцях Барыс ведаў, што мастака з яго не выйдзе ніколі. Але канчаткова ўпэўніўся ў гэтым ён, відаць, позна, тады, калі ўжо ўся шчырая душа яго была без рэшты захоплена вялікай сілай мастацтва...

І ён, не стаўшы мастаком, усё ж звязаў сваё жыццё з мастацтвам. Падросшы, вучыўся, чытаў, думаў, даследаваў

сам і ў дваццаць пяць год абараніў дысертацыю на званне кандыдата мастацтвазнаўства...

Мастацтва здаўна і назаўжды зачаравала яго істоту, напоўніла дух неспатольнай прагай цудоўнага... Ён не дужа цікавіўся палітыкай, тым неспакойным, шматтурботным жыццём, што бурліла, плыло, абганяла яго. Вучонага мала кранал і планы і падзеі надзённасці — змалку ён адасобіўся ад усяго, што не складала чароўнай прывабы мастацтва. З гэтай, відаць, прычыны ён не разумеў і не дужа цікавіўся братам — інжынерам-канструктарам самалётаў. З юнацтва яшчэ яны ўзаемна аддаліліся, сустракаліся рэдка і па духу былі адзін аднаму чужыя. Апошні раз яны з’ехаліся гады два назад на пахаванне бацькі і тады ж пару дзён правялі разам...

Апынуўшыся ў войску, ён адчуў сябе белай варонай, няўмекам, самым няўдалым з усіх у гэтай гаманлівай, асаблівай, ні на што вядомае яму не падобнай грамадзе разнастайных людзей. Ён ніяк не мог навучыцца хадзіць у нагу, хутка ўскакваць на пад’ёме, няўклюдна пад рогат таварышаў аддаваў чэсць, заняткі па штыкавому бою ўшчэнт знясільвалі яго. Спярша ён горка перажываў, балюча зносіў уціск крыклівых сяржантаў, каяўся за няўвагу да вайсковай справы ў інстытуце і думаў, што ён самы няздольны чалавек на зямлі. Пасля трохі асвойтаўся, трапіў на фронт, іншыя, большыя страхі і клопаты зацямнілі яго кволае інтэлігенцкае самалюбства. Ён быў чалавек удумлівы і разумеў, што гэта пакутна і марудна нараджаўся ў ім той, на каго ён менш за ўсё рыхтаваў сябе, — нараджаўся баец. І яшчэ Фішар з вялікай тугой заўважаў, як усё меней і меней заставалася ў ім ад яго былога — ад мастацтвазнаўцы Фішара. Грубае, страшнае жыццё штодзённа і няспынна сцірала з яго душы вялікае значэнне мастацтва, якое ўсё болей і болей саступала сваё месца інстынктам барацьбы — выходзіла, што тое высокае і нязменнае, чым дыхаў ён трыццаць гадоў, цяпер проста было непатрэбным у гэтым страшным хаосе вайны. І тады прыйшло гэтае таемнае сумненне, у якім ён сёння ўрэшце прызнаўся сабе: ці сапраўды яно — тое адзіна вялікае і вечнае, чаму ён аддаў свае лепшыя маладыя гады? Ці не памыліўся ён, узяўшы яго за адзіны свой крыж, ці не

лепш зрабіў брат, які аддаў веку і людзям свае намаганні іншага парадку — намаганні, што ўвасобіліся цяпер у рэальную сілу, здольную ўратаваць свет?..

13

Прычыніўшы за сабой дзверы старажоўкі, Пшанічны з рашучай выразнасцю адчуў, што ён назаўжды ўжо адарваўся ад гэтых пяцярых людзей, з якімі звёў яго недарэчны вайсковы лёс. З самай гэтай хвіліны, як ён ступіў у мокрую цемру ночы, ён апынуўся адзін, не звязаны ўжо ні з кім ва ўсім белым свеце. Усё яго няладнае мінулае засталося адрэзаным на парозе той цёмнай задымленай старажоўкі — засталося па сваёй волі пакінутае ім, будучае было недзе на гразкай дарозе...

Узышоўшы на гулкі насціл мастка ў нізінцы, Пшанічны яшчэ азірнуўся і зноў адчуў у сабе самотную тугу і з асаблівай сілай — пачатак невядомай свае адзіноты. Гэтае адчуванне міжвольна ахапіла яго так моцна, што ён аж спыніўся, але затым зноў зазлаваў на сябе і, прыпомніўшы злосную заклапочанасць Аўсеева, падбадзёрыўся. Так, ён не памыляецца, ён задумаў правільна ўжо хоць бы таму, што яны там асуджаны на смерць. А ён урэшце памкнецца асядлаць свой лёс, заслужыць, даказаць сваё права на людскае жыццё, жыццё, якога ён варты, нягледзячы ні на якія няўдачы...

Парадкам ужо аддаліўшыся ад пераезда і бяроз, Пшанічны адзначыў, што самае страшнае пройдзена. У яго адлягло на сэрцы, з'явіліся лёгкасць, некаторая зухаватасць у думках. Ён перакінуў з рукі ў руку вінтоўку і падумаў, што зброя ўжо не спатрэбіцца, а пры сустрэчы з немцамі можа толькі пашкодзіць яму. Не прыпыняючы хады, баец ухапіў яе аберуч за штых, размахнуўся ў паветры і шпурнуў за канаву ў поле. Пачуўшы, як яна пляснулася аб размяклую зямлю, Пшанічны крыва ўсміхнуўся сваім мардатым адкормленым тварам. Цяпер яго ўжо нічога не звязвала з арміяй, з абавязкамі грамадзяніна Савецкай краіны, цяпер ён застаўся адзін між небам і зямлёю. Гэта было незвычайна — адчуваць сябе адзінокім, без найменшай залежнасці ад людзей. Але ён ведаў, што так не пражывеш доўга, каб уратавацца ад смерці

і прыдбаць якую-ніякую долю, у яго абставінах найлепшым было здацца немцам — на іх літасць і ўладу.

Ад паспешнай хады Пшанічны разагрэўся, расшпіліў каўнер шыняля і трохі сцішыў крок. Тым часам ранак ужо разагнаў цемру, можна было выбіраць дарогу, і ён, абыходзячы лужыны, ішоў па абочыне. Аднастайнасць хады ўжо зусім суняла яго кароткую ўзрушанасць. Пшанічны захацеў есці і, падумаўшы, што трэба скарыстаць спакой і адзіноту, на хаду развязаў свой мяшок. Тут ён нядобрым словам яшчэ раз памянуў Свіста, які выцягнуў яго сала, але хлебны акраец з цукрам здаўся яму смачным, і Пшанічны, жуючы, паглыбіўся ў свае думкі.

Перш за ўсё цікавіла, як да яго паставяцца немцы. Добра, калі б адразу сустрэўся які інтэлігентны, разумны афіцэр, уцякач паказаў бы яму нямецкі пропуск-лістоўку, некалі знойдзеную ў полі і рупліва прыхаваную на ўсякі выпадак. Пасля ён папрасіў бы адвесці яго ў штаб і там расказаў бы якому начальніку, хто ён і чаму добраахвотна здаўся ў палон. Калі б патрабавалі даць звесткі пра свой полк, ён не таіўся б. Навошта? Усё роўна раней ці пазней яго разаб'юць канчаткова, гэта зусім не залежыць ад таго, пасведчыць аб ім Пшанічны ці не. Калі запатрабуюць яшчэ чаго, ён зробіць усё, бо ўсё гэта будзе для яго і супраць тых, ад каго ён досыць напакутаваўся на сваім вяку. Не можа быць, каб немцы не ацанілі як трэба яго шчырасці і не аддзячылі яму. У лагер яго як добраахвотнага перабежчыка не павінны адправіць, відаць, адпусцяць на волю, а можа, нават паставяць на якую кіраўнічую пасаду ў горадзе ці сельскай мясцовасці. Гэта было заманліва. О, тады Пшанічны паказаў бы свае здольнасці, даказаў бы яго апекунам, што яны не памыліліся ў ім...

У сярэдзіне гэтых мараў-разваг блізка наперадзе пачуўся нейчы адрывісты голас. Пшанічны насцярожыўся, да болю ў вачах імкнучыся пранікнуць у затуманены прасцяг дарогі, што-кольвечы ўбачыць у ім, і паціху ішоў над канавай. Неўзабаве з туману цьмянымі постацямі выніклі стрэхі хацінак, голае вецце дрэў, пасля плот з забытай анучай на жардзіне. За рогам крайняй хаты, куды паварочвала дарога, чулася прыглушаная туманам прысутнасць людзей, і Пшанічны яшчэ болей устрывожыўся ад думкі — хто там? Яму страшна

было зноў напаткаць сваіх, рускіх, якія невядома як аднесліся б да яго, бяззбройнага. Зноў жа — стала боязна і немцаў, Пшанічны на момант упершыню адчуў невыразную прыкрасць ад свае паспешнасці, але ўжо было позна.

З-за рога хаты раптам высунуўся танклявы, падпяразаны, у казыркастай шапцы салдат — упіраючыся нагамі ў зямлю, ён ускаціў на сухое матацыкл і, не выпускаючы з рук руля, паставіў нагу на завадную педаль. Пшанічны не адразу зразумеў, хто перад ім, і спыніўся ад нечаканага страху. Матацыкл тым часам загыркатаў, і тады немец убачыў разгубленага Пшанічнага. Салдат устрапянуўся, крыкнуў, схапіўся за аўтамат, што боўтаўся на яго грудзях. З-за хаты выбег яшчэ адзін немец у плямістым, як жаба, камбінезоне, і Пшанічны, адчуўшы, як у грудзях яго нешта абарвалася, няспрытна і з нейкай раптоўнай нязладнасцю ў душы ўзняў рукі.

Немцы сталі ля матацыкла, трымаючыся за аўтаматы, а ён, ледзьве перастаўляючы замлелыя ногі, боязна ішоў да іх. Яны не стралялі, толькі гыркнулі злосна і варожа нешта незразумелае, і адзін, той, што заводзіў матацыкл, — белатвары, з абвіслай губой мужчына, — ступіў да яго насустрач. Ён нешта закрычаў па-свойму, Пшанічны не зразумеў і, не апускаючы рук, паспрабаваў вытлумачыць:

— Рус капут. Я — плен, плен...

Ён апусціў адну руку, спрабуючы дастаць з-за пазухі недаравальна забыты ў такую хвіліну пропуск-лістоўку, але немец пагрозліва крыкнуў і тыцнуў яму аўтаматам у грудзі.

Другі, маладзейшы, стаяў зводдаль і, наставіўшы на яго зброю, цікаўна аглядаў перабежчыка сваімі лянівымі вачыма.

Так Пшанічны стаяў з узнятымі рукамі пад скіраванымі на яго аўтаматамі. На гоман з двароў яшчэ выбягалі немцы, падкаціла некалькі матацыклаў з каляскамі, з якіх тырчалі ручныя кулямёты. Той маладзейшы салдат і яшчэ адзін падступілі да яго, сцягнулі з плячэй рэчавы мяшок, абмацалі кішэні, бесцырымонна сарвалі з ланцужка ножык. Пшанічнаму не шкада было свайго барахла, яго прыгнятала толькі гэтая беспрычынная злосць у іх рухах і тварах, насцярожаная падазронасць да яго. Ён усё спрабаваў пераканаць то аднаго, то другога, што ён не мае дрэннага

намеру і па сваёй волі здаецца ў палон, пры гэтым крыва ўсміхаўся з незатухлым страхам у вузкіх вачах і бубніў:

— Я плен, камарад немец... сам плен, сам...

Ён аглядаў гэты дзясятак салдат з матацыкламі, спрабуючы згадаць дабрэйшага або ўгледзець афіцэра, і яго позірк сустрэўся са змрочным паглядам немца ў фуражцы і шынялі з чорным аксамітным каўняром. Адчуўшы, што ўсё пайшло не так, як ён марыў, і ад таго не могучы ўжо адолець уладарнай тужлівасці, ён кінуўся да гэтага немца-камандзіра.

— Пан афіцэр! Я ж сам, я ж плен, плен... — узмаліўся Пшанічны.

Афіцэр, аднак, не глядзеў на яго, ён нешта казаў салдатам, нацягваючы на жылістую руку рудую скураную пальчатку. Пшанічны тады зусім спалохаўся — ён адчуў упершыню, што сталася нешта непапраўна благое.

Немцы загергеталі між сабой, абыякава пазіраючы на яго, камандзір яшчэ нешта сказаў, і той, з абвіслай губой, што першы ўбачыў яго, тузануў Пшанічнага за рукаў і махнуў уздоўж дарогі. Ён зразумеў, што трэба ісці, і, азіраючыся, пайшоў, думаючы, што немец пойдзе за ім канваірам. Але салдаты засталіся на месцы і, бачачы яго нерашучасць і, відаць, жадаючы падбадзёрыць, замахалі рукамі ўздоўж пустой ранішняй вуліцы. Ён здзівіўся, што яны не хацелі суправаджаць яго, нешта жахлівае і незразумелае ўпілося ў яго душу, у балючай грымасе скрывіўся твар, і ён, раз-поразу азіраючыся, баязліва пайшоў, куды паказвалі яму.

Так ён аддаліўся крокаў на сотню, немцы ўсё стаялі ззаду, адзін матацыкл, гыркнуўшы маторам, зрабіў паўкола і скіраваўся на яго. Ад благога прадчування Пшанічны ўжо траціў уладу над сабой і, не ведаючы, куды і нашто, віхлява крочыў па гразі, скрэмзанай слядамі гумавых колаў. У паваленых варотах абгароджанага парканам двара нечакана паказалася спалоханая кабета ў тоўстай хустцы з пустымі вёдрамі на каромысле. Пшанічны аж пахаладзеў нутром ад нечаканасці гэтай нядобрай у такі момант сустрэчы і ў той жа час здрыгануўся ад кароткага грому кулямётнай чаргі ззаду. Грудзі яго маланкай пранізаў пякельны боль,

і ён, падламаўшыся ў каленях, павольна асеў на гразкі дол вуліцы.

Напаследак, сутаргава хапаючы ротам паветра, Пшанічны ўчуў роспачны лямант кабеты і нема замычаў — ад болю, ад усведамлення канца і апошняй лютай нянавісці да немцаў, якія забілі яго, да тых, на пераездзе, што яшчэ заставаліся жыць, да сябе, ашуканага сабою, і да ўсяго белага свету...

14

Тая кулямётная чарга, што скончыла зацятае жыццё Пшанічнага, скаланула з паўсоннага забыцця і Фішара. Яшчэ не ўсвядоміўшы таго, што сталася, ён прахапіўся, ускочыў у акопе і зноў упаў на дно, не ўтрымаўся ад болю ў заседжаных нагах. Ужо добра развіднела, але поле і лес засцілала рэдкая кісяя туману, было ціха і золка. Ля шляху нерухома і расплывіста маячылі ў мутным небе бярозы, дарога ляжала пустая, з-за лагчыны белым бокам ледзь вырысоўвалася старажоўка. Вёскі, завалочанай туманам, адсюль не было відаць.

І тады з туманнай далечы, дзе знікала дарога, бязладны трэск матораў прарваў цішыню. У Фішара маркотна заныла ў грудзях, аслабелі рукі, насцярожаным поглядам уставіўся ён удалячынь і з тугою адчуў, што надышоў той час, калі вызначыцца ўвесь сэнс яго жыцця. Сяк-так сабраўшы рэшткі душэўнай сілы, ён тузануў затворам і ўжо не зводзіў блізарукага позірку з затуманенага пачатку дарогі, дзе павінны былі паказацца немцы. Але ці то ворагі ехалі вельмі марудна, ці зусім ужо аслаб зрок байца: ён нічога не бачыў там, а матацыклы ўсё прадаўжалі трашчаць. Некалькі гэтых хвілін перадышкі далі Фішару прыдушыць хваляванне, і чалавек зразумеў, што яму тут прыйдзецца кепска. Але ў такіх абставінах, калі ўся яго дзейнасць у гэтым полі была на віду ў старшыны, ён, сам таго не ўсведамляючы да канца, хацеў, каб старшына ўрэшце перамяніў сваю думку аб ім. Гэта было не фанабэрыяй навабранца і не жаданнем паддобрыцца да камандзіра — проста так трэба было Фішару. Відаць, за гэтую пакутную ноч роздуму немудроная старшынова мерка салдацкіх вартасцей у нейкай меры стала і для Фішара эталонам жыццёвай годнасці.

Так ён чакаў, ад напружання і ўвагі дробна ляскаючы сківаіцамі і да болю ўціскаючы ў плячо прыклад вінтоўкі. Схіліўшыся, ля мушкі далікатна трымцела на лёгкім ветры нейкая ўсохлая сцяблінка. Ад частых гарачых выдыхаў пацелі шкельцы акуляраў, але Фішар баяўся зняць, каб працерці іх. Ён вельмі дакладна адчуваў свой абавязак і ўжо набраўся рашучасці да канца выканаць яго...

Калі ўрэшце ў канцы дарогі з дымчатай завесы туману выніклі невыразныя прыземістыя сілуэты матацыклаў, Фішар упёр локці ў гразь бруствера і прыцэліўся. Але ад доўгага напружання зрок яго ўсё болей мутнеў, туман і праклятая блізарукасць не давалі як трэба разгледзець цэль. Фішар перавёў дыханне, прыклаўся яшчэ раз і тады сцяміў, што трапіць у ворагаў зусім няма шанцаў.

Тое адкрыццё было жахлівае, баец спалохаўся і зноў разгубіўся. А матацыклы тым часам, усё болей набіраючы хуткасць і штораз акрэсліваючыся ў тумане, шпарка сунуліся па гразі дарогі.

Не ведаючы, што зрабіць болей, каб як спыніць ворагаў, баец усё ж сяк-так прыцэліўся і стрэліў. Прыклад балюча штурхнуў у плячо, у твар патыхнула гаркатой пораху, а матацыклы на дарозе каціліся далей. Перажыўшы нядоўгае змярцвенне, Фішар хуценька пeразарадзіў і зноў стрэліў, пасля яшчэ і яшчэ.

Выпусціўшы абойму, ён шырока расплюшчыў вочы і ўгледзеўся. Нідзе ва ўсёй калоне не было ніякага знаку яго стрэлаў — ніхто не спыніўся, не паглядзеў у той бок, дзе сядзеў Фішар. Пярэдні матацыкл ужо шпарка набліжаўся к бярозам, і байцу трэба было ўцякаць ці стаіцца. Але тут яму з незвычайнай выразнасцю ўявіўся строгі скуласты Карпенкаў твар, і Фішар амаль наяве ўчуў яго звычайны зняважлівы вокліч: «Разява». Гэта балюча сцебанула па яго пачуццях; не ведаючы яшчэ, што ён зробіць, Фішар увапхнуў у магазін новую абойму і скіраваў вінтоўку ў бок недалёкіх бяроз.

Гэта было самае пэўнае і самае небяспечнае з усяго магчымага ў тых надзвычайных абставінах. За нядоўгі час, пакуль баец, душачы ў грудзях трапяткое сэрца, прыціскаўся да бруствера і вёў, вёў ствалом за матацыклам, ні-

воднае выразнай думкі не з’явілася ў яго галаве. Ён канчаткова страціў тады са свайго адчування і жыццё, і мастацтва, і развагі аб годнасці свае асобы — увесь свет у той час абмежаваўся для яго толькі дакорлівым позіркам злосных старшыновых вачэй і гэтым імклівым ланцужком матацыклаў.

Пярэдні матацыкл, стрымана пагойдваючыся ў калдобінах і віхляючы з боку ў бок, старанна абʼязджаў лужыны і не дужа імкліва, але ўсё шпарчэй набліжаўся. Ужо стаў відаць плячысты вадзіцель у шынялі і казыркастай шапцы, які, ні разу не варухнуўшыся, здавалася, зліўся ў адно з машынай; ніжэй, у калясцы, бачны быў другі немец — на ім высока тырчала фуражка і цямнеў чорны каўнер шыняля. Баец не думаў тады, што яго могуць расстраляць раней, чым паспее стрэліць ён сам, ён не дужа хаваўся ў акопе і ўсё вёў, вёў ствалом за тым блізкім пярэднім ворагам, пакуль ён не параўняўся з бярозамі, і тады стрэліў. Той, што сядзеў у калясцы, адразу хіснуўся на сядзенні, аберуч ухапіўся за грудзі і размашыста дзябнуў ілбом аб жалеза каляскі. Нейкім абвостраным, ненатуральным слыхам Фішар учуў у грукаце матораў той гук, і зараз жа страшэнны гром вострым болем расшчапіў яго галаву. Баец выпусціў з рук вінтоўку і, абцярушваючы рукамі мокрую зямлю, споўз на дно акопа.

Нейкі час ён яшчэ быў жывы, але ўжо не адчуваў нічога. Не бачыў баец Фішар, як кінуліся немцы да першага і адзінага забітага ім ворага, як беражна ўклалі яго, акрываўленага, у люльцы, як двое ці трое саскочылі з матацыклаў, шастаючы ў іржышчы ботамі, падбеглі да акопчыка і разрадзілі ў яго свае аўтаматы...

15

Учуўшы далёкую, знаёмую па тэмпу чаргу нямецкага кулямёта, Карпенка рвануў дзверы і зычным голасам, здольным узняць полк, закрычаў у старажоўку:

— У ружжо!!!

Глечык і Свіст, жмурачы заспаныя вочы на замурзаных, нямытых тварах, кінуліся ў дзверы. Свіст спрасонку не мог трапіць у рукаў шыняля, няспрытна распінаў яго і так выскачыў са старажоўкі, няўцямна азіраючы абшар. Аўсееў

бліснуў спалохам на раптоўна збялелым твары, хуценька скочыў у траншэю і прытуліўся ў ячэйцы. Карпенка тым часам таксама заняў сваё ўкрыцце і залязгаў затворам, заражаючы кулямёт.

Нейкі час яны ўсе чакалі, баючыся патрывожыць цішыню, але наперадзе не было нікога. Тады трывога пакрысе ўлеглася, байцы агледзеліся, пачалі меркаваць, і Карпенка, успомніўшы пра знікненне Пшанічнага, гучна і злосна вылаяўся:

— Дзе Пшанічны, д'ябальская морда? Што гэта такое?

Свіст і Аўсееў, якія ўпершыню ўчулі, што прапаў баец, здзіўлена паглядзелі на старшыну. Гэтая падзея з Пшанічным непрыемна ўразіла іх, але трэба было сачыць за дарогай, бо, чулі яны, там здарылася нешта важнейшае.

Абапіраючыся рукамі аб не дужа высокі ўскраек акопа, старшына пільна ўзіраўся ў туман і злосна думаў пра гэтага Пшанічнага, няўмеку Фішара, які маўкліва сядзеў у полі, не падаючы ніякага знаку, і пра тую невядомую падзею наперадзе, што прарвалася стрэламі. Карпенка не сумняваўся, што ў вёсцы ўжо немцы, ён толькі не ведаў, калі яны пакажуцца з туману, і баяўся, каб Фішар, заснуўшы, не трапіў у іхнія рукі. На якое там стойкае супраціўленне гэтага няўмелага байца-«вучонага» камандзір і не спадзяваўся, ён палічыў бы за лепшае, каб той проста цяпер уцёк да сваіх.

Але Фішар не бег, і яшчэ праз трохі часу на пераездзе пачулі далёкае фыркатанне матацыклаў. Карпенка зірнуў на Свіста, які, бяспечна высунуўшыся з акопа, азіраў дарогу, на Аўсеева, што нізка прыхінуўся да бруствера, і таксама ўпіўся ўдалячынь. Глечыка за рогам старажоўкі яму не было відаць, і старшына ўладарна скамандаваў:

— Увага! Да мяне не страляць! Замры!!!

Ён і сам прыпаў да прыклада свайго «дзегцяра», па-драпежнаму самкнуў над пераноссем шырокія густыя бровы і напружана сцяўся. І ў той час усе пачулі, як на пагорку затахалі рэдкія адзіночныя стрэлы і з туману выпаўзлі матацыклы.

— Нашто? Нашто? — не разумеючы, чаму не ратуецца Фішар, закрычаў старшына. — Цікай давай! Эх ты, раз-зя…

Ён не дакончыў свайго папроку, бо стрэлы ў той час сціхлі, а матацыклы шыбавалі сабе далей. Карпенка чакаў, што Фішар, можа, яшчэ выбежыць у нізінку, а пасля ён стаў думаць, што баец стоіцца, прапусціўшы немцаў, але неўзабаве грымнуў адзінокі стрэл, які, відаць, адразу і затрымаў усю матацыклетную калону. Старшына здзівіўся, зусім не ведаючы, як разумець тое, і скамянеў, збянтэжаны незвычайнай сутычкай, што разыгралася ў полі ля дзвюх закаржэлых бяроз.

Яго вывеў з гэтай недаўменнай змярцвеласці пагрозлівы вокліч Свіста:

— Ах вы, сабакі! Я ж вам зараз уляплю!

Ён ухапіўся за свой ПТР, але было яшчэ рана, і старшына крыкнуў:

— Стой! Я табе ўляплю!

Бранябойшчык нездаволена азірнуўся, але паслухаўся і, відаць, зрабіў добра. Не прайшло і хвіліны, як ля бяроз выплылі з туману два бронетранспарцёры, яны спыніліся ля пярэдняга матацыкла, нешта пастаялі і пасля цішэй, чым дагэтуль, відавочна асцерагаючыся, пачалі спускацца па дарозе ўніз. За імі рушыла чарада матацыклаў.

Ужо зусім развіднела, скрозь разарваны ветрам туман паказалася ўгары клочча невысокіх аблокаў, дзе-нідзе між іх густой завалачы сіратліва бліскалі прагалы блакіту.

Карпенка зразумеў, што *яно* пачынаецца. Транспарцёры нямала занепакоілі яго, але старшына сабраў усю немалую сілу свае натуры і толькі сцяў сківіцы. Каб ударыць пэўна і з карысцю, трэба было падпусціць іх як найбліжэй, і Карпенка вызначыў для гэтага рубеж на дарозе — масток крокаў за дзвесце ад пераезда.

— Свіст! — гукнуў ён бранябойшчыку. — Глядзі, брат, пачнеш з задняга. Чуеш?

— Будзь спок! — каротка азваўся Свіст, наводзячы на машыны доўгі ствол свайго пэтээра.

Пераезд сціх. За лініяй чыгункі ў траншэі стаілася яго чацвёра абаронцаў. Заклапочаны Карпенка ўжо не азіраў сваіх байцоў і не бачыў, як самотна зморшчыўся за рогам старажоўкі малады твар Глечыка, як засцярожліва стаіўся за бруствeрам Аўсееў, як напружыўся за нацэленым пэтээрам

Свіст. Бегучы сюды, у траншэю, баец недзе згубіў пілотку і цяпер уцяў у плечы галаву, на якой ва ўсе бакі тырчалі яго нястрыжаныя льняныя віхры.

Пярэдні транспарцёр яшчэ не дасягнуў мастка, калі з яго нечакана і глуха раздалося «бу-бу-бу-бу...», і адразу ж на чыгунцы, брустверы, на даху старажоўкі і яшчэ недзе ззаду, з імпэтнай лютасцю раскідваючы зямлю і трэскі, прагрукатала чарга разрыўных буйнакаліберных куль. Карпенка схамянуўся, калі на яго шчаку пляснула гразёю, але выціраццa ўжо не было калі. Падумаўшы, што ворагі заўважылі іх, старшына старанна прыцэліўся і даў першую доўгую чаргу.

Скрозь грукат стрэлаў ён чуў, як побач звонка стукнуў Свістаў ПТР і на брані пярэдняй машыны бліснула злая іскрынка. Транспарцёр крутнуўся ўбок, тыцнуўся пярэднімі коламі ў канаву і стаў. Старшына адпусціў пад пальцамі курок, у той час другі транспарцёр выскачыў наперад. Зноў побач, балюча аддаўшыся ў вуху, грымнуў другі стрэл Свіста, і машына, збавіўшы хуткасць, павалі спынілася. Матацыклы закруціліся на дарозе, бы растрывожаныя вадзяныя жукі, бязладна заляскаталі іх кулямёты, і кароткі імпэтны пасвіст куль зноў скрамсаў паветра над пераездам.

Карпенка хацеў крыкнуць Свісту, каб той хутчэй дабіў бранявыя машыны, але ён баяўся адарвацца ад кулямёта, каб не ўпусціць момант замяшання і не даць матацыклістам схавацца за транспарцёры. Жалезнай хваткай сцяўшы кулямёт, ён біў па іх кароткімі і доўгімі чэргамі і, здаецца, зрабіў сваю справу. Праз якую хвіліну два ці тры матацыклы ўжо кульнуліся ў канаву, адзін стаяў пасярэдзіне, пакінуты седакамі, толькі задні, спрытна завярнуўшы, паімчаў па дарозе ўгору.

Карпенка павярнуў ствол і, спяшаючыся, каб не празяваць яго, разы тры націснуў спуск. Але матацыкл усё ж узляцеў на пагорак і, мінуўшы бярозы, выскачыў з-пад агню.

Тады старшына адарваў ад пляча кулямёт і зірнуў у нізіну. Транспарцёр на дарозе ўжо гарэў, ахоплены мігатлівымі языкамі полымя, і слаў над полем касяк чорнага касмылявага дыму. Другі стаяў у канаве, задраўшы на абочыну доўгую плямістую скрынку кузава, нечым падобную на

труну, а ўздоўж канавы адзін за адным уцякалі к бярозам з паўтузіна немцаў.

Старшына зноў схапіўся за кулямёт, але дыск ужо апусцеў, і, мяняючы яго на зараджаны, камандзір азірнуўся на сваіх байцоў. Віцька Свіст таропка біў запальнымі кулямі, стараючыся падпаліць другі транспарцёр; з ажыўленым натхнёным тварам высунуўся з акопа Аўсееў, а за рогам падзёўбанай кулямі старажоўкі часта і нават неяк весела грукала і грукала вінтоўка Глечыка.

Карпенка, не тоячы сваёй радасці, закрычаў:

— Агню, агню давай! Бі, Аўсееў, ядроны корань! Палі гэтых гадаў!

І яны яшчэ білі ў нізіну, па ўцекачах на пагорку, пакуль некалькі ўцалелых ворагаў не схавалася за бярозамі. На дарозе, у канавах, ля транспарцёраў засталіся нерухомыя целы, адна падбітая машына гарэла дымным, хісткім на ветры полымем.

Тады байцы зразумелі, што адбілі першую атаку, перамаглі, і вялікая радасць ахапіла байцоў. Свіст мудрагеліста вылаяўся, агледзеўся і з зухаватым выразам на вясёлым свавольным твары падышоў да Карпенкі. Радасна і стрымана ўсміхнуўся ў сваёй ячэйцы Аўсееў, недзе за старажоўкай з відавочнай неахвотай спыніў страляніну Глечык.

— Віцька — маладзец, дай пяць, — сказаў Карпенка і моцным поціскам страсянуў руку бранябойшчыка.

А той, ззяючы радасцю на кірпатым твары, тлумачыў:

— Разумееш, думаў па заднім, а калі пярэдні даў чаргу, рашыў: не! Гад, такой траскатні нарабіў, ужо думаў галаву прадзіравіць. Ну, я яму проста ў лабаціну і звездануў.

— Халера, а мне пад самы ствол разрыўную ўсмаліў, ледзь вочы не заляпіў, — казаў Карпенка, выціраючы рукавом запэцканы твар. — Ну, цяпер уціхаміраліся.

— А я матацыкл падбіў, — уставіў Аўсееў. — Вунь, што ў канаву зваліўся. Мая работа.

Яны трошкі выхваляліся, шчасліва радуючыся першай перамозе, кожны быў поўны ўласных уражанняў, і ніхто не азірнуўся назад, дзе ля рога старажоўкі стаяў са сваёй драгункай сарамяжлівы Глечык. Невядома, як вытрымаў ён гэтае сваё першае выпрабаванне вайны, але цяпер у яго

хлапечых вачах, звернутых да таварышаў, было сапраўднае шчырае захапленне.

Старшына Карпенка, аднак, не доўга радаваўся, хутка ён успомніў Фішара, які нечакана стойка загінуў ля старых бяроз.

— Глядзі ты, а вучоны наш як выстаяў. Не збаяўся, — сказаў старшына і нахмурыўся.

Свіст і Аўсееў паглядзелі туды, дзе ледзьве прыкметнай плямкай выдзяляўся ў іржышчы акопчык Фішара. Яны не сказалі нічога, толькі кароценькая самота варухнулася ў іхніх вачах.

— А я на яго наракаў, — разважна казаў Карпенка. — А ён маладзец, глядзі ты.

Аднак кароткае захапленне-радасць хутка мінулася, людзі аддаліся новым развагам-клопатам пра сваё хуткае будучае. Старшына ведаў, што неўзабаве трэба яшчэ чакаць немцаў ды ўжо куды большае сілы, чым гэтыя, што былі, пэўна, разведкай. Ён загадаў Свісту, Аўсееву і Глечыку падрыхтавацца і сам пачаў набіваць патронамі два апусцелыя магазіны. Свіст адышоўся ў сваю ячэйку, стаў воддаль Аўсееў, а Карпенка, прысланіўшыся спіной да сцяны траншэі, шчоўкаў у дыску патронамі і думаў.

Неяк трошкі прыкра было камандзіру ад таго, што надоечы накрычаў ён на Фішара, што наогул не раз пагарджаў гэтым байцом, можа, нават зневажаў яго. Старшына ніяк не мог зразумець, як гэты інтэлігент-кніжнік наважыўся на такую самаахвярную смеласць. І Карпенка, які ўсё жыццё паважаў людзей простых, зразумелых і рашучых, як ён сам, цяпер першы раз усумніўся ў сваёй праўдзе, адчуўшы, што ёсць яшчэ нейкая невядомая яму сіла, апроч сілы мышцаў і знешняй відавочнай рашучасці.

— Але дзе ж гэты Пшанічны? Няўжо ўцёк?.. — сам у сябе запытаўся Карпенка і пакруціў галавой, падумаўшы, што і тут ён праваронію — нечага недагледзеў у чалавеку.

16

Аліку Аўсееву рыхтавацць-такі не было чаго: патронаў хапала, вінтоўка была ў спраўнасці, акоп даволі глыбокі, і баец, расшпіліўшы кручкі шыняля, узваліўся грудзьмі на бруствер і пазіраў на дарогу.

Якіх паўгадзіны назад у грымоце кароткага бою ніхто не заўважыў, што пасля першай чаргі з транспарцёра Аўсееў затуліўся галавой за бруствер і так не крануўся з месца. Баец зусім не бачыў дарогі, па якой ехалі немцы, і не страляў, толькі збочыў галаў, каб як-небудзь бачыць Карпенку. Пакуль грукацелі стрэлы, Аўсееў пакутаваў і ўсё папракаў сябе, прадчуваючы хуткую гібель, папракаў, што не знік ноччу, калі стаяў на варце, не ўцёк за лес, дзе можна было б далучыцца да якога падраздзялення і ўнікнуць недарэчнай пагібелі. Нейкім асаблівым абвостраным пачуццём ён згадваў, што Пшанічны ўцёк назаўжды, і яму было дужа крыўдна за сваю нядаўнюю нерашучасць, за якую прыйдзецца цяпер плаціць галавой. Супраць гэтай блізкай пагібелі ў ім роспачна пратэставала ўсё цела, увесь настырны Алікаў дух, кожная клетачка крычала, патрабуючы жыць.

Але мінула нямнога хвілін, а пагібелі ўсё не было, ды і асаблівага страху — таксама. Стрэлы з дарогі сціхлі, толькі грукала збоч ПТР ды тарахцеў старшыноў кулямёт, і Аўсееў асцярожна выглянуў.

Тое, што ўбачыў ён на дарозе, адразу сагнала з яго панічны настрой, зніклі пакуты, баец схапіў вінтоўку і пачаў страляць. Ён біў у немцаў, якія ўцякалі па канаве, аднойчы яму здалося, што адзін з іх упаў, забіты яго куляй. Гэта аказалася нават прыемна — змагацца і перамагаць, і хоць Аўсееў ведаў другое і даўно вызначыў свае адносіны да гэтай барацьбы, нешта ў ёй мімаволі захапіла яго. Але бой хутка скончыўся, і ён аж пашкадаваў, што гэтак мала дасталося яму зухаватай радасці.

Пасля, чым болей мінала часу, тым усё настойлівей пачалі з'яўляцца іншыя думкі — што добра зрабіў, застаўшыся тут, не паддаўшыся слабасці і страху, што цяпер і ён можа не толькі пахваліцца, але і адчуць у душы ніколі яшчэ не адчуванае і даволі прыемнае шчасце перамогі. Думкі ляцелі далей, і Алік згадваў ужо, што калі ім пашанцуе як выкарабкацца адсюль, то ўсіх іх, відаць, узнагародзяць, і тады і ў Аўсеева будзе медаль або ордэн — гэта было незвычайна зманліва і суліла нямала прыемнасцей.

Так ішоў час, а навокал усё было ціха. Недзе за парадзелымі, прадранымі да нябеснай сіні аблокамі праракаталі і

сціхлі самалёты, аднекуль данесліся па ветры глухія выбухі бомбаў. Дзень зноў пачынаўся ветраны, па-асенняму няўтульны і сцюдзёны, але цяпер нягоды надвор'я адступалі на другі план.

Свіст па-ранейшаму не мог зладзіць са сваім ажыўленнем. Нікольki не асцерагаючыся, ён вылез з гразкай траншэі і ў незашпіленым шынялі з настаўленым каўняром рассеўся на тыльным брустверы. Праўда, асцерагацца, можа, і не трэба было, бо дарога і поле наперадзе скрозь пуставалі. Транспарцёр яшчэ дыміў, але ўжо дагарэў, выставіўшы ветру закураны жалезны бок. Там жа стаялі пакінутыя пабітыя матацыклы, і Свіст, усё пазіраючы туды, не вытрымаў.

— Камандзір, — гукнуў ён Карпенку, які лапаткай выкідваў гразь з ячэйкі, — давай туды збегаю на хвіліну.

Карпенка выпрастаўся, паглядзеў у поле, паморшчыўся: відаць было, што ён не ўхваляе гэтай задумы, хоць і не хоча адмовіць Свісту.

— Га, камандзір? — пытаўся бранябойшчык. — Можа, з яды што прыдбаем. А то пуставата, турэцкі бог, ярына зялёная.

Карпенка яшчэ агледзеўся і нехаця дазволіў:

— Ну ідзі, толькі глядзі, каб дзе ранены не падстрэліў.

— О, мы яго хутка прыкокнем, — узрадаваўся бранябойшчык і пераскочыў траншэю. — Аўсееў, гайда са мной.

— Не, лепш ідзі сам.

— Эх ты, баягуз! — пагардліва кінуў Свіст і гукнуў Глечыку: — Пайшлі, салажонак, трафеі збіраць.

Глечык збянтэжыўся, не ведаючы, што рабіць, — хацелася паглядзець і было боязна вылазіць з траншэі на паверхню, дзе нядаўна лютавала смерць. Але адмовіцца ён усё ж не здолеў, тым больш што Свіст ужо пагардліва кінуў:

— Чаго трусіш? Пайшлі.

Тады ён узяў вінтоўку і вылез у вольны, вельмі прасторны і боязны свет. Яны перайшлі чыгунку і выправіліся па дарозе ў лагчыну.

Глечык даволі ніякавата адчуваў сябе тут, у гэтай прасторы, усё карцела адстаць ад Свіста, прыхавацца за яго спіну, думалася, што вось-вось ад тых варожых машын загрукаціць чарга і смерць-боль праніжа яго цела. Аднак

там пакуль што не бачна было нікога, і хлопец стрымліваў, перамагаў свой страх і ішоў поплеч з таварышам. Так яны перайшлі масток і набліжаліся к пабоішчу, ніхто не страляў у іх, і Глечык паспакайнеў. Свіст жа досыць рашуча, з гранатай за дзягай, на якой блішчала вялікая флоцкая спражка, падышоў да транспарцёра, што стаяў на дарозе, абышоў яго, зазірнуў у адчыненыя ззаду дзверцы. Жывога тут не відаць было нікога, воддаль на гразі ляжаў ніцма забіты немец, ля яго ў канаве другі, смярдзела палёнай гумай, смылелым рыззём і фарбай. Не бачачы небяспекі, Глечык таксама падышоў да машыны.

Зірнуўшы туды-сюды, Свіст ухапіўся за дзверцы і скочыў у нутро транспарцёра. Глечык з нарыхтаванай вінтоўкай зазірнуў следам і аж адскочыў ад страху. На чорным цыратавым сядзенні, адкінуўшы галаў і звесіўшы на дно нерухомую руку, ляжаў забіты гітлеравец. Пасля, трохі асмялеўшы, хлопец цікаўна і палахліва ўгледзеўся ў яго бяскроўны белабрысы твар, ён хацеў убачыць у ім які выраз, якую рысу — разгадку той ваяўнічай сквапнасці, што несла ў Расію шматмільённая армія гэтых чужынцаў. Але твар немца быў звычайны, хударлявы, парадкам няголены, і ні следу болю, ні чаго іншага з былога пачуцця ўжо не было ў ім. Свіст жа, безуважны да забітага, бесцырымонна пераступіў яго і, лязгаючы нейкім жалеззем, пачаў корпацца ў чэраве машыны.

— Эй, Глечык, трымай!

Ён падаў у дзверы новенькі і нічуць не абгарэлы зграбны варанёны кулямёт. Глечык узяў яго, а Свіст яшчэ пакапаўся нешта і саскочыў з бярэмкам снаражоных патронамі стужак. Іх ён таксама аддаў хлопцу, а сам падхапіў на дарозе пакінуты аўтамат, нагой перавярнуў на спіну яго забітага гаспадара і гідліва плюнуў. Глечык увесь час адчуваў сябе ніякавата і боязна. Забітыя былі зусім як жывыя: у шынялях, папружках, з круглымі бляшанкамі procівагазаў, толькі не рухаліся, але здавалася, у кожнае імгненне яны могуць ускочыць з долу і кінуцца на іх. А Свіст гэтым часам, не звяртаючы на мерцвякоў асаблівай увагі, агледзеў матацыкл, абышоў другі транспарцёр, той, што засеў у канаве, і цераз борт таксама пералез у яго кузаў.

— Халера, няма нічога, — з прыкрасцю сказаў ён адтуль. — Пагарэў увесь харч, ярына зялёная.

Глечык дык аж узрадаваўся, што яды не знайшлося (якая там яда сярод гэтай гідоты). Доўга тут расходжвацца яны не сталі і неўзабаве падаліся назад.

Хлопец валок кулямёт, цяжкі маток металічных стужак і цяпер ужо не адчуваў таго страху, з якім ішоў сюды. Гэтая экскурсія нават спадабалася Глечыку, і ён усё перажываў захапленне сваімі сябрамі, якія ўчынілі такі вялікі разгром. Цяжка было нават уявіць сабе, што тыя звычайныя, простыя людзі гэтак удала панішчылі магутную германскую тэхніку, пабілі на дарозе тых самых немцаў, якія заваявалі Еўропу і якіх ад самай граніцы не маглі спыніць нашы дывізіі. Хлопец не мог зразумець усяго, але адчуваў, што і Карпенка, і Свіст, можа, і Аўсееў са знешняй сваёй прастатой і нехлямяжасцю маюць нешта ўмелае, дужае і надзейнае. І толькі ён, Глечык, відаць, не меў у сабе ніякай вайсковай сілы і таму баяўся і пакутаваў: гэтулькі страху ў нядаўнім баі вынесла яго хлапечае сэрца. Але ён пяўся, душыў у сабе той страх, стараўся хоць чым-небудзь памагчы ў той агульнай справе, што рабілі яны. Цяпер жа, пазнаўшы першую перамогу і супакоіўшыся, ён немаведама што гатовы быў зрабіць для камандзіра Карпенкі, для смелага слаўнага Свіста, да слёз шкада было Фішара, з якім яны трохі нават пасябравалі ў апошнія дні, елі суп з аднаго кацялка. Маладая адзінокая і шчырая душа Глечыка гарнулася да іх — гэтай маленькай купкі байцоў, у якой і ён пакрысе пачынаў знаходзіць свой жыццёвы прытулак.

— От гэта ладна, — сказаў Карпенка, калі яны падышлі да траншэі. — От гэта хвалю.

Ён пераняў у Глечыка яго ношу, беражна агледзеў новенькі кулямёт, ухапіўшы вялізнай пяцярнёй, пацягнуў рукаятку.

— Трафей, — засмяяўся Свіст, скакаючы ў траншэю да камандзіра. — А гламянуць няма. Была торба галет, ды і тая абгарэла. А гэта табе, камандзір, — усё трохі лягчэйшы за твайго пудовіка-«дзегцяра».

Карпенка ўсё круціў у руках кулямёт, аглядаючы яго з усіх бакоў, паляскаў затворам, нацэліўся, ускінуўшы на

руку. Кулямёт яму падабаўся, але старшына ўсё нешта разважаў з сабой.

— А патроны? — спытаў ён Свіста. — Гэта і ўсё? Не, брат, не падыдзе. На, Аўсееў, асвойвай, а мне мой болей здатны.

Свіст, здзівіўшыся, свіснуў і крануў на віхрах пілотку.

— Ну і дарма. Я яго сам схапіў бы, ды ПТР — з двума не зладзіш.

Аўсееў без усякай радасці ўзяў кулямёт, а Свіст, запусціўшы руку ў глыбокую кішэню свайго шыняля, нешта выняў у сцятым кулаку.

— Ну, а на гэта што скажаш? Га?

Карпенка далікатна ўзяў з яго далоні круглы кішэнны гадзіннік на доўгім бліскучым ланцужку, заскарузлымі вялікімі пальцамі беражна расчыніў футляр, пакруціў галоўку. Гэта быў добры кішэнны гадзіннік з секунднай стрэлкай, выпуклымі фосфарнымі лічбамі на крэмавым цыферблаце.

— Пятнаццаць камянёў, анкерны ход — вот, брат, трафей! — хваліўся Свіст. — Хочаш, бяры. На імяніны не дам, а цяпер — калі ласка.

— Глядзі ты, ладная штуковіна: пятнаццаць камянёў, кажаш? — не то ўсур’ёз, не то з іроніяй казаў старшына. — Маладзец ты, Свіст, малайчына. Так праз год-два з цябе выйдзе выдатны марадзёр, ці не так, ярына зялёная?

— Ну, яшчэ што скажаш: марадзёр! — засмяяўся Свіст. — Не хочаш — давай сюды.

Ён працягнуў руку, але Карпенка, не зважаючы на гэта, размахнуўся з усяе свае немалое сілы і так ляпнуў гадзіннікам аб пашчэрбленую сцяну старажоўкі, што аж пасыпалася тынкоўка і з тонкім звонам разляцеліся ў бакі, пэўна, усе пятнаццаць каменьчыкаў.

— Вось і ўсё, і маўчок — справа скончана, — сказаў камандзір і адвярнуўся да свайго кулямёта ў ячэйцы.

Свіст пачухаў патыліцу, па-блазенску падміргнуў Глечыку і сапраўды не сказаў ні слова.

17

Зацікавіўшыся новаю зброяй, Глечык падышоў да Аўсеева, і яны ўдвух пачалі даследаваць гэты трафейны кулямёт. Аўсееў чамусьці зноў стаў невясёлы і маўклівы, і нельга было зразумець, што рабілася ў яго душы. Дэманстратыўна

не прыкмячаючы Глечыка, ён паставіў на бруствер трафей, здзьмухнуў пыл і расчыніў затворную каробку.

— Эмга трыццаць чатыры, апошняй мадэлі, — буркнуў ён. — У вучылішчы мы вывучалі. Хуткастрэльнасць велізарная — не раўня нашаму «дзегцяру».

Глечык уважліва глядзеў, слухаючы болей за сябе спрактыкаванага таварыша, і думаў, што той пакажа, як абыходзіцца з кулямётам.

Але Аўсееў з незразумелай варожасцю закрычаў на хлопца:

— А наогул на якога д'ябла! Ты прынёс — ты і страляй!

— Дык я ж не ўмею, — шчыра прызнаўся Глечык. — А чаму ты не хочаш?

Аўсееў памаўчаў, пашчоўкаў затворам і раптам злосна гыркнуў:

— Мне яшчэ жыць хочацца.

Глечыку ён не хацеў казаць усяго, што разумеў сам, — таго, што з кулямётам куды больш небяспечна ў баі, чымся з вінтоўкай, што ў першую чаргу б'юць кулямётчыкаў, што цяпер яму не схавацца ў траншэю, бо Карпенка запатрабуе агню і зноў Аўсееву прыйдзецца рызыкаваць галавой. Адразу чорным ценем азмрочыўся яго спачатку праяснелы настрой, зноў у голаў шыбануў жаль, што, паддаўшыся нерашучасці і стоме, праспаў такую здатную для паратунку ноч. Трывожнае пачуццё асуджанасці ўсё больш ахоплівала яго, і Аўсееў, напружыўшы ўсе сілы розуму, узяўся шукаць выйсця.

Ён прыкінуў, што калі перадаць кулямёт Глечыку і дамовіцца з ім, дык можна было б, прыкрываючыся ад старшыні рогам старажоўкі, па траншэі і канаве як-небудзь прабрацца к лесу. Думалася яму, што напалоханы ў першай сутычцы Глечык можа пагадзіцца на ўцёкі, а ён паабяцае, што затым паможа знікнуць і яму. Таму раптам перамяніўшы свае адносіны да маладога байца, Аўсееў па-сяброўску спытаў:

— Слухай, хочаш кулямёт? Страляць я цябе навучу.

— Ага, навучы, — згадзіўся Глечык і падступіў бліжэй.

Аўсееў ужо акрыяў ад першай удачы і ўзяўся тлумачыць, як зараджаць кулямёт, калі ад старажоўкі пачуўся строгі Карпенкаў голас:

— Не хітруй, Аўсееў. Тут табе не кірмаш — таргавацца. Табе загадана, ты і выконвай.

Звузіўшы на ветры злосныя вочы, Аўсееў з нянавісцю паглядзеў на старшыну і прыкусіў губу.

— Сабака, — ціха сказаў ён праз зубы. — Фельдфебель. Чорта лысага ты тут да вечара пратрымаешся. Паб'юць, як мышэй.

Глечык з раптоўнай трывогай у душы зірнуў на яго, памаўчаў, прыкідваючы сэнс благіх слоў, і не паверыў таварышу.

— Няўжо паб'юць? А мы з кулямётаў, ды пэтээр ёсць.

— З кулямётаў! — пагардліва чмыхнуў Аўсееў. — Прафан ты ў гэтых справах. Невук зялёны.

Глечык збянтэжана паціраў рукавом варанёную сталь кулямёта. Настойлівая ўпартасць Аўсеева ў благім урэшце ўстрывожыла і яго, але хлопец не хацеў верыць у тое, бо ўжо звыкся з думкай аб іх удачы, і з кепскім проста не было сіл пагадзіцца.

— Пшанічны вось змыўся, — змрочна паведаміў Аўсееў. — І, пэўна, зрабіў правільна.

— Як змыўся? — прастадушна здзівіўся Глечык, узняўшы на хлопца вялікія чысцютка-сінія вочы.

— Так. Махнуў у тыл і цяпер дзе-небудзь у абозе анучы сушыць.

Глечык паныла змоўчаў, стараючыся зразумець таямнічае знікненне Пшанічнага. Як можна было пакінуць таварышаў, узвод, уцячы ў тыл — гэтага Глечык, як ні стараўся, ніяк уявіць не мог. У галаве паўставалі неадольныя ў яго разуменні перашкоды для такога ўчынку — загад камбата, які належала выканаць, гнеў таварышаў, каторы ў такіх умовах нельга было стрываць, вечная ганьба трусасці, што разадрала б яго душу, урэшце — такія далёкія, але ўладарныя паняцці, як прысяга і абавязак перад Радзімай.

Пакуль хлопец пакутліва меркаваў, Аўсееў адступіў у траншэю і пільна пазіраў на яго. Першы план паратунку праваліўся ў самым яго пачатку, і цяпер хітры Аўсееў думаў, што прыдумаць яшчэ. Згаворвацца з Глечыкам было, відаць, марнай справай, бо хлопец ён недалёкі і цяпер трохі абстраляўся, пасмялеў і на ўцёкі, пэўна, не згодзіцца. Не адважваючыся канчаткова раскрываць яму свой намер, Аўсееў усё думаў, пакуль грымотны голас Карпенкі зноў не ўстрывожыў увесь пераезд:

— К бою!!!

Міжвольна падпарадкуючыся камандзе, Аўсееў ухапіўся за кулямёт, палахліва кінуўся на сваё месца Глечык, а старшына ўладарна і сурова распараджаўся далей:

— Свіст, на прыцэл — танкі! Аўсееў — па пяхоце. Глечык — гранаты к бою! Замры! Агонь па камандзе!

Зноў смяротная небяспека падступіла да пераезда. Удалечы добра бачнай дарогі на выездзе з вёскі, стрэхі якой ледзьве тарчалі з-за ўзгорка, паказаліся немцы. Гэта была вялікая, відаць, калона, якая марудна пасоўвалася з некалькімі танкамі ў галаве.

Над шэрым восеньскім полем, над скрыжаваннем дарог і далёкім лесам, за якім быў такі зманлівы для гэтых людзей паратунак, сумнай усмешкай бліснула нізкае сонца. Толькі на адзінае імгненне ясным прасветам слізганула яно па сырой гліне траншэі, шэрай сівізне ржышча, полымем кранула рэдкае пажоўклае лісце бяроз, і гэта яго ціхая ласка вострым болем тугі працяла людскія сэрцы. Глечык скіраваў удалячынь вінтоўку, асцярожна загнаў у патроннік патрон і ўціснуў у плячо пашкрэбаны драўляны прыклад. Ён трошкі пабялеў, зябка ўздрыгваў і, каб суняць тую дрыготкую самоту, тужэй прыціскаўся к зямлі і мацней сціскаў ложу. Карпенка высунуў наперад цяжкую сваю сківіцу, у дзясятак маршчын сцяў нізкі шырокі лоб. Аўсееў зморшчыўся, нібы ад зубнога болю, і здзічэлым позіркам лыпаў па абшарах, шукаючы, пэўна, ратунку. У гэтым пакутным напружанні раптам незвычайна і дзіўна прагучала заўзятая Свістава прымаўка:

— Эх, ярына зялёная!.. Слухай байку.

Глечык, якому за рогам старажоўкі не відзён быў гэты дзівакаваты чалавек, аднак, учуў яго і здзівіўся. Здзіўлена варухнуў бровамі заняты заклапочаны камандзір, нервозна вертануўся к суседу Аўсееў.

А Свіст, прыгарнуўшы да бока абшыты кірзай прыклад свайго пэтээра і сочачы за ворагам, казаў:

— Ось, браткі. Сядзяць у турме два басякі. Аблаялі ўрадніка, вось і сядзяць галодныя і пра жратву думаюць. Кажа адзін: «Давай, Ягор, зробім падкоп і ўцячом». — «Давай», — згаджаецца Ягор. «Пасля давай зломім замок і ўлезем у хлебную лаўку». — «Давай», — кажа Ягор. «Возьмем бохан

і ходу». — «Давай». — «Схаваемся дзе ў падваротню і па чарзе: я кусь, ты кусь...» — «Ага, — аблізваецца Ягор. — Ты кусь, і я кусь... кусь...» — «Я кусь, а ты кусь-кусь! — як зараве Піліп. — Во табе!» — і кулаком у рыла Ягору. Той і завыў: «Ты ж сам два разы кусь-кусь». І давай яны біцца. Уляцеў надзірацель, разняў і абодвух у карцэр — на адну ваду. Вось. Можна смяяцца, — жартоўна абвясціў Свіст.

Але і гэты раз ніхто не смяяўся. Карпенка не спускаў вачэй з калоны, якая ўсё расла і расла на дарозе, ужо чуваць было, як дрыжала зямля ад танкаў, як ляскацелі іх цяжкія шырокія тракі. Пяхоты, здаецца, было небагата — некалькі машын, а далей у калоне ішлі гружаныя аўтамабілі. Крыху не дасягнуўшы бяроз, якраз на самым пагорку, пяхота пасаскаквала з кузавоў і тут жа пачала разбягацца абапал дарогі ў няроўны мітуслівы ланцуг. Машыны спыніліся, і далей уніз пайшлі танкі — тры грукатлівыя сталёвыя аграмадзіны.

— Віцька! — сярод наплыўшага густога грукату ўстрывожана крыкнуў Карпенка. — Не спяшайся!

Свіст не спяшаўся. Недзе ўнутры яго маркотна заныла нядобрае прадчуванне: ведаў баец — пачнецца нялёгкае. Але гэта на адзін толькі кароценькі момант. Хлопец адразу ж перайначыў сябе на звычайны зухавата-дзелавы настрой і сачыў за ворагам. Трохі засмучала яго, што танкі ішлі ў лоб. Хоць бы адзін крутануў дзе ўбок, падставіў борт, і тады Віцька спрытна пранізаў бы яго. Але яны ішлі прама, а ля дарогі, не спраўляючыся за імі і адстаючы, разгортваўся ланцуг.

З сярэдзіны пагорка пярэдні танк, не спыняючыся, грымнуў стрэлам — над пераездам нешта фыркнула, і ззаду ў полі скалануў зямлю выбух. Другі снарад ударыў у чыгунку перад траншэяй — байцоў аглушыла, абдало пылам, зямлёй, кіслым смуродам тратылу. На лініі ўздыбілася некалькі вывернутых з насыпу шпал, задраўся ўгору сагнуты канец перабітай рэйкі.

Пагойдваючыся і пакалыхваючы гарматамі, танкі ішлі ў лагчыну, а пераезд маўчаў. Пярэдні ўжо набліжаўся да абгарэлых транспарцёраў, дасягнуў іх, сапхнуў у канаву пакінуты матацыкл і павярнуў крыху, каб абысці завернутую ўпоперак дарогі машыну. І тады без каманды Карпенкі, але вельмі ў час звонка грукнула Свістава ружжо, і танк адразу стаў. Яшчэ нічога не было відаць — ні дыму,

ні полымя, але збоку ўжо адскочыла накрыўка люка, з якога, бы тараканы са шчыліны, кінуліся на дарогу чорныя танкісты. Старшына даў першую чаргу, і пераезд азваўся беспарадачным грукатам.

Яшчэ праз хвіліну ўвесь гэты восеньскі панылы абшар напоўніўся бязладным страшэнным грымоццем. Трапіўшы пад кулямётны абстрэл, пяхота ў полі залягла і адкрыла па пераездзе агонь. Другі танк асцярожна пасоўваўся па дарозе, адпіхнуў убок транспарцёр і, прыпыніўшыся, навёў гармату.

— Лажысь!!! — галасіста крыкнуў Карпенка, і не паспеў яшчэ яго крык патануць у грукаце бою, як страшэннае сілы выбух чорнай земляной хмарай накрыў пераезд-траншэю, людзей, старажоўку.

Калі пыл здзьмула ветрам, стала відаць, што ад той дарожнай будыніны разляцеліся ў бакі кавалкі дошак, тынкоўкі, ад даху не засталося і следу, а ў тым месцы, дзе некалі была грубка, курылася вялізная варонка з мучніста-мяккай зямлёй.

Пераезд змоўк, здавалася, нікога жывога ўжо не засталося ў траншэі. Аднак у самым канцы яе мільганула зацярушаная пяском постаць Свіста — ён ухапіў ружжо і роспачна, злосна вылаяўся. Яго ўлюбёная зброя, якая не раз ужо выратоўвала людзей з бяды, недарэчна пазірала з бруствера кароткім перабітым ствалом.

— Старшына, братка! Што нарабілі, гады паўзучыя! Ах, чортавы вырадкі! — лямантаваў Свіст, без патрэбы ляпаючы затворам свае сапсаванай зброі.

І тады з акопа ўзнялася збялелая ў твары, дзіўна павольная і расслабленая постаць Карпенкі. Невідушчым позіркам змярцвелых вачэй старшына паглядзеў на дарогу, дакрануўся рукой да разбітай галавы, з якой на плечы шыняля, на бруствер і прыклад кулямёта лілася густая неўтаймаваная кроў.

— Свіст!.. Не пушчаць! — слабым, дрыготкім голасам выкрыкнуў ён і паваліўся ў траншэю.

Свіст кінуўся да яго, мінаючы Аўсеева, які, уцяўшы галаў у плечы, курчыўся ў ячэйцы. Бранябойшчык падхапіў старшыну, прыўзняў яго, той цяжка, задышліва соп, круціў галавой і асіпла прасіў:

— Танкі, танкі... Бі, не спазніся...

Ён не ведаў, што біць танкі ўжо не было чым, і Свіст яму не сказаў пра гэта. Крывавячы свае рукі, бранябойшчык пацёртым у кішэні пакетам перавязваў яго галаву са зліплымі ад крыві валасамі, услухоўваўся ў грукат бою і недарэчна супакойваў параненага:

— Нічога, нічога! Ты ляжы, ляжы...

Пасля баец ускочыў у траншэю, працяты благой думкай, што немцы ўжо побач, а іх засталося ўсяго двое. Але ў гэты час збоку ад руін старажоўкі забахалі стрэлы Глечыка, Свіст узрадаваўся і схапіў кулямёт старшыны. Немцы ў полі пакрысе перабягалі ў нізіну, а два танкі вельмі асцярожна, адзін па правым баку дарогі, другі па левым мінулі транспарцёры і набліжаліся да мастка. Кулі з іх кулямётаў seклі зямлю, чыгунку, быльнёг, верашчалі ўвысі, рыкашэцячы ад рэек. Разрывы і стрэлы поўнілі наваколле грымотным жахлівым стогнам.

Свіст быў чалавек дзеяння, не ў яго характары было разважаць і думаць нават у спакойны, здатны для гэтага час. Цяпер ён бачыў, што, прарваўшыся на пераезд, танкі падушаць іх у траншэі і, нікім не затрыманыя, пойдуць далей да лесу. Адзінае месца, дзе можна было затрымаць іх, — гэта на мастку, абапал якога ляжала гразная балацявіна. Гэтая думка ледзь не імгненна шыбанула ў яго галаву, калі пярэдні танк быў ад мастка ў якіх пяцідзесяці кроках.

Бранябойшчык кінуў кулямёт і, бегучы ў свой канец траншэі, крыкнуў усё яшчэ скурчанаму ў ячэйцы Аўсееву:

— Давай к кулямёту! Прыкрый!

Ён ухапіў у абедзве рукі дзве цяжкія супрацьтанкавыя гранаты, на локцях і каленях вылез з акопа, пераваліўся цераз бруствер, ускочыў, прыгнуўшыся, разы тры сігануў да чыгункі і кульнуўся ў выбітую снарадам варонку. Там ён агледзеўся. Танкі ўсё ішлі, б’ючы з кулямётаў, кулі коратка, люта фыркалі над самым насыпам. Ён трошкі марудзіў, цяжка дыхаў і збіраўся на апошні, рашучы скачок. Разбіваючы сырую зямлю, наўскасяк ад шпалаў к канаве прабегла чарга — вжык, вжык, вжык, — і на абочыне застаўся роўны ланцужок чорных плямак-адмецін. Свіст ускочыў і што было сілы кінуўся ўніз, пад прыкрыццё невысокага дарожнага насыпу.

Па сцягне яго ўсё ж сцебанула, баец адчуў, як пацёк да калена гарачы ліпкі струмень крыві, але боль быў невялікі, і баец не зважаў на яго. Прыгнуўшыся за насыпам, на каленях і локцях ён кінуўся да мастка, на які, замарудзіўшы ход, быццам конь, які абнюхвае трываласць апоры, ужо выходзіў пярэдні танк. Удушлівая горыч перахапіла дыханне, ад стомы ў грудзях разрывалася сэрца.

Яны сышліся якраз на мастку — ушчэнт змораны, паранены баец і гэтае грымлівае крыжастае страшыдла. Свіст, слаба размахнуўшыся, адну за адной шпурнуў пад гусеніцы абедзве свае цяжкія гранаты, але сам ні схавацца, ні адбегчы ўжо не паспеў...

18

Невядома, што здалося немцам, але, пасля таго як пярэдні іх танк, падарваны Свістам, праваліўся пад мост, уткнуўшыся гарматай у тарфяністую багну балота, яны ўзняліся са схілу пагорка і, адстрэльваючыся, пачалі адыходзіць назад. Другі танк даў задні ход і таксама папоўз угору. Страляніна паменшала, і абцярушаны зямлёй, замурзаны, спакутнелы Глечык адарваўся ад сваёй вінтоўкі.

Увесь ён аж калаціўся ад перажытага і ледзьве асільваў сябе, каб не заплакаць, не спарахнець ад пакут і мінулага жаху. Пачуццё і розум не маглі пагадзіцца, што няма ўжо і Свіста, што нерухомая яго постаць, выбухам адкінутая ў травяністую мокрую забалаць, ніколі ўжо не ўстане, не загамоніць, нават не паварухнецца. Але самае страшнае было ў пакутным бяссіллі заўжды ўладарнага, руплівага старшыны, без якога Глечык адчуў сябе зусім маленькім, слабым і разгубленым. Ён не парадаваўся нават з таго, што немцы пачалі адыходзіць. Агорнуты новай трывогай, хлопец падбег да Карпенкі.

Старшына, відаць, вельмі пакутаваў. Твар яго неяк раптоўна схуднеў, шчокі запалі, збялелі пад натапыраным шчаціннем, якое цяпер адразу пабольшала. Ён ляжаў на баку, адкінуўшы галаў, у набрынялай крывёю павязцы, уздрыгваў, скурчыўся ад болю і ціха варушыў вуснамі. Глечык, укленчыўшы побач, нагнуўся, яго спакучанае сэрца аж разрывалася ад нясцерпнага гора страты.

— Што, што? Ну што вам, таварыш старшына? Свіста няма, няма, — бы да малога, лагодна і жаласна казаў ён, прытрымліваючы знявечаную галаву камандзіра.

— Стой... Стой... — відаць, не пазнаючы байца, ціха шаптаў старшына. Яго засмяглыя вусны ледзьве ўжо варушыліся, усё большалі паўзы між словамі: — Свіст... Бі!

Глечык зразумеў, і ў яго скрывіліся вусны — ад жалю да камандзіра і сябе, да мёртвага небаракі Свіста, ад страху і роспачнай адзінокай безнадзейнасці. Не ведаючы, чым дапамагчы параненаму, ён усё папраўляў яго голаў, падклаў пад яе сваю пілотку, але старшына не ляжаў на ёй, усё кідаўся, скрыгаў зубамі, хмурыў, паводзіў бровамі, быццам назіраў бойку, і натужна патрабаваў:

— Свіст... Свіст... Раз-зява!..

— Яны ўжо адступілі, — усё сіліўся вытлумачыць Глечык. — Адышлі.

Старшына быццам учуў тое, прыціх, услухаўся, цяжка, з намаганнем узняў павекі і далёкім, незнаёмым позіркам паглядзеў на хлопца.

— Глечык! — неяк нібы супакоена і нават трошкі ўзрадавана вымавіў старшына. — Глечык, ты?

— Што вам, таварыш старшына? Можа, вады? Можа, шынель падаслаць? Свіста няма ўжо, — казаў Глечык, адразу акрыяўшы ад таго, што старшыня ачнуўся.

Гэтая нечаканая радасць узбадзёрыла хлопца, і тое, што гэты суровы, паважаны камандзір меў патрэбу цяпер у яго дапамозе, натхнёнай самаадданасцю запаліла Глечыка. Ён адчуваў, што мог бы цяпер перамагчы найцяжэйшае, перасіліў бы ўсялякі страх і гатовы быў на самае вялікае, калі б тое спатрэбілася старшыне. Але камандзір зноў заплюшчыў вочы і сцяў зубы — сказаць ужо ён, здаецца, не мог нічога.

І тады ў траншэі з'явіўся Аўсееў. Прыгнуўшыся, з вінтоўкай у руцэ, ён таропка сігануў цераз Карпенку, абсыпаўшы яго зямлёй са сцяны, і нечакана і загадкава кінуў Глечыку:

— Цякай к чортавай матары!

Усё прытрымліваючы старшынову голаў, Глечык не зразумеў і вялікімі змярцвелымі вачыма няўцямна пазіраў услед таварышу, які адразу ж знік за павароткай траншэі. І калі праз момант усё стала страшэнна ясна, Глечык амаль

фізічна адчуў, як пакутна сутыкнуліся два варожыя неўразумелыя пачуцці — прагнасць паратунку, пакуль была на тое магчымасць, і свежая яшчэ, толькі што пазнаная і гордая рашучасць стрываць. Хлопец збянтэжыўся і аж застагнаў ад гэтай нязноснай раздвоенасці. А на дне траншэі кідаўся непрытомны камандзір, яго акрываўлены, спатнелы твар пыхаў жарам і вялікаю мукай, а з вуснаў слабым шэптам сыходзіла адна толькі фраза:

— Свіст, агонь! Агонь, хутчэй агонь... ох! Нешта гарачым варам шыбанула ў галаў Глечыка, з вачэй яго, няпрошаныя і нястрымныя, пырснулі слёзы, пякучая крыўда апаліла яго шчырую душу. Ён ускочыў у траншэю, ужо не таячыся ад ворага, і ўбачыў Аўсеева, які, мільгаючы падэшвамі, шалёна адмахваючы левай рукой, з вінтоўкай у правай шпарка бег па канаве да лесу. Глечык захлябнуўся слязьмі і крыўдай і па-хлапечы звонка з неспатольнай здзічэлай роспаччу закрычаў услед:

— Стой!!! Стой!!! Што робіш, зладзюга? Стой!!!

Аўсееў на бягу азірнуўся і яшчэ хутчэй замільгаў нагамі, відаць было, не затым ён пабег, каб спыняцца. Тады Глечык дрыготкімі рукамі ўхапіў старшыноў кулямёт, перакінуў яго на тыльны бруствер і, амаль не цэлячыся, выпусціў наўздагон Аўсееву ўсё, што было ў недастрэленым дыску.

Калі ён, узрушаны і дзіка зацяты ад жаху, адняў ад прыклада замурзаную шчаку, дык убачыў далёка ў канаве шэры нерухомы бугарок шыняля, што горбіўся на спіне Аўсеева, і болей аж да самага лесу нідзе не было нікога. Знясілены Глечык гаротна апусціў рукі. Восеньскі вецер хутка сушыў яго слёзы, баец раптоўна апусцеў, сціх і, хістаючыся, невядома куды пабрыў па траншэі.

Ён хадзіў так па ёй, можа, гадзіну ці дзве. Хадзіў, сляпа натыкаючыся на сцены, на зваротку ля сваёй ячэйкі, погляд яго стаў нерухомы, і ў акругленых вялікіх вачах была пустата. Адзін раз ён наткнуўся на старшыновы ногі ў кірзавых ботах, спатыкнуўся аб іх і апусціўся да былога свайго камандзіра. Старшына ляжаў ціха, раскінуўшы ў бакі сагнутыя ў локцях рукі і трошкі ашчэрыўшы шырокія зубы. Нічога ў ім ужо не было ад былой рупнай камандзірскай строгасці, толькі цьмяна ўгадвалася ў рысах твару нейкае

запытанне, здзіўленне — можа, адбілася гэта ўчарашняя развага аб тым, каму з іх, шасцярых, суджана будзе закончыць бой. І, можа, адчуў ён або зразумеў, што побач адзін толькі Глечык, і таму спазнелым нямым здзіўленнем азначыўся гэты змярцвелы твар.

19

У полі запанавала цішыня. Вецер настойліва гнаў з неба нізкае ашмоцце хмар, шмат дзе ў вышыні блішчалі прагалы блакіту з беражкамі далёкіх белых аблокаў. Між імі зманлівай скупой радасцю праглядвала восеньскае сонца, і шырокія імклівыя цені няспынным агромністым статкам хутка-хутка плылі па зямлі.

Гэтая маўклівая сцішанасць мала-памалу пачала вяртаць да жыцця збалелага нутром Глечыка. Як ні жахліва і безнадзейна было яму заставацца ў адзіноце на месцы смерці сваіх таварышаў, але, забіўшы Аўсеева, ён адчуў, што прыйдзецца трываць да канца. І хлопец няспешна і без былой баязлівасці, безуважны ўжо да сябе, хадзіў па траншэі і ладзіў зброю. Ён перанёс старшыноў кулямёт у Свіставу ячэйку, трафейны паставіў на другім фланзе. Пасля ён туды ж перавалок стужкі, апроч таго, у Карпенкавай ячэйцы ўзяў апошнюю супрацьтанкавую гранату, развінціў, паглядзеў, ці зараджана, і паклаў на броўку траншэі.

Немцы на пагорку чамусьці маўчалі, але не знікалі і ўсё хадзілі ўдалечыні за бярозамі, нешта выглядалі. Аднойчы, збочыўшы з дарогі ля вёскі, у поле выехала некалькі машын з гарматамі ззаду.

Глечык разумеў, што яны нешта рыхтуюць, але ранейшага страху ў хлопца ўжо не было, была толькі маўклівая злараднасць ад іх шматлікіх намаганняў супраць яго, аднаго.

Так ішоў час, ужо, мабыць, настаў поўдзень. Неба ўсё праяснялася, зганяючы хмары, усё часцей і даўжэй паказвалася негарачае сонца. Вецер добра сушыў начную макрату, святлелі размяклыя груды бруствера, бралася ў падсохлыя плямы дарога, толькі Глечыкаў шынель усё быў вогкі, ушчэнт запэцканы глеем і пудовым цяжарам душыў плечы. Міжвольна горнучыся да цяпла і сонца, баец вылез

з сырой засені акопа і сеў на бруствер, звесіўшы з калень бязвольныя рукі.

Так, перажыўшы страх і дакучлівую асцярогу за сваё жыццё, маўкліва сядзеў ён на пераездзе тварам да таго поля, дзе варушыліся, ездзілі і хадзілі ворагі, рыхтуючы чарговы ўдар, і ў галаве яго мроіліся невясёлыя, цяжкія думкі.

Перш за ўсё да свядомасці дайшло адчуванне мізэрнасці і марнасці ўсіх яго колішніх пякельных крыўд. Які ён быў дурны, крыўдуючы калісьці на маці, айчыма, балюча перажываючы дробныя нягоды вайсковай службы — старшынову строгасць, нячуласць таварышаў, сцюжу і голад, страх смерці. Якое ўсё гэта было далёкае і надзіва нязначнае, дробязнае ў параўнанні з толькі што перажытай трагедыяй пагібелі тых, каму болей, чымся сабе, верыў ён і каго гэтак паважаў у жыцці. Відаць, гэтае няшчасце было яго першым пасля смерці бацькі сапраўды жахлівым няшчасцем. Хлопец невыразна адчуваў, што, перажыўшы яго, ён ужо не мог застацца ранейшым — ціхмяным, боязкім Глечыкам, нешта новае — мужнае і цвёрдае — уваходзіла ў яго характар.

Але, здаецца, выжыць яму не давядзецца. У поле з вёскі выехала яшчэ некалькі машын, якія падаліся ў аб’езд, у бок лагчыны. На пагорку, відаць, на прамую наводку ставілі, акопвалі некалькі гармат — ворагі рыхтаваліся грунтоўна і пэўна. А жыць так хацелася — хоць як-небудзь: у сцюжы, голадзе, страху, хоць у такім жудасным пекле, якім была вайна, — усё роўна хацелася жыць.

Глечык, зажмурыўшыся, усім нямытым, запэцканым слязьмі тварам паглядзеў угору на сонца — яно было яшчэ высока і свяціла, не спяшаючыся на сустрэчу з ноччу, якая так патрэбна была байцу. У той жа момант да яго слыху даляцелі дзіўныя журботныя гукі, ад якіх ён яшчэ вышэй задраў галаву і ўгледзеўся ў паднябессе. Ён заўсміхаўся і тужліва, з незразумелым, нечакана салодкім болем у душы доўга глядзеў у неба. Марудна пасоўваючыся пад аблокамі і самотна, квола курлыкаючы, ляцеў там у невядомую далеч невялікі ланцужок журавоў.

У спапялелую ад гора душу байца дыхнула замілаванай, шчаслівай мінуўшчынай яго дзяцінства, шчымлівым болем

па ўсім тым, што пражыта, пакінута і назаўжды ўжо страчана для васямнаццацігадовага юнака. Ён ледзьве ўтрымаў крыўдлівую спазму ў горле і глядзеў, глядзеў услед чародцы родных з маленства птушак, якія прынеслі ў яго пачуцці дзясяткі да болю нясцерпных адчуванняў... І калі ўжо яго зрок ледзь-ледзь нашчупваў у шэрай засмужанай высі тую рухавую рыску, з неба зляцеў на зямлю другі, роспачна-абрывісты гук, поўны трывогі, просьбы і безнадзейнага журботнага клічу:

— Курл!.. Курл!.. Курл!..

Наўздагон за зніклай чарадой, з апошніх сіл перабіраючы крыламі, не дужа высока ляцеў, быццам шкандыбаў у паветраным абшары, адсталы, падбіты журавок. Ад яго амаль чалавечай роспачы аж здрыгануўся здзіўлены Глечык, нешта суладнае сваім затоеным пакутам пачуў ён у тым жалобным голасе, і грымаса болю і жалю скрывіла яго круглявы хлапечы твар. А журавель крычаў, кідаў у ветраны прастор дарэмныя гукі трывогі, махаў і махаў аслабелымі крыламі, пяўся наперад сваёй доўгай выгінастай шыяй, але дагнаць чародку не мог.

Ад жахлівае роспачы птушкі нясцерпнай самотай захлынулася хлапечае сэрца. Глечык аберуч ухапіўся за галаву, заціяў вушы, напяўся, з усяе сілы сціснуўся, каб толькі стрываць. Так ён сядзеў доўга, зусім змярцвелы і абыякавы да ўсяго, збіты з панталыку тым нестрываным жураўліным сумам. Пасля ён адняў ад вушэй рукі і, нават не зірнуўшы ў неба, у якім даўно растала бедная птушка, усё яшчэ чуў перапоўнены горам і роспаччу тужлівы жураўліны крык.

А ў душы, прарваўшыся з памяці ад таго незвычайнага напамінку, ужо шырыліся, грымелі тугой пяшчотныя, дарагія ўспаміны з таго далёкага, што стала ўжо мінулым і такім нясцерпна замілаваным. Як жывая, паўстала ў памяці маці — маладая і прыгожая, але не такая прыветная і пяшчотная, як была заўсёды, а з гаротай на твары па ім, яе сыну. Успомнілася настаўніца Клаўдзія Якаўлеўна, якая любіла яго ў школе, несучы яму са свае шчодрай на ласку душы сарамяжную і цёплую жаночую прыхільнасць. З'явіўся перад вачыма непаседлівы Алёшка Бондар і з ім — дураслівыя іх забавы, паходы ў Селіцкую пушчу і такія

тады зманлівыя гульні ў вайну — самае праклятае з усіх ліхаў, заведзеных жыццём на зямлі. Зашчымела ў душы старое раскаянне за Людку, выдуманым каханнем да якой некалі дражнілі яго ў школе, за што ён зненавідзеў і аднойчы пакрыўдзіў гэтую дзяўчынку з задуменнымі сінімі вачыма.

Ахоплены ўладарнаю сілай успамінаў, не адразу заўважыў ён, як узняўся аднекуль суцэльны далёкі гул. Хлопец ачнуўся, калі на пагорак абапал дарогі выпаўз статак крыжастых страшыдлаў, загрукатала ўсё наваколле і да самага споду задрыжала зямля. Скочыўшы з бруствера, Глечык схапіў адзіную сваю гранату, прыціснуўся спіной да дрыготкай сцяны траншэі і чакаў. Ён разумеў, што гэта канец, і з усяе сілы זацяў у сабе нясцерпную журботу душы, у якой вялікаю прагай да жыцця ўсё біўся далёкі прызыўны жураўліны крык...

1959

Пра аповесць «Жураўліны крык»

* * *

Вось яна, вайна, — бой, смерць, паражэнне, перамога над сваёй слабасцю і ворагам — у творы Васіля Быкава «Жураўліны крык».

Шэсць чалавек пакінуты прыкрываць адступленне батальёна на пераездзе. Першыя, самыя трывожныя дні і гадзіны вайны. Адчуванне страшэннай і незразумелай катастрофы. І няве'е, што гэта праўда, што гэта можа быць. І рэальнасць — усе шасцёра бліжэй за ўсіх да той злавеснай сілы, якая сунецца з захаду і перад якой усё, гэткае, здавалася, надзейнае, незразумела адступіла і адступае. А яны асталіся — загад і абавязак, — хоць кожная жылка крычыць, патрабуе не чакаць.

Гэта пачуццё разліта ў аповесці як штосьці агульнае, што захоплівае і чытача, хоць кожны з шасцярых байцоў перажывае яго па-свойму і ўсе трымаюцца па-рознаму. Пачуццё гэта ствараецца і перадаецца і адзінокім зламаным шлагбаумам, і каламутнай шэрасцю раніцы, і золкасцю паветра, і холадам зямлі, у якую чырвонаармейцы закоп-

ваюцца... І ўсё гэта адчуваем і мы як рэальнасць, што абступае нас, забірае нашы думкі, адчуванні, наш настрой. І чытачу ўжо здаецца, што гэта ён на тым пераездзе, а побач — ледзь знаёмыя яму людзі, але цяпер самыя блізкія на ўсёй планеце, бо з імі яму сустракаць усю нямецкую армію і, магчыма, сваю смерць. І яму цяпер гэтак трэба, гэтак важна ўведаць — хто ж яны, тыя, што побач з ім, якія яны?.. Аўтар нібы і не навязвае нам свой расказ пра кожнага з шасцярых, а толькі адказвае на нашу нецярплівасць уведаць пра іх усё.

Уся аповесць і складаецца з «біяграфій» персанажаў, узятых у агульную рамку вайны, блізкага бою, чакання немінучай пагібелі. Гэта «рамка» якраз і надае значнасць усяму, што калісьці было з чалавекам і што ёсць, выяўляючы вялікае або нікчэмнае ў ім.

Адзін за адным гінуць: і хліпкі, але сумленны інтэлігент Фішар, і здаравяка і «статутнік» Карпенка, які ім пагарджаў, і бесклапотны блатняк Свіст. Забіты і тыя, што спрабавалі абхітрыць і таварышаў, і самую смерць: Аўсееў, Пшанічны.

У акопе застаецца самы малады, але страшэнна пастарэлы за адны суткі Глечык... Ды яшчэ — невідочна — чытач, які дзякуючы праўдзіваму таленту Быкава таксама паспеў перажыць увесь бой і ўсе страты, адну за адной, адчуў бязлітаснасць і тугу смерці. Але чытач можа адысці ў свой, мірны час, да сваіх спраў, клопатаў, радасцей. Пакінуўшы на тым адзінокім пераездзе з абломкам шлагбаума байца — ледзь не хлопчыка. Пакінуўшы яго паміраць замест сябе, за сябе. Бо час незваротны. Але што ён не можа (і не здолее), не павінен, не мае права — гэта забыць! Во гэтых франтавых хлапчукоў: «Скочыўшы з бруствера, Глечык схапіў адзіную сваю гранату, прыціснуўся спіной да дрыготкай сцяны траншэі і чакаў. Ён разумеў, што гэта канец, і з усяе сілы зацяў у сабе нясцерпную журботу душы, у якой вялікаю прагай да жыцця ўсё біўся далёкі прызыўны журавуліны крык...»

Алесь Адамовіч

Аповесць

Адным з асноўных жанраў эпічнай літаратуры з'яўляецца аповесць. ***Аповесць*** большая за апавяданне, сюжэт яе звычайна складаецца з некалькіх эпізодаў, якія звязаны з га-

лоўным героем і ахопліваюць значны перыяд яго жыцця. Па характары развіцця дзеяння, па сюжэце аповесць таксама больш складаная, чым апавяданне. Часцей за ўсё ў ёй расказваецца пра адзін чалавечы лёс, але ў сувязі з лёсамі іншых людзей. Прыкладам аповесці можа быць твор Янкі Брыля «Сірочы хлеб», вывучаемы ў сёмым класе, які складаецца з шэрагу эпізодаў з жыцця Даніка Мальца.

1. Што вы ведаеце з біяграфіі Васіля Быкава? Якія акалічнасці жыцця пісьменніка паслужылі або маглі паслужыць матэрыялам для стварэння аповесці «Жураўліны крык»?
2. Якія творы Васіля Быкава вы чыталі? Ці ведаеце, па якіх творах пісьменніка створаны кінафільмы?
3. Хто з герояў аповесці вам найбольш спадабаўся і чаму?
4. Выберыце аднаго (або двух для параўнання) персанажаў аповесці і пакажыце, як раскрываецца характар у паводзінах чалавека, яго адносінах да выканання загаду, да салдацкага абавязку, да таварышаў, у яго размовах, знешнім выглядзе, як усё гэта адпавядае яго папярэдняй «біяграфіі».
5. Як бы вы растлумачылі паводзіны Пшанічнага і Аўсеева ў крытычнай сітуацыі? Знайдзіце адказ на гэтае пытанне ў іх ранейшым жыцці.
6. Чаму аповесць называецца «Жураўліны крык»? Які сэнс гэтай назвы і як ён раскрываецца ў дачыненні да аднаго з герояў твора?
7. Складзіце падрабязны план аповесці, даўшы загаловак кожнаму яе раздзелу. Для назваў раздзелаў вазьміце асобныя сказы з тэксту. Напрыклад, раздзел першы можна назваць так: «Дарогу трэба перакрыць на суткі», другі раздзел — «Байцы на пераездзе рупна ўляглі ў работу» і г. д. Падрыхтуйце па гэтаму плану характарыстыку кампазіцыі твора.
8. У творы расказваецца пра адзін эпізод пачатку вайны. Чаму аўтар назваў твор аповесцю, а не апавяданнем?
9. Услед за творам змешчана выказванне пісьменніка і крытыка Алеся Адамовіча. Знайдзіце ў гэтым выказванні абзац, дзе вельмі сцісла, коратка і дакладна характарызуецца змест аповесці, сэнс усяго, што паказана ў творы.
10. Напішыце сачыненне па аповесці пад назвай «Выпрабаванне вайной», узяўшы для характарыстыкі аднаго з персанажаў аповесці або змест твора ў цэлым.

Прыёмы і сродкі паказу жыцця ў эпічным творы

Паказваючы жыццё ў эпічным творы, пісьменнікі карыстаюцца рознымі прыёмамі і сродкамі. Гэта — аповед — паведамленне пра падзеі, што адбываліся ў жыцці герояў, пра паводзіны, учынкі герояў. Пры дапамозе аповеду перадаецца развіццё дзеяння ў творы.

Сам пісьменнік, аўтар, як бы адмежаваны ад падзей у мастацкім творы, але мы разумеем, што менавіта ён усё апісвае, расказвае і паказвае ў творы са сваёй, аўтарскай, пазіцыі.

Важную ролю адыгрывае апісанне, г. зн. падрабязная перадача, пералічэнне прыкмет, асаблівасцей розных з'яў жыцця, месца дзеяння, карцін прыроды (пейзаж), знешняга выгляду герояў (партрэт), іх мовы, манеры гаварыць, розных прадметаў, рэчаў. Апісанне нярэдка пераходзіць у аўтарскую характарыстыку. Пісьменнік знаёміць нас з героем, характарызуючы яго як чалавека, паказваючы яго схільнасці, адносіны да жыцця, да іншых людзей. Але пісьменнік звычайна малюе не проста вобраз чалавека. Як правіла, гэта абагульнены вобраз, тып, характар, якому аўтар надае пэўныя якасці, рысы, аблічча. Узнікае так званы ***вобраз-характар***. Праз узаемаадносіны з іншымі вобразамі раскрывае ўнутраны свет героя, яго думкі і пачуцці. Праз пейзаж пісьменнік перадае настрой чалавека, яго перажыванні, радасныя ці журботныя, праз партрэт раскрывае рысы характару: дабрыню, лагоднасць ці суровасць.

Гэтак жа можа характарызавацца герой твора і праз апісанне рэчаў, абставін, у якіх ён жыве (успомніце «гісторыі» Фішара, Пшанічнага з аповесці Васіля Быкава «Жураўліны крык»).

Важны спосаб характарыстыкі персанажа — яго мова, манера гаварыць, выказваць свае думкі. Адзін гаворыць вельмі коратка, сцісла, другі любіць паразважаць, падзяліцца сваімі думкамі, перажываннямі. Манера гаварыць залежыць не толькі ад асабістых схільнасцей чалавека, але і ад таго, як адносяцца да яго іншыя людзі.

Пытанні і заданні да раздзела

1. Назавіце асноўныя адзнакі эпічнага роду. Адкуль бярэ пачатак гэты род літаратуры?

2. Якія віды народных, фальклорных апавядальных твораў вы ведаеце? Назавіце іх, прывядзіце прыклады.

3. Чым адрозніваецца апавяданне ад навелы, аповесць ад апавядання? Пакажыце гэта адрозненне на прыкладах твораў, змешчаных у вучэбным дапаможніку або іншых, прачытаных вамі твораў.

4. Якія прыёмы і сродкі паказу жыцця выкарыстоўваюцца ў эпічных творах? Ахарактарызуйце іх.

5. Супастаўце паняцці: эпас — проза. Паспрабуйце вызначыць (можна з дапамогай Слоўніка літаратуразнаўчых тэрмінаў), ці аднолькавае значэнне гэтых паняццяў-тэрмінаў. Калі не аднолькавае, то ў чым яны збліжаюцца і чым адрозніваюцца?

«ДЗВЮХ ПЛЫНЯЎ ВОЛЬНАЕ ЗЛІЦЦЁ»

ЛІРА-ЭПІЧНЫЯ ЖАНРЫ

Эпас знаёміць нас са знешнім светам праз падзеі, вучыць бачыць і разумець розныя чалавечыя характары ў дзеянні. Лірыка дапамагае глыбей спазнаць свет чалавечых эмоцый, зразумець перажыванні іншых людзей, разабрацца ва ўласнай душы. Вы пераканаліся, наколькі розная прырода гэтых літаратурных родаў, наколькі яны непадобныя нават па знешніх прыкметах: аб'ёме твораў, моўным афармленні, мастацкіх асаблівасцях. І разам з тым у эпічных творах часта сустракаюцца эмацыянальныя выказванні, якія перадаюць адносіны аўтара да падзей і герояў, нават вялікія аўтарскія разважанні, якія называюцца ***лірычнымі адступленнямі.*** І наадварот, у лірычных творах, напрыклад, у пейзажнай лірыцы, вы знаходзілі апісанні, уласцівыя эпасу. Існуюць таксама творы, у якіх лірычны і эпічны спосабы адлюстравання жыцця маюць аднолькава важнае значэнне. Такія творы называюць ***ліра-эпічнымі.*** Гэта — паэма, балада, прытча, байка.

Янка Купала

МАГІЛА ЛЬВА

(З народнага падання)

I

Нам продкаў кемкасць захавала
Шмат весцяў дзіўных з быўшых год,
Хоць гэтых весці ўжо нямала
Ў няпамяць кінуў сам народ.

Усё ж яшчэ штось засталося
Унукам з прадзедаў жыцця...
Няхай жа гэтыя калоссі
Мінуць скаранне небыцця!

Няхай той час, што згінуць мусіў
У беспрасветнай векаў мгле,
Для беспрыпыннай Беларусі
Хоць толькі ў песні ажыве.

Збіраць пачнем зярно к зярняці,
Былое ў думках ускрашаць,
Каб быт на новы лад пачаці
І сеўбу новую пачаць.

Пачнём дакапывацца самі
Разгадкі нашых крыўд і бед,
Што леглі цёмнымі лясамі
На нашай долі з даўных лет.

Пачнём някратаны паданні
Сачыць пад бацькаўскай страхой,
Шукаць ад рання і да рання,
А толькі хай шукае свой.

II

Над быстрым Днепрам, дзе сягоння
Стаяць Магілева муры,
Драмала пушча ў сотні гоняў,
Змагала громы і віхры.

На дрэва дрэва нагінала,
Адно к другому прыгняла,
Сукі з сукамі пасплятала
І з ветрам гутарку вяла.

Ваўкоў, дзікоў, ласёў, мядзведзяў
Была там днёўка і начлег
У летні час, і ў галаледдзе,
І ў зімавы глыбокі снег.

Людзей не знаў лес гэты хмурны,
Зайздросна сцежкі свае крыў,
Адно сваім дном Днепра бурны
З вясны да восені ўдаль плыў.

А з пушчы вырваўшысь на поле,
Шумеў і грозны слаў праклён,
Што не даваў яму лес волі —
Давіў галлём з усіх старон.

У гэтай пушчы з перадвекаў —
Што так драмала ўдоўж і ўшыр, —
Сялібу меў сабе Машэка,
Разбойнік страшны на ўвесь мір.

III

Даўней не зналі так марнеці,
Як мы марнеем з году ў год,
Асілкаў шмат было на свеце,
Быў шмат дужэйшы наш народ.

Асілкам гэтакім адроду
Машэка быў ў сваёй радні, —
Дзіцём нясці ўжо мог калоду,
Якой трох сталых — не маглі.

Але хоць сілу меў такую, —
Нікому крыўды не рабіў, —
Натуру меў ён залатую,
Як бы ягнём, патульны быў.

Чаму ён так змяніўся з часам,
Што да разбойства давяло,
І да крыві людской стаў ласым,
Сваё пакінуўшы сяло?

Ці дома хлеба меў замала,
Ці крыўду вызнаў ад каго,
Ці мо' прастору не ставала,
І ў пушчы стаў шукаць яго?

Ўсё гэта не было прычынай,
Але, як вестка падае,
Была прычынаю дзяўчына,
Машэка згінуў праз яе.

IV

У вёсцы той, дзе жыў ён змалку,
Дзе пасвіў, дзе араў, касіў,
На воку дзеўку меў, Натальку,
Аб ёй адной ён толькі сніў.

Былі з сабою адналеткі,
На прызбе рыліся ў зямлі,
На сенажаці рвалі кветкі,
Ўдагонкі разам часта йшлі.

Як толькі ён яе дагоніць,
Як пёрка, носіць на руках,
Смяецца, весела гамоніць,
Хоць там дзяўчыну мучыць страх.

Калі ўжо сталі падрастаці,
К рабоце трэ' было ісці,
Дык ці то ў полі, ці то ў хаце
Умелі той таго найсці.

Аб чым з сабой тады ўдваечку
Снавалі думкі, сеўшы ў рад, —
Пытаць аб гэтым трэба ночку
І за акном вішнёвы сад.

Жылі… Дзянькі за днямі гналі
Так ад вясны і да вясны.
Пасля і самі не спазналі,
Як палюбіліся яны.

V

Каханне — лёгкая прынада
Для сэрцаў чуткіх, маладых,
Хоць бы гняздзілася ў ім здрада,
Хоць гэта б яду быў кяліх.

Усе мы п’ём яго з дурноты,
Жывём ні явай і ні сном.
А прападзе к яму ахвота —
Тады — па часе ўжо — плюём.

На гэту вудачку кахання
Папаў Машэка, як не свой;
Ані спакою, ні прыстання
Не меў ён з гэтаю бядой.

Сябе сам кінуў у няволю
Дзявочых ласк і пустаты;
Пацех меў шмат, цярпення болей,
То весел быў, то — як струты.

Дзяўчына… ведама, дзяўчына —
Хто там згадаў, што ў ёй сядзіць;
Любіла ж, пэўна, хоць часінай, —
У лес па гэта не хадзіць.

Машэка гэтакі асілак,
Што рваў дзярэўе з каранём,
Ў руках яе стаў, як апілак:
Яго забрала храраствам.

VI

О, шмат прыгожанькіх дзяўчатаў
Старонцы нашай Бог прыдбаў!
Царэвіч ехаць мог бы ў сваты
К ёй не адной, каб толькі знаў.

Душы і сэрцайка такога,
І той бязмернай дабраты
Шукаці хіба толькі ў Бога, —
Ў другіх людзей не знойдзеш ты.

На беларускую дзяўчыну,
Калі тут праўду ёй аддаць,
Ніхто йшчэ каменем не кінуў
І не паважыцца кідаць.

Наталька ў вёсцы між сваімі
Найпрыгажэйшаю была,
Грудзямі, шчочкамі, вачыма,
Як мак, між макамі цвіла.

Павеўна, як даспелы колас,
Ішла наперад у танок,
З грудзей гарачых звонкі голас
Змяняла ў песню — як званок.

Прыхільна хлопцы аглядалі
Яе павабны гібкі стан,
Дый толькі сціха уздыхалі...
Адзін Машэка быў тут пан.

VII

Той панства меў недаўгавечна,
Канаў пацехі час святы:
Па Днепру выпала канечна
Па Украіну гнаць плыты;

Машэку йкраз чарга папала.
Спачатку слухаць не хацеў;
Быць можа, на яго бы стала,
Бо не на жарты сілу меў,

Але Наталька ўгаварыла:
«Едзь! Штось заробіш к жаніцьбе».
Ну, як тут не паслухаць мілай!
І наш Машэка, у жальбе

Па ненаглядненькай дзяўчыне,
Паплыў з плытамі ў край чужы
Таей Дняпровай гладдзю сіняй
Ад роднай прадзедаў мяжы.

Зямля сябе у зелень скрыла,
Лес цёмны з ветрам гаманіў,
Зязюля век людзям лічыла,
А сонца цешылася з ніў.

Машэка плыў, марнеў з нягоды,
Аддыху рэдка меў калі.
І думаў, каб хаця ўжо воды
Яго Дняпровы не змаглі.

VIII

Ў дарозе шчасце паручыла,
Загнаў да Кіева плыты,
Дамоў вяртаўся з новай сілай
Пабачыць родныя куты.

Натальку любую сустрэці,
Аджыць агнём яе вачэй,
Бо гэткіх вочак на ўсім свеце
Ён не сустрэў ані ў аднэй.

Спяшыць няўпынна, крок за крокам,
Мінае поле і лясы.
Зямлі сваёй жаданым вокам
Шукае, як канюх расы.

Штось каля Ўзвіжання дабраўся
Дамоў з далёкай чужыны...
О, лепш бы першай не даждаўся,
Як нарадзіўся ён, вясны!

Бядак дачуўся ад суседаў,
Што ўжо Наталькі маладой
Не засталось даўно і следу, —
Як бы Дняпровай сплыў вадой.

Сплыла і ўся яго надзея
Дажыць у радасці жыццё.
Каханне ў сэрцы гэтак сеяў,
А жаць прыйшлося пракляццё.

IX

Непадалёк, дзе жыў Машэка,
Быў двор вялікі, а ў двары
Стаялі хорамы ад векаў
Над самым Днепрам, на гары.

Абведзен быў высокім мурам
Палац, як той астрог, кругом,
Сталетні ліпы ўкруг панура
Стагналі ночаю і днём.

Баярын тамка жыў багаты,
Яшчэ лятамі малады,
Да сваявольства быў заўзяты,
Па-свойму час губляў з нуды.

Усюды броіў самазбродам,
Тварыў закон свой і свой суд
Над абнядоленым народам,
Што збыць не меў сіл сваіх пут.

Паціху толькі ў вёсках людзі
Маркотну гутарку вялі
Аб крыўдах тых, што ім на грудзі
Праз пана каменем ляглі.

О, як адзін хто праз другога
Цярпіць, то йшчэ тут паўбяды,
Але не скрыці ад нікога
Нам крыўды цэлай грамады!

X

Праз вёску са сваёй дружынай
Баярын гэты ехаў раз,
І ля Натальчынай хаціны
Ён затрымаўся на папас.

Тут хараство яму дзявоча
Упала ў вочы, бо нідзе
Яго не бачылі йшчэ вочы
Штось прыгажэй у прастаце.

Як грозны быў, дык стаў лісліва,
Пачаў к дзяўчыне падсядаць,
Пускаць туман і, як бы дзівы,
Ёй брэдні ўсякія складаць.

Што гаварылі, чым ёй кадзіў —
Не варта паўтараці тут,
Але з тых пор, як па загадзе,
Ён спадабаў вясковы кут.

Тады-сяды стаў заглядаці
Ўсё да Натальчыных акон,
Хоць і глядзелі бацька, маці
На гэта коса з першых дзён.

Пасля к сабе яе стаў клікаць,
Яна ішла за ім, як цень,
Аж пачала ўся вёска тыкаць
На дзеўку пальцамі штодзень.

XI

Людская хітрасць даніманнем
Патрапіць шмат зла натварыць,
Калі прыкінецца святляным
Святлом, што праўдаю гарыць.

Душу вам лёстачкамі выйме
І павядзе на павадку
Яе пуцінамі крывымі,
І ўжо не ўскрэснуць бедаку.

З Натолькай выйшла гэтаксама,
Сама к бядзе пайшла сваей,
Звязаўшы дружбай сябе з ямай,
Не дбала свету і людзей.

Забыла ўсе Машэкі ласкі,
Каханне шчырае яго, —
Пад чарам ворагавай казкі
Зраклася мілага свайго.

Не прачувала горкай долі,
Якую лёс людзям нашле;
Раз, як пайшла у двор, дык болей
Яе не ўбачылі ў сяле.

Сваю так сетку распускае
На мух услужлівы павук,
Пакуль не ўваліцца якая
І ўсіх не выведае мук.

XII

Мінула восень, а за ёю
Прыйшла з марозамі зіма.
Машэка жыў з сваёй сям'ёю, —
Не жыў, а блукаўся, як цьма.

Як бы не чуў дакучных кпінак,
Адданы гору і жальбе;
Ўжо ведаў, дзе найшла прыпынак
Яго Наталька для сябе.

Падчас бліжэй к двару падходзіў,
Страшэнна кляў і выгражаў,
І страх на стражу ўсю наводзіў,
Якую пан сабе дзяржаў.

Але не меў Машэка сілы
Такой, што сцены б разваліў
Туды, дзе вораг з яго мілай
Пасцель пуховую дзяліў.

Не мог на мак яму змяць косці,
Пракляцце толькі прызываў,
Ад сцен адходзіў з большай злосцю
І штосьці жудкае кнаваў.

З дня ў дзень хмурней ён станавіўся,
Расла ў ім помста, як змяя, —
І сам, як гадзіна, ў ёй віўся,
Ў жыцці не бачачы пуцця.

XIII

Што ёсць на свеце горш ад помсты,
Што знойдзеш ад яе страшней,
Каго не згоніць з сцежкі простай,
Не ўкіне ў цьму, за ноч цямней?

Душу і думы атумане,
Ачэпіць зводным павуццём
І распасцяжыць уладанне
Над целам, над усім жыццём.

Засела так яна ў Машэкі,
І суладаць з ёю не мог,
Крыві б пусціў, здаецца, рэкі,
І ў іх бы з крыўдай сваёй лёг.

Крывёй ці віннай, ці нявіннай
Насмерць упіўся бы з душой,
Другіх губіў бы і сам гінуў,
Абы цярпеў чужы і свой.

У муках страшных дачакаўся
Машэка першых дзён вясны
І з вёскай роднай папрашчаўся,
Уцёк з радзімай стараны.

У пушчу ўцёк, у ёй асеўся,
Змяніўся ўвесь, як ваўкалак,
У скуру воўчую адзеўся
І стаў на жыр выходзіць так.

XIV

Так страшным стала яго імя
На ўсю аколіцу з тых дат
Паміж сваімі і чужымі,
Як страшны імем сваім кат.

З сваёй бярлогі на дарогу
Вылазіў грозны з булавой,
Як пошасць, сеяў скрозь трывогу,
Загоны росячы крывёй.

Спачатку дань жыццём плацілі
Яму адны багатыры,
Пасля знаходзілі ў магіле
Спачын і вёсак жыхары.

Не памагалі мольбы, чары, —
Крывавы суд тварыў, караў;
Абезгалоўлены ахвяры
З сабою ў пушчы забіраў.

Дарма шукаюць яго схову
Бацькі забітых і сыны,
Адно збірае больш галоваў
Ён з непамернай той вайны.

Штодзень расце Машэка ў славу,
Расце з крывавага жніва,
Бароніць пушча яго справу,
А гімн пяе яму сава.

XV

Ці доўга йшчэ бы гаспадарыў
Ён гаспадаркаю такой,
Крывёй палошчучы папары,
Крывёй гарачаю людской,

Каб не сустрэў сярод дарогі
Адно здарэнне, як той вір,
Калі раз, выбрыўшы з бярлогі,
Йшоў з булавой сваёй на жыр[1].

Ішоў і ўбачыў, як карэта
Напроць кацілася якраз;
Машэка рады знайдзе гэтай
І не марнуе дарма час.

[1] *Ішоў на жыр* — ішоў на разбой, рабаванне.

Мінута. Ўжо стрымаў ён коні,
Як сноп, зваліўся ўжо фурман,
Ўжо булавой у дзверцы звоне,
З карэты скочыў к яму пан.

Але не ўспеў і азірнуцца,
Як на зямлі няжыў ляжыць;
Машэка доўбняй замахнуцца
Яшчэ на некага спяшыць...

І дзіва дзіў: рука самлела,
Слязамі вочы заліліс...
Наталька тут яго сядзела
І так глядзела, як каліс!

XVI

Як чалавек ні азвярэе
З якіх там колечы прычын, —
Надойдзе час і азарэе
Яго душа хоць міг адзін.

Чуццё прабудзіцца людское,
Дабро у сэрцы ажыве,
І зацвітуць красой святою
Дзіцячы думкі ў галаве.

Чуць толькі ўгледзеў у калясцы
Машэка любую сваю, —
Ў яе ўтануў даўнейшай ласцы,
Ёй пакарыўся без баю.

Бы тую пёрынку птушыну,
Ў сваю бярлогу яе нёс,
З лісточкаў мяккую пярыну
Ёй слаў і сам у радасць рос.

Быў рад сваёй так доўгай згубе,
Ў нагах з пакораю сядаў,
Як здаўна, песціў і галубіў,
І словы чулыя складаў.

А толькі бедную Натальку
Жыццё з ім цешыць не магло,
Як тую грэшную русалку —
Жывыя людзі і святло.

XVII

Спазнаўшы панскія раскошы,
Дзіцё сяла і грамады,
Не мела сіл змагчы ў пустошы
І адзіноцтва, і жуды.

Хоць на Машэку спазірала
Прыхільным поглядам падчас,
А ўсё у думках штось кнавала,
Агонь благі ў вачах не гас.

У думках думала няўпынна,
Як ёй разбойніка згубіць,
Якога не магла нявінна
Ўжо так, як некалі, любіць.

Раз, калі спаў Машэка з ёю,
Зрабіць надумала сваё —
За кроў пралітую крывёю
Яму яго забраць жыццё.

Паціху ўстала, нож агромны
Ўзяла ў яго з-пад галавы
І утапіла ў шыі соннай,
Ды той застаўся йшчэ жывы.

Яна другі раз замахнула
І трэці раз перавяла, —
Яго і жылка не дрыгнула, —
Душа ад цела адышла.

XVIII

Так страшны той разбойнік згінуў,
Што ўмеў любіць і забіваць;
На грэх пусціўся праз дзяўчыну
І мусіў праз яе сканаць.

Яна, сваё зрабіўшы дзела,
Ўжо страхам гнаная нямым,
У вёску родную ляцела
І расказала аб усім.

Прынесла добрыя ўсім весці,
Што ўжо разбойніка няма;
Яе віталі добрай чэсцю,
З усімі цешылась сама.

Вяла з сабой сяло народу,
Дзе спаў Машэка вечным сном,
Куды йшчэ ўчора усе ходы
Былі закрытыя людзём.

Сышлася вёска над Машэкай
Нядаўну бачыці гразу,
І не было там чалавека,
Каб хоць адну пусціў слязу.

Йшлі ад яго к гары вялікай,
Ахвяры дзе яго ляглі, —
Касцей знаходзілі без ліку,
Галоў без ліку там знайшлі.

XIX

Капалі ў пушчы дол глыбокі,
Дно высцілалі у кару,
І насып сыпалі высокі —
Машэку насып, як цару.

А на гары той недалёкай
Хавалі косці у зямлі
Ахвяр, што ад рукі нялёгкай
Без часу на той свет сышлі.

За днямі дні пабеглі шпарка,
Ў няпамяць шоў за годам год,
Мянялась свету гаспадарка,
Жыццё-быццё змяняў народ.

Той насып, дзе ляжаў Машэка,
У мох і дзерава аброс;
Пякла улетку яго спека,
Зімой трашчаў над ім мароз.

Машэкі імем сталі маткі
Пужаць, калышучы, дзяцей,
А кумкі, збегшысь на папрадкі,
Аб ім шаптаць адна аднэй.

Яго высокую магілу —
Дзе лес ды вецер панаваў —
Знаць, што вялікую меў сілу,
«Магілай Льва» народ назваў.

XX

Над ёю з часам дрэвы палі,
І горад вырас, як з зямлі,
Яго Магілевам назвалі,
Бо йнакш прыдумаць не маглі.

Там, дзе пушчар быў і балота, —
Муры глядзяцца у раку,
Зіяюць вежы пазалотай,
Жыццё кіпіць, як у гаршку.

Пры самым месцы, дзе хаваці
Людцы нябожчыкаў нясуць,
Гару з магілкамі відаці —
Яе Машэкавай завуць.

І ціха, ціха на гары тэй
Чарнеюць пліты і крыжы,
То летнім сонейкам сагрэты,
То ззябшы ўзімку, ў маразы.

Падчас вясной заблудзіць птушка,
Зазвоніць песенькай сваей,
Павесялее спяча душка
Ды зноў засне яшчэ мацней.

А пад гарой Дняпровы хвалі
З вясны да восені шумяць
І штось гавораць цёмнай далі,
А што? — нам, грэшным, не паняць!

1. Сцісла перакажыце сюжэт твора. Які момант у развіцці дзеяння з'яўляецца найбольш напружаным?
2. Знайдзіце звязаныя з развіццём дзеяння апісанні прыроды, якія папярэджваюць нас аб тым, што адбудзецца нешта страшнае.
3. Якім быў галоўны герой паэмы Машэка ў юнацтве? Знайдзіце ў пачатку твора эпітэты, якія найбольш выразна вызначаюць яго характар.
4. Што змяніла, зламала Машэку? Якім ён стаў? Пацвердзіце свае словы ўрыўкамі з тэксту. Як змяніліся адносіны паэта да свайго героя? Як ён цяпер называе Машэку?
5. Ці можна нейкім чынам апраўдаць тыя зверствы, якія чыніў Машэка?
6. Прачытайце словы, у якіх Янка Купала, адступаючы ад сюжэта, разважае пра страшную сілу помсты. Якое значэнне ў творы мае гэтае лірычнае адступленне, як яно характарызуе самога паэта?
7. Якой вам уяўляецца Наталька? З дапамогай якіх параўнанняў, эпітэтаў стварае аўтар яе партрэт?
8. Якія ўзнёслыя словы знайшоў паэт, каб перадаць прыгажосць і сардэчнасць беларускіх дзяўчат? Якое пачуццё аўтара заключана ў гэтых словах?
9. Як тлумачыць паэт здраду Натальκі? Асуджае ён дзяўчыну ці шкадуе?
10. Чаму Наталька забіла Машэку? Як паставіліся да яе ўчынку людзі? Якую ацэнку ён выклікае ў вас?
11. Што вы можаце сказаць пра інтанацыю твора, яго гучанне?
12. Растлумачце сэнс назвы твора. У якіх яшчэ вядомых вам фальклорных творах тлумачылася паходжанне назваў мясцін? Што збліжае паэму «Магіла льва» з легендамі?
13. З сёмага класа вы ведаеце паэму Янкі Купалы «Курган». Успомніце гэты твор і паспрабуйце вызначыць, чым ён блізкі да паэмы «Магіла льва» па настроі, адносінах да мінуўшчыны, выкарыстанні фальклорных прыёмаў і вобразаў.

ПАЭМА

Паэма (ад грэч. — тварэнне) — вялікі вершаваны, часцей сюжэтны твор, які расказвае пра важныя падзеі, апявае моцныя характары і перадае глыбокія перажыванні аўтара і яго герояў. Так, у вядомай вам паэме Янкі Купалы «Курган» праз сутыкненне гусляра і князя паказваецца лёс народнага мастацтва, яго сіла і непадкупнасць. У паэме «Магіла льва» Янка Купала таксама стварыў моцны і незвычайны характар — Машэку. Але праз яго лёс паэт асуджае жорсткасць і ўслаўляе дабро, чалавечнасць, высакародства.

Паэма часцей расказвае пра важныя гістарычныя падзеі, якія ўплываюць на лёс многіх людзей. Нярэдка ў паэме, як, напрыклад, у творы «Магіла льва», пераасэнсоўваюцца народныя легенды, паданні. Менавіта таму паэмы блізкія да вуснай народнай творчасці, у іх выкарыстоўваюцца ўласцівыя народным песням і легендам сродкі мастацкай выразнасці. Інтанацыя паэмы ўзнёслая, велічная, яна падкрэслівае значнасць тэмы.

У паэме, як вы ўжо заўважылі, спалучаюцца рысы эпасу і лірыкі. З эпічнымі творамі паэму зближае наяўнасць сюжэта, дыялогаў, вобразаў-персанажаў. З лірычнымі — павышаная эмацыянальнасць, усхваляванасць апавядання, яго вершаваная форма і традыцыйныя для лірычнага верша рытміка-інтанацыйныя сродкі (паўторы, інверсіі і інш.), мастацкія тропы (метафары, эпітэты, метаніміі і інш.).

Як і ў лірычным творы, у паэме выразна выяўляецца вобраз аўтара ці лірычнага героя, іх адносіны да падзей. У адрозненне ад верша, паэма мае больш складаную кампазіцыю (пабудову) твора.

Важнае значэнне ў паэме маюць лірычныя адступленні, якія перадаюць пачуцці і думкі герояў, а таксама разважанні аўтара. Спалучэнне ўласцівасцей эпасу і лірыкі дае магчымасць своеасабліва, узрушана і эмацыянальна, расказаць пра важныя праблемы народнага жыцця.

Аркадзь Куляшоў

МАЦІ

На бітву крывавую сына праводзіўшы з хаты,
На шчасце і ўдачу пасеяла маці зярняты.
Калі дачакаецца маці з тых зерняў усходу,
Сын прыйдзе з паходу,
Са славаю прыйдзе з паходу.

Дарэмна ўздыхала,
Чакала
І шчасця, і долі, —
Упалі зярняты
На камень шчарбаты
У полі.

Дарэмна здалёку
Паўнюткія вёдры цягала,
Той камень у спёку
Вадой і слязьмі палівала.

Да кроплі іх выпіў задымлены
Камень пякельны:
Два леты кіпелі на ім яны,
Як на патэльні.

Ля каменя ўпала
Цярплівая маці ў знямозе,
У роспачы скардзіцца стала
Знаёмай дарозе:
«Пачуй мае словы,
Улашчы свой камень суровы,
За гэта вярбою
Гатова я стаць над табою.
Твайго пешахода
Я ў засень ад спёкі б хавала,
У час непагоды
Ад бур і дажджоў засланяла;
Старымі рукамі
Твой дол падмятала б штодня я,
Улашчы свой камень,
Дарога мая палявая».

Сказала дарога ёй:
«Скардзішся, маці,
Дарма ты,
Не ўзыдуць зярняты,
Бо ўпалі на камень шчарбаты.
Не першая ты
Каля камня заходзішся з жалю,
Не раз на ім сеялі, але ні разу не жалі.
На нашыя нівы
Яго закацілі чужынцы;
Чужы і маўклівы,
Даўно ён ляжыць пры гасцінцы.
З-за Буга яго
Закацілі і кінулі ў полі,
Каб сына свайго
Не даждалася маці ніколі.
Не ўзыдуць зярняты
Ні ўвосень на ім, ні вясною,
Пакуль ён не стане зямлёю,
Закляты табою».

З дарогі ўставала
І каменю маці казала:
«Вады табе мала
І матчыных слёз табе мала,
Цяпер я крывёю
Сваёю
Цябе праклінаю:
Ты станеш зямлёю,
А каменем стану сама я».

І тройчы такою
Кляцьбою
Той камень пракляла.
Стаў камень зямлёю,
Сама ж яна каменем стала.

На камні былым пры дарозе
Ўзыходзяць зярняты.
Вяртаецца сын па дарозе
З паходу дахаты.

1. Гэты твор напісаны ў 1943 годзе і прысвечаны трагічным падзеям Вялікай Айчыннай вайны. Які паэтычны троп ужывае аўтар для характарыстыкі часу?
2. Праз якую ўмоўную сітуацыю перадае Аркадзь Куляшоў бязмежную самаахвярнасць маці? Якія эпітэты дапамагаюць стварыць вобраз жанчыны?
3. Як пераасэнсоўваецца ў творы народны выраз «акамянець з гора»? Якія яшчэ народныя выслоўі ўжываюцца ў творы?
4. Твор Аркадзя Куляшова «Маці» — гэта балада. Як і паэма, балада — ліра-эпічны жанр. Параўнайце прачытаныя вамі паэму Янкі Купалы «Магіла льва» і баладу Аркадзя Куляшова «Маці», звяртаючы ўвагу на сюжэт, вобразы-персанажы, аўтарскія адносіны да падзей, мову і аб'ём твора. З якімі фальклорнымі жанрамі пераклікаюцца гэтыя творы?
5. Звярніце ўвагу на фотаздымак манумента ў гонар маці-патрыёткі (скульптары Андрэй Заспіцкі, Іван Міско, Мікалай Рыжанкоў; архітэктар Алег Трафімчук). Ён прысвечаны Настассі Фамінічне Купрыянавай з беларускага горада Жодзіна, пяць сыноў якой аддалі жыццё за Радзіму ў час Вялікай Айчыннай вайны. Параўнайце лёс Н. Ф. Купрыянавай з лёсам гераіні балады Аркадзя Куляшова «Маці». Якія яшчэ творы пра Вялікую Айчынную вайну вы ведаеце? Якая агульная думка іх аб'ядноўвае?

***Аркадзь Куляшоў**

БАЛАДА АБ ЧАТЫРОХ ЗАЛОЖНІКАХ

Іх вядуць па жытняй сцяжынцы.
Чатырох.
Пад канвоем.
З дому.
Чатырнаццаць — старэйшай дзяўчынцы,
Тры гады хлапчуку малому.
Разам з імі ў падвал халодны
Гоняць цётку — сястру Міная,
А Мінай — гэта бацька іх родны,
Бацька родны,
Мсціўца народны.
Піша вораг аб ім у газетах,
Аб чырвонай

Брыгадзе ягонай,
Па усіх
Былых сельсаветах
Клеюць новы
Загад суровы.
Са слупоў, са сцен, аканіцаў
Пагражаюць Мінаю загадам:
Ён павінен скарыцца,
З'явіцца,
Здацца ў рукі фашысцкім уладам.
І вісіць той загад друкаваны
На Мінаевай хаце і клеці;
А не з'явіцца — расстраляны
Будуць заўтра заложнікі —
Дзеці...
У чаканні смяротнага часу
У падвале дзеці Міная.
З імі цётка іх родная разам,
Ёй таксама расстрэл пагражае.
— А чаму нас вартуюць салдаты? —
Знаць маленькаму хлопчыку трэба. —
А чаму не пускаюць з-за кратаў,
За якімі і сонца, і неба?
А ці скора нас вызваліць татка?
— Скора, — цётка гаворыць малому, —
Татка прыйдзе і ўсім нам, дзіцятка,
Волю дасць, і мы пойдзем дадому...
— А чаму не прыходзіць ён?
Сыну
Цяжка ўсё растлумачыць адразу.
— Спі, засні, — суцяшае жанчына
У чаканні смяротнага часу.
Цётка дзецям, уклаўшы малога,
Кажа праўду пра лёс іх суровы.
Не павінен ведаць нічога
Толькі меншы — сын трохгадовы.
— Вы нічога яму не кажыце, —

Навучае
Дзяцей Міная.
Сын у сне гаворыць аб жыцце,
Па якому
Пойдзе дадому.
У астрожнай
Трывожнай
Цішы
Сняцца краты меншаму сыну:
— Тут і мокрыя сцены,
І мышы…
Татка, татка… забыў нас… пакінуў.
— Спі, засні, — суцяшае кабета, —
Спі, сынок, не твая гэта справа.
Спі, наш татка не прыйдзе,
На гэта
Ён не мае бацькоўскага права.
Ноч праходзіць,
Сонца ўзыходзіць,
Заспявалі жаўранкі ў полі.
Іх выводзяць салдаты
За краты.
Хлопчык рад і сонцу, і волі.
Іх салдат
Да сцяны прыстаўляе.
Цэліць кат
У льняныя галовы,
Пачынае
З сына Міная.
Стрэл.
Упаў хлапчук трохгадовы…
Кат ізноў пісталет узнімае…
На сцяне — заложнікаў цені…

Вось і ўсё.
Перад бацькам Мінаем
Станьце, ўсе бацькі, на калені!

1. Трагічны выпадак, пра які расказвае напісаная А. Куляшовым у 1942 годзе «Балада аб чатырох заложніках», сапраўды адбыўся з сям'ёй партызанскага камандзіра бацькі Міная — Міная Піліпавіча Шмырова. Як апісаныя падзеі раскрываюць бесчалавечную сутнасць фашызму?
2. З самага пачатку ў баладзе ўзнікае вобраз жыта, потым ён паўтараецца («сын у сне гаворыць аб жыце»). Які сімвалічны сэнс мае гэты вобраз?
3. Радкі гэтага твора часта «разрываюцца» на асобныя словы, асабліва ў пачатку балады. Як вы думаеце, чаму?
4. Сюжэт гэтай балады характарызуецца выключнай напружанасцю. Якое слова абазначае яго кульмінацыю (вышэйшы момант напружання)?
5. Якія радкі найлепш выказваюць аўтарскія адносіны да падзей?

Янка Сіпакоў

КАНТРАБАНДА[1]

Беларуская балада.
XVI стагоддзе

Стаміліся белыя коні і цёмнымі сталі ад поту,
Стаміліся бомы звінець пад дугою —
Матляліся ўжо неахвотна,
Ахрыпла іх песня — яна наглыталася пылу
І ўжо задыхалася ўся,
Калі варта рыплівую брычку спыніла,
Дзе кожнае кола візгліва
жаданага дзёгцю прасіла...
— Гэй, што ты вязеш праз граніцу? —
Чужая злавалася мова:
Пыталася варта сурова,
Шукала упарта ахова,
Шукала яна кантрабанду
У брычцы, як позняя восень, парожняй, —
Не верыла,
Што праз граніцу парожнімі ездзіць можна.
— Дык што ты вязеш?

[1] *Кантраба́нда* — недазволены перавоз праз мяжу тавараў і каштоўнасцей. Тут: духоўных каштоўнасцей.

— Вы ж бачыце самі — нічога.
— А можа, схаваў што?
— Навошта? Пабойцеся Бога —
Вы бачыце ўсё, што са мною…
— Ясна адно, — галадранцы!
Ездзяць тут розныя швэнды[1], —
ахова ўжо стала злавацца. —
А можа, ты кнігі вязеш?
Бо з Прагі тут нейкі Скарына
Кнігі злаўчыўся вазіць на радзіму,
Якую чамусьці пакінуў.
— Кнігі?
Ад іх толькі зло…
Бэсцяць кнігі наш люд паспаліты[2]…
— І ты супраць кніг, падарожны?!
Які малайчына, глядзі ты!
А ведаеш, думаю я, што прыйдзе часіна такая:
Нам скажуць
Скарыну таго затрымаць,
І мы, будзь ты пэвен, яго затрымаем!
І кнігі тады мы яго
Папалім усюды ў краіне…
— Чакайце, а кнігі ж святыя, пра Бога…
Дык як жа паліць іх?..
— Павінен
Сказаць я табе, чалавеча,
Што ты — кацянятка сляпое:
Можна паліць і святое, калі нам загад ёсць на тое.
Ты знаеш, і Бога самога
Мы можам паслаць на спаленне,
Калі непрыдатным ён стане
Для нашага раптам малення…
Я веру, Скарыну таксама,
Касцёр наш падсобіць на неба —
Асудзяць яго на спаленне нашчадкі…

[1] *Швэ́нды* (іранічнае) — людзі, якія ходзяць або ездзяць без мэты.
[2] *Люд паспалі́ты* — просты народ.

— Так яму, неслуху, й трэба!
— Ну, едзь, падарожны...
Чакай, а хто там сядзіць у фурманцы?
— Гэта ж фурман мой.
— Бач, з форсам катаюцца нават такія,
як ты, — галадранцы!
Ну, едзь — не мазоль нам вачэй...

Весялей заціліжкалі бомы,
Яны адпачылі крыху —
Дзе падзелася пыльная стома!
Спяшаўся дадому Скарына (а гэта быў ён — вы пазналі?).
Коней сцябалі абое —
І «пан», і «фурман» коней гналі.
Глядзеў на «фурмана» з усмешкай Скарына —
Усё-ткі правёз кантрабанду ён з Богам!
Бо гэты «фурман» — быў найлепшы друкар,
Украдзены ў караля самога.
Ехаў Скарына Францыск друкаваць свае кнігі дома.
Цілімкалі
Весела
Бомы...

1. Гэты твор расказвае пра нашага найвыдатнейшага дзеяча культуры, пісьменніка, першадрукара, перакладчыка Бібліі на беларускую мову. Што вы яшчэ ведаеце пра Скарыну, пра яго дзейнасць за мяжой і на Радзіме? Чаму так высока ацэньваюць дзейнасць Скарыны нашчадкі? Якім паўстае Скарына з твора Янкі Сіпакова «Кантрабанда»?
2. Звярніце ўвагу на жанравыя асаблівасці балады «Кантрабанда». Пра якія падзеі (сучасныя ці з даўняй гісторыі або ўзятыя з паданняў, легенд) аўтар расказвае?
   - Які сюжэт у творы (спакойны, напружаны, драматычны)?
   - Ці ёсць у творы элемент загадкавасці, таямнічасці?
   - Якую ролю ў характарыстыцы герояў твора адыгрывае дыялог? Свае адказы на гэтыя пытанні падмацуйце прыкладамі з твора.

*Іаган Фрыдрых Шылер
(1759—1805)

Нямецкі паэт, драматург, аўтар шматлікіх вершаў, балад, драматычных твораў.

КУБАК

Балада

«Гэй, верныя рыцары, світа мая,
Хто смелы ў бездань нырне?
Залаты туды кубак кідаю я,
І Харыбда[1] яго праглыне.
Хто знойдзе мой кубак, з прадоння дастане,
Той возьме яго сабе ў карыстанне».

Сказаў так кароль і ўзышоў на абрыў,
Што над чорнай прорвай навіс,
Дзе вір шалёны шумеў і бурліў,
І кубак шпурнуў уніз.
«Хто кінецца ў мора, яшчэ раз пытаю?
Няўжо я адважных у свіце не маю?»

Прыціхлі, прымоўклі і чэлядзь і знаць:
«Няхай нас ратуе Бог!»
На дзікія хвалі з кручы глядзяць,
І ніхто з іх рашыцца не мог.
І ў трэці раз кароль запытаўся:
«Няўжо тут натоўп баязліўцаў сабраўся?»

Але ўсе маўчалі, як і раней.
І раптам знайшоўся смяльчак:
Рассунуўшы кола знямелых людзей,
Выходзіць шляхетны юнак,
Прыгожы паж наперад выходзіць,
І ахнула світа, вачэй не адводзіць.

---

[1] *Хары́бда* — у грэчаскай міфалогіі адна з пачвар, якая праглынала караблі.

Ён скінуў плашч і над прорвай стаў,
Зірнуў на бурлівую плынь:
Паток, што вір усмоктваў, глытаў,
Назад вяртаўся з глыбінь,
Разрэзваў з грукатам чорныя нетры,
І пыркі фантанам віліся ў паветры.

І плёскат, і булькат, і клёкат, і шып —
Нібы стрэўся агонь з вадой;
І хвалі, уздыбіўшы ўспенены хіб,
Імклівай плылі чарадой.
Навокал усё бушавала, дрыжала,
Быццам мора яшчэ адно мора раджала.

Нарэшце прыліў адступіў, адышоў,
Прыціх, наталіўшы гнеў,
І пашчу Харыбда ашчэрыла зноў,
Таемны разявіла зеў,
І туды, як у лейку, з гулам і свістам
Вада палілася струменем іскрыстым.

Але юнак апярэдзіў прыбой,
Надзеі на Бога усклаў,
І кінуўся ўніз са скалы крутой,
Нырнуў і ў прорве прапаў.
І агарнула прыдворных трывога,
Шкада ўсім стала хлапца маладога.

І прорва стуліла свае берагі,
Здабычы адчуўшы смак.
І шэпт пракаціўся поўны тугі:
«Бывай, адважны юнак!»
Штосьці глуха шумела, пасля перастала,
І жудасная цішыня настала.

Каб нават карону ўкінуў ён
І сказаў: «Хто яе прынясе,
Таму аддам і карону і трон», —
Адмовіліся б усе.
Харыбда скарбаў сваіх не пакажа,
Пра дзівы марскія ніхто не раскажа.

Нямала ахвяр праглынула яна,
Караблёў патрушчыла шмат,
Ні адзін чалавек з магільнага дна
Жывым не вяртаўся назад.
Тым часам прорва ізноў бушавала,
Бліжэй і бліжэй падступала навала.

І плёскат, і булькат, і клёкат, і шып —
Нібы стрэўся агонь з вадой;
І хвалі, уздыбіўшы ўспенены хіб,
Бягуць адна за адной,
Імчацца з грукатам несціханым,
І пырскі ў паветра ўзлятаюць фантанам.

І раптам бліснула нешта з вады:
То не лебедзь крыламі б’е,
Змагаецца з хвалямі паж малады.
Ён правай рукою грабе,
А ў левай кубак высока трымае,
І крык захаплення над прорвай лунае.

Ён дыхае доўга, шчаслівы стаіць,
Хоць твар і збялеў ад пакут.
Народ на героя з пашанай глядзіць:
«Ён жывы! Ён з намі! Ён тут!
З жахлівае бездані вырваўся ўдала —
Такога на свеце яшчэ не бывала».

Узрушаны двор пераможцу вітаў.
Ён укленчыў перад каралём
І кубак падаў, і кароль загадаў
Напоўніць кубак віном.
Сама каралеўна хлапца частавала,
І сэрца яго ад любві раставала.

«Жыві і красуйся, магутны ўладар! —
Прамовіў пачціва юнак. —
Жыццё на зямлі — найвялікшы дар,
Нябеснае ласкі знак,
А там — жах і цемра, схавана глыбока
Адвечная тайна ад прагнага вока.

І вір мяне пацягнуў, павалок
З нястрымнай сілай на дно,
А знізу сустрэчны імчаўся паток,
І яны зліліся ў адно.
І так мяне біла, круціла, вярцела:
Я думаў, душа адарвецца ад цела.

Але Бог не пакінуў мяне ў бядзе,
Не адвярнуў вачэй,
Заўважыў я выступ каменны ў вадзе
І ўчапіўся аберуч хутчэй.
Там і кубак вісеў на галінцы карала,
Ненажэрная прорва яго не забрала.

Пада мною была пурпуровая глыб,
Нібы шлях у пякельную мглу.
Я ўбачыў безліч дзівосных рыб
І між імі рыбу-пілу.
І зборышча гадаў агідных, мясістых
Паўзло, варушылася ў нетрах барвістых.

Саламандры, яшчары, змей вадзяны…
Пачвары звіваліся ў клуб:
То клюшні тырчалі з шурпатай спіны,
То востры высоўваўся зуб.
І ўжо да мяне падплывала акула,
Драпежніца кроў сваім носам пачула.

І стала мне жудасна, ледзь не самлеў,
Мой дух агарнуўся тугой:
Ніхто не ўратуе, я ў прорве вісеў
Сам-насам са смерцю ліхой,
Не чуючы добрага слова людскога,
Сярод страшыдлаў прадоння марскога.

І тут на мяне з багровай імглы
Накінуўся спрут-васьміног,
Прыцягвае, смокча, прэч ад скалы
Я рвануўся, трываць больш не мог,
І вір падхапіў мяне ў тое ж імгненне
І вынес наверх, Бог паслаў мне збавенне».

Падзівіўся кароль: «Дагадзіў ты нам,
Мы чулі цікавы расказ.
Кубак — твой, але ж я і персцень аддам,
У якім неацэнны алмаз,
Калі зноў у падводнае царства адважна
Нырнеш ты і ўсё агледзіш уважна».

Каралеўну спалохаў бацькаў загад:
«Калі ласка, я вельмі прашу,
Зазнаў ён і так небяспекі шмат,
Не губіце жывую душу,
Не прымушайце юнага пажа,
Няхай хто з рыцараў храбрасць пакажа».

З усмешкай кароль на абрыў узышоў,
І кубак знік пад вадой:
«Калі ўдасца табе адшукаць яго зноў,
Будзеш першым у свіце маёй,
І будзе жонкай тваёю тая,
Што гэтак шчыра табе спагадае».

І прасвятлела душа юнака,
Каханне адолела страх.
Румянцам палае ў красуні шчака,
І слёзы ў яе на вачах.
І кінуўся хлопец у вір галавою,
Каб шчасце знайсці ці пакончыць з сабою.

Прыбой наступае, бушуе, раве
І коціцца з шумам назад.
Глядзіць каралеўна: ён, можа, ўсплыве,
А сэрца гаворыць — наўрад.
І спадзяванні гаснуць паволі,
Няма юнака і не будзе ніколі.

Пераклад Юркі Гаўрука

1. Якімі вы ўяўляеце герояў балады: пажа, караля, каралеўну? На чым баку сімпатыі паэта?
2. Якія радкі балады перадаюць найбольш напружаныя моманты дзеяння?

3. Чаму кінуўся ў вір юнак-паж у першым і другім выпадку?
4. Якое ўражанне выклікае апісанне бурлівага мора аўтарам у пачатку балады і з аповеду юнака? Якія эпітэты, параўнанні, метафары дапамагаюць стварыць адпаведны настрой?
5. Ці можна параўнаць душу караля з «ненажэрнай прорвай»? Абгрунтуйце сваю думку.
6. Як вы лічыце, ці адбываліся апісаныя ў баладзе падзеі на самай справе?

БАЛАДА

Балада — невялікі сюжэтны верш гераічнага ці легендарнага зместу, у якім расказваецца пра незвычайнае здарэнне. Характэрнымі асаблівасцямі балады з'яўляюцца напружаны, з элементамі фантастыкі сюжэт, трагічная развязка. Так, пра фантастычныя, неадпаведныя рэальнаму жыццю падзеі расказваюць балады «Маці» Аркадзя Куляшова і «Кубак» Іагана Фрыдрыха Шылера. Часта балады пішуцца на аснове гістарычнага матэрыялу.

«Мы гаворым “балада” — і ажывае сівая, авеяная паданнямі даўніна, і непаўторным, сурова-гераічным голасам гаворыць з намі гісторыя. Разгортваюцца хвалюючыя старонкі народнай памяці. І шчымлівым пачуццём пранікаюцца нашы сэрцы...

У баладнага слова асаблівы лад і тон. У баладзе пануе атмасфера незвычайнага, адбываецца нешта важнае, істотнае, што мае дачыненне да ўсіх і кожнага. Тут дзіўна і вельмі натуральна спалучаюцца хваляванне аўтара, яго асабістае пачуццё з пачуццямі, перажываннямі ўсяго народа... Гэта паэтычны і трагічны, лірычны і адначасова эпічны дыялог чалавека з гісторыяй, асобы з грамадствам, паэта з народам. Гэта і ўрок мужнасці, веры, маральнай непахіснасці» *(Варлен Бечык)*.

На прыкладзе адной з прачытаных вамі балад пакажыце, чым гэты твор адрозніваецца ад лірычнага верша.

*Анатоль Вярцінскі

МЫ, МЁД І ПЧАЛА

А потым гаспадыня да стала,
да чаю мёд нам падала.
І ўсе, адчуўшы пах мядовы,
хваліць той мёд былі гатовы.
Калі ж адчулі яго смак —
хвалілі мёд і так і сяк.
Хвалілі гаспадыню чынна,
што частавала нас гасцінна,
а ўслед за ёй — гаспадара.
Хвалілі потым пчаляра.
Хвалілі луг, хвалілі кветкі,
што мёд даюць надзіва рэдкі.
Усім тут аддалі хвалу.
Забылі толькі пра... пчалу.

1. Што ці хто маецца на ўвазе пад вобразамі пчалы, гасцей?
2. Для чаго А. Вярцінскі расказаў нам гэтую гісторыю? Якой вам уяўляецца пазіцыя аўтара ў гэтым вершы?
3. Верш А. Вярцінскага «Мы, мёд і пчала» — гэта прытча, якая заключае маральнае павучанне. Што робіць гэтае павучанне больш пераканальным?
4. Які вывад вы зрабілі з расказанай гісторыі?

Кандрат Крапіва

ГАНАРЫСТЫ ПАРСЮК

Байка

Бывае, праўда вочы коле...
Раз гнаў пастух свіней у поле.
Адзін вялі́зарны Парсюк,
Які абегаў вёску ўсю,
За раніцу абшнырыў завуголле,
Цяпер такі меў выгляд важны,

Што носа не дастаць і сажнем[1] —
Вышэй за ўсіх ён сам сябе лічыў,
А што ў самога на лычы,
Не бачыў гэтага, аднак.
І вось адзін тут Падсвіна́к,
Які заўважыў бруд раней,
І кажа: — Дзядзечка, твой лыч у брудзе!
Нязграбна гэта й між свіней,
А што ж, калі заўважаць людзі?
Парсюк наставіў хіб[2], Парсюк раз'юшан:
— Цераз цябе я чырванець прымушан!
Такое мне сказаць асмеляцца нямногія,
Дык гэта ж — дэмагогія[3]! —
Парсюк наш лаецца, не даравацць клянецца:
— І месца мокрага, — крычыць, — не застанецца!
Ты мой свінячы гонар закрануў! —
І так ён Падсвіна́ка грызянуў,
Што той за сажняў пяць адскочыў.

Парсюк не надта быў ахвочы
Глядзецца праўдзе ў вочы.

1. Што ў паводзінах Парсюка выклікае смех? Чаму так раззлавала яго тактоўная заўвага Падсвінака?
2. Як праз лаянку Парсюка выяўляецца яго характар? Якая фраза гучыць асабліва недарэчна?
3. Хто маецца на ўвазе пад вобразамі Парсюка і Падсвінака?
4. Знайдзіце ў байцы крылатыя выразы, блізкія да народных прыказак і прымавак. Растлумачце іх сэнс.
5. На якія часткі дзеліцца байка? Чым яны адметныя?
6. Звярніце ўвагу на дыялог, які займае значнае месца ў байцы. Падумайце, для чаго ім карыстаецца пісьменнік.

---

[1] *Са́жань* — мера даўжыні, роўная 2,1336 метра.
[2] *Наста́віць хіб* — пагрозліва выгнуць пярэднюю частку хрыбта.
[3] *Дэмаго́гія* — пустаслоўе.

БАЙКА

Байка — кароткае вершаванае апавяданне, якое мае павучальны або выкрывальны характар. Сюжэт байкі *алегарычны*: найчасцей расказваецца пра звычкі і паводзіны жывёл, а падразумяваюцца і высмейваюцца заганы людзей. Іначай кажучы, байка, як і ***прытча*** (невялікі апавядальны твор, які ў іншасказальным выглядзе заключае маральнае павучанне), заўсёды мае пераносны, іншасказальны сэнс.

Персанажы байкі — пераважна жывёлы і птушкі. Гэтыя вобразы прыйшлі ў байку з казкі і захавалі рысы, замацаваныя за імі народнай фантазіяй.

Байка звычайна складаецца з дзвюх частак: апавядання (сюжэта) і вываду (маралі). *Мараль* часцей даецца ў канцы байкі, але можа быць і ў пачатку.

Байка — жанр сатырычны, гэта значыць, для яе ўласцівы выкрывальны смех, дасціпнае адлюстраванне адмоўных з'яў. Для стварэння сатырычнага эфекту ў байцы выкарыстоўваюцца гіпербала (перавелічэнне), іронія (затоеная, прыхаваная насмешка).

Алегорыя

Алегорыя (ад грэч. — «іншы» і «гавару») — іншасказальнае адлюстраванне прадмета ці з'явы праз вобразы, якія маюць пераносны сэнс. Алегорыя ўжываецца для таго, каб у канкрэтнай, наглядней форме данесці да чытача нейкую думку.

Іншасказальным характарам вызначаюцца многія народныя казкі, прыказкі, прымаўкі. Устойліва замацаваны алегарычны сэнс маюць у вуснай народнай творчасці вобразы раслін і жывёл: ліса ўвасабляе хітрасць, свіння — неахайнасць, пчала — працавітасць, жыта — жыццё і г. д. Абстрактнае паняцце, такім чынам, перадаецца праз канкрэтны вобраз.

Алегорыя ўжываецца ў байках і прытчах. Так, у байцы «Ганарысты Парсюк» праз вобраз Парсюка паказваецца нахабная сіла тых, хто ваюе супраць праўды пра сябе.

1. Растлумачце алегарычны сэнс адной з вядомых вам баек.
2. Чым блізкія паміж сабой алегорыя і метафара?

Вучымся выразна чытаць байку

Чытальнік расказвае байку — сюжэт пра нейкае цікавае, смешнае, недарэчнае здарэнне, якое мае павучальны сэнс. Перадаючы голасам характэрныя асаблівасці персанажаў, ён як бы бачыць іх збоку, застаючыся апавядальнікам. Пры чытанні байкі трэба імкнуцца зацікавіць, заінтрыгаваць чытачоў нібы толькі што прыдуманай гісторыяй, выкарыстоўваючы сатырычны падтэкст.

Вызначым мэту чытання байкі «Ганарысты Парсюк»: высмеяць зазнайства, самалюбства, высакамерныя адносіны да акружаючых.

«Ганарысты Парсюк» — такую яркую характарыстыку галоўнаму персанажу байкі дае яе назва, якую трэба прачытаць, падкрэсліваючы самазадаволенасць, напышлівасць героя, што выглядае вельмі недарэчна.

Раздзелім тэкст байкі на сэнсава завершаныя часткі і складзём партытуру іх чытання.

Першы радок байкі — яе мараль, якая патрабуе асабліва ўважлівага прачытання.

Бывае, ↗праўда| ↘вочы коле...\/

Лагічны націск у фразе падае на асабліва важнае па сэнсе слова «праўда». Паміж гэтым словам і наступным фразеалагізмам «вочы коле» — вялікая супярэчнасць, на якой будуецца ўвесь змест байкі. Гэтую супярэчнасць падкрэслівае лагічная паўза, а таксама павышэнне і паніжэнне тону голасу. Затым трэба зрабіць псіхалагічную паўзу, паказваючы, што вы рыхтуецеся расказаць нешта цікавае.

Наступная частка байкі — уступная, у якой расказваецца пра час дзеяння, герояў і завязку канфлікту. Лагічнымі націскамі, паўзамі, павышэннем і паніжэннем тону голасу мы вылучаем сэнсава важныя словы, якія называюць паняцці, герояў, перадаюць супастаўленне, пералічэнне.

Раз гнаў пастух| свіней у поле. ||
Адзін вялі́зарны Парсюк,
Які абегаў вёску ўсю,|
За раніцу абшнырыў завуголле,

Цяпер такі меў выгляд важны,
Што носа| не дастаць і сажнем —
Вышэй за ўсіх ён сам сябе лічыў,
А што ў самога на лычы,
Не бачыў гэтага, аднак. ‖

У наступных частках — завязка дзеяння, калі далікатны Падсвінак, нібы просячы прабачэння, асмельваецца зрабіць заўвагу; кульмінацыя, калі раз'юшаны Парсюк абараняе свой «свінячы гонар»; і развязка. Апошнія два радкі дапаўняюць мараль, вяртаючы нас да слова «праўда» — сэнсавага цэнтра байкі.

Паспрабуйце самастойна закончыць складанне партытуры чытання байкі і падрыхтуйце яе выразнае чытанне.

*Уладзімір Корбан

МУЗЫКАЛЬНАЯ КАМЕДЫЯ

Матулі неспакой: што робіцца з малым?!
Ну так і трэцца ля шафёра!
Ледзь толькі той на двор прыгоніць «ЗІМ»,
Сынок заўсёды з ім.
Старанна калупаецца ў маторы.
Пухір — а ведае і камеры і блок,
Яму вядома шрубачка любая.
Жалеззя ў свой пакойчык навалок,
Пілуе нешта, склёпвае, згібае.
«А можа, у хлопчыка да тэхнікі ўхіл?..» —
Не раз падказвалі суседзі.
Матуля ў крык: «Мой Федзя
Ды каб у бруд палез, у пыл?
Я гэтага не дапушчу ніколі!
У нас ён будзе піяністам —
Сучасным Лістам[1]!»
Вось Федзя ўжо ў музычнай школе,

[1] *Ферэнц Ліст* — вядомы венгерскі кампазітар, піяніст, дырыжор.

Развучвае дыезы ды бемолі[1],
Хоць і жадання ў яго няма.
У хлопчыка ў кішэнях гайкі,
Ён марыць аб майстэрстве пайкі…
Але дарма.
Матуля з ім змагаецца штосілы —
Выкідвае з кватэры гайкі і балты,
Дзяўбе, дзяўбе: «Музыка ты!»
І ўсё ж дабілася нарэшце, адвучыла
Ад «чорнай» працы хлапчука.
Ды захадам такім сынка
Яна таленавітым не зрабіла.
Падрос ён, шавялюру адпусціў,
— Ну як жа! — «Чыжыка» блямболіць
навучыўся!
«Я Шубертам[2], Бетховенам[3] зрабіўся!»
— Дзе трэба і не трэба ён часціў
І талентам сваім хваліўся
Направа і налева як мага.
І хто ён зараз дзякуючы маме? —
Ні богу свечка і ні чорту качарга.
А ў нас яшчэ бывае так часамі,
Я дам параду мамам усім чыста:
Не трэба перашкод малым рабіць.
Куды шаноўней слесарам выдатным быць,
Чым дрэнным піяністам.

1. У байцы Кандрата Крапівы «Ганарысты Парсюк» асноўная думка твора раскрываецца праз іншасказанне, праз сюжэт, у якім галоўнай дзейнай асобай выступае Парсюк. Чым адрозніваецца ад папярэдняй байкі твор Уладзіміра Корбана «Музыкальная камедыя»?
2. Знайдзіце ў тэксце байкі «Музыкальная камедыя» радкі, у якіх непасрэдна фармулюецца мараль байкі. Падумайце і адкажыце, ці толькі да гэтага выпадку — захапленне хлопчыка тэхнікай — можна

[1] *Дые́зы ды бемо́лі* — знакі павышэння і паніжэння гуку ў нотным пісьме.
[2] *Франц Шуберт* — аўстрыйскі кампазітар.
[3] *Людвіг ван Бетховен* — нямецкі кампазітар, дырыжор.

дастасаваць гэтую думку. Які больш шырокі, абагульнены сэнс яна мае?

3. У байцы ўжываюцца яскравыя выказванні тыпу: «Ні богу свечка ні чорту качарга». Скажыце, як яны называюцца і дзеля чаго ўжыты.
4. Ці ёсць у гэтай байцы іронія, гіпербалы?
5. Падрыхтуйцеся да выразнага чытання гэтай байкі. Прадумайце, з якой інтанацыяй трэба чытаць кожную яе частку.

Пытанні і заданні да раздзела

1. Якія рысы, уласцівыя эпічным і лірычным жанрам, аб'ядноўваюць у сабе паэмы, балады, прытчы, байкі?

2. На прыкладзе адной з прачытаных вамі паэм раскажыце пра яе жанравыя асаблівасці: тэму, ідэю, сюжэт, вобразы-персанажы, аўтарскія перажыванні і пачуцці, адлюстраваныя ў творы.

3. На прыкладзе адной з балад пакажыце, што ўласціва гэтаму літаратурнаму жанру.

4. Чым блізкія паміж сабой і чым адрозніваюцца паэма і балада?

5. Што адрознівае прытчу ад іншых ліра-эпічных твораў?

6. Што аб'ядноўвае такія літаратурныя жанры, як прытча і байка?

КАЛІ ХАРАКТАРЫ РАСКРЫВАЮЦЦА Ў ДЗЕЯННІ

ДРАМАТЫЧНЫЯ ЖАНРЫ

Асноўнай асаблівасцю драматычнага спосабу адлюстравання жыцця з'яўляецца паказ чалавека ў дзеянні, раскрыццё яго характару праз паводзіны, учынкі, выказванні. Гэтым драматычныя творы блізкія да эпічных. Але ў эпічных творах звычайна расказваецца аўтарам пра тое, што адбывалася з героямі раней, пра падзеі, якія ўжо былі, прайшлі. У драматычных — дзеянне паказваецца, яно адбываецца непасрэдна перад намі, падзеі разгортваюцца на нашых вачах. У драматычных творах адсутнічае аўтарскі аповед, апісанне, зрэдку сустракаюцца толькі тлумачэнні таго, як выглядае сцэна, ды *рэмаркі* — кароценькія заўвагі аб знешнім абліччы персанажа, яго паводзінах. Сам падзел драматычнага тэксту на часткі вельмі адметны: гэта дзея, акт, карціна, з'ява.

Драматычныя творы маюць форму *дыялога* — размовы дзвюх і больш асоб. Але не ўсякі дыялог, не ўсякая размова можа быць асновай для драматычнага твора. Дыялог часта прысутнічае і ў эпічных творах — раманах, аповесцях, апавяданнях, там, дзе героі абменьваюцца думкамі, што-небудзь паведамляюць адзін аднаму. У драматычных творах дыялог непасрэдна звязаны з дзеяннем, з *канфліктам*, што ляжыць у аснове сюжэта, ён падштурхоўвае, рухае дзеянне п'есы. Драматычныя творы часцей за ўсё сюжэтныя, заснаваныя на вострым канфлікце, барацьбе характараў.

Побач з дыялогам у драматычных творах нярэдка сустрэнем і маналог, або *рэпліку* — разгорнутае эмацыянальнае выказванне, разважанні героя, звернутыя да гледача ці чытача. Гэтым драматычныя творы збліжаюцца з лірыкай, дзе форму маналога мае амаль кожны верш.

Драматычныя творы звычайна пішуцца для пастаноўкі на сцэне. Іх змест раскрываецца пры дапамозе ігры акцёраў у адпаведным чынам аформленым спектаклі. Сувязь драматычных твораў з тэатрам абумоўлівае іх будову, *кампазіцыю*. Яны не могуць быць вельмі вялікімі па працягласці дзеяння, а гэта значыць, і па аб'ёме, не могуць мець, як у рамане, шмат сюжэтных ліній, дзейных асоб.

Першым беларускім вандроўным лялечным тэатрам была ***батлейка*** (XVI — пачатак XX ст.). Спачатку батлейка мела рэлігійны характар, але паступова батлейшчыкі пачалі ўводзіць інтэрмедыі, бытавыя сцэнкі камедыйнага характару. Падобныя лялечныя тэатры былі і ў іншых краінах: ва Украіне (XVII ст.) ён называўся вертэп, у Расіі (XVII ст.) гэта быў тэатр Пятрушкі. Аб'ядноўвала гэтыя тэатры тое, што ўсе героі спектакляў былі вясёлымі, непераможнымі абаронцамі слабых і прыгнечаных.

Самыя даўнія з драматычных жанраў — трагедыя і камедыя. Яны ўзніклі каля двух з паловай тысячагоддзяў таму, яшчэ ў Старажытнай Грэцыі, з народных прадстаўленняў, якія разыгрываліся ў час розных свят, карнавальных відовішчаў. ***Трагедыя*** мае ў сваёй аснове вельмі востры канфлікт, непрымірымую барацьбу супрацьлеглых сіл, якая заканчваецца смерцю галоўнага героя. ***Камедыя*** — наадварот, паказвае такія жыццёвыя з'явы, якія выклікаюць смех. Смех можа быць і нязлосным, лёгкім (гумар), і вельмі з'едлівым, вострым (сатыра). ***Драма*** як жанр узнікла значна пазней. Яна адрозніваецца ад камедыі і трагедыі тым, што паказвае з'явы паўсядзённага жыцця, канфлікты, нярэдка вострыя (драматычныя), але без трагічнай развязкі.

У залежнасці ад зместу, характару дзеяння вызначаюць такія віды камічных твораў, як *вадэвіль, фарс* (гл. Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў).

Янка Купала

ПАЎЛІНКА

Камедыя ў двух актах

Асобы:

С ц я п а н К р ы н і ц к і, засцянковы шляхціч, 45 г.
А л ь ж б е т а, яго жонка, 40 г.
П а ў л і н к а, дачка Крыніцкіх, 19 г.
П р а н ц і с ь П у с т а р э в і ч, сваяк Крыніцкіх, 50 г.
А г а т а, яго жонка, 43 г.
Я к і м С а р о к а, настаўнік, 25 г.
А д о л ь ф Б ы к о ў с к і, 24 г.
Г о с ц і, м у з ы к і

Рэч адбываецца да рэвалюцыі, у хаце Крыніцкіх.

АКТ ПЕРШЫ

Абшырная святліца. Направа ад публікі вокны ў сад, бліжэй да аркестра — стол; каля стала — лавы і табурэцікі, над сталом — вісячая недарагая лямпа, на сцяне — абразы. Налева — дзверы ў сенцы, бліжэй да аркестра — куфар. Напроці — сцяна і дзверы ў бакоўку (каморку); справа пры сцяне ад бакоўкі — ложак, засланы коўдрай, у галавах высока накладзена падушак; налева — у кутку — печ; на сцяне стрэльба, старасвецкі з гірамі гадзіннік і некалькі тандэтных[1] малюнкаў. Час — асенні вечар перад Пакровамі.

З'ява I

П а ў л і н к а *(адна)*

Стройная і досыць прыгожая дзяўчынка. Адзеўшыся ў недарагую крамніну, але чысценька; без хусткі — у валасах колькі грабеньчыкаў. Сядзіць на ложку і пільна шые крамны кафтанік. Як падымаецца заслона — П а ў л і н к а пяе.

Ой, пайду я лугам, лугам,
Дзе мой мілы арэ плугам;
Ой, пайду я лугам, лугам!
Ён арэ поле валамі,
А я плачу ўсё слязамі;
Ён арэ поле валамі.

Перастаўшы пець.

[1] *Тандэ́тных* — тут: недарагіх, танных.

Э-э, штось не пяецца сягоння. Неяк сэрцайка трасецца, як бы хто яго знячэўку перапужаў. А мо' гэта песня вінавата? Даліпантачкі аніяк не магу сама з сабой да ладу прыйсці. Ану, на шчасце зачну другую. Якую ж бы тут? Ага!.. *(Пяе.)*

Дый чаго ж ты, дуб зялёны,
Пахінаешся?
Дый чаго ж ты, мой міленькі,
Задумляешся?

Пеючы, падыходзіць да акна і паглядае, пасля ізноў садзіцца.

А ўсё-такі нешта нецікава на сэрцы. І чаго яму, бедненькаму, не стае? Піць і есці, дзякаваць богу, хватае, часам татка дае грошы і на сукенкі... Чаго, чаго, здаецца, тут хацець?.. Ох, ох, як жа маркотненька! Проста хоць збірай манаткі ды йдзі ўпрочкі з хаткі. Ужо вечарэе: зараз не будзе як шыць, а трэба сягоння канешне кончыць. Заўтра Пакровы... у Міхалішках кірмаш... Эх, эх, каб хаця той прыйшоў, каго так хочацца сягоння пабачыць. *(Садзіцца пры акне і пачынае зноў, шыючы, пець.)*

Ой, ляцелі гусі дый з-пад Беларусі,
Селі яны, палі на сівым Дунаі!

Селі яны, палі, ваду замуцілі
Дый нас, маладзенькіх, з сабой разлучылі.

Бадай тыя гусі марне запрапалі,
Як мы любіліся — цяпер перасталі.

(Паглядзеўшы ў акно.) Ну, ужо зусім няма як без агню шыць! Зараз трэба запаліць лямпу. Цямнее і цямнее, ночка набліжаецца, а яго як няма, так няма! А шчыра абяцаўся, шэльма, напэўна прыйсці. *(Шукае запалак і запальвае лямпу.)* І што гэты тата да яго мае. З таго часу, як даведаўся, што ён на мяне мілым вокам паглядае, усё роўна як чорная кошка між імі перабегла. Ён-то нічога, але тата — дык жыўцом бы яго з'еў. Ну, але тата сваё, Якім сваё, а я — сваё. Паглядзім, чый верх будзе: таткаў, ці мой, ці яго? *(Падумаўшы.)* Казаў, прыйдзе сягоння, каб там і ліха гарэла. «Трэба, кажа, сякую ці такую зрабіць пастанову. Мы, кажа, не дзеці — маем свой розум і можам

сабой пакіравацца. Толькі ты, кажа, Паўлінка, павінна на гэта прыстаць канешне, бо іначай, кажа, згінем, як рудыя мышы...» *(Ускочыўшы.)* Ай! нехта ідзе. Ён, ён, напэўна, ён!

З'ява II

П а ў л і н к а, Я к і м

Я к і м. Вось і я — як тут быў! Добры вечар яснепекнай панне Паўлінцы. Што, золатца маё ненаглядкае, прачакалася трохі мяне, ненавісніка? *(Глянуўшы на бакі.)* А ці нікога няма? *(Гаворачы, набліжаецца да Паўлінкі, вітаецца і хоча абняць яе.)*

П а ў л і н к а *(баронячыся)*. Ой, ой! памалу! Усе дома, усе дома. Толькі ў Якіма не ўсе дома, бо поначы ходзіць да маладых дзяўчат. Дадуць, дадуць зараз пытлю старыя. *(Тупаючы нагой.)* Пазваленне ёсць гэтак позна прыходзіць?

Я к і м *(садзячыся)*. Ёсць, ёсць, мая ты сакатушка, шчабятушка! Кажы толькі хутчэй, галубка мая бяскрылая: тата твой дома ці не? Бо ж сама ведаеш, якая ў нас з ім страшэнная любасць...

П а ў л і н к а *(садзячыся за шыццё)*. Ой, чаму ж не ведаю: як між катом і сабакам, якраз. Але, але смела будзь, як у бога пад прыпечкам. Паехалі абое на торг і, пэўна, позна вернуцца, бо маюць трохі сяго-таго да прадання і маняцца сякія-такія зрабіць пакупкі. Бачыш, заўтра мае быць трохі гасцей з кірмашу. *(Абнімае Якіма, раптам знаходзіць у кішэні кнігу.)* А гэта што? *(Чытае няўмела першыя радкі з «Песні аб Сокале» М. Горкага. Потым ён забірае ў яе кнігу і сам чытае.)*

Я к і м. Та-а-к! Значыцца, тым кшталтам, вечарынка будзе.

П а ў л і н к а. Так, так! Вечарынка быць-то будзе, але не ўсе на ёй будуць.

Я к і м. Эх, Паўлінка! Ты ўсё сваё; мне і так горка на душы, як бы хто там палын засеяў, а ты яшчэ прытычкамі сваімі соліш. Вазьму назлосць ды прыйду. Што ж яны са мною зробяць?

П а ў л і н к а. Зрабіць-то нічога не зробяць, але і ты сам нічога не зробіш; а толькі пераробіш...

Я к і м *(робячы папяросу)*. Ці ясне-панна Паўлінка пазволіць мне закурыць пры ёй?

П а ў л і н к а. Ого, скуль такая далікатнасць? Рукам каля дзяўчыны дае волю без пытання, а як папяроску закурыць, дык пазвалення просіць. Не пазваляю затое, вось і ўсё тут!

Я к і м. А я закуру.

П а ў л і н к а. А я не дам!

Кідае шыццё і хоча адабраць папяросу. Нейкі час тузаюцца, бегаюць адно за адным па хаце і няўмысля раскідаюць на ложку падушкі.

Я к і м *(бегаючы)*. Ну, ужо годзе, годзе, Паўлінка! Болей нічому без твайго пазвалення даваць волі не буду.

П а ў л і н к а. Ну, калі так, то згода!

Садзяцца. Я к і м курыць. П а ў л і н к а шые.

Я к і м *(памаўчаўшы)*. Паўлінка!

П а ў л і н к а. Га! Ці пан Якім забыўся, як я завуся?

Я к і м. Ды не! Я хацеў бы, золатца, сур'ёзна з табой пагаварыць.

П а ў л і н к а. І-і!!! Ведаю я гэтыя сур'ёзнасці. Першнаперш будзе, ці я люблю, пасля — ці вельмі моцна, а пасля — ці гатова ўсё чысценька зрабіць, што чарнабрывы Якім захоча, а там, а там... і паехала, як на непадмазаных калёсах... Ці ж не праўда?

Я к і м. Праўда то праўда, але ўсяму мусіць быць канец.

П а ў л і н к а. Ну, дык слухаем, вашэці. А вось можа і новую песеньку нам спяіцё. Адно толькі за ўмовай: або надта вясёлую-вясёлую, каб аж лявоніху захацелася ісці, або такую сумна-сумненькую, што, выслухаўшы яе, — раз, два, ды бухтыль у вір галавою! вось так!

Паказвае і чуць не валіцца; Якім падхоплівае і садзіць яе на лаве.

Я к і м. Гэта будзе ад цябе, маё ты сонейка, залежаць. Як захочаш — такая і песенька выйдзе: або вясёлая, радасная, як бы самое неба яснае, або сумная, гаротная, як асеннія хмары над гэтай зямелькай чорнай. *(Памаўчаўшы.)* Эх, эх! І дакуль жа ўсё гэта будзе цягнуцца? Дакуль, як сухавей, сушыць і мучыць нас будзе?

П а ў л і н к а *(жартаўліва)*. Толькі не нас, а мяне, трэба гаварыць. Мне дужа добра, весела і так лёганька, лёганька на сэрцы, што…

Я к і м *(з дакорам)*. Паўлінка!

П а ў л і н к а *(закрываючы губы рукой)*. Ну, ну, ужо маўчу… як нямая рыба.

Я к і м *(як бы сам да сябе)*. Калі, калі ўжо надойдзе тая часінка, што нас злучыць навекі, і мы ўжо ніколі не расстанемся? Калі? Калі?..

П а ў л і н к а. Ха-ха-ха! На святое ніколі. Вельмі ўжо татка мой заеўся на цябе з таго часу, як даведаўся, што мы з табой злюбіліся. Ну, а без таты гэты інтэрас наладзіць будзе вельмі трудна.

Я к і м. Трудна то яно трудна, але няма таго злога, каб не выйшла на добрае. Хоць бы, прымерам, мы з табой так зрабілі: выбраўшы падхадзячую часіну, калі стары будзе не ў злосці, узяліся з табой за рукі, падышлі да яго, укленчылі і сказалі: так і так, наш добры бацечка, — я люблю Паўлінку, а я люблю Якімку — вельмі-вельмі моцна, так, што і жыцця нам аднаму без аднаго нямашака, ну дык супакойце нашы сэрцайкі, дайце нам пазваленне ўзяць ды пажаніціся.

П а ў л і н к а. Э-э!!! Не туды, мой дурненькі Якімка, паехаў! Уедзеш гэтак у нерат, што ні ўзад ні ўперад. Каб гэта яшчэ толькі з мамкай, то яно сяк-так, як табе не раз я і казала, але са старым дык чыстая бяда, настаяшчае гора. Хоць ты яму кол на галаве чашы, дык нічога не выдзеўбеш. «На парог, кажа, каб і не важыўся паказвацца; мазгаўню, кажа, гаду пашчапаю!» Вось і рабі з ім, што хочаш! Каб мог, дык на першай асіне павесіў быў цябе. Ну, і дзе ж у такім разе набрацца смеласці, ісці кленчыць перад ім і прасіць пазвалення?.. Задасць такога пытлю і табе, і мне разам, што і жаніцьба ў галаву не палезе.

Я к і м. Так то яно так! Але я неяк усё яшчэ надзеі не трачу, — а ну ж адпусціцца. Быў жа такі час, што мяне любіў ды нават у бядзе то тады, то сяды памагаў.

П а ў л і н к а. Быў час, але вадою сплыў. Памагаў, пакуль не ўбачыў, што трэба і дачкою памагчы, а як да гэтага стала даходзіць, вось у ім і адазвалася шляхоцкая фанабэрыя. Другую песню цяпер пяе. Нож точыць… востра нож точыць

родны мой татка на таго, каго сам калісь любіў і каго я палюбіла... *(Устаючы, горача.)* І на векі вечныя любіць буду.

Ідзе і папраўляе падушкі, за ёй — Якім, абнімае яе і садзяцца, абняўшыся, на ложку.

Я к і м *(памаўчаўшы, ласкава)*. Паўлінка!

П а ў л і н к а *(смеючыся)*. Ізноў забыўся, як завуся?

Я к і м. А ты ізноў сваё... Слухай, міленькая: ці ты надумалася зрабіць тое, аб што я цябе надовічы прасіў і маліў? Сама ж ты, золатца, казала мне не раз і цяпер кажаш, што татка твой ні на якія просьбы не згодзіцца. Значыцца, сама добра разумееш, што іншага выхаду для нас нямашака. А гэтак, як я казаў, будзе найлепей. Ці то мы будзем першыя, або апошнія? Янка Лукашонак з сваёй Зосяй так зрабілі, Ігнась Манякоўскі з сваёй Дамінісяй, ды і шмат хто... Бацькі спачатку пазлуюць, пазлуюць трохі і адпусцяцца, — ведама, бацькаўскае сэрца. Вось мы з табой, міленькая, такім парадкам самі сабе шчасце збудуем і нічыёй ласкі прасіць не будзем. Адно, абы твая згода — і ўсё будзе добра. Я ўжо, прызнацца табе, гаварыў з папом. Ён заўтра прыязджае ў Міхалішкі імшу адпраўляць і заначуе ў ваколіцы. Ну, а мы к яму... раз, два і — гатова.

П а ў л і н к а. Думаць то я думала, але неяк страшна. Можа б было лепей, каб яшчэ трохі пачакаць, а то так скора, раптам... Хто спяшыць, той людзей смяшыць.

Я к і м. Якая ты нядобрая, Паўлінка! Ты зараз — страшна, страшна, пачакаць, пачакаць! Гэтак і ўсю сваю моладасць пачаканкамі перачакаем. А так гэта дачэснае жыццё можна добра наладзіць, так добра, абы толькі ахвота ў нас была ды вытрываласць.

П а ў л і н к а. А што калі зловяць? Гэта ж я не выжыву з сораму, людзі вочы выберуць, нельга будзе на свет паказацца. Цяпер і то колькі ўсякай брыды ўслужлівыя суседзі і суседкі на нас вернуць, а што і гаварыць тады, як нам гэта «бог наш уцечка» не ўдасца.

Я к і м. Не бойся, золатца, не зловяць! Усё пойдзе гладка. Заўтра ў вас вечарынка; пасля вечарынкі ўсе будуць спаць моцна, так што хоць з гарматаў страляй — нічога не пачуюць. Я ўсё акуратна прыгатую, ты толькі звяжаш у

клумак што патрэбнейшае, а там праз момант — і ты мая на векі вечныя.

П а ў л і н к а *(нібы са злосцю)*. Не я твая, а ты мой на векі вечныя!

Я к і м. Ну, хай будзе, як Сора казала; але гэта толькі тады ў нас выйдзе, калі ты прыстанеш на тое, аб што я цябе прасіў і прашу.

П а ў л і н к а *(падумаўшы, смеючыся)*. Ну, згода да... заўтрашняга дня, а там пабачым.

Я к і м *(павесялеўшы)*. І даўно ўжо трэ' было гэтак сказаць, мая ты кветачка майская. Заўтра вечарам, як толькі ўсе паўкладаюцца, — я ўжо ў садзе пад акном буду на цябе чакаць. Ты аконца адчыніш, лахі пад пахі ды скакель з хаты ў сад, як пятух!

П а ў л і н к а. Гэта ты, як пятух, а я, як...

Я к і м *(перапыняючы)*. Як курыца.

П а ў л і н к а. Не курыца, а як зязюлька.

Я к і м. Як зязюлька, праз акно фырр! а пятух цап, а поп крапілам пырсь! а там...

П а ў л і н к а *(смеючыся)*. А там ізноў фырр!..

Размахвае рукамі і хоча вырвацца. Якім мацней прыціскае яе к сабе і хоча пацалаваць; яна нібы бароніцца, а пасля хватае яго за шыю, і доўга горача цалуюцца.

Я к і м. Ох, каб гэтак усё жыццё і кожную мінутку.

П а ў л і н к а. Ого! Разласаваўся!.. Аскому нагоніш, пакуль ахвоту спагоніш. *(Прыслухаўшыся.)* Ой, недзе туркоча! Ці не едуць толькі нашы з торгу!

Я к і м *(прыслухаўшыся)*. Такі ж нехта едзе!

П а ў л і н к а *(сумна)*. Значыцца, Якімка, трэба ўжо табе рабіць фырр!

Я к і м *(устаючы, з уздохам)*. Нічога не парадзіш — трэба!.. Ой, гэтыя бацькі! І чаму гэта не родзяцца на свет дочкі без бацькоў!..

П а ў л і н к а *(устаючы)*. Ах, чуць не забылася. Ці прынёс мне тое, што абяцаўся?

Я к і м. А як жа, прынёс, маё ты золатца. *(Дастае з кішэні фатаграфію і аддае Паўлінцы.)*

П а ў л і н к а *(прыглядаючыся да фатаграфіі, весела)*. Вот так добра! Заместа аднаго маю ўжо двух: аднаго, што сам

ходзіць да дзяўчат і рукам волю дае, а другога, што трэба насіць за... пазухай. *(Смяецца.)*

Я к і м *(любуецца ёю, хватае і цалуе)*. Ах ты, зязюлька мая ненаглядная!

П а ў л і н к а *(баронячыся)*. Ну, ну, петушок! Не гарачыся: паспееш з козамі на торг. *(Выпіхаючы Якіма з хаты.)* Марш дадому! Раз, два, тры!..

Я к і м *(у дзверах)*. Помні, Паўлінка, — заўтра!.. *(Выходзіць.)*

З'ява III

П а ў л і н к а *(адна)*

П а ў л і н к а *(папраўляе ложак, пасля прыглядаецца да фатаграфіі, цалуе яе і хавае за пазуху, прыціскаючы грудзі рукамі)*. А што, смачна? цёпленька?.. Га?.. Каля самага сэрцайка дзявочага... Пэўна чуеш, як яно, бедненькае, трапечацца. Выгадна табе тут, як нідзе, нікому!.. Але не, не! Гэтак не выпадае. Яшчэ трохі порана... Паслязаўтра — іншая рэч. А цяпер... *(Ідзе к абразу.)* Пасядзі лепш, саколік, за абразікам. Седзячы гэтак у бога за плячыма, меней будзеш мець грэшных думак у галаве, чымся песцячыся тут *(паказвае)* у маладой дзяўчыны. *(Напяваючы, падыходзіць да сцяны, хавае фатаграфію за абраз і як ні ў чым не бывала садзіцца за шыццё.)*

Дый чым жа твая, дзеванька,
Галоўка занята? (і г. д.)

З'ява IV

П а ў л і н к а, С ц я п а н, А л ь ж б е т а

С ц я п а н *(п'янаваты ўваходзіць з Альжбетай з сенцаў і прыпявае)*.

Дзе мы едзем, дзе мы йдзём, —
Карчмы не мінаем;
Дзе заедзем, дзе зайдзём, —
Там і пагуляем.

А л ь ж б е т а *(кладучы пакупкі на куфар і раздзяваючыся, да Сцяпана)*. Не смяшы ты людзей. Калі падпіў, дык ляж спаць!

С ц я п а н. Маўчы, баба!.. Ты, каханенькая, родненькая, нічога не разбіраеш... Валасы доўгія, а розум кароткі. *(Прыпявае.)*

Ой, там, на гарэ,
Мужык жонкай арэ,
А другая падбягае:
«Запражы ж ты мяне».

(Хоча абняць Альжбету.)

А л ь ж б е т а *(адпіргнуўшы)*. Ах ты, гнілая качарэжка! Яшчэ можа табе чаго захочацца?..

С ц я п а н *(выкручваючы нагамі)*.

Дзед боб малаціў,
Баба падсявала...

П а ў л і н к а. Тата! Ды кіньце ўжо!.. Ось лепей раздзявайцеся ды можа чаго з'ясцё.

С ц я п а н. А можа гэта і добра, каханенькая, родненькая... Каб так кіслай ды гарачай капусты. *(Скідае вопратку і кладзе на куфар.)*

Скіну бурку, скіну боты
Дый надзену лапці;
Кожны дурань ці разумны —
Пан у сваёй хаце.

Садзіцца за стол.

П а ў л і н к а *(кінуўшы шыццё на ложак, да Альжбеты)*. Мамка, дастаньце з куфра настольнік, а я прынясу вам з'есці. *(Выходзіць.)*

З'ява V

С ц я п а н, А л ь ж б е т а

А л ь ж б е т а *(дастаючы настольнік з куфра)*. З кім ты гэтак намурзаўся?

С ц я п а н *(закурваючы люльку)*. Я і з тым, я і з сім, а ты, каханенькая, родненькая, згадай, — з кім?

А л ь ж б е т а. А немач цябе ведае, з кім!

С ц я п а н. Ці ж я не казаў, што ў цябе тут *(торкаючы сабе пальцам у лоб)* не ўсе дома? Але слухай: з зяцем!

А л ь ж б е т а *(здзівіўшыся)*. З зяцем?!

С ц я п а н. Так, так, каханенькая, родненькая. Хто з сватам, хто з свацця́й, а як Сцяпан Крыніцкі, дык з родным зяцем.

А л ь ж б е т а *(накрываючы стол)*. Такі праўду кажуць, што гарэлка людзей з поля зводзіць. Калі ж ты ўспеў яго нажыць?.. Дачка яшчэ замуж не выйшла, а бацька ўжо зяця мае!

С ц я п а н. Калі не маю цяпер, дык буду мець у чацвер. Гэта, бачыш, ён яшчэ толькі збіраецца падмазацца да нашай Паўлінкі; ну, а каб слізчэй усё пайшло, дык перш мяне ён падмазаў.

А л ь ж б е т а *(садзіцца)*. Так бы і казаў адразу. А хто ж гэта такі?

С ц я п а н. Адольф Быкоўскі!

А л ь ж б е т а. Э-э! Я думала, хто там!.. Ажно нічога людскога. Толькі ездзіць ды нюхае, якая дзяўчына пасагу больш мае, а сам дык голы, як бізун.

С ц я п а н. Пасаг нюхае, бо нос мае. Але ўсё-такі гэта для нас блін ды яшчэ маслам падмазаны. Ён сам мне, каханенькая, родненькая, хваліўся, што яго гаспадарка ў сто раз лепшая ад усіх тутэйшых гаспадароў. За аднаго каня толькі, казаў, заплаціў сёлета тры сотні. «На гэтым жа кані, кажа, заўтра да васпанства заедуся з кірмашу». *(Мацаецца па кішэнях, сам сабе.)* Дзе ж бы яна падзелася?.. *(Да Альжбеты.)* Ты, баба, ці не бачыла кніжкі, што я купіў сягоння? Дзе яна прапала?

А л ь ж б е т а. А што я, пастушка над тваімі кніжкамі? Прапіў можа з гэтым сваім зяцем.

С ц я п а н *(ідзе к куфру, знаходзіць у бурцы кніжку і кладзе яе за абраз, дзе Паўлінка палажыла фатаграфію)*. Каханенькая, родненькая, не думай, што я якую дрэнь выбраў сабе на зяця. Заўтра ён прыедзе, паглядзіш, дык адразу што другое запяеш. Адным словам, хлапец: шляхоцкага заводу, з рызыкай, з усякай далікатнасцяй і ўсё такое...

З’ява VI

П а ў л і н к а, С ц я п а н, А л ь ж б е т а

П а ў л і н к а *(уваходзячы з міскай, з лыжкамі і хлебам пад пахай)*. Аб кім гэта, татка, гаворыце, што мае ўсякую далікатнасць і ўсё такое? *(Ставіць яду на стол і садзіцца за шыццё.)*

С ц я п а н *(едучы́.)* Вельмі васпанна цікавая! Скора састарышся, каханенькая, родненькая, як усё будзеш ведаць.

П а ў л і н к а *(просячы)*. Скажыце, скажыце, татачка!

С ц я п а н. Ага, ні села ні пала, захацела баба сала! Калі ўжо табе, каханенькая, родненькая, так хочацца, дык скажу. *(З павагай.)* Знакам тым, гэты паніч з далікатнасцяй і з усякім такім — мой зяць.

П а ў л і н к а *(пырснуўшы смехам)*. Зяць?!

С ц я п а н. Знакам тым, ён не саўсім яшчэ зяць, але скора на яго выкіруецца.

П а ў л і н к а. А як жа годнасць гэтага... гэтага, ну, як яго... што некалі татавым зяцем зробіцца?

А л ь ж б е т а. Дык гэты ж, гэты... Ты, пэўна, яго бачыла некалі... Адольф Быкоўшчык.

П а ў л і н к а. Быкоўшчык!!

С ц я п а н. Але. Але! Пан Адольф Быкоўскі!

П а ў л і н к а. Ну, хіба, татка, для яго другой дачкі пастараецеся або самі з ім ажэніцеся, каб перарабіць яго з простага чалавека на свайго зяця.

С ц я п а н. А ты што? Зломак?

П а ў л і н к а. Зломак — не зломак, але і за ламаку не пайду.

С ц я п а н. А дзяга нашто?

П а ў л і н к а. На ўсё, толькі не на паганяку к замужству.

С ц я п а н. Каханенькая, родненькая, яшчэ паглядзім, дзе каго пасадзім.

А л ь ж б е т а *(едучы́, да Сцяпана)*. Еш вот лепей, чымся з пустога ў парожняе пераліваць. Як прыедзе сватацца, тады тое і будзе.

П а ў л і н к а. Татка, ведаеш не сягоння, за каго я толькі пайду, або за нікога.

С ц я п а н *(змяніўшыся, кідаючы лыжку аб стол)*. Што?.. За каго?..

П а ў л і н к а *(устаючы і ідучы к ложку)*. За каго? За Якіма.

С ц я п а н *(стукаючы кулаком па стале)*. Маўчы, гадаўка! Раз сказаў, каб гэтага шэльмы і звання не было ў маёй хаце, каб яго імені я не чуў ніколі... гэтага недаверка, гэтага ...гэтага забастоўшчыка! Дык і не забывайся аб гэтым, каханенькая, родненькая...

П а ў л і н к а *(паірытавана).* Нашто дарэмшчыну вясці. Ён нікому ніякай забастоўкі не рабіў і не робіць.

С ц я п а н *(закурваючы са злосцю люльку).* Чорт яго бяры, не тут успамінаючы, — рабіў ці не рабіў. Знаць і бачыць не хачу яго ў сваёй хаце, гэтага хамуйлу, гэтае плюгаўства.

А л ь ж б е т а. Прыбірай, Паўлінка, ужо са стала!

П а ў л і н к а *(кінуўшы на ложак шыццё і ідучы к сталу).* А даўно гэта, татка, сам з ім цалаваўся?

С ц я п а н. Каханенькая, родненькая, не лезь у вочы. А не, то вон з хаты і цябе з гэтай дрэняй выганю.

Паўлінка ідзе з міскай к дзвярам; неўспадзеўкі дзверы адчыняюцца, увальваецца ў хату п'яны П р а н ц і с ь П у с т а р э в і ч, за ім — яго жонка. Пранцісь няўмысля выбівае міску ў Паўлінкі.

П а ў л і н к а. Ай, што ж гэта, дзядзька, зрабілі?

З'ява VII

П а ў л і н к а, С ц я п а н, А л ь ж б е т а, П р а н ц і с ь, А г а т а

П р а н ц і с ь. Глупства, глупства, пане дабрудзею! Пахвалёны Езус. Собственно, адкупім, адкупім, вось-цо-да!

С ц я п а н і А л ь ж б е т а. Навекі.

А л ь ж б е т а. А мае ж вы родненькія, ці ж гэта вы ўсё яшчэ з рынку едзеце? Здаецца ж, раней за нас выехалі?

П р а н ц і с ь. Собственно, вось-цо-да, кабыла заблудзіла, пане дабрудзею.

А г а т а. Тудэма-сюдэма, ці ж гэта мачыляпа калі прыехаў у сваім часе дамоў! Ён жа, як рызнік, то туды, то сюды блытаецца па дарозе.

П р а н ц і с ь. Пане дабрудзею, тваё бабскае дзела — маўчаць! Я, собственно, вось-цо-да, спрытны, — тонка панімаю, што і як раблю.

А л ь ж б е т а. Ды садзіцеся ж, мае міленькія!

А г а т а. Тудэма-сюдэма, куды тут садзіцца! Ноч на дварэ, кабыла за плотам, паўвярсты да дому, а гэты, тудэма-сюдэма, начніца касавокая, не вытрываў, каб людзям не нарабіць уночы неспакойства. *(Садзіцца, а за ёй — іншыя.)*

С ц я п а н. Э, што там такое! Выспімся! Дзякуй богу, ночка не пятровая, а пакровая.

П а ў л і н к а *(падбіраючы чарапкі)*. Заўтра госці будуць, а дзядзька апошнюю міску стоўк. Трэба, каб на кірмашы дзве адкупіў.

П р а н ц і с ь. Глупства, пане дабрудзею, глупства! Хаўтурнага, собственно, вып'ем па місцы. *(Дастае з бакавой кішэні пляшку, пацягае з яе і хавае назад.)*

А л ь ж б е т а *(смеючыся)*. А каб гэта нам сваток даў гэтай сусолькі пассаць. Ці ж мы з сваццяй паскрэбкі...

П а ў л і н к а *(выходзячы з чарапкамі)*. Ого! Гэтых свянцоных кропель дзядзька і канаючаму не даў бы, не то, што... *(Выходзіць.)*

З'ява VIII

С ц я п а н, А л ь ж б е т а, П р а н ц і с ь, А г а т а

П р а н ц і с ь *(услед Паўлінцы)*. Глупства, глупства, пане дабрудзею. Маладзенькая яшчэ, маладзенькая! Лазы трэба, собственно, вось-цо-да.

А г а т а *(да Альжбеты)*. Што, свацейка, тудэма-сюдэма, добрага куплялі на рынку?

А л ь ж б е т а. Ат, сёе ды тое. Паглядзіце, калі хочаце. Нічога такога цікаўскага. *(Устаюць і ідуць абедзве да куфра і разглядаюць кінутыя на ім пакупкі.)*

П р а н ц і с ь *(да Сцяпана)*. Чуў, сват, пане дабрудзею, што сягоння людзі казалі?

С ц я п а н. Не, не, каханенькі, родненькі, не чуў, не было калі! А што?

П р а н ц і с ь. Ды як жа, вось-цо-да! Кажуць, француз, пане дабрудзею, ідзе на Барысава па шапку і рукавіцы, што каліс там заставіў. Чатырыста тысяч войска з сабой вядзе і, собственно...

А г а т а *(перабіваючы з месца)*. Не чатырыста тысяч, а чатыры сотні тысячаў...

П р а н ц і с ь. Глупства, глупства, пане дабрудзею. Усё роўна ідзе, вось-цо-да. Спранжыновы касцёл з сабой нясе, пане дабрудзею.

А г а т а *(з месца)*. Тудэма-сюдэма, не нясе, а на паветры, на машыне, што лётаюць, гэты касцёл вязе.

С ц я п а н і А л ь ж б е т а *(здзівіўшыся)*. Ай-я-я! Аж на паветры касцёл вязуць!..

А г а т а. Але ж, але! Тудэма-сюдэма, я сама на свае вушы чула.

С ц я п а н. Во калі пайшло ўсё ўверх нагамі! Як паставяць гэты спранжыновы касцёл, то можна будзе спадзявацца і для нашага брата якога-такога палягчэння. Дзякуй богу, дзякуй богу!!! А вось мая гэта ахмістрыня, дачушка мая сакатушка, сплуталася з гэтым... з гэтым бязбожнікам, і хоць ты ёй вар на галаву лі.

П р а н ц і с ь. Маладзенькая, собственно, вось-цо-да. Бярозавай кашы не шкодзіла б, пане дабрудзею.

А л ь ж б е т а. Дужа трудна паладзіць з цяперашняй моладдзю. Пайшло такое распуства на свеце, што не дай божа! Заместа кніжак ды набажэнства — чытаюць нейкія дрындушкі. Вецер у ва ўсіх па галаве ходзіць. Гэта ж мне калісь сказалі: ідзі за Сцяпана, — я і пайшла без ніякай спрэчкі са сваімі старымі.

А г а т а. А так, так, тудэма-сюдэма! І мой, як да мяне пасватаўся, бацька-нябожчык і кажа: ідзі, бо ўсё роўна ніхто цябе лепшы не возьме; я падумала, тудэма-сюдэма, ну і пайшла. *(Глядзяць абедзве на сваіх мужоў, пасля — адна на адну, плююць кожная ў другі бок і разглядаюць ізноў клункі.)*

П р а н ц і с ь. Так, так, пане дабрудзею, іначай калісь было. *(Дастае пляшку і п'е, а пасля дае Сцяпану.)* Собственно, глупства, вось-цо-да, было, а ты, сват, выпі, каб тое, што было, у памяці не сядзела.

Сцяпан п'е, Пранцісь прытрымлівае за пляшку, каб той залішне не выпіў.

С ц я п а н *(абціраючы вусы ды сплёўваючы)*. Шчыпецца, каб яе гаручка!

П р а н ц і с ь *(хаваючы гарэлку)*. Ага, вось-цо-да, шчыпецца, собственно, бо чужая, пане дабрудзею. *(Абодва закурваюць.)*

А л ь ж б е т а *(да Агаты)*. А ці заўтра, сваціейка, будзеце на кірмашы?

А г а т а. Ды трэба ж будзе як сцягацца.

З'ява IX

Тыя ж і П а ў л і н к а

П а ў л і н к а *(уваходзячы, да Альжбеты.)* Можа б, мамка, прыціснулі сыр, бо да заўтрашняга не адціснецца.

А л ь ж б е т а. Яшчэ паспее... Дай мне з цёткай разгаварыцца.

П а ў л і н к а. Ідзіце, ідзіце, мамка, а я за вас з цёткай пагавару.

А г а т а. Ідзіце, свацейка, тудэма-сюдэма, не зважайце на мяне. Мы тут з Паўлінкай пачакаем на цябе.

А л ь ж б е т а *(выходзячы)*. Ну, як сабе хочаце.

Паўлінка з Агатай садзяцца на куфры і жыва аб чымсьці гавораць.

З’ява X

П а ў л і н к а, С ц я п а н, П р а н ц і с ь, А г а т а

С ц я п а н. Знаеце, сваток, гэтага, гэтага... як ён... а каб цябе... *(Да Паўлінкі.)* Паўлінка, як гэты завецца, што мяне сягоння падмазываў?

П а ў л і н к а *(з месца)*. А скуль жа я магу ведаць, хто татку мазаў?

С ц я п а н. Ну, гэты ж?.. каб ён цяміўся... зяць, зяць!

П а ў л і н к а *(прыпамінаючы)*. Як жа ён, як?.. Здаецца, Бык... Бычок...

С ц я п а н. Ага, ён, ён. Не, не так! Быкоўскі, каханенькая, родненькая, вось як. Пан Адольф Быкоўскі. *(Да Пранціся.)* Дык бачыш, сваток, ён, значыцца, падлабуньваецца да маёй Паўлінкі. Што ты на гэта?

П р а н ц і с ь *(дастаючы гарэлку)*. Глупства, глупства, пане дабрудзею. Собственно, бычок, вось-цо-да, больш нічога. *(П’е і дае гарэлкі Сцяпану.)*

С ц я п а н *(выпіўшы)*. Заўтра, знакам тым, прыедзе абнюхаць, як і што, дык і сваток са сваёй загляньце да нас. А ну ж, каханенькі, родненькі, можа які гандаль будзе наладжвацца, дык прыкінеш якое слаўцо. Прыедзьце толькі.

П р а н ц і с ь. Глупства, пане дабрудзею, і прыйсці можна. Собственно, блізка, вось-цо-да.

С ц я п а н. Блізка то блізка, але каб не было слізка: на дождж як бы збіраецца.

П а ў л і н к а *(з месца)*. А ці татка, каня паілі?

С ц я п а н. Не, каханенькая, родненькая. Зараз пайду. *(Да Пранціся.)* Можа разам з сватам пойдзем? Я свайго напаю, а сват свайго паглядзіш, ці добра прывязаны.

П р а н ц і с ь. Глупства, пане дабрудзею. Собственно, жонка завязе, калі б кабыла ўцякла. *(Да Агаты.)* Праўда, баба?

А г а т а *(з месца)*. Што — праўда?

П р а н ц і с ь. Собственно, калі б кабыла ўцякла, то мяне тады ты дамоў завязеш, пане дабрудзею.

А г а т а. А каб ты, тудэма-сюдэма, бокам ездзіў! Ідзі скарэй, паглядзі! Гэта ж і мне з памяці сышло.

С ц я п а н. Пойдзем, каханенькі, родненькі. *(Абымаюцца і сланяючыся выходзяць, напяваючы.)*

Чаму ж нам не пець,
Чаму ж не гудзець,
Калі ў нашых хатачках
Парадак ідзець?

З'ява XI

П а ў л і н к а, А г а т а

П а ў л і н к а. Але ж калі я яго люблю, цётачка.

А г а т а. Мала што, дзеткі, тудэма-сюдэма, любіш яго, але калі бацька не хоча, дык падумай, што людзі скажуць, як супроці волі старых пойдзеш.

П а ў л і н к а. А што там людзі? Яны ж з ім жыць за мяне не будуць і па маёй смерці за мяне пакутаваць не будуць. Пагаворадь, пагавораць ды перастануць, як намазоляць языкі.

А г а т а. Як уважаеш, мае дзеткі. Што ж, я, тудэма-сюдэма, нічога не дараджу.

П а ў л і н к а *(заламаўшы рукі на каленях)*. Калі ён такі добры, такі разумны, што і сказаць не магу.

А г а т а. Усе яны добрыя, пакуль не ўбярэ каторы дзяўчыны ў свае рукі, а як убярэ, тады на іншы лад, тудэма-сюдэма, зайграе, а ты танцуй пад яго дудку. І мой, пакуль толькі сватаўся да мяне, — патульны быў, як цялё, а як ажаніўся, дык праўдзівым ваўком зрабіўся.

П а ў л і н к а *(як бы не зважаючы на гаворку Агаты)*. Кніжкі мне прыносіў... Хораша так аб усім расказваў... як трэба жыць, як людзей трэба ўсіх любіць, і шмат, шмат чаго. І любіць жа ён гэтых людзей зусім неяк не так, як мы іх любім. Гэта ж трэба ведаць, столькі мой тата на яго ўсякай

дарэмшчыны нагаварыў і ачарніў, а ён хоць бы што. «Ведама, кажа, чалавек: яму нешта абышло ці не спадабалася, дык і помстуе. У нас, кажа, усё ідзе не так, як трэба. Людзі, кажа, у нас, як звяры: адзін на другога кідаюцца, адзін другога цкуюць, пад'юджваюць, ненавідзяць адзін другога. Змалку дзён, кажа, прывыкаюць у ненавісці жыць, змалку дзён іх да гэтага вучаць і дома, і за домам. Сляпыя, кажа, усе сляпыя. Адзін над другім не маюць ніякай літасці, хоць усіх душаць зверху ўсялякія пошасці ды злыдні».

А г а т а. Чула я, чула аб ім не раз. Вельмі ўжо, кажуць, тудэма-сюдэма, разумны і добры ён.

П а ў л і н к а *(ажывіўшыся)*. А што ж, ці не праўда? І ўсё б было добра, каб не гэты тата: хоць немаведама што рабі з ім...

А г а т а. Трэба, дзеткі, пачакаць, ану ж, тудэма-сюдэма, ліха перамелецца, і ўсё добра будзе.

П а ў л і н к а. Трэці год, цётачка, чакаем, і нічога не выходзіць. Трэці год трасуся і выглядаю той часінкі, каб толькі з ім пабачыцца. Павешуся, цётачка, павешуся, калі мяне з ім разлучаць!..

А г а т а *(хрысцячыся)*. Мёйца, сына! Тудэма-сюдэма, што ты, Паўлінка? Пабойся бога гэткія рэчы гаварыць напроць ночы! Цьфу! матачка найсвентшая!

П а ў л і н к а *(паказваючы)*. Калі тут, цётачка, так пад сэрцам баліць, што і жыць неўмагату. Такі ён міленькі, такі прыгожанькі, такі паслухмяны... *(Заглядзеўшыся ўдаль.)* Калі яшчэ з татам былі яны добра, прыйдзе, бывала, вады за мяне прынясе, дрэўкі нашчапае. Не глядзіць на тое, што калісь вучыўся, а цяпер сам вуча і большых, і меншых. Ніколі ад яго слова благога не чула. Так, ведаеце, цётачка, і хочацца з кім-колечы аб ім гаварыць і думаць без канца і пачатку. І чаму я такая няшчасная? *(Са слязьмі.)* Бацька родны хоча мяне адарваць ад таго, хто мне цяпер мілей ад усяго чыста — жыцця, хаты роднай, цэлага свету. І чаму ж я такая няшчасная?

А г а т а *(тулячы да сябе Паўлінку, праз слёзы)*. Ціха, мае дзеткі, ціха. Не гаруй, не маркоцься, міленькая, вельмі. Неяк жа ды будзе. Бог найвышэйшы, тудэма-сюдэма, міласэрны, і аб тваёй тут цяжанькай долі не забудзецца.

П а ў л і н к а *(як бы збудзіўшыся)*. А няхай сабе будзе, што мае быць — я свайго такі даб'юся, або згіну, каб і следу не засталося.

А г а т а. А ўсё ж такі, скажы мне, дзеткі, чаму так твой тата на яго заеўся?

П а ў л і н к а. Бо... бо Якім з мужыкоў...

З'ява XII

П а ў л і н к а, А г а т а, С ц я п а н, П р а н ц і с ь

П р а н ц і с ь *(за дзвярыма)*. Глупства, вось-цо-да. Не дзе падзелася! Я знаю, собственно, дамоў уцякла, пане дабрудзею.

С ц я п а н *(уваходзячы ў хату, а за ім Пранціська)*. І трэ' было ж свату так дрэнна яе прывязаць, ды ў гэткую яшчэ цемру.

А г а т а *(усхапіўшыся)*. Каго прывязаць?

П р а н ц і с ь. Кабылу, кабылу, пане дабрудзею. Ужо ж не цябе, вось-цо-да.

А г а т а. Дык дзе ж кабыла?

П р а н ц і с ь *(дастаючы пляшку)*. Собственно, няма кабылы, дзе была, вось-цо-да, пане дабрудзею.

А г а т а *(падбягаючы да Пранціся з кулакамі)*. Дык чаго ж ты, тудэма-сюдэма, несвянцоная костка, рассеўся, як у сваёй хаце!

П р а н ц і с ь *(пацягваючы з бутэлькі)*. Глупства, глупства, вось-цо-да. Пасвенцім, собственно, пане дабрудзею, калі несвянцоная.

А г а т а *(хоча вырваць пляшку, Пранціська не дае)*. Вот я цябе зараз, тудэма-сюдэма, як высвенчу гэтай пляшкай па галаве, дык і сваіх не пазнаеш, няшчасны ты «вось-цо-да». *(Галосячы.)* А божа ж мой, бацюхна мой! Нашто мяне пакараў гэтай, тудэма-сюдэма, п'яніцай, гэтай недарэкай, гэтай куксамордай, гэтай... гэтай...

З'ява XIII

Тыя ж і А л ь ж б е т а

А л ь ж б е т а *(убягае, трымаючы ў руцэ клінок з тварагом)*. Што гэта ў вас тут парабілася, мае міленькія?

П а ў л і н к а. Кабыла дзядзькава ўцякла ці хто ўкраў. *(Ідзе, садзіцца на ложак і шые.)*

А л ь ж б е т а *(да Пранціся)*. Дык чаго ж, сватка, чакаеце? Бяжыце скарэй дамоў, — пэўна, там; гэта ж ёй не першыня.

А г а т а. Ці ж гэту, тудэма-сюдэма, трухлявую калоду зрушыш з месца! Сядзіць жа вось анцыхрыст, каб яму моль пяты пабіла, і з месца не скранецца.

С ц я п а н *(закурваючы люльку)*. Супакойцеся, сваццялцця. Не дзе яна дзенецца. Каханенькая, родненькая, яна дома, напэўна дома.

А г а т а. А сват, тудэма-сюдэма, не сунься з сваім носам туды, куды цябе не просяць. *(Да Пранціся.)* Ідзём! Чуеш ці не!..

П р а н ц і с ь *(устаючы)*. Глупства, пане дабрудзею, глупства. Мае мазгі спрытныя. На табе, вось-цо-да, паеду, собственно, дамоў.

А г а т а *(выводзячы Пранціся)*. Бывайце здаровы! Пахвалёны Езус!.. Падла гэты, ламака, нарабіў работы! *(Выходзяць, за імі — Альжбета з клінком.)*

З’ява XIV

П а ў л і н к а, С ц я п а н

С ц я п а н. Ох, і даюцца ж гэтыя сваякі ў знакі. Але, дзякуй богу, дзве дзюркі ў носе і скончылося, — ужо пазбыўся.

П а ў л і н к а. А даўно гэта таткаў гняды ўцёк з Лужанкі, і татка дамоў пехатой прытрапаў?

С ц я п а н. Што было, тое сплыло і болей, каханенькая, родненькая, не будзе, як кажуць людзі.

П а ў л і н к а. Паглядзім. Заўтра кірмаш.

С ц я п а н. Не бойся, каханенькая, родненькая. Я кабылу злаўлю, але і ты глядзі, каб мне таго зяця злавіла, аб якім я табе сягоння гаварыў.

П а ў л і н к а. Што ён конь ці вол, каб я яго яшчэ мела лавіць?

С ц я п а н. Не конь і не вол, а так сабе, дойная жывёліна.

П а ў л і н к а. Дык, татка, яго і дойце, калі ён для вас такі дойны, а я і не думаю.

С ц я п а н. Нічагутанькі, каханенькая, родненькая. Надумаешся, ваша, як пакармлю бярозавай кашай. Вось

толькі каб пагода была добрая, а то казаў ён, што на кірмаш не паедзе, калі будзе дождж ісці.

П а ў л і н к а. Ліха не возьме! Гэткі цукар не размокне.

С ц я п а н. Каханенькая, родненькая, як скажу, так і будзе; дзве дзюркі ў носе і скончылося. Вось толькі трэба даведацца, ці будзе напэўна заўтра пагода. Купіў я сягоння каляндар — нейкі беларускі, як кажа крамнік. Пытаўся ў яго, ці піша аб пагодзе, дык крамнік гавора мне, што аб пагодзе напісана ў ім болей, як аб чым іншым. Значыцца, паглядзім праўды.

Ідзе і дастае з-за абраза каляндар, адтуль валіцца на зямлю фатаграфія. Паўлінка, саскочыўшы з ложка, падбягае падняць яе, але не паспявае.

С ц я п а н *(падымаючы фатаграфію)*. А гэта што такое?

П а ў л і н к а *(хочучы адабраць)*. Гэта мая. Аддайце мне, тата!

С ц я п а н. Я пытаюся — хто гэта?

П а ў л і н к а. Ці ж, тата, не бачыце?

С ц я п а н *(са злоснай насмешкай)*. Ха-ха-ха! Якім!.. Хай жа ён прападзе саўсім. *(Хоча рваць, Паўлінка адбірае.)*

П а ў л і н к а *(скрозь слёзы)*. Аддайце, татачка, аддайце, не рвіце! не здзекавайцеся над ім...

С ц я п а н *(адпіргнуўшы ад сябе Паўлінку)*. Адчапіся ад мяне, гіцлёўка! Я вам тут наразводжу шашняў...

Стукат у сенцах. Уваходзяць П р а н ц і с ь, А г а т а, а за імі А л ь ж б е т а. Паўлінка стаіць патупіўшыся, глытаючы слёзы, і скубе пальцамі фартух.

З’ява XV

П а ў л і н к а, С ц я п а н, А л ь ж б е т а, П р а н ц і с ь, А г а т а

П р а н ц і с ь. Глупства, пане дабрудзею. Я, вось-цо-да, казаў, собственно, не дзе падзенецца.

А г а т а *(дражнячы)*. Вось-цо-да, вось-цо-да! Сам кабылу, тудэма-сюдэма, паставіў у вас пад паветкай, а шукае за плотам. Дарма толькі поўзалі і слядоў прыглядаліся.

А л ь ж б е т а. Ну, дзякуй богу, што хоць найшлася. *(Да Сцяпана.)* Што ты там круціш у руках?

С ц я п а н *(тыкаючы фатаграфію ў твар Альжбеце)*. На, на! Любуйся, якія празэнты атрымлівае твая дачушка!

А л ь ж б е т а *(закрываючы рукой твар).* Чаго соваешся… Такая яна і твая, як мая.

С ц я п а н. Лжэш! Каб яна была мая, то была б такая, як і я.

П р а н ц і с ь. Пакажы, пакажы, пане дабрудзею, што гэта за птушка?

С ц я п а н *(паказваючы).* На, глядзі, сваток! Павіншуй мяне з такой дачушкай і з гэтым, з гэтым гарэтыкам!

П р а н ц і с ь *(разглядаючы).* Эге! Гэта гэты разумненькі, вучоны, грамацей… Собственно, Сарока, вось-цо-да.

С ц я п а н. Але ж, але! Якім Сарока.

А г а т а *(да Сцяпана).* Тудэма-сюдэма, пакажыце і мне, сватка.

П р а н ц і с ь *(да Агаты).* Ты, пане дабрудзею, баба, не лезь сюды з цікавым носам. Собственно, пільнуй сваёй спадніцы і панчохаў, вось-цо-да. А мы суд, суд зробім… правы і скоры.

П а ў л і н к а *(падыходзячы да Альжбеты, ласкава).* Мамачка, адбярыце яе ў таткі.

А л ь ж б е т а. Што я з ім, дзеткі, зраблю? Яшчэ біцца будзе…

С ц я п а н *(да Пранціся).* А добра, сватка, кажаш. Зробім суд, перасуд добрым складам над гэтым гадам. А які?

П р а н ц і с ь. А такі, пане дабрудзею: стражнікаў паклікаць, спраўніку данясці. Собственно, інквізітарскі суд зрабіць — па палавіне шась! і гатова, вось-цо-да.

П а ў л і н к а *(кідаючыся да Сцяпана і цалуючы яму рукі, скрозь слёзы).* Татачка, аддайце! Не здзекавайцеся над ім!.. Ён жа вам нічога благога не зрабіў.

С ц я п а н *(са злосцю).* Спаць, спаць пайшла, калі гэткага знайшла! Спаць! *(Рве фатаграфію.)*

П а ў л і н к а *(з плачам апускаючыся на лаву).* Татка, згубіць мяне хочаце… Гвалтам з хаты выгнаць.

П р а н ц і с ь *(дастаючы пляшку).* А цяпер, собственно, вып'ем хаўтурнага, вось-цо-да. *(П'е.)*

П а ў л і н к а *(усхапіўшыся з лавы, кідаецца да Пранціся).* Па кабыле сваёй пі хаўтурнага, а не па чалавеку, якога і падноскаў не варт! *(Вырываючы і разбіваючы аб зямлю пляшку.)* Вось-цо-да!

П р а н ц і с ь *(развесіўшы рукі, здзіўлены, як і ўсе).* О-о-о!!!

Заслона

АКТ ДРУГІ

Тая ж самая — што ў першым акце — святліца. За сталом сядзяць: С ц я п а н, А л ь ж б е т а і г о с ц і — тры хлопцы і тры дзяўчыны. Мужчыны сядзяць з аднаго канца стала, а жанчыны — з другога. П'юць гарбату, наліваючы на сподкі; закусваюць. Дзецюкі з дзяўчатамі жартуюць, перакідваючыся крошкамі ад хлеба. З левай стараны (гледзячы ад публікі) пры сцяне ад бакоўкі сядзяць д в а м у з ы к і і, зводзячы інструменты, ціха перагаварваюцца між сабой. Ля дзвярэй ад сенцаў, у канцы куфра, на табурэце стаіць самавар. П а ў л і н к а, прыбраўшыся па-святочнаму, увіхаецца каля гасцей. Трохі ў твары змяніўшыся; час ад часу ўздыхае і няўзнак паглядае ў акно; адно стараецца быць з усімі вясёлай і бойкай. Як падымаецца заслона — Паўлінка нясе гарбату.

З'ява I

П а ў л і н к а, С ц я п а н, А л ь ж б е т а, г о с ц і, м у з ы к і

П а ў л і н к а *(стаўляючы гарбату перад Сцяпанам)*. Што ж гэта нешта татавага зяця так позна ні слуху ні духу? Ці не знюхаў ён, што ў мяне пасагу нямашака?

С ц я п а н. Каханенькая, родненькая, не бядуй. Не будзе Гірша, будзе чорт іншы.

П а ў л і н к а *(насмешліва)*. Мала што будзе... Але ж, калі мяне ўжо неяк, як цмокам, стала цягнуць да гэтага Бык... Бычка... Ах, як яго?..

С ц я п а н *(з націскам)*. Быкоўскага.

П а ў л і н к а *(падыходзячы да другога канца стала)*. Можа Адэльцы яшчэ шклянку?

А д э л ь к а *(госця)*. Дзякуй. Ужо напілася.

А л ь ж б е т а. Ды бяры! Што там пытаешся? Панна Адэля толькі дзве выпіла.

А д э л ь к а. Калі ж болей не хочацца.

П а ў л і н к а *(забіраючы шклянку)*. Вып'еш, вып'еш, Адэлька, — змесціцца.

А л ь ж б е т а *(падсоўваючы гасцям яду)*. Старайцеся, госцікі, старайцеся. Вось — сыр, масла, вяндліна! Такі ж сягоння трохі папрацавалі каля полькі ды лявоніхі.

К о л ь к і г а л а с о ў *(пераджоўваючы і сёрбаючы)*. Дзякуй, дзякуй! Мы стараемся.

С ц я п а н. Чым хата багата — тым рада. Хлеб на стале — рукі свае. Выбачайце толькі, каханенькія, родненькія, што

гарэлкі няма. Але я ў гэтым не вінават. Хацеў узяць у Міхалішках, дык, як на ліха, манаполька цэлы дзень была закрыта.

М у з ы к а *(убок да другога)*. Каб не салгаў, дык бы і не жыў. Я сам бачыў, як пасля імшы адбываўся з пляшкамі пры манапольцы нешпар.

Д р у г і м у з ы к а. Слухаць! Скнэра і больш нічога.

П а ў л і н к а *(паставіўшы Адэлі шклянку, да аднаго з гасцей)*. Можа пан Вінцусь яшчэ вып’е?..

В і н ц у с ь *(госць; уціраючы канцом настольніка губы і лоб)*. Яно б то было ўжо і досыць, але, калі панна Паўлінка так пекна просіць, дык можна яшчэ са шкляначку.

П а ў л і н к а *(ідучы са шклянкай)*. Гэты ўжо дык пятую шклянку бабохае…

С ц я п а н *(да Альжбеты)*. Ці добра хаця ты прасіла Пустарэвічаў? Чаму іх так доўга няма?

А л ь ж б е т а. Каб і не прасіла, то прыедуць. *(З насмешкай.)* Пэўна, собственно, кабыла заблудзіла.

А д з і н з г а с ц е й. Штось сягоння на кірмашы Якіма Сарокі не было. А то, бывала, такім франтам пахаджывае, што куды мяне вядзеш, пусці мяне к чорту.

П а ў л і н к а *(стаўляючы гарбату)*. А пану Банадысю зайздрасць, што так прыадзецца не патрапіць, хоць мо і мае за што.

Г о с ц ь. Чымся грошы траціць на адзежу, я лепей іх каму пазычу.

П а ў л і н к а *(садзячыся на ложку)*. І працэнцік добры злуплю, каб аж у пяты другому закалола.

Г о с ц ь *(самадавольна)*. Хе-хе-хе! А панне Паўлінцы злосць яшчэ не адышла, што калісь гэтаму ягамосці Сароцы не за які працэнт не пазычыў.

П а ў л і н к а. Вельмі ж яму гэтым і не пашкодзілі. Нашліся людзі, што і без працэнтаў пазычылі і далі яму магчымасць паехаць на настаўніцкія курсы. Цяпер нічыёй ласкі не патрабуе.

А д н а з г а с ц е й. Пэўна, што не! Такі чалавек нідзе не прападзе.

С ц я п а н *(прыслухваючыся дагэтуль гутарцы аб Сароцы)*. Кахаленькія, родненькія, кіньце аб гэтым свінапасе

гаварыць. Прыелася ўжо мне гутарка аб ім горш горкай рэдзькі. І ці гаманіце аб ім, ці не гаманіце — усё роўна нічога не выйдзе. Я ўжо яму даў дарогу.

П а ў л і н к а *(неспакойна)*. Якую дарогу?

С ц я п а н. А ты, каханенькая, родненькая, не слухай вушы развесіўшы, ды лепей гасцей глядзі. Дзве дзюркі ў носе і скончылося.

Нейкую хвіліну ціха. Паўлінка падыходзіць браць шклянкі, але ўсе адказваюцца.

А л ь ж б е т а. Што ж, выбачайце, госцікі. Не хацелі піць і есці, пасля самі будзеце жалець.

С ц я п а н. Выбачайце, выбачайце, каханенькія, родненькія, адно не скажыце, што ўсяго было ўдаволь, толькі прынукі не было.

К о л ь к і г а л а с о ў *(устаючы з-за стала)*. Дзякуем, дзякуем пану гаспадару і пані гаспадыні. Падмацаваліся, хвала богу, як лепей не трэба.

П а ў л і н к а *(устаючы з ложка)*. Проша паненак сюды прысесці, а, паны кавалеры, вазьміце сабе табурэцікі ды вось тут падсядзьце, а я тым часам пачастую гарбатай нашых музыкаў.

С ц я п а н і А л ь ж б е т а *(вылазячы з-за стала)*. А як жа — трэба, трэба!

Дзяўчаты садзяцца на ложку, хлопцы каля іх на табурэтах; жартуюць між сабой.

А л ь ж б е т а *(падыходзячы да музыкаў)*. Хадзіце, міленькія, выпійце са шкляначку гарбаты.

М у з ы к і. Дзякуем пані! Мы ўжо сягоння пілі.

А л ь ж б е т а. Мала што калі было, а цяпер трэба яшчэ падмацавацца. *(Забірае інструменты і кладзе іх на куфар, садзіць музыкаў за стол і сама садзіцца. Да Паўлінкі.)* А ты, дзеткі, налі музыкам гарбаты!

С ц я п а н *(закурваючы люльку)*. Выбачайце толькі, каханенькія, родненькія, што гарэлкі няма.

М у з ы к і. І без гэтых кропель будзем жывы.

Чуваць стукат у сенцах.

С ц я п а н. А бач, нехта такі хоць нарэшце з'явіўся. Трэба ісці ды глянуць, а то яшчэ ў дзверы не луча. *(Ідзе.)*

А д з і н з г а с ц е й. Нясі, божа, нежанатага ды багатага!

А д н а з г а с ц е й. Жаніць будзем!

П а ў л і н к а *(стаўляе музыкам гарбату, падыходзе і глядзіць у акно. Убок.)* Ах, як жа цёмненька!

А д з і н з г а с ц е й. Каго так, панна Паўлінка, выглядаеце?

П а ў л і н к а. Таго ж — нежанатага ды багатага.

З'ява II

Тыя ж і А д о л ь ф Б ы к о ў с к і

С ц я п а н *(спатыкаючы Адольфа ў дзверах)*. А-а! Нарэшце з'явіўся, дарагі госцік! Што ж гэта, каханенькі, родненькі, так доўга чакаць на сябе нас заставіў?

А д о л ь ф *(вешаючы пальто на сцяне каля парога)*. Пахвалёны ў хату!

К о л ь к і г а л а с о ў. Навекі! Навекі!

А д о л ь ф *(вітаючыся са Сцяпанам)*. Выбачайце, што трохі прыпазніўся. Але гэта вінават мой жарабец. Як панёс з гары, што каля Прытыкаў, — і мяне выкінуў, і вось зламаў, так што аж мусіў другую каламажку ўзяць; праз тое і замарудзіў.

А д з і н з м у з ы к а ў *(убок да другога)*. Каб ён толькі дыхаў. Які яго чорт нёс! Пристаў конь, ды ўсё тут.

Д р у г і м у з ы к а. Няўжо ж што. У мае вочы заплаціў вясной за нейкую здыхляціну трыццаць рублёў, і тая ўжо скарэй яго панясе.

С ц я п а н *(да Адольфа)*. Проша ж, проша далей, сюды, дзе бліжэй кут і дзе ўсе тут.

А д о л ь ф. Дзякую, дзякую, вашэці. Проша са мной клопату не рабіць.

Ідзе і з усімі вітаецца; Альжбету цалуе ў руку, стоячы к ёй бокам і не згінаючыся.

А л ь ж б е т а. Проша пана Адольфа, проша за стол! Можа вып'еце гарбаты і чаго закусіце? *(Да Паўлінкі.)* Паўлінка, налі пану Быкоўскаму гарбаты!

А д о л ь ф *(садзячыся за стол з другога канца ад музыкаў і закурваючы папяроску)*. А што ж у васпанства добрага чуваць?

С ц я п а н *(прысаджваючыся к сталу)*. Ды што ў нас чуваць? — Старая баба не хоча здыхаць, а маладая замуж ісці.

А д о л ь ф *(самадавольна)*. Хе-хе-хе! Старую трэба пшыдусіць, а маладую пшымусіць.

А л ь ж б е т а *(да Сцяпана)*. А, ваша, схадзі паглядзі, ці добра прывязаны конь пана Быкоўскага.

А д о л ь ф. Не турбуйцеся. Я яго добра прывязаў.

С ц я п а н. Каханенькі, родненькі, хоць і прывязаў, але сена, пэўна, не даў. У нас так: госць як папала, а жывёліну дык трэба добра дагледзець. *(Выходзіць.)*

З’ява III

Тыя ж без С ц я п а н а

П а ў л і н к а *(стаўляючы перад Адольфам гарбату і сама садзячыся воддаль)*. Што ж гэта пана Адольфа конь хацеў разнясці?

А д о л ь ф. А як жа! Тры сотні вясной заплаціў і толькі клопату нажыў. Але ў мяне ўсё так! Каровы мае кожная варта па якой сотні рублёў; як загілююць летам, дык і на добрым кані іх не ўгоніш.

П а ў л і н к а *(хітравата)*. Пэўне і авечкі ў пана Адольфа таксама гілююць?

А д о л ь ф. А так, так! Маю пятнаццаць старых і дваццаць маладых. Як ударыць гарачыня, дык яны чуць не ўсе чыста круцяцца на адным месцы.

П а ў л і н к а *(ідучы па гарбату для сябе, убок)*. Матыліцы авечак мучаць, як і сам тут *(паказваючы пальцамі на сваю галаву)* матылі мае, а думае, што яны зыгуюць.

А л ь ж б е т а. Якія ж сёлета ўраджаі ў пана Адольфа?

А д о л ь ф. А ніштто сабе. *(Відам лгучы.)* Жыта нажаў коп са дзвесце, аўса таксама са дзвесце, ячменю — з сотню.

А д з і н з г а с ц е й. А колькі ж у пана зямлі?

А д о л ь ф. Валокі з паўтары добрыя будзе.

Г о с ц ь. І лес ёсць?

А д о л ь ф *(абціраючы хустачкай лоб)*. А як жа — ёсць: з паўвалокі, калі не болей. Сосна ў сасонку!

Г о с ц ь. І сенажаць ёсць?

А д о л ь ф. Ёсць, ёсць! Над самай рэчкай, таксама з паўвалочку. Мурог, як шафран.

М у з ы к а. Дык у пана ўсяго з паўвалочку ворнай зямлі?

А д о л ь ф. Н-нуу, так! З добрую паўвалочку!

А л ь ж б е т а. У нас ворнай зямлі, мусіць, і са тры валокі будзе, і то мы столькі не нажалі.

П а ў л і н к а *(сеўшы з гарбатай пры стале)*. Пан Адольф лепшы, відаць, за нас гаспадар.

А д о л ь ф. О, у мяне гаспадарка ні ў чым не зблыша. У мяне жонка і то будзе лепшая, як у ва ўсіх.

А д з і н з г а с ц е й. Каб толькі не ўдалася наравістая.

П а ў л і н к а. Цікавасць, ці пан Адольф ужо затаргаваў сабе якую?

А д о л ь ф. Гэта, пакуль што, сакрэт.

П а ў л і н к а. А мне пан Адольф скажа?

А д о л ь ф. Так. Але перш тату і маме, а пасля ўжо і васпані на самае вушка.

П а ў л і н к а *(беручы ў яго шклянку)*. Добра, добра! Пан Адольф як ведаў, што я трохі глухавата.

А д о л ь ф. Глухавата?!

П а ў л і н к а *(ідучы па гарбату, убок)*. Трэба шэршня за нос павадзіць, каб і дзясятаму заказаў, як жонкі купляць.

А л ь ж б е т а. Пан Быкоўскі, здаецца, у нас першы раз?

А д о л ь ф. А так — першы!

А д н а з г а с ц е й. Дык пану трэба даць пацалаваць старую бабу.

А д з і н з г а с ц е й. Пан Адольф толькі да маладых ды багатых лас, а старыя ў яго ў рахунак не йдуць.

А д о л ь ф. А праўда, праўда! Я толькі да маладых маю імпэт.

А л ь ж б е т а *(убок)*. І дурны ж ён, як відаць.

П а ў л і н к а *(падаючы гарбату Адольфу)*. Да каго гэта маеце такі імпэт, да дарагіх кароў ці дарагіх кабыл?

А л ь ж б е т а. Ды не! Пан Быкоўскі мае імпэт толькі да маладых дзяўчат.

А д о л ь ф *(п’ючы гарбату)*. Але ж, але. Толькі да маладых дзяўчат.

П а ў л і н к а. А кільчака часам з гэтага не нагоніце на язык?

А л ь ж б е т а. Што ты?! Ці ж пан Быкоўскі конь?

М у з ы к а *(убок да другога)*. Конь не конь, а як відаць, дык быдлё парадашнае.

А д о л ь ф *(да Паўлінкі)*. Панна Паўлінка дык усё мне капліменты гавора.

П а ў л і н к а *(рассеяна)*. Ага! Капліменты. *(Да музыкаў.)* Мацуйцеся, мацуйцеся, музыканцікі. А то ўжо ногі чэшуцца. Так і хочацца з панам Адольфам сыпнуць лявоніху.

А д о л ь ф. Фі! Я такіх мужыцкіх танцаў не гуляю.

М у з ы к а *(да Паўлінкі)*. Дзякуем! Ужо як належыць сабраліся, цяпер можам і рэзнуць што-колечы для паненкі. *(Садзяцца на свае месцы і зводзяць інструменты.)*

П а ў л і н к а *(да Адольфа)*. А якія ж вы танцы гуляеце?

А д о л ь ф. Гэрц-польку, падзі-спаць, манчыз, падзі-кварту. *(Выходзячы з-за стала, цалуе Альжбету ў руку, да Паўлінкі.)* Ну, што ж? Можа, мы з паненкай папрабуем?

П а ў л і н к а. Калі ж я гэтых мудрых танцаў не толькі што не ўмею, але ніколі нават іх і не бачыла.

А д о л ь ф. Не бойцеся! Я на ўсе лады выўчу паненку скакаць. *(Бярэ Паўлінку як да танца, да музыкаў.)* Зайграйце нам гэрц-польку!

М у з ы к а. Мы гэтага не ўмеем.

А д о л ь ф. Ну, дык падзі-спаць!

М у з ы к а. Першы раз чуем.

А д о л ь ф. А можа падзі-кварту знаеце?

М у з ы к а. І гэта першы раз чуем.

П а ў л і н к а *(як бы бядуючы)*. А-ей-ей! Вось табе і на! Так і не наўчуся гэтых панскіх танцаў.

А д о л ь ф. Не бядуйце вельмі. Я буду вытылінгіваць на язык, а васпанна толькі прыслухоўвайся ды выробляй нагамі так, як і я.

П а ў л і н к а. Значыцца, будзем гуляць пад язык.

Смех. Адольф іграе на язык і без толку выкручваецца з Паўлінкай.

А д о л ь ф *(паказваючы)*. Вось так, вось так! Правую нагу сюды, а левую туды. Галава ў левы бок, а задам пад парог, ды вось так!.. Раз, два, тры, то направа, то налева…

Усе прыглядаюцца да іх і смяюцца.

З’ява IV

Тыя ж і П р а н ц і с ь, А г а т а, С ц я п а н

П р а н ц і с ь *(п’яны)*. Пахвалёны Езус. Вось-цо-да, пане дабрудзею.

К о л ь к і г а л а с о ў. Навекі! Навекі!

П р а н ц і с ь *(глянуўшы на Паўлінку і Адольфа)*. А гэта што такія, собственно, за выкрутасы, як у цырку ці ў сумашэдшым доме?

А д з і н з г а с ц е й. Гэта пан Быкоўскі навучае панну Паўлінку навамодных танцаў.

Пранцісь і Агата распранаюцца.

П р а н ц і с ь. Можна, можна далей круціцца, як у хваробе святога Лявэнтага. Далей, далей! Раз, два, тры, вось-цо-да!

А д о л ь ф *(далей паказваючы Паўлінцы)*. Вось як, вось так! То направа, то налева. Раз, два, тры! То туды, то сюды, ножка ў ножку, раз, два, тры!

П а ў л і н к а *(вырываючыся)*. Не, такі нічога не выйдзе. Не кемкая я да навукі.

А д о л ь ф *(садзячы Паўлінку)*. Гэта толькі трудна першы раз, а пасля пойдзе ўсё гладка, як пугай высмаліць!

Ходзіць па хаце, махаючы каля твару хустачкай. Пранцісь, Агата і Сцяпан садзяцца за стол; Альжбета падае ім гарбату.

П р а н ц і с ь *(закурваючы люльку са Сцяпанам)*. Собственно, пане дабрудзею, кабыла заблудзіла і праз тое трохі спазніліся. Але гэта глупства, глупства! Яшчэ парой будзе, вось-цо-да.

А г а т а. Якое чорта заблудзіла! Пакуль аб’ехаў, тудэма-сюдэма, усю ваколіцу, як пагарэлец, дык і поўнач чуць не агарнула. Тудэма-сюдэма, усё га́ры тэй сабе шукаў.

П р а н ц і с ь. Ты, баба, собственно, маўчы, вось-цо-да! Ты нічога ніколі не кеміш, а я маю розум спрытны. Я, пане дабрудзею, Барнашоў, дзе пайшоў, там і прайшоў. *(Да гасцей.)* А вы, маладзічкі, не зважайце, вось-цо-да, ды танцуйце, пане дабрудзею, пакуль казінец не ўбіўся ў ногі.

П а ў л і н к а. А праўду дзядзька кажа. Будзема гуляць, нашто дарма час марнаваць! *(Да музыкаў.)* Зайграйце, калі ласка, польку, але такую, як ведаеце... каб аж свет хадыром пайшоў!

Музыкі іграюць польку; усе, апрача старых, танцуюць: Адольф з Паўлінкай, другія госці — хто з кім. За сталом Пранцісь са Сцяпанам частуюцца гарэлкай з пляшкі, якую першы прынёс з сабою.

А д о л ь ф *(танцуючы, прыпявае)*.

Танцовала рыба з ракем,
А пятрушка з пастарнакем,
А цыбуля дзівовала,
Цо пятрушка танцовала...

П а ў л і н к а *(адпяваючы)*.

А на печы, на лучыне,
Дзеўкі грошы палічылі;
Налічылі паўталера
Дый купілі кавалера.

А д о л ь ф.

Дзяўчынэчка суха, бледна,
Я да цебе ў госці еду,
І конікаў не жалую,
Ушыстку ночку машырую.

П а ў л і н к а.

У гародзе ячмень родзіць,
А да мяне Якім ходзіць.
Радзі, радзі, ячмень гусцей, —
Хадзі, хадзі, Якім, часцей!

А д о л ь ф.

Сядзіць голуб на галіне,
Салавей на ветке;
С аднэй дзевушкай гуляю,
Другая в прыметке.

П а ў л і н к а.

Ажаніся, не ляніся, —
Будзеш панаваці:
З аднэй будзеш свінні пасвіць,
З другой — заганяці.

А д о л ь ф.

Наша поле камяніста —
Ні праехаць, ні прайсці.
Нашы дзевачкі фарсісты —
Нельга к ім і падысці.

П а ў л і н к а.

Я фарсуха, ты католік;
Не руш мяне за падолік, —
Мой падолік шоўкам шыты,
Хто палезе, будзе біты!

С ц я п а н *(як сціхла гульня)*. Брава, брава, пан Адольф! Складзен да танцаў, як, не раўнуючы, закрыстыян да ружанцаў.

П р а н ц і с ь *(пацягваючы з пляшкі)*. Глупства, глупства, вось-цо-да! Собственно, хоць у кішэні пуста, затое ногі сыплюць густа. Каб яму яшчэ ды мой розум растропны, дык зусім было б добра, пане дабрудзею.

А г а т а. Кінь ты ўжо, тудэма-сюдэма, плявузгаць, як латак у млыне! Гуляюць — няхай гуляюць; ты сваімі качэргамі так не патрапіш.

А л ь ж б е т а *(да Пранціся)*. Можа б чаго, сватка, закусілі?

П р а н ц і с ь. Глупства, вось-цо-да. Собственно, закушу, закушу. *(Да гасцей.)* А вы, пане дабрадзею, забаўляйцеся, пакуль гаспадар вон з хаты не гоне, вось-цо-да.

П а ў л і н к а *(да Адольфа)*. Можа, пан Адольф, спяеце нам што-колечы? Я чула, што вельмі пекны голас маеце.

А д о л ь ф *(астанаўліваючыся)*. Э-э! які там пекны! Ось так сабе! Канешне, лепшы, як у іншых.

К о л ь к і г а л а с о ў. Дык проша спець. Мы ўсе просім.

А д о л ь ф. Калі ўжо так пекна просіце, дык можна. А якую ж бы панна Паўлінка хацела?

П а ў л і н к а. А ўсё роўна, хоць якую! Ну, якая лепей у пана Адольфа выходзе.

А д о л ь ф *(пяе няскладна, махаючы хустачкай па твары)*.

Плываё голэмбі,
Летаё лабэндзі;
З нашэго кахання,
Пэўна, ніц не бэндзе.

П а ў л і н к а. А такі ж нічога не будзе.

А д з і н з г а с ц е й. Ці ж гэта «голэмбі» плываюць, а «лабэндзі» лятаюць?!

А д о л ь ф. Ну, калі перабіваеце, дык саўсім не буду пець.

А л ь ж б е т а. Хай пан Быкоўскі на іх не зважае ды пяе; ведама, — блазнота, што яны знаюць!

П а ў л і н к а *(паглядзеўшы ў акно)*. Выбачайце, пан Адольф! У мяне няўмысле вылецела слаўцо.

К о л ь кі г а л а с о ў. Выбачайце, выбачайце! Просім, просім. Больш не будзем!

П р а н ц і с ь. Собственно, пане дабрудзею, завядзі яшчэ сваю шарманку: яна ў цябе прост, як грамафон, вось-цо-да, трубіць.

А д о л ь ф. Ну, ужо буду! Але калі яшчэ хоць раз перапыніце, тады загневаюся і саўсім кіну пець. Пейце тады самі!

К о л ь кі г а л а с о ў. Не, не! Не будзем!

А д о л ь ф *(пяе)*.

Гляжу я без толку на хладную шаль,
І чорную душу церзае печаль.

П а ў л і н к а *(душачыся ад смеху)*. Ці ж у пана Адольфа чорная душа?

А д з і н з г а с ц е й. Нашто ж глядзіш на яе, пан, без толку?

А д о л ь ф *(насупіўшыся)*. Болей пець вам не буду, хоць на каленях прасіце. Пейце сабе самі, калі такія разумныя! *(Садзіцца.)*

П а ў л і н к а. Дык і спяём, калі пан Адольф такі някемкі, што нават жартаў не разумее. *(Убок.)* Эх, скарэй бы ўсё гэта скончылася!

А д з і н з г а с ц е й. А такі ж спяём, і ўсе разам.

П а ў л і н к а *(да Адольфа хітравата)*. А пан Адольф нам паможа?

А д о л ь ф. Ані думаў.

К о л ь к і г а л а с о ў. А што мы спяём?

П а ў л і н к а. «Дый куды ж ты, дуб зялёны, пахінаешся?..»

А д о л ь ф. Фі, мужыцкая!

П а ў л і н к а. А пан Адольф можа б хацеў, каб завялі якога манчыза?!

Пранціс. Собственно, вось-цо-да, калі такой панскай натуры, дык пазатыкай кудзеляй вушы, пане дабрудзею.

Сцяпан *(да Пранціся, сціха)*. Каханенькі, родненькі, не кратайце яго! Ён, бачыш, як я ўжо і казаў, масціцца да маёй Паўлінкі. Як будзеш яму наругацца, дык гатоў яшчэ адбіцца, а я яго стараюся прыручыць.

Паўлінка. Ну, дык што? Згода на гэту?

Колькі галасоў. Згода, згода!! А пасля другую.

Паўлінка. Толькі не збівацца з толку. Глядзець, як буду я рукамі тахты адбіваць.

Колькі галасоў. Добра, добра!

Пяюць. Паўлінка, сумна ўсміхаючыся, дырыгуе, пасля і Пранціс падходзе і пляшкай адмахвае тахты; музыкі также сваёй ігрой памагаюць.

Дый куды ж ты, дуб зялёны,
Пахінаешся?
Дый чаго ж ты, мой міленькі,
Задумляешся?

Пранціс *(як перасталі пець)*. А цяпер, вось-цо-да, «Як жа мне не пець», пане дабрудзею.

Адольф. Ізноў мужыцкую?

Пранціс. Але, мужыцкую, але, вось-цо-да! А васпан, собственно, сваю панскую схавай свінням на снеданне.

Агата *(падыходзіць і цягне Пранціся за полы)*. Кінь ты ўжо, тудэма-сюдэма, з поля сходзіць!

Пранціс. Вось-цо-да, адчапіся ад мяне, пане дабрудзею!

Паўлінка. Ну, будзем пець «Як жа мне не пець, як жа не гудзець?..».

Пяюць, як першую.

Пранціс *(як скончылі)*. А цяпер, собственно, «Чачотачку», пане дабрудзею.

Колькі галасоў. Чачотачку, чачотачку! *(Пяюць чачотачку.)*

Спарадзіла чачотачка семера дачок,
Спарадзіла невялічкіх семера малых...

А л ь ж б е т а *(як сціхлі)*. Аддыхніце, міленькія, хоць трохі, а то замарыліся дужа. *(Да Пранціся.)* Хадзіце, сваток, за стол, ды можа чаго закусіце, бо і ты ж памагаў.

П р а н ц і с ь *(садзячыся)*. Собственно, глупства, вось-цо-да. Маладым трэба паказаць, паказаць, пане дабрудзею, а яны ўсё патрапяць… правільна толькі навучыць іх. *(Папіваючы з пляшкі, да Сцяпана.)* А ты, сват, трымайся, вось-цо-да. Ім не дам, яны маладзічкі яшчэ, паспеюць.

С ц я п а н. А праўда, праўда, сватка! Яшчэ іх пара не ўцякла. *(Выпівае.)*

П а ў л і н к а *(каля гасцей)*. А што ж мы цяпер будзем рабіць? Ужо напяяліся, дык можа ізноў пагуляема?

П р а н ц і с ь *(закусваючы)*. Собственно, пачакайце, я зараз скамандую, пане дабрудзею, за што і як узяцца, бо мой розум растропны, а вы нічога не ведаеце.

П а ў л і н к а. Ну, добра, пачакаем. *(Да Адольфа.)* Што ж гэта, пан Адольф, надуўся, як мыш на крупы або як апошняе ў печ усыпаўшы?

А д н а з г а с ц е й. Пан Адольф, відаць, закахаўся.

А д о л ь ф. Ну, дык што, калі закахаўся?

П р а н ц і с ь *(пераджоўваючы яду)*. Собственно, цяпер, вось-цо-да, пойдзем лявоніху, пане дабрудзею!

У с е. Лявоніху! Лявоніху!

А д о л ь ф. Ізноў мужыцкае!

П а ў л і н к а *(да Адольфа, прыпадхлебваючыся)*. А мы з панам Адольфам сыпнем лявоніху, сапраўды, сыпнем! Адпусціцеся на мяне, грэшную, болей ці ўдасца так весела з вамі паскакаць.

А д о л ь ф. Ды я ўжо вельмі не гневаюся. Калі ўжо так хочаце, дык пойдзем, што ж там надта такое?!

П р а н ц і с ь *(да музыкаў)*. Собственно, рэжце, пане дабрудзею! *(Да Альжбеты.)* А мы з сваццяй тупнем, вось-цо-да!..

С ц я п а н *(да Агаты)*. А мы з сваццяй, каханенькая, родненькая!

Музыкі іграюць лявоніху. Кабеты трохі ўпіраюцца, але пасля ідуць, за імі іншыя госці. Паўлінка з Адольфам.

П р а н ц і с ь *(прыпявае).*

О, Лявоніха Сымоніха была,
Ды Лявону хлеба, солі не дала!
О, Лявоніха Сымоніха, а-ей!
Не хадзі ламаць капусткі маей!

А л ь ж б е т а.

Хоць капуста зарасла лебядою,
Не пайду яе палоць за табою.
Прападзі ты і з капустай сваёй,
Не сушы ты маладосці маёй!

С ц я п а н.

О, Лявоніха, ты жонка мая,
Дый не мытую сарочку дала;
Не качаную, не мытую,
Толькі шоўкам абашытую.

А г а т а.

А мой татка, дзевярусенька,
Вядзі мяне памалюсеньку.
Не вядзі мяне па пожынцы,
Вядзі мяне па дарожынцы;
Па пожынцы мае ножкі не йдуць,
Па дарожынцы дык самі бягуць.

А д о л ь ф.

Як я бегаў, дык і бегаў,
Абы мілую праведаў;
Як каціўся, дык каціўся,
Абы к мілай прыхіліўся.

П а ў л і н к а.

А калі ж я у матулькі жыла,
Як вішанька у садочку цвіла,
Дасталася злому духу — мужыку,
Ссушыў мяне, як ліпінку у духу.

А д о л ь ф.

> Ты, бярозачка, бярозка мая,
> Ты, бярозка, нецярэбленая;
> Тваё лісце не сярэбранае,
> Нашы дзеўкі непаседлівыя.

П а ў л і н к а.

> Не вядзі мяне ні ў лес, ані ў сад, —
> Завядзі мяне к татульку назад;
> Не вядзі мяне у лес, а ні ў бор, —
> Завядзі мяне к татульку на двор!

П р а н ц і с ь *(як перасталі гульню, да Сцяпана)*. Собственно, і дала ж твая баба мне дыхту, вось-цо-да. Аж лыткі трасуцца, пане дабрудзею.

С ц я п а н. І твая, кахаленькі, родненькі, не адстала, — аж дыхавіцу чуць мне не нагнала.

А г а т а. Абодва вы кавалёвыя мяхі, тудэма-сюдэма, непаваротлівыя, дык і здаецца, што нехта вам дыхту нейкага даваў.

А л ь ж б е т а. А праўда, сваце́йка, праўда. Ім толькі каля пляшкі круціцца, а не з дарэчнымі жанкамі лявоніху ісці.

П р а н ц і с ь. Ага, собственно, добра, што сваце́йка, пане дабрудзею, успомніла *(Дастае пляшку і частуецца з Сцяпанам.)*

П а ў л і н к а *(да Адольфа)*. Ну, як жа пану Адольфу спадабаўся наш мужыцкі танец? Як я ўважаю, дык лепей у вас лявоніха выходзе, чымся тое нейкае «падзі-кварта». І прыпеўкі складныя знаеце.

А д о л ь ф *(нібы скромна)*. А трохі ж нейкіх навучыўся калісь.

А д з і н з г а с ц е й. Пара нам і чэсць знаць! Пэўна, ужо каля поўначы матаецца.

К о л ь к і г а л а с о ў. Так, так, час рухацца дамоў!

П а ў л і н к а *(з аблягчэннем, убок)*. Дзякуй богу!.. *(Да гасцей.)* А можа б яшчэ пагулялі?

А л ь ж б е т а. Каму далёка, то яно так, а каму блізка, дык не шкодзіць яшчэ пазабаўляцца.

К о л ь к і г а л а с о ў. Не! Не! Ужо час і пара́!

П а ў л і н к а. Ну, дык хай музыкі на адходнае хоць марша зайграюць, каб весялей усім снілася і каб моцна, моцна ўсім спалася.

С ц я п а н. А гэта не шкодзіць. *(Да музыкаў.)* Што ж, каханенькія, родненькія, зайграйце, калі ласка, яшчэ штоколечы на адходнае дарагім госцікам, а там дзве дзюркі ў носе і скончылося.

Музыкі іграюць марш. Госці адзяваюцца, адвітваюцца і выходзяць, за імі — музыкі.

З'ява V

П а ў л і н к а, А д о л ь ф, С ц я п а н, А л ь ж б е т а, П р а н ц і с ь і А г а т а

С ц я п а н. Вось і пацішэла трохі ў нашай хаце, няма ўжо каму скакаці.

П р а н ц і с ь. Собственно, глупства, вось-цо-да. Было шумна, пане дабрудзею, і будзе шумна!

А г а т а. А так, так, тудэма-сюдэма, як будзе вяселле ў Паўлінкі.

П а ў л і н к а. Э-э, майго вяселля ніколі не будзе, значыцца, і шумна не будзе!

А д о л ь ф. Ці ж у бацькоў маладога, паненка, думаеце, не хваце на вяселле?

П а ў л і н к а. Хваце не хваце, а такі вяселля майго ніхто не ўбача...

С ц я п а н. Гэта, каханенькая, родненькая, пабачым. Яшчэ я на тое ёсць, і ў сваёй хаце гаспадар, а не госць! Жыта повен аруд і сала не адзін пуд.

П р а н ц і с ь. Собственно, глупства, вось-цо-да. Часам ці вяселле, ці павесіў — адно на другое, пане дабрудзею, выходзе.

А г а т а. А ты, «вось-цо-да», прыкусі свой язык і не тыцкайся, тудэма-сюдэма, туды, куды цябе не просяць. Напіўся, наеўся, дык і маўчы!

А л ь ж б е т а *(да Агаты)*. Што ж там, свацейка, такое? Сват жа нічога благога не кажа. *(Да Паўлінкі.)* Прыбірай ты ўжо, дзеткі, са стала.

П р а н ц і с ь. Собственно, ці свінні елі, ці шляхта папасавалася — гэтак, вось-цо-да, стол выглядае, пане дабрудзею.

П а ў л і н к а. Добра, мамка, зараз. *(Да Адольфа.)* А пан Адольф мне паможа!

А д о л ь ф. Калі патраплю, дык чаму ж не?

Прыбіраюць са стала; пасудак стаўляюць на табурэце, каля самавара.

А л ь ж б е т а. Вы бы, дзеткі, заняслі пасудак на тую палавіну.

П а ў л і н к а. Усё роўна, я пасля занясу сама, а цяпер... *(паглядаючы хітравата на Адольфа)* я баюся з панам Адольфам ісці адна на тую палавіну!..

А д о л ь ф *(несучы пасудак, убок)*. Відаць, дзеўка ўлялюскалася ў мяне па самую шыю.

П а ў л і н к а *(ідучы к сталу, убок)*. І собіла ж Богу стварыць гэткую чапялу недарэчную!

П р а н ц і с ь *(да Паўлінкі)*. А праўда, собственно, лепш старожа, як варожа, пане дабрудзею.

А г а т а *(да Пранціся)*. А ты, «старожа», не мялі попусту, а думай, як дахаты ісці.

П р а н ц і с ь. Пане дабрудзею, дык і пойдзем; што ж там, собственно, такое.

Развітваюцца абое і выходзяць. Альжбета памагае прыбіраць са стала.

З'ява VI

П а ў л і н к а, А д о л ь ф, С ц я п а н, А л ь ж б е т а

П а ў л і н к а. Не так, пан Адольф, бярэш шклянкі; трэба вось як. *(Паказвае.)* Ну, і зграбны ж! не раўнуючы — як вол да карэты.

А д о л ь ф. А панна Паўлінка ўсё капліменты мне гавора.

П а ў л і н к а *(убок)*. Дурню плюнь у вочы, а ён скажа: дождж ідзе!

А л ь ж б е т а *(да Сцяпана, які клюе носам за сталом)*. Што ты табаку важыш? Ідзі ды кладзіся спаць. Гэта ж табе тут не карчма!

С ц я п а н *(сонна)*. Каханенькая, родненькая, я наважу, а ты купіш. Сон — не кепская рэч. Для чаго калядкі — добрыя святкі, што пад'еў ды на палаткі. *(Вылазячы з-за стала, да Адольфа.)* Каханенькі, родненькі, выбачай... Забаўляйся тут з Паўлінкай, а я прыкархну трохі... Сягоння яшчэ досві-

та мяне мая ўспарола. *(Адводзячы Адольфа ў старану.)* Ну, што? Як мая Паўліна... падышла пад мысль?

А д о л ь ф. О, важная маладзіца! Хоць сягоння гатоў з ёю жаніцца.

С ц я п а н. Ну, так тупай каля яе; толькі смела; яна дзеўка падатлівая, хоць можа і мае трохі якіх мухаў у носе.

А д о л ь ф. Хэ-хэ-хэ! Я да ўсякай патраплю падлізацца.

С ц я п а н. Ну, дык падлізывайся, каханенькі, родненькі. *(Адвітваецца і ідзе ў бакоўку.)*

З'ява VII

П а ў л і н к а, А д о л ь ф, А л ь ж б е т а

А л ь ж б е т а *(сціраючы стол)*. А ты, Паўлінка, можа ў карты пайграеш з панам Адольфам?

А д о л ь ф *(закурваючы)*. Ды і мне ўжо трэба збірацца дамоў.

П а ў л і н к а. Ці ж пан Адольф рассыпаўся, што маніцёся збірацца? Заедзеце яшчэ; каня ж маеце не жартачкі!..

А д о л ь ф. О, конь мой добры!

А л ь ж б е т а. Ну, дык і чаго ж спяшацца?.. Нам, старым, як той кажа, такая рэч: пад'еў ды на печ.

П а ў л і н к а *(убок)*. Чаго добрага — заначуе, вось будзе бяда! *(Голасна.)* А пагода сягоння нядрэнная. Нават месяц свеціць, што рэдка на пакровы. Будзе добра для пана Адольфа дамоў ехаць.

А д о л ь ф. А хоць бы і дрэнная, дык мне блізка, жарабец мой у момант дамчыць.

А л ь ж б е т а *(да Паўлінкі)*. Ну, дык паглядзі ж ты, дзе карты, ды пазабаўляйцеся яшчэ трохі з панам Адольфам, бо я, мусіць, зраблю следам за дзедам. Трохі ж сягоння такі натупалася.

А д о л ь ф. Проша, проша, панічка! На нас, маладых, не зважайце.

А л ь ж б е т а. А ўжо ж я такі і пайду.

А д о л ь ф *(цалуючы ў руку Альжбету)*. Хутка і я паеду, вось толькі дам аднаго гаспадара панне Паўлінцы.

П а ў л і н к а. Паглядзім — хто каму?!

Шукае карт. А л ь ж б е т а выходзіць у бакоўку.

З’ява VIII

П а ў л і н к а, А д о л ь ф

А д о л ь ф. Чаго паненка шукае?

П а ў л і н к а. Таго, чаго яшчэ не маю, — карт.

А д о л ь ф *(глянуўшы на акно).* А вось яны, на акне.

П а ў л і н к а *(убок).* Думала, што не ўбачыць; скарэй бы можа з хаты выпхнула, не найшоўшы карт. *(Да Адольфа.)* Ну, калі ёсць, дык будзем іграць. *(Паглядзеўшы ў акно.)* А ў што?

А д о л ь ф. У гаспадара.

П а ў л і н к а. Гэта, значыцца, у дурня?

А д о л ь ф. Ну, гэта толькі мужыкі так гавораць. *(Раздае карты.)*

П а ў л і н к а. А як пан Адольф думаў, хто мы? То ж таксама мужыцкага роду.

А д о л ь ф. Першы раз чую!

П а ў л і н к а. Ды і пан Адольф таксама мужыцкага роду. *(Іграюць у карты.)*

А д о л ь ф *(здзіўлены).* І я?!

П а ў л і н к а. Але, але! Калісь былі ўсе мужыкі, ну дык цяпер кожны чалавек мужыцкага роду, хоць каторы і прыкідваецца панам ці графам. Ды і што гаварыць! Адам і Ева і то былі мужыкамі.

А д о л ь ф *(здзіўлены).* Адам і Ева?!

П а ў л і н к а. І Ной, і Езус...

А д о л ь ф. Што я чую? Адкуль гэта, панна Паўлінка, усё ведаеце?

П а ў л і н к а. Ого, не скажу!

А д о л ь ф *(просячы).* Проша сказаць.

П а ў л і н к а. Не тэй б’іце! Вот салапяка!

А д о л ь ф *(паправіўшыся).* Ды скажыце!

П а ў л і н к а *(нецярпліва).* Ну, добра. Запытайцеся ў Якіма Сарокі: ён усё вам раскажа. *(Адольф праігрывае.)* Дурань пан! Дурань пан!

А д о л ь ф *(папраўляючы).* Гаспадар. *(Раздае карты.)*

П а ў л і н к а *(убок).* Які чорта гаспадар, калі дурань?

А д о л ь ф. Што панна Паўлінка кажа?

П а ў л і н к а. Кажу: але, гаспадар. *(Хвілю маўчаць. Паўлінка ўбок.)* Што тут гаварыць з гэтай вандзонкай. І трымае ж яго нядобрае! *(Да Адольфа.)* А ці, пан Адольф, жаніцца хочаце?

А д о л ь ф. Ой, страшэнна хачу. А панне Паўлінцы замуж хочацца?

П а ў л і н к а. Ого, яшчэ і як хочацца!.. Калі ўдасца, дык яшчэ і сягоння, мажа, пайду.

А д о л ь ф. А я ж яшчэ з таткам і мамкай вашымі нічога аб гэтым не гаварыў.

П а ў л і н к а. Аб чым — аб гэтым?

А д о л ь ф. Ну, аб тым, як я жаніцца буду, а панна Паўлінка замуж ісці. *(Праігрывае.)*

П а ў л і н к а. Ізноў пан дурнем! Ізноў дурнем!

А д о л ь ф. Гаспадаром!.. *(Раздае карты.)*

П а ў л і н к а. А можа ўжо будзе? Нешта спаць як бы хочацца. *(Зявае, устае і паглядае ў акно. Убок.)* А што, калі не прыйшоў?

А д о л ь ф *(не пачуўшы)*. Хто не пайшоў?

П а ў л і н к а. Я кажу, каб хаця дождж не пайшоў. *(З удаванай жаласцю.)* Я так жалею, так жалею пана Адольфа, каб не замок, што аж тут нешта трасецца. *(Паказвае на грудзі.)*

А д о л ь ф. І я таксама панну Паўлінку жалею і цяпер, і потым.

П а ў л і н к а. Калі гэта потым? Як пан Адольф яшчэ дурня возьме?

А д о л ь ф. Ды не! Тады, як будзем... як будзем... ну, як гэта сказаць?

П а ў л і н к а. Ізноў скруціў! *(Папраўляе.)* Вось гэтак было, гэтак біць трэба, а з гэтай хаджу, і пан Адольф ізноў дурань, дурань, дурань!

А д о л ь ф. Гаспадар!

П а ў л і н к а. Усё роўна, хоць гаспадар, але, як карты паказваюць, дык дурань!

А д о л ь ф. Хай будзе і так! Цяпер за тое, што панна Паўлінка мяне гэтак абыграла, вазьму ды паеду. *(Устае.)*

П а ў л і н к а *(з аблягчэннем, убок)*. Сабраўся-такі нарэшце.

А д о л ь ф. Дабранач панне Паўлінцы! Проша чакаць, — я прыеду па канчатак.

П а ў л і н к а. Забярыце лепей яго цяпер!

А д о л ь ф. Каго?

П а ў л і н к а. Ды канчатак той.

А д о л ь ф. А панна Паўлінка ўсё жартуе. *(Адвітваецца. Выходзячы, убок.)* Вот так на ўсе бакі дзеўка! Адным словам, як сторублёвая кабыла. Гэткая — дыхт для мяне жонка!

З’ява IX

П а ў л і н к а *(адна)*

П а ў л і н к а *(неспакойна)*. А той, можа, хай бы лепей і не прыйшоў. Так усё неяк у сярэдзіне трасецца... І нашто гэта я яму абяцала? Лепей было б пачакаць. Што тут рабіць? *(Ходзіць ад акна да акна і пaглядае.)* Падшахнула ж мяне нядобрае на згоду прыстаць! *(Сумна-весела.)* А можа не прыйдзе?.. *(Сумна.)* А калі не прыйдзе, то, значыцца, ён ужо мяне не любіць болей. Не, няхай прыйдзе лепей, а там — што будзе, то будзе. Трэба паваражыць. *(Стукае ў пальцы.)* Прыйдзе, не прыйдзе, прыйдзе, не прыйдзе, прыйдзе... *(Весела.)* Прыйдзе, прыйдзе! А цяпер — любіць ці не любіць? Ну, гэта трэба на карты паваражыць. *(Бярэ і перакідае карты.)* Любіць, не любіць, к сэрцу прыжме, к чорту пашле; любіць, не любіць, к сэрцу прыжме... *(Весела.)* Так, так, любіць, к сэрцу прыцісне! Ну, раз карты гэтак паказалі, то трэба збірацца. Але мушу ўперад паслухаць, ці спяць старыя. *(Ідзе і падслухоўвае ў дзверах бакоўкі.)* Спяць, ажно храпуць, як бы суконкі дралі. *(Падыходзіць, глядзіць у акно, задумваецца.)* Што тут узяць? Ага, трэба заглянуць у куфар. *(Адчыняе куфар, капаецца ў ім; дастае пацеркі і прымярае.)* Во! Гэта дык трэба забраць, — так мне з імі да твару ідзе. Ну, сукенку новую таксама трэба ўзяць. Усё гэта звяжам у хустку. *(Рассцілае хустку і складвае свае рэчы.)* А-а, і чаравічкі мушу забраць, бо ў чым жа я з ім бегаць буду? Шнуровачку такжа вазьму, бо хто ж яе тут будзе насіць?.. І-і!! ужо болей, здаецца, нічога. *(Звязвае і ідзе к ложку. Чуваць шорах за акном. Паўлінка сціхае.)* Ай, хтось там прыйшоў! *(Весела.)* Прыйшоў мой міленькі, прыйшоў! Такі карты праўду паказалі. *(Ідзе к акну.)* Хто там?

Г о л а с з-з а а к н а *(прыдушаны)*. Я!.. Я!..

П а ў л і н к а *(угледаючыся ў акно, убок)*. Нічагутанькі не відаць! Цемната страшэнная! *(У акно.)* Хто — я?

Г о л а с. Я!.. Я!.. Ну, ці ж не пазнала?

П а ў л і н к а. Пачакай мінутку. Вось я зараз. Толькі падушачкі звяжу і коўдру.

Г о л а с. Ды мне нічога не трэба!

П а ў л і н к а. Мала што не трэба, а я вазьму… *(Хутка ідзе к ложку, звязвае падушкі і коўдру ў посцілку.)* Ну, ужо гатова! *(Адчыняе акно і выкідвае вузлы.)* Пераймай, а зараз — і мяне! *(Да сябе.)* Трэба з бакоўкі ўзяць верхнюю вопратку і хустку, толькі б хаця ж старыя не прабудзіліся. *(Зніжае агонь у лямпе і ідзе ў бакоўку. Па нейкім часе выходзіць стуль адзеўшыся.)* А цяпер і сябе трэба выкінуць! *(Шыбка ідзе к акну. Чуваць шорах у бакоўцы.)* Ай, нехта ўстаў!

З'ява X

П а ў л і н к а, С ц я п а н

С ц я п а н *(выбягае з бакоўкі, ахінуўшыся коўдрай)*. Хто тут? Хто тут лазіць апоўначы? Альжбета! Альжбета! Хутчэй сюды! *(Паўлінка, перахрысціўшыся, кідаецца ў акно. Сцяпан убачыў.)* Гвалт! Злодзей! *(Бяжыць к акну і хватае Паўлінку за ногі.)* Альжбета! Скарэй сюды! Стрэльбу хватай!!.

З'ява XI

П а ў л і н к а, С ц я п а н, А л ь ж б е т а

А л ь ж б е т а *(выбягае — як Сцяпан — акрыўшыся коўдрай; уся трасецца)*. Матачка найсвентшая! Што тут робіцца?! *(Мацае па сцяне.)* Зараз, зараз нясу стрэльбу. *(Хватае за гіру ад гадзінніка, гадзіннік з грохатам валіцца са сцяны і разбіваецца.)* Ай, што ж я нарабіла!!

С ц я п а н *(трымаючы Паўлінку за ногі, да Альжбеты)*. Куды цябе немач уперла? Падкруці хутчэй кнот ды памажы цягнуць!..

А л ь ж б е т а *(бяжыць к лямпе)*. Ужо, ужо!

П а ў л і н к а *(перавесіўшыся праз акно)*. Цягні, братка, ямчэй!

А л ь ж б е т а *(падкруціўшы кнот і бегучы к Сцяпану)*. Божухна мой! Гэта ж Паўлінка! Скуль ты ўзяў таго злодзея?

С ц я п а н. Каханенькая, родненькая, не мялі языком ды вось памагай цягнуць; там нейкі гад яе за рукі трымае.

П а ў л і н к а. Мацней, мацней, браток!

А л ь ж б е т а *(памагаючы Сцяпану цягнуць)*. Што ты, дзеткі, здурэла, ці што?.. *(Сцягваюць Паўлінку з акна на хату.)*

С ц я п а н. Ты гэта, каханенькая, родненькая, куды манілася ляцець?

П а ў л і н к а *(апіраючыся рукой аб стол, патупіўшыся)*. Я!.. Я!.. хацела замуж ісці!

С ц я п а н і А л ь ж б е т а. Праз акно?!

П а ў л і н к а. А што ж калі татка і мамка праз дзверы не пускаеце.

З’ява XII

Тыя ж і П р а н ц і с ь, А д о л ь ф, А г а т а

П р а н ц і с ь *(без шапкі ўвальваецца ў хату, трымаючы за каўнер Адольфа)*. Собственно, пане дабрудзею, злодзея, злодзея злавіў, вось-цо-да.

А г а т а *(цягнучы вузлы)*. А як жа, тудэма-сюдэма, з гэтымі катомкамі каля вашага акна капаўся.

П а ў л і н к а, С ц я п а н і А л ь ж б е т а. Пан Быкоўскі?

П р а н ц і с ь. А так, так, пане дабрудзею. Адольф, Адольф! Злодзей, собственно, вось-цо-да!

С ц я п а н *(да Адольфа)*. Дык гэта ты мне хацеў дачку ўкрасці, зладзюга, каханенькі, родненькі!

А д о л ь ф *(заікаючыся і не разумеючы, у чым рэч)*. Я... я... збіўся тут каля саду з дарогі, дык хацеў у панны Паўлінкі запытацца праз акно, кудой выехаць...

П р а н ц і с ь. Собственно, злодзей, злодзей! Вузлы з хаты праз акно павыцягваў. Можа і шапку маю ўкраў.

А г а т а. Ты зараз, п’яніца, тудэма-сюдэма, і галаву забудзешся. Гэта ж аж дамоў даваломся і тады толькі агледзеўся, што шапкі забыўся.

П р а н ц і с ь. Собственно, а баба нашто, — каб усяго пільнавала. Але злодзея, пане дабрудзею, злавіў, злавіў, вось-цо-да.

С ц я п а н *(да Паўлінкі)*. Дык гэта ты, каханенькая, родненькая, за яго хацела замуж уцякаць, як даведалася, што гэнага гада, гэнае плюгаўства за афішкі арыштавалі?

П а ў л і н к а *(глуха)*. Божухна мой, божа! Якімку арыштавалі!!

С ц я п а н *(самадавольна)*. Хе-хе-хе! ужо гэтае мужыцкае насенне не будзе больш нашых сцежак паганіць.

П а ў л і н к а. Якімку арыштавалі! Майго саколіка ненагляднага арыштавалі.

С ц я п а н *(да Адольфа)*. А ты, каханенькі, родненькі, негадзяй, вірутнік з-пад цёмнай гвязды, вон з маёй хаты, каб твая і нага тут не была! Не мог, як трэба, па-хрысціянску — з сватам, з запаведзямі маю дачку ўзяць, але, як злодзей, хацеў праз акно вывалачы! Вон! Вон!

А д о л ь ф. Я... я... толькі хацеў дарогі запытацца...

П р а н ц і с ь *(развязваючы вузлы)*. Собственно, злодзей, пане дабрудзею! Падушкі і сукенкі дзявочыя праз акно пакраў. К ураднiку, марш! К ураднiку, гіцаль, вось-цо-да!

П а ў л і н к а. Якімку арыштавалі! Маю зорачку ясную арыштавалі. *(Дзіка.)* Ха-ха-ха! Звяры сляпыя!!! *(Як сноп, валіцца на зямлю. Суматоха. Крыкі: «Вады! Вады...»)*

П р а н ц і с ь. Собственно, пане дабрудзею, у мяне ёсць кроплі. *(Дастае з кішэні пляшку і пырскае ў твар Паўлінцы гарэлкай.)*

А г а т а *(кідаючыся да Пранціся)*. Тудэма-сюдэма, ашалеў!..

С ц я п а н *(панура)*. Каханенькія, родненькія, дзве дзюркі ў носе і скончылося.

Заслона

1. Чаму Паўлінка і Якім Сарока сустракаюцца ў сакрэце ад бацькоў?
2. Якія выказванні і паводзіны Паўлінкі сведчаць пра тое, што яна кахае маладога настаўніка?
3. Па якіх каларытных выслоўях Сцяпана Крыніцкага і Пранціся Пустарэвіча іх можна адрозніць паміж сабой?
4. Як ставіцца Паўлінка да сваіх бацькоў?
5. Знайдзіце ў тэксце другога акта п’есы неабходны матэрыял для характарыстыкі Адольфа Быкоўскага, Сцяпана Крыніцкага, Пранціся Пустарэвіча, падкрэсліўшы пыхлівасць, духоўную абмежаванасць засцянковай шляхты.

6. Складзіце план характарыстыкі аднаго з разгледжаных на ўроку персанажаў камедыі. Адбярыце матэрыял для вуснага паведамлення «Якой я ўяўляю сабе Паўлінку?».
7. Каму з герояў аўтар сімпатызуе, каго асуджае, высмейвае?
8. Знайдзіце ў творы прыклады камічнага паказу персанажаў і паспрабуйце адрозніць, дзе камізм не злосны (гэта значыць ужываецца гумар), а дзе — надзвычай востры, з'едлівы, іншымі словамі, пісьменнік выкарыстоўвае сатыру.
9. Якімі прыёмамі і сродкамі ствараюцца смешныя, камічныя сцэны, вобразы герояў? Прывядзіце прыклады.
10. Калі ёсць магчымасць, падрыхтуйце для інсцэніраванага прадстаўлення якую-небудзь сцэну з камедыі «Паўлінка». Падумайце, як аформіць гэту сцэну, апрануць выканаўцаў. Звярніце ўвагу на фотаздымкі выканаўцаў адной з галоўных роляў (Паўлінкі). (Гл. уклейку).
11. Падрыхтуйце вуснае або пісьмовае сачыненне-разважанне па адной з прапанаваных у выглядзе пытанняў тэм: 1) што з'яўляецца галоўнай перашкодай на шляху Паўлінкі да шчасця? 2) якія рысы характару Паўлінкі дазваляюць атаясамліваць яе вобраз з вобразам Беларусі пачатку XX ст.?
12. Улічваючы разгляд усіх папярэдніх пытанняў, вызначце жанр п'есы Янкі Купалы «Паўлінка».
13. Якія іншыя драматычныя творы вы чыталі або глядзелі ў тэатры, па тэлевізары? Якіх беларускіх драматургаў, артыстаў ведаеце?

Пытанні і заданні да раздзела

1. Чым адрозніваюцца драматычныя творы ад эпічных і лірычных?

2. Якімі сродкамі і прыёмамі паказу жыцця вызначаюцца драматычныя творы?

3. Назавіце асноўныя жанры драматычнага роду. Чым яны адрозніваюцца адзін ад аднаго ў паказе жыцця і герояў?

4. Каго вы ведаеце з беларускіх драматургаў? Прыгадайце самых выдатных драматургаў свету. Назавіце вядомыя вам творы гэтых аўтараў або пастаўленыя па іх спектаклі.

5. Напішыце пісьмовы водзыў на прагледжаны вамі спектакль ці фільм.

6. Падрыхтуйце выразнае чытанне ўрыўка з драматычнага твора (на ваш выбар).

Максім Танк

* * *

Я спытаў чалавека,
Які прайшоў праз агонь,
І воды,
І медныя трубы:
— Што самае цяжкое
На гэтым свеце?
І ён адказаў:
— Прайсці праз вернасць.

Сяргей Чыгрын

ТРЫЯЛЕТ

Чыстая, вясёлая вада
З красавіцкім сонейкам у згодзе.
Па балоце першы бусел ходзіць —
Чыстая, вясёлая вада.
Будзе шчасце, кажуць у народзе,
Буслу кола пакладзі на дах.
Чыстая, вясёлая вада
З красавіцкім сонейкам у згодзе.

ДАВЕДНІК ПРА АЎТАРАЎ ТВОРАЎ, ЗМЕШЧАНЫХ У ВУЧЭБНЫМ ДАПАМОЖНІКУ

Максім Багдановіч (1891—1917) — нарадзіўся ў Мінску. Раннія дзіцячыя гады правёў у Гродне, пасля жыў і вучыўся ў Ніжнім Ноўгарадзе і Яраслаўлі. Скончыў юрыдычны ліцэй і восенню 1916 г. пераехаў у Мінск. Цяжкая хвароба прымусіла паэта ехаць на лячэнне ў Ялту, дзе ён і памёр.

Першы твор — апавяданне «Музыка» — М. Багдановіч апублікаваў у 1907 г. У 1914 г. у Вільні выдаў зборнік вершаў «Вянок». Напісаў паэмы «Страцім-лебедзь», «Максім і Магдалена», для дзяцей — паэму-казку «Мушка-зелянушка і камарык — насаты тварык». Вядомы як публіцыст, літаратурны крытык, перакладчык. Многія творы паэта пакладзены на музыку.

Рыгор Барадулін — народны паэт Беларусі. Нарадзіўся ў 1935 г. на Віцебшчыне. Скончыў Ушацкую сярэднюю школу, БДУ.

Першы зборнік вершаў «Маладзік над стэпам» выйшаў у 1959 г. Аўтар шматлікіх зборнікаў паэзіі, кніг літаратурна-крытычных артыкулаў. Плённа працуе ў галіне перакладу. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы.

Данута Бічэль нарадзілася ў 1938 г. на Гродзеншчыне. Скончыла Гродзенскі педагагічны інстытут імя Янкі Купалы. Працавала настаўніцай, старшым навуковым супрацоўнікам Гродзенскага абласнога гісторыка-археалагічнага музея.

Аўтар зборнікаў вершаў «Дзявочае сэрца», «Запалянкі», «Дзе ходзяць басанож» і інш., а таксама шматлікіх кніг для дзяцей. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы.

Васіль Быкаў (1924—2003) — народны пісьменнік Беларусі. Нарадзіўся на Віцебшчыне. Вучыўся ў Віцебскім мастацкім вучылішчы. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Быў двойчы паранены. З вайсковай службай канчаткова развітаўся толькі ў 1955 г.

Аўтар шматлікіх кніг апавяданняў і аповесцей — «Жураўліны крык», «Альпійская балада», «Сотнікаў», «Абеліск», «Знак бяды», «Аблава», «Сцюжа» і інш. Лаўрэат Ленінскай прэміі, Дзяржаўных прэмій СССР і БССР.

Анатоль Вярцінскі нарадзіўся ў 1931 г. на Віцебшчыне. Скончыў БДУ. Працаваў у газеце «Літаратура і мастацтва», выдавецтве «Беларусь», Саюзе пісьменнікаў БССР. Выдаў кнігі вершаў і паэм «Песня пра хлеб», «Тры цішыні», «Святло зямное» і інш. Напісаў п’есы для дзяцей «Дзякуй, вялікі дзякуй», «Гефест — друг Праметэя», «Скажы сваё імя, салдат». Працуе ў галіне перакладу. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР.

Сяргей Грахоўскі (1913—2002) нарадзіўся на Піншчыне. Скончыў літаратурны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута. У 1936 г. быў рэпрэсіраваны, 17 гадоў знаходзіўся ў лагеры і ссылцы. Аўтар зборнікаў лірычных вершаў, апавяданняў, аўтабіяграфічнай кнігі «Споведзь», за якую ў 1992 г. атрымаў Дзяржаўную прэмію Рэспублікі Беларусь імя Якуба Коласа.

Анатоль Грачанікаў (1938—1991) нарадзіўся на Гомельшчыне. Скончыў Беларускі інстытут чыгуначнага транспарту. Працаваў у газеце «Літаратура і мастацтва», у розныя гады ўзначальваў часопісы «Вясёлка», «Бярозка», «Маладосць». Упершыню выступіў у друку ў 1957 г. Аўтар некалькіх зборнікаў вершаў, кніг для дзяцей. Працаваў у галіне перакладу. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР.

Леанід Дайнека нарадзіўся ў 1940 г. на Магілёўшчыне, аўтар паэтычных твораў і гістарычных раманаў «След ваўкалака», «Жалезныя жалуды», «Меч князя Вячкі».

Генрых Далідовіч нарадзіўся ў 1946 г. на Стаўбцоўшчыне. Скончыў БДУ, працаваў настаўнікам беларускай мовы і літаратуры. З 1973 г. — у рэдакцыі часопіса «Полымя», з 1979-га па 2002 г. — у часопісе «Маладосць».

Аўтар зборнікаў прозы «Дажджы над вёскай», «Цяпло на першацвет», «Маладыя гады» і інш. Працуе і ў жанры рамана: «Гаспадар-камень», «Пабуджаныя», «Свой дом», «Заходнікі». Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь імя Якуба Коласа.

Аляксей Дудараў — беларускі драматург. Нарадзіўся ў 1950 г. на Віцебшчыне. Скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут, быў акцёрам Тэатра юнага гледача, галоўным рэдактарам часопіса «Мастацтва». Друкуецца з 1973 г. Выдаў зборнік апавяданняў «Святая птушка». Аўтар п’ес «Вечар», «Парог», «Радавыя» і інш. Па сцэнарыях А. Дударава зняты мастацкія фільмы «Купальская ноч», «Восеньскія сны», «Белыя росы» і інш. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР за спектакль «Радавыя».

Васіль Зуёнак нарадзіўся ў 1935 г. на Міншчыне. Скончыў БДУ. Працаваў у газеце «Піянер Беларусі», часопісах «Бярозка», «Маладосць», Саюзе пісьменнікаў БССР. Выступае ў друку з 1954 г. Аўтар шматлікіх зборнікаў вершаў, у тым ліку гумарыстычных, кніг літаратурна-крытычных артыкулаў, нарысаў, твораў для дзяцей. Перакладае з рускай, украінскай, балгарскай і іншых моў. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы.

Віктар Карамазаў — беларускі празаік і публіцыст. Нарадзіўся ў 1934 г. на Магілёўшчыне. Скончыў БДУ. Працаваў у газетах «Звязда», «Літаратура і мастацтва», у часопісе «Полымя». Аўтар кніг аповесцей і апавяданняў «Падранак», «Вясёлка сярод зімы», «Дзяльба кабанчыка» і інш., раманаў «Пушча», «Бежанцы».

Уладзімір Караткевіч (1930—1984) нарадзіўся ў Оршы. Скончыў філалагічны факультэт Кіеўскага ўніверсітэта імя Т. Р. Шаўчэнкі. Працаваў настаўнікам. Аўтар зборнікаў апавяданняў і аповесцей «Блакіт і золата дня», «Чазенія», «Вока Тайфуна», раманаў «Каласы пад сярпом тваім», «Хрыстос прызямліўся ў Гародні», «Нельга забыць», «Чорны замак Альшанскі» і інш., зборнікаў паэзіі «Матчына душа», «Мая Іліяда», «Быў. Ёсць. Буду», п’ес «Маці ўрагану», «Званы Віцебска», «Калыска чатырох чараўніц» і інш. Пачынальнік гістарычнай тэмы ў сучаснай беларускай літаратуры. Выступаў як публіцыст і крытык. Працаваў як перакладчык. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа.

Якуб Колас (Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч, 1882—**1956)** — народны паэт Беларусі. Нарадзіўся на Стаўбцоўшчыне ў сям’і лесніка. Скончыў Нясвіжскую настаўніцкую семі-

нарыю, настаўнічаў, выкладаў у Мінскім беларускім педагагічным тэхнікуме, БДУ, з 1929 г. быў нязменным віцэпрэзідэнтам Акадэміі навук БССР.

Дэбютаваў вершам «Наш родны край» (1906). Першы зборнік вершаў «Песні-жальбы» выйшаў у Вільні ў 1910 г., затым — кнігі прозы «Апавяданні», «Родныя з'явы». У савецкі час выдадзены кніга апавяданняў «Казкі жыцця», зборнік вершаў «Водгулле», паэмы «Новая зямля», «Сымонмузыка», трылогія «На ростанях», п'есы. Якуб Колас — аўтар шматлікіх твораў для дзяцей: паэмы «Міхасёвы прыгоды», вершаванай казкі «Рак-вусач», вершаў. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.

Уладзімір Корбан (1910—1971) — беларускі байкапісец. Нарадзіўся на Віцебшчыне. Працаваў у часопісе «Вожык» (1952—1971). Аўтар зборнікаў сатырычных вершаў, баек і фельетонаў, гумарыстычных апавяданняў, кніжак для дзяцей. Пераклаў на беларускую мову байкі І. А. Крылова.

Кандрат Крапіва (Кандрат Кандратавіч Атраховіч, 1896—1991). Народны пісьменнік Беларусі. Нарадзіўся на Міншчыне. Працаваў настаўнікам, рэдактарам часопіса «Вожык», дырэктарам Інстытута мовазнаўства АН БССР (1952—1956), віцэ-прэзідэнтам АН БССР (1956—1982). Аўтар шматлікіх кніг сатыры і гумару: «Асцё», «Крапіва», «Байкі» і інш. Напісаў п'есы «Хто смяецца апошнім», «Мілы чалавек», «Канец дружбы», «Брама неўміручасці» і інш. Выдаў зборнікі прозы. Аўтар літаратуразнаўчых і крытычных прац. Пераклаў на беларускую мову творы І. А. Крылова, А. С. Пушкіна, М. В. Гогаля, У. Шэкспіра і інш. Тройчы лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.

Аркадзь Куляшоў (1914—1978) — народны паэт Беларусі. Нарадзіўся на Магілёўшчыне. Працаваў у газеце «Чырвоная змена», на Беларускім радыё, на кінастудыі «Беларусьфільм». У 1930 г. выйшаў першы зборнік вершаў «Росквіт зямлі». Аўтар зборнікаў паэзіі «Сцяг брыгады», «На сотай вярсце», «Новая кніга», «Сасна і бяроза», «Крылы» і інш., шматлікіх паэм. Пераклаў на беларускую мову творы А. С. Пушкіна («Цыганы», «Яўгеній Анегін»), М. Ю. Лермантава, С. Ясеніна і інш. Лаўрэат Дзяржаўных прэмій СССР і БССР.

Янка Купала (Іван Дамінікавіч Луцэвіч, 1882—1942) — народны паэт Беларусі. Нарадзіўся ў фальварку Вязынка на Маладзечаншчыне ў сям'і арандатара. Скончыў Бяларуцкае народнае вучылішча, вучыўся ў Маскве, Пецярбургу. Удзельнічаў у стварэнні нацыянальнага тэатра, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Акадэміі навук БССР.

У літаратуру ўвайшоў вершам «Мужык» (1905), а ў 1908 г. выдаў першы паэтычны зборнік «Жалейка». Аўтар зборнікаў вершаў «Гусляр», «Шляхам жыцця», «Спадчына», «Безназоўнае» і інш., паэм «Курган», «Магіла льва», «Сон на кургане» і інш., п'ес «Паўлінка», «Раскіданае гняздо», «Тутэйшыя» і г. д. Напісаў шмат твораў для дзяцей («Хлопчык і лётчык», «Алеся» і інш.). Пераклаў на беларускую мову «Слова пра паход Ігаравы», творы А. С. Пушкіна, Т. Р. Шаўчэнкі, І. А. Крылова, А. Міцкевіча і інш. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.

Алесь Наўроцкі нарадзіўся ў 1937 г. на Гомельшчыне. Скончыў Мінскі медыцынскі інстытут. Працаваў фельчарам. Аўтар зборнікаў вершаў «Неба ўсміхаецца маланкаю», «Гарачы снег» і інш., кнігі апавяданняў «Валун».

Янка Сіпакоў (1936—2011) нарадзіўся на Віцебшчыне. Скончыў БДУ. Працаваў у часопісах «Вожык», «Маладосць». Выдаў некалькі кніг паэзіі, аповесцей і апавяданняў, нарысаў. Пераклаў на беларускую мову творы А. С. Пушкіна, Т. Р. Шаўчэнкі, А. Блока, У. Уітмена і інш. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР.

Максім Танк (Яўген Іванавіч Скурко, 1912—1995) — народны паэт Беларусі. Нарадзіўся на Мядзельшчыне. Працаваў у часопісах «Вожык», «Полымя» (1948—1966), у Саюзе пісьменнікаў БССР (1966—1990). Прыйшоў у літаратуру ў 30-я гг. Першыя кніжкі паэзіі «На этапах», «Журавінавы цвет», «Пад мачтай» выдаў у Вільні. Аўтар зборнікаў паэзіі «Каб ведалі», «След бліскавіцы», «Мой хлеб надзённы», «Прайсці праз вернасць», «За маім сталом», «Збор калосся» і інш., кнігі-дзённіка «Лісткі календара», кніг вершаў і казак для дзяцей. Пераклаў творы А. С. Пушкіна, У. Маякоўскага, польскіх паэтаў. Лаўрэат Ленінскай прэміі і Дзяржаўных прэмій СССР і БССР.

СЛОЎНІК ЛІТАРАТУРАЗНАЎЧЫХ ТЭРМІНАЎ

Адухаўле́нне — адзін з відаў метафары, прыпадабненне нежывога прадмета жывой істоце, чалавеку.

Акта́ва — васьмірадковы верш, які часцей за ўсё пішацца пяцістопным або шасцістопным ямбам і рыфмуецца па схеме *абабабвв*.

Алего́рыя — гл. с. 294.

Амфібра́хій — трохскладовая стапа з націскам на другім складзе; вершаваны памер з такіх стоп.

Ана́пест — трохскладовая стапа з націскам на трэцім складзе; вершаваны памер з такіх стоп.

Анекдо́т — кароценькае жартоўнае апавяданне з нечаканай дасціпнай канцоўкай.

Антытэ́за — кантрастнае супастаўленне процілеглых вобразаў, думак, перажыванняў для ўзмацнення ўражання ад іх ці выяўлення іх супярэчлівасці.

Апавяда́нне — гл. с. 191.

Апіса́нне — гл. с. 258.

Апо́вед — гл. с. 258.

Апо́весць — гл. с. 256.

А́ўтарская характары́стыка — гл. с. 258.

Ба́йка — гл. с. 294.

Бала́да — гл. с. 291.

Батле́йка — вандроўны лялечны тэатр на Беларусі, сцэнай для якога служыла пераносная скрынка ў форме доміка або царквы з двух паверхаў, дзе разыгрываліся розныя прадстаўленні.

Вадэві́ль — жанр драматычных твораў, лёгкая камедыя з займальнай інтрыгай у аснове сюжэта.

Гіпе́рбала — моцнае перавелічэнне ўласцівасцей, якасцей ці памераў прадмета або з'явы з мэтай узмацнення паэтычнай выразнасці.

Гу́мар — паказ жыццёвых з'яў або чалавека ў камічным, смешным выглядзе; нязлосны, добразычлівы смех.

Да́ктыль — трохскладовая стапа з націскам на першым складзе; вершаваны памер з такіх стоп.

Дра́ма — род літаратуры, у якім жыццё паказваецца галоўным чынам праз дзеянне, дыялог, праз узаемаадносіны паміж персанажамі.

Дыяло́г — размова паміж двума або некалькімі персанажамі ў мастацкім творы, якая перадаецца пры дапамозе простай мовы.

Жанр — форма літаратурнага твора, якая склалася гістарычна на аснове ўвасаблення пэўнага зместу.

Завя́зка — момант, з якога пачынаецца развіццё дзеяння ў літаратурным сюжэтным творы.

Ідэ́я — гл. с. 27.

Інве́рсія — гл. с. 126.

Інсцэніро́ўка — перапрацоўка літаратурнага твора для пастаноўкі на сцэне тэатра або ў кіно.

Інтана́цыя — тон, характар вымаўлення фразы, якія выяўляюць пачуццё, настрой, душэўны стан чалавека.

Інты́мная лі́рыка — гл. с. 121.

Інтэрме́дыя — невялікія камічныя сцэнкі, якія разыгрываліся паміж актамі асноўнага дзеяння спектакля.

Ка́зка — жанр вуснай народнай творчасці, звычайна празаічнае апавяданне фантастычнага або сацыяльна-бытавога зместу з выкарыстаннем вымыслу (выдумкі).

Каме́дыя — жанр драматычнай літаратуры, твор, у якім камічна, у смешным выглядзе паказваюцца розныя (часцей адмоўныя) з’явы жыцця з мэтай іх крытыкі.

Камі́чнае — тое, што выклікае смех, своеасаблівая форма крытыкі адмоўных з’яў у мастацкім творы.

Канфлі́кт — адлюстраванне ў літаратурным творы барацьбы, сутычкі характараў, што тлумачыцца процілегласцю інтарэсаў, намераў, імкненняў людзей.

Кульміна́цыя — пункт найвышэйшага напружання ў развіцці дзеяння, сюжэта мастацкага твора.

Леге́нда — фальклорнае фантастычнае апавяданне, якое выдаецца і ўспрымаецца як верагоднае, хоць яно і не пацверджана гістарычнымі фактамі.

Лі́рыка — гл. с. 101.

Ліры́чныя адступле́нні — гл. с. 260.

Ліры́чны геро́й — гл. с. 107.

Манало́г — разгорнутае, тэматычна адзінае выказванне літаратурнага героя або аўтара, звернутае да іншых асоб або да сябе.

Метані́мія — гл. с. 132.

Мета́фара — перанос уласцівасцей адной з’явы на другую паводле падабенства.

Наве́ла — гл. с. 191.

О́да — урачысты, узнёслы верш, хвалебная песня ў гонар важнай падзеі, з’явы, асобы.

Пада́нне — вуснае празаічнае народнае апавяданне, у якім ад імя сведкі або ўдзельніка падзей расказваецца пра розныя цікавыя

жыццёвыя з’явы, падзеі або пра выдатных людзей, іх учынкі, подзвігі.

Паралелі́зм — гл. с. 104.

Параўна́нне — супастаўленне дзвюх з’яў з мэтай іх характарыстыкі адной праз другую.

Партрэ́т — апісанне ў літаратурным творы знешняга выгляду персанажа, яго твару, адзення, манеры паводзіць сябе.

Пасла́нне — лірычны верш у форме звароту аўтара да якой-небудзь асобы або групы людзей. Звычайна мае характар маналагічнай прамовы ці адкрытага ліста, які часта важны не сам па сабе, а як нагода для разважання.

Паэ́зія — адзін з асноўных відаў мастацтва слова. Вызначаецца вершаванай формай, шырокім ужываннем слоўных вобразаў (тропаў, фігур), настроенасцю на думкі і пачуцці яркія, узнёслыя, прыгожыя, гарманічна выказаныя, як у лірычных вершах. Лірыка — заўсёды паэзія, але паэзія — не толькі лірыка, гэта і ліра-эпічныя творы, вершы ў прозе і інш. (гл. *Проза. Лірыка*)

Паэ́ма — гл. с. 277.

Пейза́ж — апісанне прыроды ў літаратурным творы.

Персана́ж — дзейная асоба ў літаратурным творы.

Прабле́ма — гл. с. 27.

Про́за — адзін з асноўных відаў літаратурна-мастацкай творчасці. Невершаваная літаратура, сваім зместам звернутая на пазнанне і адлюстраванне складаных жыццёвых з’яў, людскіх узаемадачыненняў, характараў. У празаічнай форме звычайна пішуцца эпічныя творы, але могуць быць і такія, як вершы ў прозе, свабодны верш (гл. *Паэзія. Эпас*).

Пры́тча — гл. с. 294.

Развя́зка — заключны этап у развіцці дзеяння ў эпічным або драматычным творы.

Рама́нс — невялікі лірычны верш напеўнага характару пра каханне.

Ры́фма — сугучнасць канчаткаў вершаваных радкоў.

Рэма́рка — аўтарская заўвага ў тэксце драматычнага твора, у якой даюцца тлумачэнні адносна таго, як выглядае, паводзіць сябе герой у дадзены момант, з дапамогай якіх рухаў, жэстаў, мімікі выяўляецца стан яго душы і г. д.

Рэфрэ́н — слова, радок ці некалькі радкоў, якія паўтараюцца пасля кожнай страфы.

Сане́т — форма лірычнага верша з 14 радкоў, у якім радкі звычайна рыфмуюцца ў пэўным парадку *(абба абба ввг дгд)*. Санет дзеліцца на дзве часткі: у першых дзвюх строфах развіваецца тэма, у наступных — робіцца вывад. Санеты пішуцца ямбам.

Сатыра — форма востракамічнага, выкрывальнага паказу адмоўных з'яў, пры якім крытыкуюцца заганы грамадскага жыцця або асобных людзей.

Сімвал — гл. с. 110.

Сінекдаха — гл. с. 132.

Страфа — група аб'яднаных рыфмоўкай вершаваных радкоў, якая паўтараецца на працягу твора.

Сюжэтныя лініі — кірункі сюжэта, звязаныя з найбольш значнымі характарамі мастацкага твора.

Трагедыя — гл. с. 300.

Троп — гл. с. 132.

Трыялет — форма лірычнага верша з васьмі радкоў, у якім два першыя і два апошнія, а таксама першы і чацвёрты радкі аднолькавыя. Такім чынам, першы радок паўтараецца тройчы, другі — двойчы.

Тэма — гл. с. 27.

Увасабленне — адзін з відаў метафары, перанясенне чалавечых уласцівасцей на з'явы прыроды.

Фарс — лёгкая вясёлая камедыя бытавога зместу, з ужываннем знешне камічных прыёмаў.

Характар — мастацкі вобраз чалавека ў літаратурным творы, індывідуальнасць героя, што выяўляе яго адносіны да жыцця.

Харэй — двухскладовая стапа з націскам на першым складзе; вершаваны памер з такіх стоп.

Экспазіцыя — частка твора (перад завязкай сюжэта), у якой аўтар знаёміць чытача з героямі, месцам і часам дзеяння.

Элегія — лірычны верш, прасякнуты сумным настроем з прычыны грамадскай несправядлівасці, асабістага няшчасця, неразздзеленага кахання, разважанняў аб жыцці і смерці і інш.

Эпізод — асобная падзея ў эпічным творы, якая мае пэўнае самастойнае значэнне ў развіцці сюжэта або ў характарыстыцы персанажа.

Эпілог — частка мастацкага твора, якая ідзе пасля заканчэння дзеяння.

Эпітафія — жалобны верш на ўшанаванне памяці памерлых. У Старажытнай Грэцыі — вершаваны надпіс на надмагільным помніку.

Эпітэт — мастацкае азначэнне, якое вобразна характарызуе прадмет, з'яву або чалавека.

Ямб — двухскладовая стапа з націскам на другім складзе; вершаваны памер з такіх стоп.

ЗМЕСТ

КАЛІ ХАРАКТАРЫ РАСКРЫВАЮЦЦА Ў ДЗЕЯННІ

(Назва і нумар школы)

Навучальны год	Імя і прозвішча вучня	Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні	Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам
20 /			
20 /			
20 /			
20 /			
20 /			

Вучэбнае выданне

Лазарук Міхаіл Арсеньевіч
Русілка Вольга Іванаўна
Слесарава Іна Мікалаеўна

БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА

Вучэбны дапаможнік для 8 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання

Нач. рэдакцыйна-выдавецкага аддзела *Г. І. Бандарэнка*
Рэдактар *Л. Б. Сопат*
Мастацкі рэдактар *І. А. Усенка*
Камп'ютарная вёрстка *Ю. М. Галавейка*
Карэктары *К. В. Шобік, С. М. Алава*

Падпісана ў друк 06.05.2011. Фармат 60×90 1/16.
Папера афсетная. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 22,5.
Ул.-выд. арк. 17,6 + 0,39 форз. Тыраж 113 500 экз. Заказ

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.
ЛИ № 02330/0494469 ад 08.04.2009. Вул. Караля, 16, 220004, г. Мінск

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Мінская фабрыка каляровага друку». ЛП № 02330/0494156 ад 03.04.2009.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, г. Мінск